Цэна 1 р. 50 к.

Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ГАЎРЫЛА ГАРЕЦКІ

# НАРОДНЫ ПРЫБЫТАК БЕЛАРУСІ

## (Национальный доход Белоруссии)

З прадмовай проф. А. А. Рыбнікава

529265

МЕНСК
Выданьне Дзяржпляну Б. С. С. Р.
1926 г.

ГАЎРЫЛА ГАРЭЦКІ.

# Народны прыбытак Беларусі.

Б29265

Пад рэдакцыяй праф. А. А. РЫБНІКАВА.

ВІЦЕБСК
1926.

Витокрлитбел № 15356
Тип. «Коминтерн»
Издательство «Заря
Запада», Долгоруков-
ская ул., № 10. Зак.
№ 850—1500 экз.

БИБЛИОТЕКА
Академии Наук БССР

Всякое хорошо и хозяйственно поставленное предприятие всегда начинается с инвентаризации, с учета того, какими средствами располагает хозяин для ведения своего дела.

Белорусский народ начинает сам строить свое народное хозяйство. Осуществление планомерного государственного строительства требует хорошего учета сил и средств страны, нуждается в исчислении доходов народного хозяйства. К сожалению, от прошлого Белоруссия получила мало по познанию себя, она бедна знанием своей экономики.

Работа Г. И. Горецкого: «Народны прыбытак Беларусі» во многих отношениях прекрасно заполняет имеющийся острый недостаток в познании хозяйства Белоруссии. Помимо весьма ценного и тщательно проработанного материала, который мы находим в труде Г. И., мы должны, кроме того, подчеркнуть строгую научную критическую продуманность автора в искании путей и приемов исчисления доходов народного хозяйства.

Свои исчисления доходов Белоруссии автор доводит до 1913 г. Пусть многое изменилось с указанного времени и для конкретной ориентировки в современности придется еще производить дальнейшую работу. Все это не может умалить высокого достоинства произведенного Г. И. труда, так как только после его работы делаются ценными и плодотворными изучения дальнейших изменений в народном хозяйстве Белоруссии; эти изменения будут понятны и ясны и характеристика современного состояния хозяйства будет иметь в работе Г. И. хорошую перспективу в прошлом.

Но не только одно теоретическое познание Белоруссии облегчает работа Г. И.,—она является совершенно необходимым пособием для каждого работающего над восстановлением народного хозяйства Белоруссии, думающего и болеющего о ее нуждах и ищущего путей усовершенствования народного хозяйства молодого государства.

*А. Рыбников.*

31/VII—1925 г.

# Прадмова.

Працу гэтую зрабіў я першы раз у 1920—21 г. г., калі быў студэнтам Сельск.-Гаспадар. Акадэміі імя К. А. Ціміразева (тады яшчэ Пятроўскай). Сёлета я перарабіў яе, вылічыўшы прыбытак па асобных беларускіх губэрнях.

Народны прыбытак яскрава адбівае ў сабе гаспадарчыя асаблівасьці краю, дае магчымасьць вызначыць ролю паасобных галін гаспадаркі, іх разьвіцьцё; ён паказвае адносную беднасьць ці багацьце народу і, што ў тыя гады здавалася мне асабліва важным, ён паказвае наша месца, нашу адносную вагу ў гаспадарцы Эўрап. Расіі, супольнае жыцьцё з якою, на працягу больш за сотню гадоў, адбілася і на нашай гаспадарцы і на ведах аб гэтай гаспадарцы (на супольнай з Расіяй дзяржаўнай статыстыцы).

Гэтыя думкі я маю і цяпер, праз чатыры гады пасьля першай спробы вылічэньня. Яны узмацніліся маім ухілам ў эканамічную геаграфію, бо вылічэньне народнага прыбытку дапамагае адшуканьню геаграфічных законамернасьцяў, дае матар'ял для меркаваньня аб тыпе народнае гаспадаркі.

Пачынаючы нанова гэтую працу, я кіраваўся яшчэ думкай аб практычнай карысьці ад вылічэньня народнага прыбытку, бо яно можа быць сталай падставай эканамічнай палітыкі, асабліва ў беларускіх умовах, калі маладая наша дзяржава пачынае самастойнае гаспадарчае будаўніцтва пры адсутнасьці самага першапачаткавага матар'ялу па вывучэньню Беларусі.

Выказваю шчырую падзяку праф. А. А. Рыбнікаву за карысныя мэтадалёгічныя рады.

**Г. Гарэцкі.**

Меншая Багацькаўка
на Мсьціслаўшчыне.
15/VII 1925 г.

# Уступ.

**Асноуныя разуменьні.** Народным, або нацыянальным прыбыткам завуцца ў тэорыі палітычнай эканоміі розныя разуменьні. Кожны аўтар-тэарэтык кладзе ў гэта разуменьне той зьмест, які адпавядае асноўным падставам яго эканамічнага сьветагляду. Маёю мэтаю ня ёсьць даць гістарычны агляд розных кірункаў у асьвятленьні народнага прыбытку, таму каротка застанаўлюся толькі на некалькіх азначэньнях. Адам Сьміт [1]) кажа: «Штогодны прыбытак усякае грамады цалком раўняецца менавой вартасьці усяго гадавога вытвору яе працы, або больш пэўна—прыбытак гэта і ёсьць тая самая менавая вартасьць». І далей: «Уся сума цаны, або менавой вертасьці гадавога вытвору якой-небудзь краіны павінна пабіцца на тры часткі і падзяліцца між усімі жыхарамі краіны, як іх заробчая плата, прыбыль на капітал, або як зямельная рэнта» [2]) Карл Маркс лічыць такое азначэньне памылковым, бо народны прыбытак меншы за вартасьць усяго гадавога вытвору і ровен толькі вытвору гадавой вартасьці. Маркс дэталічна разглядае развагі Сьміта [3]): «Ва ўступе да свае працы А. Сьміт проста кажа, што ўсе часткі таварнае вартасьці, існуючыя як прыбытак, роўны гадавому прадукту працы, прызначэньне якога—стварыць грамадзкі спажывецкі фонд... Значыцца, прадукт гадавое вартасьці, які ёсьць часткаю гадавога прадукту, складаецца толькі з двух элемэнтаў: з эквівалента гадавой заробчай платы рабочае клясы і гадавой дадатковай вартасьці, якая дастаецца клясе капіталістаў. А таму нідзе не застаецца месца для нязьменнай капітальнай вартасьці, каб аднаўляць капітал, які ужываецца ў форме сродкаў вытвору [4]). Першая памылка А. Сьміта ў тым, што ён ня робіць розьніцы між вартасьцю гадавога прадукта і прадуктам гадавой вартасьці. Астатні зьяўляецца прадуктам толькі працы мінулага году; першая мае ў сабе, апрача таго, усе тыя эквіваленты вартасьці, якія былі спажыты на вытвор гадавога прадукту, але створаны за год перад гэтым, а часткай і за ранейшыя гады: сродкі вытвору, вартасьць якіх толькі зьяўляецца нанова і якія, што датыча іх вартасьці, ня былі ні створаны ні адноўлены працаю, якая страчана на працягу астатняга году. Дзякуючы такой мешаніне дзьвюх розных рэчаў, А. Сьміт адкідае нязьменную частку вартасьці гадавога прадукту» [5]) «Гадавая праца», паколькі яна стварала вартасьць, ні ў якім разе не стварала ўсяе вартасьці прадукта, выробленага гэтаю працаю;... прадукт вартасьці менш, чым вартасьць прадукту [6]).

---

[1]) Ад. Смит «Исследования о природе и причинах богатства народов», пер. П. А. Бибикова. СПБ. 1866 г., стар. 263, т. II.

[2]) Там-жа, т. II стар. 21.

[3]) К. Маркс «Капитал, т. II, кн. II. Процесс обращения капитала», пад. рэд. В. Базарава і І. Сьцяпанава М. 1907, стар. 347.

[4]) Аб тым жа: Капитал, III, ч. II, ст. 371, выд 1923 г.

[5]) Там-жа, стар. 347.

[6]) Там-жа, стар. 348; аб тым-жа на стар. 409.

Памылка А. Сьміта тут вытлумачана яскрава. Усё-ж трэба заўважыць, што і ў Сьміта ёсьць жаданьне вылучыць з вартасьці гадавога вытвору (або гадавога прадукту) капітальную вартасьць. Гэтак, пасьля раней паданай цытаты, дзе гаворыцца аб тым, што ўся вартасьць гадавога вытвору дзеліцца на тры часткі—заробчую плату, прыбыль на капітал і зямельную рэнту,—у яго зараз-жа ідуць такія радкі[1]): «Аднак-жа, хаця ўся вартасьць гадавога вытвору зямлі і працы якой-небудзь краіны і дзеліцца такім чынам між усімі яе жыхарамі і зьяўляецца іх прыбыткам, усё-ж—такі, як і ў прыбытку прыватнай маёмасьці, мы адрозьніваем гуртавы прыбытак ад прыбытку чыстага, такім-жа самым чынам мы можам зрабіць такое-ж адрозьніваньне і ў прыбытку усіх насельнікаў значнай краіны. Гуртавы прыбытак усіх жыхароў вялікага краю складаецца з усяе масы гадавога вытвору іх зямлі і працы, а чысты прыбытак з таго, што ўіх застанецца па выплаце ўсіх страт на ўтрыманьне па-першае іх нязьменнага, а па-другое іх зваротнага капіталу, або з таго, што яны могуць, не чапаючы сваіх капіталаў, зрабіць прыпасамі дзеля свайго спажываньня». Як самы падзел нацыянальнага прыбытку на гуртавы і чысты, так і першае азначэньне народнага прыбытку, ў якім выказана думка об поўным падзеле гадавога прадукту на заробчую плату, прыбыль і зямельную рэнту,—сьведчаць аб няўпэўненасьці народна-гаспадарчай пазіцыі А. Сьміта, аб нявыразнасьці яго тэорыі вартасьці. Як кажа Маркс: «Сама гэта мешаніна («вартасьць гадавога прадукту» і «прадукт гадовай вартасьці» *Г. Г.*) зьяўляецца вынікам другой памылкі яго асноўнага погляду: ён ня бачыць падвойнага характару самое працы, працы, калі яна, зьяўляючыся стратай рабочае сілы, стварае вартасьць, і калі яна ў якасьці канкрэтнае карыснае працы стварае прадукты спажываньня (спажывецкую вартасьць). Агульная сума створаных за год тавараў, г. зн., у в е с ь г а д а в ы п р а д у к т ёсьць прадукт к а р ы с н а е працы...; усе гэтыя тавары існуюць толькі затым, што скарыстаная грамадою праца была страчана ў многалічных галінах сыстэмы карысных родаў працы»[2]).

Погляд Маркса на народны прыбытак яшчэ больш выяўляецца з яго разваг аб гуртавым прыбытку і гуртавой выручцы. «Калі мы ня хочам ствараць сабе некарысных перашкод, дык мы павінны адрозьніваць гуртавую выручку і чыстую выручку ад гуртавога прыбытку і чыстага прыбытку. Гуртавая выручка, або гуртавы прадукт, гэта — ўвесь створаны і адноўлены прадукт. За выключэньнем авансаванай, але неспажытай часткі асноўнага капіталу, вартасьць гуртавое выручкі або гуртавога прадукту роўна вартасьці авансаванага і спажытага ў вытворы капіталу, нязьменнага і зьменнага, плюс дадатковая вартасьць, якая раскладаецца на прыбыль і рэнту. І калі разглядаць прадукт не адзінкавага капіталу, а ўсяго грамадзкага капіталу, дык гуртавая выручка роўна натуральным элемэнтам, ствараючым нязьменны і зьменны капітал, плюс натуральныя элементы дадатковага прадукту, у якіх зьмяшчаюцца прыбыль і рэнта.— Гуртавы прыбытак, гэта—тая частка вартасьці і адпаведная ёй частка прадукта брутто, або гуртавога прадукту, якая застаецца па выключэньні тэй часткі вартасьці і адпаведнай ёй тэй часткі прадукту усяго вытвару, якая аднаўляе авансаваны і спажыты у вытвары нязьменны капітал. Значыцца гуртавы прыбытак ровен заробчай плаце (або той частцы прадукта, прызначэньне якой—нанова зрабіцца прыбыткам рабочага)+прыбыль+рэнта. Наадварот, чысты прыбытак, гэта—дадатковая вартасьць, а значыцца—дадатковы прадукт, які застаецца па выключэньні заробчае платы»[3])...

---

[1]) „Исследования“, ст. 20, т. II.
[2]) Там-жа, стар. 347.
[3]) „Капитал“, III, ч. II. 377, 78, выд. 1923 г. Аб тым-жа на ст. 371.

«Розьніца між прадуктам адзінкавага капіталіста і прадуктам грамады вось у чым: з погляду асобнага капіталіста чысты прыбытак адрозьніваецца ад гуртавога тым, што з яго выключана заробчая плата, з гуртавога-не. Калі разглядаць прыбытак усяе грамады, дык нацыянальны прыбытак складаецца з заробчае платы + прыбыль + рэнта, г. зн. з гуртавога прыбытку. Аднак-жа і гэта зьяўляецца абстракцыяй, адцягненасьцю, у тым разуменьні, што ўся грамада, на падставе капіталістычнага вытвору, ставіцца на капіталістычны пункт погляду, і таму чыстым прыбыткам лічыць толькі прыбытак, які ровен прыбылі і рэнце» [1]). Якраз гэтак памылкова глядзелі пасьлядоўнікі школы А. Сьміта, прадстаўнікі лібэральнай эканоміі, якія з нацыян. прыбытку проста выключалі заробчую плату. З паданых выпісаў з Маркса відаць, як старанна праводзіць ён розьніцу між народна-гаспадарчым і прыватна-гаспадарчым пунктам погляду на нац. прыбытак. Лепш нават было-б і не казаць аб прыбытку ў адносінах да цэлага народу, а зваць гэта — народным прадуктам [2]).

Такім чынам, народны прыбытак па Марксу ёсьць нацыянальны прадукт гадавое вартасьці, або увесь гуртавы прадукт народу па выключэньні тае часткі, якая аднаўляе спажыты нязьменны капітал. Тое, што А. Сьміт заве гуртавым прыбыткам, па Марксу ёсьць гуртавая выручка, гуртавы прадукт, або вартасьць гадавога прадукту; тое, што у Сьміта завецца чыстым прыбыткам нацыі—у Маркса ёсьць гуртавы прыбытак, нац. прыбытак, прадукт гадавое вартасьці. У адносінах да народнага прыбытку лепш зусім ня ўжываць падзелу на гуртавы і чысты (бо гэта выклікае мешаніну прыватна-гаспадарчага і народна-гаспадарчага пунктаў погляду), а адрозьніваць з аднаго боку—народную выручку, з другога — народны прадукт, прыбытак. Па думцы Р. Мэйера [3]) падзел на гуртавы і чысты трэба пакінуць, як у тэорыі, гэтак і ў практыцы, каб пад чыстым разумець прыбытак па выключэньні вядомых страт. Так і робіць аўтар лепшага вылічэньня расійскага прыбытку С. М. Пракаповіч, усюды адрозьніваючы «гуртавую вытворчасьць» і «чыстую вытворчасьць» [4]); такі-ж падзел ужываюць усе афіцыяльныя выданьні б. Расійскай імпэрыі. Але некаторыя тэорыі «зусім адкінулі гэту розьніцу («гуртавы» і «чысты»), бо яна мае адносіны толькі да выручкі, а не да прыбытку, які, уласна кажучы, ствараецца з чыстае выручкі» [5]). Гаагскі кангрэс таксама выказаўся супроць падзелу нац. прыбытку на гуртавы і чысты. Ня буду застанаўлівацца на нямецкіх азначэньнях народ. прыбытку (Einkommen), хоць яны і вельмі пашыраны (Шмольлер, Гэрман). Па самай сутнасьці разуменьня ў іх няма нічога новага, толькі асабліва падкрэсьліваецца галоўнае прызначэньне прыбытку — быць крыніцай для здаваленьня людзкіх патрэб. Напрыклад Гэльфэрых піша: «Канечная мэта гаспадарчае працы—спажываньне. Зьлішак прадуктаў над неабходнымі стратамі вытвору ёсьць нар. прыбытак. Зьлішак нар. прыбытку над патрэбамі спажываньня есьць узрост народ. маемасьці [6])».

**Віды прыбытку**. Таксама, як многа ёсьць азначэньняў нар. прыбытку, многа ёсьць і падзелаў прыбытку на віды: залежыць гэта ад мэтаў, якія ставіць дасьледчык. Розьніца між прыбыткам асобы і пры-

---

[1]) Там-жа, стар. 378 Курсыў мой. Г. Г.

[2]) Гл аб гэтым-жа Л Литошенко „Национальный доход СССР“ М. 1925.

[3]) Зборнік „Промышленность“, артыкулы з Handwörterbuch der Staatswissenschaften. М 1896 Р. Мейер „Доход“.

[4]) С Н. Прокопович (ред.) „Опыт исчисления нар. дохода 50 руб Евр. России в 1900—13 г.г.“ М. 1918.

[5]) Мейер, ст. 291.

[6]) Гельферих „Развитие нар. хозяйства Германии с 1888 по 1913 г.“ М. 1920.

быткам народу, між гуртавым і чыстым ужо была разгледжана. Розьніца між незалежным (Ursprüngliches) і залежным (abgeleitetes) прыбыткам тая, што першы дастаюць асобы за непасрэдны удзел у вытворы, другі—асобы, якія ніякага удзелу ў вытворы ня прыймалі. Грашовы прыбытак розьніцца ад натуральнага ў залежнасьці ад таго, у якой форме яго атрымоўвае гаспадар (ці народ) — грашыма, ці натуральнымі прадуктамі. Падзел гэты мае асаблівае значэньне ва ўмовах беларускіх. «Пры панаваньні натуральнае гаспадаркі... грашовая форма выклікае часта вельмі добрае уяўленьне аб стане гаспадаркі, якая часта хоць і мае зьлішак сваіх натуральных прадуктаў, але ня можа прыдбаць іншыя прадукты спажываньня... або, што яшчэ больш важна, ня можа споўніць свае абавязкі выплаты» [1]).

**Як вылічаецца прыбытак.** Як галоўным падзелам прыбытку зьяўляецца падзел на асабовы і народны, так і галоўных спосабаў вылічэньня ёсьць два: асабовы і рэальны; пры першым спосабе падлічаюцца прыбыткі усіх асоб тэй ці іншай нацыі, а складаньнем асабовых прыбыткаў выводзіцца прыбытак нацыянальны,—пры другім—вылічаюцца прыбыткі ад асобных галін усяе народнае гаспадаркі, якія у суме дадуць таксама народны прыбытак. Першы спосаб можна ўжываць толькі там, дзе ёсьць добра пастаўленая статыстыка прыбыткаў (звычайна дзяржаўная, дзеля падатковых мэтаў), якая-б ахоплівала ўсе слаі народу; вялікую увагу пры гэтым спосабе трэба зьвярнуць на вылучэньне прыбыткаў залежных ад незалежных, бо іх лёгка палічыць двойчы (залежныя прыбыткі трэба зусім выкінуць). Другі спосаб можна ўжываць толькі ў тых краінах, дзе кожная галіна гаспадаркі мае сваю статыстыку, і статыстыку даволі дэтальную, каб можна было падлічыць ня толькі выручку, але і ўсе страты. Для падлічэньня-ж выручкі трэба ведаць ня толькі колькасны бок тэй ці іншай галіны, але і якасны (якую прадукцыю мае кожная гаспадарчая адзінка). Такой поўнай і пэўнай статыстыкі ня мае ніводная краіна ў сьвеце, нават Злуч. Штаты толькі падбліжаюцца да такога ідэалу. Таму звычайна вылічаюць прыбытак рознымі ўкоснымі мэтадамі і мэтадамі мешанымі. Дык трэба згодзіцца з Вагнэрам, што «лепш проста прызнаць, што мы пакуль што ня ўладаем ніякімі сродкамі статыстычнага падлічэньня нац. прыбытку» [2]) і з думкай Р. Мэйера, хоць яна, як і Вагнэрава, была выказана ў XIX яшчэ стагодзьдзі: «Трэба згодзіцца, што ні адзін з разгледжаных мэтадаў падлічэньня нар. прыбытку не дае такіх вынікаў, якія-б хоць прыблізна дасягалі тэй меркі пэўнасьці, якую мы прызвычаіліся патрабаваць і знаходзіць у іншых галінах статыстыкі, напр. у статыстыцы насельніцтва» [3]). Дзеля расійскіх умоў я вызнаю маючым поўную моц такі выраз Пракаповіча: «Статыстычнае падлічэньне прыбытку расійскага народу у наш час зусім немагчыма» [4]). Гэта я пакажу у далейшым. Для гэтага трэба разгледзіць галоўныя спробы падлічэньня прыбытку Расіі.

**Спробы вылічэньня прыбытку Расіі.** Першымі спробамі зьяўляюцца праца В. Я. Пакроўскага [5]) і так званы «Опыт приблизительного исчисления народн. дохода по различным его источникам и по размерам в России» [6]). Першая праца ўжывае больш рэальны мэтад, другая—больш асабовы. Прызнаўшы, што «вылічэньне сумы народ. прыбытку зьяўляецца вельмі цяжкім заданьнем, зусім

[1]) Р. Мейер, ст. 297.
[2]) Р. Мейер, стар. 299.
[3]) Там-жа, стар. 311.
[4]) „Опыт“, стар. 5.
[5]) «К вопросу об устойчивости актив. баланса рус. внешней торговли».
[6]) «Материалы к проекту Положения о госуд. подоходном налоге», СПБ. 1906.

неапрацованым у нашай статыстычнай і эканамічнай літаратуры», аўтары «Опыта» перш-наперш цалком выключаюць з падлічэньня усе прыбыткі сялян з надзельнае зямлі і наагул усе прыбыткі, якія не дасягаюць 1000 р.; калі лічыць разам з аўтарамі, што 1000 р. якраз роўны неабходнаму спажываньню ў расійскіх умовах, дык у лепшым выпадку вылічаны з такімі выключэньнямі прыбытак можна-б было прыраўнаваць толькі да так званага «вольнага» прыбытку, г. ё. народнага прыбытку па выключэньні страт на харчаваньне і інш. спажытак. Усе вылічэньні наагул вельмі умоўныя; для прыкладу праглядзім, як вылічаецца прыбытак ад сельскае гаспадаркі. Папершае сюды трапіў толькі прыбытак ад зямлі, хоць і вядома, што прыбытак ад зямлі, ад земляробства, гэта далёка ня прыбытак ад усяе сельскае гаспадаркі. А самая прыбыткоўнасьць зямлі скрозь па ўсіх губэрнях вызначана ў 6% ад рыначнае цаны зямлі; напр., у Меншчыне, згодна з аўтарамі, у паноў ёсьць 4.276,2 тыс. дзесяцін зямлі, цана 1 дзес. зямлі 34 р., значыцца, уся каштоўнасьць зямлі 145.390,8 тыс. руб., а прыбытак—6% ад гэтага, г. ё. 8.723,5 тыс. р. Зразумела, што гэткі «прыбытак» далёка не зьяўляецца народным ні ў якім разуменьні, а падзяліць яго між асобнымі галінамі сельскае гаспадаркі немагчыма ніяк.

«Опыт» Пракаповіча першы (для вызначэньня прыбытку 1900 г.) быў зроблен у 1906 г. і другі, паўторны, у 1918 г. (для прыбытку 1913 г.). У большасьці ўжываецца рэальны мэтад і толькі пры поўнай адсутнасьці матар'ялаў—асабовы: напр., для садоўніцтва, гародніцтва, мясной прадукцыі прыбытак вылічаецца па бюджэтах. Вялікія плюсы працы у тым, што яна падлічае прыбытак ад усіх галін народнае гаспадаркі больш-менш аднакавым мэтадам і за два пэрыяды; тым самым яна дае сканцэнтраваны, сьціснуты матар'ял па эвалюцыі, разьвіцьцю гаспадаркі, і па ролі асобных галін гаспадаркі ў цэлым гаспадарчым організьме. Але праца мае і заганы, якія ўжо шмат разоў абгаварываліся у эканамічнай літаратуры. Па 1)— з нар. прыбытку ня выключаны страты на амортызацыю і на рэмонт гаспадарчай маемасьці; па 2)—у страты на харчаваньне скаціны залічаны толькі салома, сена і ячмень для сьвіней; па 3)—увесь прыбытак не распарадкаван добра між асобнымі галінамі, напр. прыбытак ад рабочых коняй і прыбытак ад гною, якія павінны былі-б аднесьціся да жывёлагадоўлі, пакінуты ў прыбытку ад палявых культур, а прыбытак ад сенажацяў і саломы ня вылучан з прыбытку ад жывёлагадоўлі; па 4)—вельмі часта ўжываюцца розныя «нормы» без належнага ўгрунтаваньня іх; па 5)—не цалком выкарыстовываецца аднакавы мэтад пры вылічэньні прыбытку у 1900 г. і 1913 г.; па 6)—тэрмін, за які вылічаецца прыбытак не аднакавы для ўсіх галін, для адных гэта 1896—1900 г. г. і 1909—13 г.г., для другіх 1900 і 1913 г.г., для трэцьціх 1898, 95 і 1910 г.г.; па 7)—некаторыя галіны гаспадаркі зусім выкінуты з падлічэньня, напр. птушкі, і па 8)—ня прынят пад увагу замежны баланс (гандлёвы і плацежны). Трэба застанавіцца на некалькіх заганах больш дэталічна.

1. Ніякіх масавых матар'ялаў для падлічэньня страт на амортызацыю і рэмонт няма, дык гэта навет і добра, што Пракаповіч ніякіх няпэўных лічбаў, вылічаных убочным спосабам, не даваў. Але-ж вядома, што страты на рэмонт і амортызацыю ў розных галінах гаспадаркі вельмі розныя, і ў прамысловасьці, напрыклад, транспарце, будаўніцтве значна вышэйшыя, чым у сельск. гаспадарцы—дык таму сапраўдная роля асобных галін у народным прыбытку, з якога не адкінута частка на амортызацыю, зьначываецца, і роля сельскай гаспадаркі, бязумоўна, абніжаецца.

2. Загану пад п. 2 ня можна лічыць вялікай заганай. Аўтар «Опыта» меркаваў, што ўсё сена і салому, апрача тэй, што зьядаюць гарадзкія вайсковыя коні, спажывае сельская жывёла, а таму ў агульную суму пры-

бытку ён не залічаў прыбытку ад гэтага сена і саломы; норму харчаваньня сьвіней ён прыняў дужа высокую—аж 7 пудоў ячменю на 1 пуд сала: вядома, што сьвіньня на 1 фунт прыросту патрабуе сярэдне 3.2 крухмальных эквіваленты, а па Кэльнэру у 100 фунтах сярэдняга ячменю ёсьць 72,0 такіх эквівалентаў, значыцца, на 1 пуд прыросту трэба толькі (100 : 72,0) 3.2 = 4.46 пудоў ячменю. Тое-ж самае можна паказаць інакай. З досьледаў амэрыканскіх дасьледчых станцый і фэрмэраў, якія апрацаваў праф. Гэнры, відаць, што пры жывой вазе ад 200 до 250 хунтаў трэба канцэнтраваных харчоў на 1 хунт прыросту толькі 4.98 х. [1]); а вага расійскай сьвіньні прынята як-раз у 6 пудоў, або 240 хунтаў. Дык калі навет прыняць, што сьвіньня на 1 пуд сала схарчуе 5 пудоў, а ня 7, то і тады прыдзецца харчовыя страты на сьвіней ў Пракаповіча з 131.800 тысячаў рублёў зьнізіць да 94.143 тыс. руб., або на 37.657 тыс. рублёў (для 1913 году). Памылка «Опыта» толькі тая, што ня выключан з прыбытку кошт аўса, які стравілі коні ўсяе Эўроп. Расіі ў 1913 годзе; але калі прыняць, што ўсе 718 мільёнаў пудоў спажытага аўса [2]), коштам у 452.4 мільёны рублёў, пайшлі на корм коням, і калі выкінуць адсюль 37.7 мільёнаў залішне палічаных на харчаваньне сьвіньням, дык выйдзе, што ад прыбытку сельскай гаспадаркі трэба адкінуць 414.7 мільёнаў рублёў; гэта складае толькі 3,5% ад прыбытку з ўсяе народ. гаспадаркі, а 7,4% з ўсяе сельскай гаспадаркі. Амартызацыя і рэмонт у сельск. гаспадарцы хістаюцца ад 3 да 6%, значыцца, перавялічэньне сельск.-гасп. прыбытку праз недалік харчоў ды перавялічэньне праз амортызацыю і рэмонт дасягаюць 10—13%.

3. Трэцяя загана—няпэўнае распарадкаваньне прыбытку між асобнымі галінамі—яшчэ больш павялічваецца праз тое, што не адкінуты ад прыбытку амартызацыйныя і рэмонтныя страты. Гэту загану разам з шостай я лічу галоўнаю (аб гэтым трошку пазьней).

4. Няўгрунтаванасьць «нормаў» зьяўляецца аднэй з найпаважнейшых перашкод да шырокага ўжываньня «прыбытковага» мэтаду. Чаму убойная вага рагатае скаціны роўна ў 1913 г. 10 пудам, а не 10.54 пудоў, як у 1900 г. у таго-ж Пракаповіча, або не 16 пуд, як у В. В. Марачэўскага? [3]) Чаму вага сьвіньні 6 пудоў, а ня 5 пудоў, як у Ліскуна [4]), або ня 2.66—3.2 пуды, як у Каньюнктурнага Інстытуту Наркамфіна СССР? Чаму % малочных кароў у статку 1900 году будзе такі самы, як і ў 1916 годзе? Чаму лік кароў у 1900 г.—13.790.672 штук, а чаму не 25 мільёнаў кароў, як у Марачэўскага? І гэта «чаму» можна бясконцу паўтараць адносна кожнае нормы. І можна атрымаць той ці іншы адказ, і ад кожнага дасьледчыка адказы будуць ўсё розныя. А «норма»-ж тут—гэта ўсё. Даволі зьмяніць норму вагі сьвіньні з 5 пудоў да 6—як прыбытак, пры адных і тых жа абсалютных лічбах колькасьці сьвіньней, зьмяняецца на 20%; хоць-бы статыстыка колькасьці рагатае скаціны была абсолютна пэўна—норма вагі убойнае ня ў 10, а ў 16 пудоў зробіць прыбытак на 60% вышэйшым! Калі пэўнасьць вылічэньня 60%,—як можна такім мэтадам угледзіць рэальную гаспадарчую зьмену у 5%? Ніяк. Без угрунтаваньня «нормаў», што можна зрабіць толькі на падставе статыстыкі, вылічэньне прыбытку «рэальным» мэтадам траціць палову сваей вартасьці. Гэта асабліва належыць да жывёлагадоўлі, тэй галіны, якая мае такое вялікае значэньне у беларускіх умовах. Навет у Заход. Еўропе няма добрае веды аб якасным

[1]) Праф. М. Ф. Іваноў. „Свиноводство“. М. 1922.

[2]) „Производство, перевозки и потребление хлебов“, вып. I і II.

[3]) В. В. Морачевский. „Земледельческий промысел в нар. хоз-ве России“, адбітак уступу да выдан. Д-ту Земл. „Агрономическая помощь в России“, 1914.

Е. Ф. Лискун. „Мясной вопрос в созременной хоз. обстановке“. П. 1917 г. Материалы „КЕПС“.

баку жывёлаводзтва. Ю. Э. Янсон[1]) (выдатнейшы расійскі статыстык) пісаў: «Відавочна, што не даволі ведаць адну агульную колькасьць скаціны: трэба мець колькасныя лічбы для вывучэньня якасных адносін, і з гэтага пункту погляду статыстыка ня можа лічыцца зусім здавальняючай... У земляробчых перапісах (Зах. Эўропы. *Г. Г.*) цяжка знайсьці веды аб вазе жывой і убойнай, аб сярэдняй колькасьці розных прадуктаў, якія дае скаціна, і аб тым, колькі жывёлы гадуецца дзеля тых ці іншых спэцыяльных мэтаў»... Аб расійскай-жа статыстыцы ён казаў вось што[2]): «Калі-б у наш час мы захацелі мець якое-небудзь уяўленьне аб колькасьці прадуктаў, якія дае жывёлагадоўля, дык мы павінны-б былі ужыць той-сама спосаб, які быў у шасьцідзесятых і ў пяцідзесятых гадох: 20—25 гад. сельск.-гасп. статыстыка наша не зрабіла ніякіх посьпехаў. Уся розьніца будзе толькі ў тым, што каэфіцыэнты множаньня зараз можна будзе ўзяць больш дэталічныя». Розьніца будзе якраз ня ў гэтым: і цяпер бяруць такія-ж грубыя нормы, каэфіцыэнты; розьніца толькі у тым, што замест «20—25 гадоў» у наш час можна сказаць «65—70 гадоў»! Далей яшчэ часта я буду застанаўлівацца на нормах.

5. Аднакавы мэтад вылічэньня пРыбытку за два пэрыяды мае катэгарычнае значэньне: толькі ў такім выпадку і можна рабіць параўнаваньні. Між тым у Пракаповіча гэта патрабаваньне парушаецца вельмі часта. Вось прыклады. Для вылічэньня прыбытку ад палявых культур ён бярэ спачатку засеўную плошчу аднаго 1900 году, а потым сярэднюю за пяцёхгодзьдзе 1909—1913 г. г. Цэны на прадукты жывёлагадоўлі першы раз бяруцца за 10 гадоў (1891—1900 г. г.), у другі раз толькі за 1 год сярэднія (1913). Гэта б было можна зрабіць з цэнамі на збожжа, якія растуць ня так шыбка, але ніяк ня з цэнамі на жывёльныя прадукты. Прыблізную памылку можна бачыць з параўнаваньня цэн па Эўрапэйскай Расіі за гады: 1896—1900 і 1891—1900, 1913 і 1909—13:

Цана за адзін пуд — капеек

| | 1896—1900 | 1891—1900 — % | 1913 | 1909—1913 — % |
|---|---|---|---|---|
| Гавядзіна . . | 268 | 200 + 3,2 | 500 | 456 + 9,6 |
| Сьвініна . . . | 332 | 331 + 0,2 | 597 | 506 + 18,0 |
| Сала сьвінное | — | 540 — | 876 | 821 + 6,7 |
| Бараніна . . | 238 | 231 + 3,1 | 477 | 418 + 14 |
| Сала бараньн. | — | 416 — | 666 | 618 + 7,8 |

Калі-б наагул браць цэны сярэднія за пяць гадоў, дык ў такім разе прыбытак ад мяса жывёлы за першы час зьменшан супроць супраўднага на 2—3%, а за другі (1913 г.) павялічан на 10—12%; калі браць цэны толькі за адзін год, то розьніца між цэнамі 1891—1900 г. г. і 1900 г. канечна будзе значна большая, чым 3%—і ўсё роўна гэтым ня будзе парушан такі вынік: толькі дзякуючы аднэй памылцы—неаднакавым спосабам узятым цэнам—Пракаповіч зьменшыў прыбытак ад жывёлагадоўлі ў 1900 г. і павялічыў яго супроць супраўднага ў 1913 г.

6. Прыбытак ад усіх галін гаспадаркі павінен быць вылічан абавязкова за які-нібудзь адзін пэўны і аднакавы для ўсіх галін тэрмін, іначай паасобныя часткі гаспадаркі ня можна раўнаваць між сабою, бо гаспадарка ўвесь час разьвіваецца, ідзе наперад ці назад, і адзін год для

---

[1]) Ю. Э. Янсон «Сравнительная статистика России и западно-европейских государств, т. II Промышленность и торговля. Отд I Статистика сельского хозяйства» СПБ. 1880. Стар. 467.

[2]) Там-жа стар 660.

некаторых галін прыносіць вельмі значныя зьмены. Пад увагу гэта патрабаваньне пры вызначэньні прыбытку Эўр. Расіі ня было узята. Прыбытак ад збожжа (зернявых культур) і ад гандлёва-прамысловых расьлін вылічаецца за 1909—13 г. г. сярэдні за пяцёхгодзьдзе, а за 1900 г. нейкі мяшаны—засеўная плошча 1900 г., а ураджай, чысты збор і цэны сярэднія за 1896—1900 г.г.[1]) Прыбытак ад іншых галін сельск. гаспадаркі, напр. жывёлагадоўлі, вылічаецца ўжо за адзін год. Такім чынам, роля палявых культур у сельск. гаспадарцы зьменшана адносна іншых галін. Наколькі? Для пэўнага адказу трэба-б было нанова пералічыць прыбытак. З параўнаньня абсалютных лічб збораў за 1913 г. і 1909—13 г.г. і цэн за тыя-ж гады па ўсёй Эўрап. Расіі разам—можна прыблізна меркаваць, што прыбытак ад збожжа і прам.-тэхн. культур за 1913 г. вышэй за прыбытак 1909—1913 г.г. на 12—15%. Праз неаднакавы тэрмін вылічэньня і агульная роля сельскае гаспадаркі ў народным прыбытку зьмяншаецца, бо прыбытак ад прамысловасьці, гандлю, будаўніцтва, шляхоў зносін вылічаўся за адзін год, а не сярэдні з некалькіх.

Астатнія дзьве памылкі Пракаповіча я не ўважаю за вельмі значныя. Ня гледзячы на ўсе гэтыя заганы, прыбытак, вылічаны Пракаповічам, больш—менш пэўны. Агульная тэндэнцыя аўтара была—усё перавялічваць. І такія галіны, як прамысловасьць, транспарт, гандаль у яго бязумоўна маюць дужа шчодрае падлічэньне. Пытаньне аб зьмяншэньні можна аднесьці толькі да сельскае гаспадаркі. Большасьць сел.-гасп. эканамістаў так і глядзіць на прыбытак «Опыта», як на зьменшаны. Той разгляд, які я зрабіў, дае магчымасьць меркаваць іначай. Праз недалік харчоў, амартызацыі і рамонту перавялічэньне прыбытку роўна 11—13% ад усяго сел.-гасп. прыбытку, калі з асьцярожнасьцю застанавіцца навет на 10%, то толькі адно гэта дасьць 563 міліёны рублёў перавагі; каб зьмяншэньне прыбытку ад збожжа было навет на 15% (я лічу 10%), або 405 міл., а прыбытку ад гандлёвых культур навет 20% (я лічу 15%), або 146 міл., то і ў такім выпадку зьмяншэньне—551 міліёнаў расквіталась-бы з перавялічэньнем — 563 міліёнаў рублёў. У гэтым запэўнівае і іншы спосаб доказу. Чысты прыбытак сельскае гаспадаркі 50 губэрняў Эўрапэйскае Расіі вызначан Г. Студзенскім[2]) у 5.349,3 тысячы рублёў для 1911—15 г.г., а ў Пракаповіча для 1909—13 г.г. у 5.630,2 тыс. рублёў. Але трэба спачатку зрабіць гэтыя лічбы параўнальнымі адна з другою. Дададзём да чыстага прыбытку[3]) Студзенскага страты на рэмонт скаціны—135,4 міл. руб., на харчаваньне яе (апрача сена і саломы)—746,3 міл. руб., на амартызацыю і розныя ўкосныя страты 289,3 мил. руб. і адкінем прыбытак ад птушак, які Пракаповіч не падлічае, 154,3 міл. руб. Тады велічынямі прыбытку, якія можна параўновываць, будуць: у Студзенскага 6.366,0 міл. рублёў, у Пракаповіча 5.630,2 міл. руб., або на 735.8 міл. менш. Ад пэрыаду 1909—13 г.г. да пэрыаду 1911—15 г.г. прайшло 2 гады, дзеля таго, што на іх прападае час вялікага гаспадарчага росквіту, прыймаем ўзрост прыбытку па складаных процантах не 5,6, а 6%; будзем мець ўзрост—першы год 337,8 мил. р., другі—358,1 міл. руб., разам 695,9 міл. рублёў—лічба вельмі блізкая да 735,8 міл. р., што і сьведчыць аб пэўнасьці вылічэньня ў Пракаповіча і блізкасьці яго прыбытку да супраўднага.

Але ў расійскай эканам. літаратуры мы навет ня маем дэталічнай спробы фактычна давесьці, што лічбы ў Пракаповіча зьменшаны.

---

[1]) Такім-жа чынам вылічана „гуртавая прадукцыя“ Беларусі аўтарамі кнігі „Очерки по народному хозяйству и финансам Белоруссии“. Менск. 1925.—Засеўны пляц за 1913 г, а збор з дзесяціны сярэдні за 5 гадоў.

[2]) Г. А. Студенский—„Очерки сел.-хоз. экономии“ М. 1925 г.

[3]) Чысты ровен у Студзенскага гуртавому мінус страты на харчаваньне і рамонт скаціны, мінус страты на амартызацыю і ўкосныя страты.

Застановімся на некалькіх. А. Л. Вайнштэйн [1]) робіць спробу крытыкаваць лічбы «Опыта» на падставе бюджэтаў. Ен бярэ прыбытак ад сельскае гаспадаркі, бяз страт на харчаваньне скаціне і на насеньне, па 6 губэрнях: Валагод., Маскоўск., Ноўгарод., Пензен., Смаленск. і Харкаўскай, па 7 губэрні—Тамбоўскай—робіць інтэрпэляцыю (пералічэньне ўсяго прыбытку, грунтуючыся толькі на аднэй грашовай частцы яго і адносінах яе да гуртавога прыбытку ў іншых губэрнях),—выводзіць з 7 губэрняў сярэдні прыбытак на 1 чалав. і на 1 гаспадарку і параўновывае яго з лічбам-Пракаповіча. Далей бярэ вылічаны В. Марачэўскім прыбытак ад сельск. гаспадаркі ўсяе б. імпэрыі за 1910 год, робіць т. зв. «мінімальныя папраўкі», павялічвае прыбытак па складаных процантах (5,6) да 1913 году і вылучае частку прыбытку Эўрап. Расіі з усяго прыбытку б. імпэрыі па насельніцтву, мяркуючы ,што адзін чалавек б. імпэрыі мае аднакавы прыбытак, як і адзін чалавек Эўрап. Расіі. Нарэшце Вайнштэйн складае такую табліцу [2]).

Прыбытак на 1 душу рублёў:

| | |
|---|---|
| Па бюджэтах | 75,8 |
| Па С. Пракаповічу | 54,9 |
| Па В. Марачэўскаму | 64,4 |

А з таблічкі робіць вывад: «выпраўленыя лічбы б. Д-ту Земляробства (В. Марачэўскага. *Г. Г.*) бліжэй да бюджэтных, чымсі лібчы Пракаповіча, ня гледзячы на яго запэўніваньне, што ён перавялічыў сельск.-гасп. прыбытак... «прыбытак ад сел.-гасп. на душу сельскага насельніцтва мусіць быць недзе пасярэдзіне між вылічэньнямі бюджэтаў і Марачэўскага, г. зн., магчыма каля 70 руб. на душу сел. жыхарства... Таму, прымаючы лічбы В. Марачэўскага, якія мы выправілі і дадалі для 1913 году, мы бярэм зусім мінімальныя лічбы передваеннага прыбытку ад сельск. гаспадаркі» [3]) Выпраўленыя такім чынам лічбы Вайнштэйн заве «нашымі вылічэньнямі» [4]), таму, разглядаючы іх, мы разглядаем ня толькі спробу крытыкаваць Пракаповіча, але і спробу самастойных вылічэньняў прыбытку. Успомнім зараз-жа, што ў першым сваім творы [5]) Вайнштэйн казаў аб «Опыте» іначай: «агульнае зьмяншэньне часткай можа замяніцца тым, што не адкінуты паказаныя стацьці страт (харчаваньне скаціны, амортызацыя, рамонт *Г. Г.*)... цалкам і ўагуле сельск.-гасп. прыбытак, вылічаны С. Пракаповічам, не перавялічан і дасягае да супраўднага умоўна-чыстага прыбытку ад сельскай гаспадаркі» [6]).

Па-першае, усякія бюджэтныя лічбы, пры тым стане бюджэтнай статыстыкі, які быў перад вайною, а навет і пры сучасным, ні ў якім разе не зьяўляюцца характэрнымі для ўсяе масы гаспадарак. Усе лічбы бюджэтаў перавялічаны, бо ў досьлед пападала большасьць гаспадарак вышэйшага тыпу. Па-другое—7 губэрняў гэта ня б. імпэрыя, а выбар іх такі няўдалы, што тып гаспадаркі ў іх ня ёсьць тып гаспадаркі большасьці раёнаў б. імпэрыі. А па-трэцяе, новыя бюджэтныя досьледы, а таксама і вылічэньні сел.-гасп. прыбытку рэальным мэтадам даюць лічбы, якія рэзка

---

[1]) А. Л. Вайнштейн—«Место сел. хоз. в нар. хозяйстве России», адбітак з «Социалистическое хозяйство» № III. 1924 г.

[2]) «Обложение и платежи крестьянства в деревне и революц. время». М. 1924 г. стар. 24.

[3]) „Обложение“... стар. 104.

[4]) „Обложение“... стар 105 і 145.

[5]) „Место сел. хоз. в нар. хоз. России“.

[6]) Курсыў мой Г. Г. Праф. Л. Літошанка кажа аб крытыцы А. Вайнштэйна: „Тщательные“ падлічэньні Д. Л Вайнштэйна паказваюць, што... трэба вызначыць лічбу Пракаповіча зьменшанаю на 17%“ („Нар. доход СССР“, стар. 33).

адхіляюцца ад лічб Вайнштэйна, як у абсалютным значэньні, гэтак і ў адносным:

Чысты прыбытак на душу сельск.-гасп. нас.

| | па Вайншт. | па Студзен. | па Літошанка |
|---|---|---|---|
| Валагод. . . . | 46,3 | 46,6 | — |
| Маскоўск. . . . | 94,4 | 38,0 | — |
| Ноўгарод. . . . | 45,9 | 47,7 | — |
| Пензенск. . . . | 81,4 | 47,1 | 41,7 |
| Смален. . . . | 55,3 | 59,7 | 31,0 |
| Тамбоўск. . . | (92,9) | 52,4 | 39,4 |
| Харкаўск. . . | 114,2 | 66,4 | 46,7 |

Падлічэньні належаць да розных тэрмінаў, дык абсалютныя лічбы павінны быць рознымі. Але парадак іх адносін аднэй да другой павінен быў бы захавацца; даволі застанавіцца на параўнаваньні толькі некалькіх губэрняў: Маскоўскай, Пензенскай, Тамбоўскай, Харкаўскай, каб бачыць, як бюджэтныя лічбы перавышаюць масавыя, а значыцца—які гэта нікчэмны матар'ял для крытыкі прыбытку, вылічанага рэальным мэтадам.

Спасылацца-ж, для крытыкі Пракаповіча, на Марачэўскага зусім не магчыма. Сам Марачэўскі прызнае, што яго лічбы прыбытку «гэта толькі вельмі прыблізнае разьлічэньне і толькі для прыкладу» [1]). І далей: «Аднак жа, калі такія лічбы пазбаўлены вялікага абсалютнага значэньня, дык за імі ўсё-ж такі ёсьць значэньне адносных пакажчыкаў, асабліва пры тэй умове, калі такія разьлічэньні зроблены для розных тэрмінаў, але падставы падлічэньня ужыты аднакавыя». Ужо Марачэўскаму было зразумела, што параўновываць можна толькі прыбыткі, вылічаныя аднакавым спосабам. Гэтага-ж вымагае Мэйер [2]): «Найперш, параўнаваньні магчымы, калі з пэўнасьцю можна меркаваць, што нямінучыя памылкі зроблены ў адным кірунку і па вялічыні ня вельмі розьняцца адна ад другой». Ці-ж паклапаціўся Вайнштэйн зрабіць параўнальнымі вылічэньні Марачэўскага і Пракаповіча? Толькі часткова: ён адкідае 20% на насеньне з прыбытку 1910 г., але не адкідае ўсіх страт на харчаваньне скаціны; замест таго, каб па спосабу Марачэўскага вылічыць прыбытак Эўр. Расіі непасрэдна, ён ідзе убочным шляхам, бяручы ад б. агульна-імпэрскага прыбытку % на Эўр. Расію па процанту насельніцтва, чым бязумоўна робіць памылку, бо прыбытак на 1 чалавека ў Эўр. Расіі і ўва ўсёй б. імпэрыі ня можа быць аднакавым; тэрмін, за які падлічае прадукцыю Марачэўскі—1910 г., у Пракаповіча па збожжу і тэхнічных культурах 1909—13 г., па пчалярству 1910 г., па іншых галінах 1913 г., дык павялічываць увесь сельск.-гасп. прыбытак з 1910 г. па 5,6% (складаных), як робіць крытык «Опыта», ніяк ня можна, бо трэба тады па спосабу Пракаповіча падлічыць прадукцыю збожжа і прамысловых расьлін ужо для 1913 году (у гэтым якраз і ёсьць асноўная памылка Вайнштэйна). Але калі Вайнштэйн робіць папраўкі навет у непасрэдным падлічэньні Марачэўскага (хмель, шаўкаўніцтва і інш.),—дык чаму ён ня робіць усіх паправак непасрэдна ў самым спосабе вылічэньня б. Д-ту Земляробства? Ці ж ня грубая памылка браць убойную вагу рагатае жывёлы ў 16 пуд., ці ж можна раўнаваць так вызначаную прадукцыю мяса з тэй, якую вызначае Пракаповіч, бяручы убойную вагу за 10 пуд.? Чаму ня выправіў Вайнштэйн у Марачэўскага колькасьць кароў, калі яна базумоўна павялічана, і г. д. Пакуль зроблены ня ўсе папраўкі для параў-

[1]) „Землед. промысел" стар. 8.
[2]) Р. Мейер „Доход", стар. 312.

наньня абодвух прыбыткаў, датуль ня варта іх і раўнаваць, бо вывады пераўнаньня будуць памылковымі. Ня буду выпісваць абсалютных лічбаў прыбытку па Марачэўскаму і Пракаповічу. Калі прыбытак 1910 г. аднесьці да Эўр. Расіі, і зрабіць папраўку колькасьці кароў, карыстаючыся сел.-гасп. перапісам 1916 году, то можна мець вынік, што і пры павялічэньні прыбытку 1910 г. на узрост да 1913 г.—прадукцыя жывёлагадоўлі ў Марачэўскага будзе значна ніжэй, чым у Пракаповіча. Прадукцыя палявых расьлін пры належных папраўках (адзін тэрмін) павінна быць аднакавай. І ніякага зьмяншэньня сельсл.-гасп прадукцыі пры такіх умовах пераўнаньня у Пракаповіча ня будзе. Але самы спосаб крытыкі праз пераўнаньне непараўнальных вялічынь памылковы і шкодны, бо ім усё можна сьцьвердзіць. Такі спосаб меркаваньня магчыма па недагляду, ужывае і праф. Літошанка [1]). «Па яго (Пракаповіча. *Г. Г.*) лічбах прыбытак ад сельск. гаспадаркі складаў у 1913 г. каля 48 руб. 34 кап. на душу сельскага насельніцтва... Каб зрабіць гэту лічбу параўнальнай з нашай, трэба прыняць пад увагу, што ў Пракаповіча не падлічан прыбытак сельскага насельніцтва ад промыслаў і іншых ня хатніх заробкаў». Калі параўнаць толькі прыбыткі ад сельск. гасп., то мы бачым, што яны зьнізіліся ў параўнаньні з мірным часам з 48 руб. 34 кап. да 38 руб., г. зн., прыблізна на 20,8%... Толькі што названы % скарачаньня здаецца не дакладным з усімі вядомымі пакажчыкамі зьнішчэньня нашае вёскі. І сапраўды ён, відаць, троху зьменшан, бо не магчыма мець абсялютна-параўнальныя лічбы. Так, напр., разлічэньні Пракаповіча рабіліся па гуртавых цэнах, а нашы па кірмашовых, і гэта адно павінна-б было значна павысіць нашу сярэднюю норму прыбытку, а значыцца і ўпрыгожыць сапраўдны стан жыцьця» [2]). А справа тут, апрача ўсяго іншага, ў тым, што Літошанка прыняў 48 руб. 34 кап. за прыбытак ад сельск. гасп. аднае душы с е л ь с к а г а жыхарства, тады як гэта ёсьць прыбытак ад сельск. гаспадаркі аднае душы ў с я г о насельніцтва, разам з гарадзкім; а каб мець лічбу сел.-гасп. прыбытку на аднаго с е л ь с к а г а насельніка, трэба з 116.484,6 чал. усіх жыхароў у 1913 г. адкінуць 18.448,7 тыс. гарадзкога, і падзяліць між імі 5.630,2 тыс. руб. сельск. гасп. прыбытку — будзем мець ня 48 руб. 34 кап., а 57 руб. 43 кап., на 18,8% больш; і зьніжэньне сучаснага прыбытку ад сел. гасп. СССР на аднаго чалавека будзе не 20,8%, а 33,8%.

Такім чынам, можна лічыць, што ў агуле прыбытак, вылічаны Пракаповічам, ня гледзячы на ўсе заганы, вельмі блізкі да супраўднага, і што да гэтага часу няма фактычнае праверкі і крытыкі яго вылічэньняў, хоць вынікі з працы Пракаповіча і маюць вельмі шырокае распаўсюджаньне.

Праф. Л. М. Літошанка зрабіў у 1925 г. вельмі цікавую спробу вылічэньня нац. прыбытку СССР пераважна а с а б о в ы м мэтадам. Прыклад Амэрыкі запэўніваў яго, што «пры даволі добрай падрабязкавасьці і пэўнасьці статыстычных ведамасьцяў можна дасягнуць вельмі значнага падбліжэньня вялічыняў нац. прыбытку, вылічаных абодвума мэтадамі. Амэрыканскі інстытут эканам. дасьледаваньняў, ідучы абодвума шляхамі, вызначыў лічбы нац. прыбытку Зл. Штатаў, якія разыходзіліся ўсяго на 2—3% [3]). Літошанка выкарыстоўвае матар'ялы прыбыткова-падатковай статыстыкі і бюджэты. Супроць першых нічога сказаць ня можна. Але супроць бюджэтаў трэба выказацца рашуча. Пакуль яны ня зробяцца масавымі, да таго часу іх і трэба ўжываць толькі для ўяўленьня якасных бакоў вытвору і спажываньня, і ніякім чынам ня колькасных. У праф. Літошанкі толькі 1274 бюджэты, а ўсіх гаспадарак у Саюзе 18.380,4 тысяч,

---

[1]) Л. Н. Литошенко „Нац. доход СССР". М. 1925 г, стар. 32 і 33.
[2]) Там-жа, стар. 33.
[3]) «Нац. доход СССР», стар. 6.

ці-ж можна па адным бюджэце меркаваць аб 14.430 гаспадарках, або ці-ж 42 гаспадарак Харкаўшчыны і 20 гаспадарак Доншчыны даволі, каб меркаваць аб 4.811 тысячах украінскіх двароў? Бо гэта як-раз тое, аб чым піша праф. Бэрнштэйн[1]): «Было-б відавочна недазволенай памылкай рабіць вывады на ўсеукраінскі маштаб на падставе абсьледаваньня аднае губэрні». Усе гаспадаркі праф. Літошанка дзеліць на групы ў залежнасьці ад колькасьці засеўнай плошчы, лічучы, што прыбытак зьмяняецца разам з засеўн. плошчай (для інтэнсыўных раёнаў з жывёлагадоўным ухілам, як Беларусь і Заходняя Украіна, гэта няпраўдзіва), і для кожнай групы выводзіць сярэдні прыбытак з тых бюджэтаў, якія на гэту групу прыпадаюць. Чым багацей група, тым менш ёсьць для яе бюджэтаў, тым больш магчымасьці ўсё выпадковае, асабовае ў бюджэце прыняць за тыповае. Вось прыклад:

| Засеву на 1 гаспадарку | Лік бюджэтаў | | Лік гасп. ў тыс. | | На 1 бюджэт гасп. (тысяч) | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Украіна | Спаж. паласа | Украіна | Спаж. паласа | Украіна | Спаж паласа |
| Да 2 дзес. . . | 16 | 90 | 2254 | 2803 | 140 9 | 31 1 |
| 2— 4 дзес. | 20 | 136 | 1489 | 982 | 74.4 | 7.2 |
| 4 – 6 » . | 7 | 69 | 592 | 176 | 84 6 | 2 5 |
| 6— 8 » . | 8 | 21 | } | 39 | } | 1.9 |
| 8—16 » . | 7 | 15 | } 476 | } 15 | } 25 1 | } 0.9 |
| 16 дзес. і бол | 4 | 1 | } | | } | |
| Разам . . | 62 | 332 | 4811 | | | — |

У першых групах, хоць на адну гаспадарку-бюджэт і шмат прыпадае іншых гаспадарак (напр. на Украіне ў першай групе 140,9 тысячаў!), але колькасьць іх большая, і ўсё асабовае тут яшчэ можа зацёрціся масаю; але калі ў групе 7, 16, 19, 21 бюджэт—тут асабовае застаецца, і ў падагуленьні сваё месца выявіць.

Сел.-гасп. прыбытак СССР за 1922/23 г. праф. Літошанка вызначыў асабовым мэтадам вылічэньня у 5.714 міл. рублеў, а рэальным у 6.098 міл. руб.—розьніцу у 384 міл., або 6.7%, трэба прызнаць зусім малою; для ўмоў расійскай статыстыкі гэткая дакладнасьць і пэўнасьць вылічэньня была-б вялікім дасягненьнем. На жаль, параўнаньні з іншымі вылічэньнямі для таго-ж 1922/23 году—кажуць іншае.

Каньюнктурны Інстытут Наркамфіна СССР сваім асобным спосабам вызначыў прыбытак ад сельск.-гасп. СССР у 4.738 міл. рублёў, або 53,4% таго, які быў перад вайною, і «вылічан» Вайнштэйнам; розьніца паміж прыбыткамі ужо 20,6%. Навет і гэта вялікая пэўнасьць для таго спосабу, якім абодва прыбыткі вызначаны. Вайнштэйн, пад кіраўніцтвам якога вылічаўся прыбытак у Кан'юнктурным Інстытуце, вельмі пэвен у сваіх лічбах: «такім чынам, кажа ён, сел. гаспадарка яшчэ у 1922/23 годзе дала прыбытку сярэдне толькі каля паловы таго, што быў перад вайною, калі прыняць пад увагу бязумоўны недалік намі передваеннага прыбытку. Гэтым самым нішчыцца сьцьвярджэньне, якое цьвёрда пусьціла карэньне ў нашай эканам. літаратуры, нібы прадукцыя сельск. гасп. агулам роўна толькі 70—75% передваеннай»[2]). А Літошанка, ідучы ў азначэньні сельск. гаспад.

[1]) «Теоретические основания выборочного метода» А. Боули. Харьков, 1924. Уступ праф. С. Бернштэйна.

[2]) «Обложение»..., стар. 112.

прыбытку асабовым мэтадам (у Каньюнктурнага Інстытуту пераважны мэтад—вылічэньне па спажываньню, г. ё. вельмі блізкі да асабовага), знайшоў, што сел. гасп. прадукцыя СССР роуна 79,2%—(66,2% з папраўкаю на насельніцтва, *Г. Г.*) той, што была перад вайною. Гэта лепшы доказ поўнай нягоднасьці мэтаду, калі на грунце яго можна «цьвёрда» заснаваць адначасна дзьве супярэчныя думкі! Вітаючы спробу Літошанкі, як першую спробу, мушу зазначыць, апрача усіх няпэўнаўсьцяў у вылічэньні, што для эканамічнай палітыкі больш з практычнага боку цікава ведаць будову «нацыянальнае прадукцыі», чым «нацыянальнага прыбытку» (сума асабовых прыбыткаў). Вось што можа даць з практычных ведаў нац. прыбытак: «Пры даволі падрабязкавым групаваньні асабістых прыбыткаў мы маем найбольш пэўнае уяўленьне аб сацыяльна-эканам. будове грамады, аб перавазе ў ёй працоўных ці непрацоўных прыбыткаў, аб ролі буйнай і дробнай маёмасьці, аб сярэднім стане дабрабыту асобых кляс і ўсяе грамады цалком» [1]). І рэальным мэтадам можна вызначыць сац.-эканамич. будову грамады, яе паасобных кляс і іх добрабыт, праўда, толькі з меншай пэўнасьцю, чым асабовым. Затое рэальны мэтад дае веды аб будове вытвору, аб падзеле яго на асобныя галіны, аб іх ролі, аб павялічэньні ці зьмяншэньні яе, чаго пакуль што ня можа даць асабовы мэтад (кажу аб падзеле на галіны буйных частак народнае гаспадаркі: прамысловасьці, сельск. гасп. і г. д.).

Нарэшце, застанаўлюся яшчэ на адным найноўшым вылічэньні народ. прыбытку 50 губ. Эўр. Расіі—ад аднае толькі сельскае гаспадаркі. Гэта —праца Г. А. Студзенскага[2]). Пад эмпірычнае вылічэньне аўтар падводзіць багатыя тэарэтычныя падставы. Сельск.-гасп. эканомію ён разглядае, як навуку аб тым, як выяўляюцца ў сельск. гаспадарцы агульныя эканамічныя прынцыпы, якія дае тэарэтычная палітычная эканомія. Выяўляюцца гэтыя прынцыпы ў якіх-небудзь канкрэтных асаблівасьцях сельск.-гаспадаркі, у формах яе. «Таму формы сельск.-гаспадаркі, як вынік дзеяньня агульных гаспадарчых прынцыпаў—і ёсьць аб'ект сельск.-гасп. эканоміі»[3]). Вывучаць формы сел.-гасп. можна толькі стылізуючы гэтыя формы, выбіраючы толькі тыповае ў іх, будуючы тыпы сельск.-гаспадаркі і іх тлумачучы. Як і многія іншыя аўтары, Студзенскі лічыць меру інтэнсыўнасьці найпаважнейшым пакажчыкам для падзелу форм сел.-гаспадаркі на тыпы. Пад інтэнсіўнасьцю ён разумее „спосаб, у якім выяўляецца камбінацыя страт —зямлі з аднаго боку і усіх іншых фактараў з другога“ [2]). Трымя старонкамі пазьней, аднак, аўтар кажа нешта іншае: «Склад стратаў, якія кладуцца ў зямлю, мае важнае значэньне паміж іншым і для тыпізацыі сельск.-гасп., але для азначэньня меркі інтэнсыўнасьці мае ролю другарадную“. Калі інтэнсыўнасьць ёсць пакажчык камбінацыі страт, чаму склад, камбінацыя стратаў ня можа быць пакажчыкам і меркай інтэнсіўнасьці? Лепш было б проста сказаць, што інтэнсыўнасьць паказвае не камбінацыю страт, а адносіны іх да зямлі. Дзеля таго, што інтэнсыўнасьць мае вялікае значэньне для тыпізацыі сельск.-гаспадаркі, трэба знайсьці нейкую мерку для ступянёў інтэнсыўнасьці. Такой меркай, як і многія іншыя аўтары[4]), Студзенскі абірае гуртавы прыбытак з адзінкі зямельнай плошчы, бо ў ім добра адбіваецца агульная сума усіх страт,— гуртавы прыбытак узрастае разам і роўнаважна з ўсімі гаспадарчымі стратамі. Але ведама, што характар сел.-гаспадаркі, разважае далей аўтар, не выяўляецца толькі ва ўзроўні інтэнсыўнасьці: і пры адным ўзроўні могуць

---

[1]) „Нац. доход СССР“, стар. 7.

[2]) „Очерки сел.-хоз. экономии“. М. 1925 г., стар. 21, 22 і 30.

[3]) Там-жа, стар 31. Курсыў мой. Г. Г.

[4]) Гл. А. Кот-Котов „Эконом. ландшафт полосы сев. ж. д. от ст. Москва до ст. Пушкино“ М. 1923.



529265

...БІБЛІЯТЭКА Акадэміі Навук Б...

быць розныя тыпы, у залежнасьці ад таго, якім спосабам здабываецца прадукт і якая форма яго рэалізацыі [1]). Таму Студзенскі прыймае і іншыя пакажчыкі для тыпаў сел.-гаспадаркі. Нарэшце іх налічваецца аж чатыры:

«1) узровень інтэнсыўнасьці сельск.-гасп. вытвору,

2) адносіны земляробства і прадукцыйнае жывёлагадоўлі па іх адноснай вазе,

3) будова земляробства і жывёлагадоўлі з боку складаньня іх галін,

4) колькасьць і склад рыначнасьці гаспадаркі» [2]).

А таму, што пад сельск. гасп. раёнам аўтар разумее «геаграфічнае ажыцьцёўленьне таго ці іншага тыпу сельскае гаспадаркі» [3]), ён падставай тыпізацыі лічыць сельск.-гасп. раёнаваньне. Вядома затым, што раёнаваньне, як «тэхнічны бок у тэорэтычнай проблеме тыпізацыі сельск. гаспадаркі», павінна грунтавацца на вышэйпаданых 4 пакажчыках. Што яны павінны паказваць? Аўтар адказвае сам: «За выбіраньне пакажчыкаў, якія зьяўляюцца падставамі дзеля раёнаваньня, у літаратуры змагаюцца, а часамі жывуць пасуседзку, два пункты погляду: адзін лічыць патрэбным адбіць у сельск. гасп. раёнах умовы сельск. гасп., а другі—самыя працэсы яе» [4]). «Па маёй думцы, кажа далей Студзенскі, сел.-гасп. раёнаваньне па самому свайму разуменьню і прызначэньню павінна кожны раз адбіць якраз працэсы сельск. гаспадаркі, а ніяк не яе умовы» [5]). «Калі ўзяць раёнатворчымі пакажчыкамі вышыню, будову і рыначнасьць гуртавога сельск.-гасп. прыбытку... мы будзем мець у руках матар'ял для самага поўнага і ўсебаковага меркаваньня аб найглыбейшых асаблівасьцях ў эканамічнай будове сельск.-гасп. вытвору» [6]).

Ці патрэбен які-небудзь доказ, што гуртавы сельск.-гасп. прыбытак не адбівае ні умоў, ні працэсаў у сел. гаспадарцы, а толькі адны вынікі? Гэта зразумела само. Па гуртавым прыбытку можна меркаваць толькі аб вышыні страт; ні складаньне страт, ні роля асобных галін у гаспадарчым працэсе (а працэсам відавочна мы будзем называць самую гаспадарчую дзейнасьць, незалежна ад яе вынікаў) у гуртавым прыбытку не адбіваюцца. І пакуль гэтага Студзенскі не даведаў, усе яго тэарэтычныя развагі застаюцца адарванымі ад яго эмпірычнай працы, якая займае большую частку яго твору. Іншая справа была-б, каб Студзенскі прызнаваў тое азначэньне сыстэмы сельск. гаспадаркі, якое дае Скварцоў: «Сыстэмай гаспадаркі завецца тая форма аб'яднаньня элемэнтаў вытвору (прыроды, працы, капіталу), якая вызначае сабою спосаб, якім будзе атрымана рэнта ў гаспадарцы, паказваючы галоўны род прадукта, які гэта гаспадарка выкідае на рынак, іначай кажучы, паказваючы яго ролю ў грамадзкім працэсе» [7]). Але-ж Студзенскі востра яе крытыкуе. Усяго Скварцоў вызначае тры галоўныя сыстэмы гаспадаркі: 1) зярнёвая (збожжавая), 2) жывёлагадоўная, 3) тэхнічная. «Асноўнай заганай гэтай клясыфікацыі, якую справядліва ўжо адзначылі ў літаратуры ў свой час, ёсьць яе вельмі фармальныя адносіны да аб'екту, няўменьне зірнуць у пасяродак яго. Падзел гаспадарак на групы робіцца ў гэтай клясыфікацыі чыста знадворны, павярхоўны, у

---

1) „Очерки“, стар. 97.
2) „Очерки“, стар. 98.
3) Там-жа, стар. 110.
4) Там-жа 111 і 112.
5) Курсыў мой. Г. Г.
6) „Очерки“, стар. 120—121.
7) Курсыў мой. Г. Г.

якім ані каліва не адбіваецца іх пасяродкавае эканам. разьвіцьцё»[1]). Адкладаю крытыку гэтай крытыкі да іншага разу, але павінен заўважыць, што прыбытак якраз і адбівае, як характар тэй прадукцыі, якая ствараецца гаспадаркай, так і тэй, якая ідзе на рынак, якая вызначае ролю гаспадаркі ў грамадзкім падзеле працы. У далейшых развагах Студзенскі проста сьцьвярджае, што «поўнае уяўленьне аб будове сельск.-гаспад. вытвору краіны можна мець толькі з аналіза складу нацыянальнага гуртавога сельск.-гасп. прыбытку»[2]), хоць нідзе не паказвае, як і чаму гуртавы прыбытак адбівае сабою будову сельск.-гасп. вытвору, сельск.-гасп. працэс, адносіны элемэнтаў вытвару (прыроды, працы і капіталу, а не аднае толькі зямлі і іншых фактараў).

Не застанаўліваючыся болей на тэарэтычным баку працы Студзенскага, разгледзім некаторыя бакі яго статыстычнай якасьці. На жаль, мусіць за бракам месца, ня ўсе зьмешчаны абсалютныя лічбы і ня ўсюды ёсьць угрунтаваньне тых норм, якія бяруцца. Студзенскі высока ставіць расійскую сел.-гасп. статыстыку. Ен лічыць, што яна дае яму «подавляющее количество» масавага матар'ялу—і аб крыніцах сел.-гасп. вытвору (ужыткоўнасьці, засеўная плошча, колькасьць жывелы), і аб вытворчасьці сельск.-гасп. галін (ураджай, укосы, удоі малака, колькасьць мяса, сала, воўны з аднае жывёлы) і аб мясцовых цэнах і аб нястачы або лішках сельск.-гасп. прадуктаў па губэрнях. «Толькі у выключных выпадках даводзілася мне, ухіляючыся ад прынцыпу, зьвяртацца да бюджэтаў і пашыраць лічбы з іх на ўсю губэрню, або ужываць абы-якія штучна вылічаныя коэфіцыэнты. Наагул-жа, усе пытаньні, якія ставіць мой мэтад, знаходзяць просты адказ у статыстычных публікацыях...»[2]) «Пэрыад перад вайною і пэрыад з пачатку вайны адносна сел.-гасп. статыстычнага вывучэньня ня прымушае жадаць нічога лепшага з пункту погляду майго заданьня»[3]).

Гэта сьвядомы самападман. А што гэта так, убачым пераглядзіўшы, якія статыстычныя матар'ялы скарыстовывае Студзенскі. Ужыткоўнасьці за 1887 год, жывёла за 1916 год, а для яго патрэбен быў матар'ял 1911—16 г.; ураджайнасьць няведама чаму узвышаецца на 10% (я йшчэ разгледжу гэты пункт); ніводнае статыстычнае лічбы, што да вытврочасьці жывёлы; на многія прадукты мясцовых цэн зусім няма і бяруцца ці з суседніх губэрняў, ці агульна-расійскія; аб нястачы ці лішках прадуктаў бярэцца самы шурпаты матар'ял: збожжа за 1909—13 г. г.; лён, пянька, мас. насеньне за 1907—9 г. г.; мяса малой шыбкасьці і сьвініна вялікай за 1906—9 г.г., яйкі, масла кароўе і малочныя прадукты за 1907—9г.г., скуры за 1907—9 г. г., птушкі жывыя за 1909 г., бітыя за 1910 г., жыр, сала, воўна за 1907—09 г. г. і г. д.; за адсутнасьцю статыстыкі харчаваньня аўтар прымушан быў лічыць спажываньне гарадзкога і сельскага жыхарства аднакавым, дзяліць прывоз хлебу ў якую небудзь губэрню між горадам і вёскай па колькасьці насельніцтва і г. д. Ці-ж у краіне з добра пастаўленаю статыстыкаю магчымы такія статыст. недарэчнасьці? Які раз брак статыстыкі і прымушае карыстацца тымі спосабамі, якія ўжываліся 75 гадоў назад (гл. Янсон, было раней, стар. 11.) А што такое ўсе гэтыя бюджэтныя лічбы, якія пашыраюцца з якой-небудзь аднае губэрні, з сотні гаспадарак, на цэлыя вялізныя раёны з некалькіх губэрняў?

А розныя «папраўкі» і «штучна вылічаныя коэфіцыэнты»—ці-ж пад імі ёсьць грунт? Паглядзімо. Студзенскі павялічвае ураджай на 10% і спа-

---

1) „Очерки", стар. 90.

2) Там-жа стар. 108—109.

3) Там-жа, стар. 128.

сылаецца на Марэса[1]). Вайнштэйн робіць тое самае; аўтары кнігі «Очерки по народному хозяйству и финансам Белоруссии» тое самае, і г. д., і г. д. Што за фатальная лічба і адкуль яна ўзялася? Л. Марэс у названым зборніку[2]) ў артыкуле «Производство и потребление хлебов в крестьянском хозяйстве» на стар. 7 піша: «патрэбная да лічбаў ЦСК папраўка дзеля сялянскіх ураджаяў відаць не перавышае 10%, для прыватнаўласьніцкіх—20%». Спасылаецца ён пры гэтым на земскую статыстыку і болей за ўсё на А. Ф. Фартунатава, на яго «Урожаи ржи» (а кніжка гэта выдана у 1893 г.). З параўнаньня лічб бягучай земскай і урадовай статыстыкі толькі па 77 паветах была выведзена розьніца ураджаяў для сялянскіх +13,1%, для панскіх+22,7%. Затым за 7 гадоў—1883—89—А. Ф. Фартунатаў зрабіў такое ж параўнаньне па 124 паветах—і знайшоў розьніцу між урадовымі і земскімі+7,1% па ўсіх паветах. Відаць, для легкасьці ўжываньня, Марэс перарабляе 13,1% на 10%, а 22,7%—на 20%. І пашла фатальная лічба ў жыцьцё, каб з сотні паветаў з канца XIX стагодзьдзя кіраваць усімі «папраўкамі» на ўраджай навет для другога дзесятку гадоў XX веку. А можа паходжаньне гэтае лічбы яшчэ старэйшае. Ю. Э. Янсон[3]) піша: «Толькі гэтыя матар'ялы (публікацыя аб ураджаях за 1870—74 г.г. *Г.Г.*) і годны для апрацаваньня, бо ўсе, якія за ранейшыя гады выдаваліся, маюць адны агульныя лічбы зімовага і ярнага збожжа і бульбы. Лічбы, якія ёсьць у іх, лічуцца ніжэй сапраўдных на 10—15%; так думаў Тэнгаборскі, так лічыць Вільсон, аўтар «об'ясненій к сел-хоз. атласу"; такая ацэнка захавалася за імі і да нашага часу у Зб́ор Д. Зем. і Сел. Прамысловасьці і ў творах Ярмолава[2]), хоць трэба лічыць, што з таго часу, як справа забясьпечаньня народ. харчаваньня трапіла у рукі земства, лічбы павінны зрабіцца больш блізкімі да супраўднасьці, і мы мяркуем, што нашы матар'ялы аб засевах і навет зборах зусім не такія дрэнныя, г. зн., няпэўныя». Бязумоўна, памылка ЦСК з часам павінна была зьменшыцца.

Усе так званыя «штучна вылічаныя коэфіцыэнты» не зьяўляюцца грунтоўнымі для пэўных статыстычных меркаваньняў. Разгледзім прыклад. Статыстыка не паклапацілася даць лічбаў аб прадукцыі жывёлы (убойная вага, удоі малака, выхад воўны і г. д.), падобна да таго, як яна дае іх аб прадукцыі зямлі (ураджаі, укос сенажацяў і г. д.). На дапамогу выклікаюцца розныя каэфіцыэнты. Праф. А. М. Чалінцаў[4]) першы спрабаваў вызначыць такім спосабам вагу сьвіней; ён дзяліў цану някормнае сьвіньні на цану сьвініны і атрымоўваў тэарэтычную вагу. Здаецца, у яго і запазычыў Пракаповіч лічбу сьвіное вагі ў 6 пудоў[5]). Чалінцаў багата скарыстаў сваю вылічаную вагу дзеля характарыстыкі сьвінаводных раёнаў, і якраз на падставе гэтых тэарэтычных лічбаў быў пакрыўджан гонар нашае беларускае сьвіньні; Беларусь была вызначана, як „многасьвінны—экстэнсыўны —нечарназёмны палескі раён з дробнымі сьвіньнямі", доўгавечнымі; раён, у якім штогод б'юць нязначную частку ўсіх сьвіней. Відаць, мэтад Чалінцава запазычыў і Студзенскі[6]), ён таксама дзеліць цану (у восень) някормнае сьвіньні на цану пуда сьвініны. Як быццам усё добра, бо ці-ж не відавочна, што цана сьвініны залежыць ад цаны сьвіньні? Але гэта-б было толькі ў тым выпадку, калі-б запатрабаваньне на сьвініну было такім жа, як і на жывых сьвіней, іначай кажучы, калі-б тavailable сьвініны і сьвіней была аднакавая. Вядома, што гэтага няма, што цана на сьвініну

[1]) Л Н. Марес. „Влияние урожаев и хлебных цен на некоторые стороны рус. нар. хозяйства". СПБ. 1897 г. ст 7.

[2]) Сравнительная статистика, стар. 413—14 СПБ. 1880 г.

[3]) Курсыў мой. Г. Г.

[4]) А. Н. Челинцев „Производство свинины в Евр. России". М. 1916 г.

[5]) Там-жа, стар. 21.

[6]) „Очерки сел.-хоз. экономии", стар. 134—135.

узрастае шыбчэй, чым цана на жывых сьвіней, дык з часам тэарэтычная вага сьвіньні павінна ўсё зьмяншацца і зьмяншацца.

Вось фактычны доказ гэтае думкі:

| Раёны: | Зьмена цэн з 1883—1900 г. г. да 1909—13 г. г. ± %/% | | Вылічаная вага сьвіньні у гадох | |
|---|---|---|---|---|
| | на сьвініну | на сьвіней | 1883—1900 | 1909—13 |
| Украінскі . . . . . . . . . . . | +45 | + 3 | 6.3 | 3.5 |
| Паўднёва—Заходні . . . . . . . | +39 | —17 | 6.0 | 3.0 |
| Цантрова—Земляробчы . . . . . | +38 | +22 | 5.0 | 4.0 |
| Прыбалтыка . . . . . . . . . . | +30 | — 2 | 4.8 | 3.2 |
| Новарасійскі . . . . . . . . . . | +38 | + 6 | 4.7 | 3.1 |
| Літва . . . . . . . . . . . . . | +34 | —21 | 4.7 | 2.4 |
| Беларусь . . . . . . . . . . | +41 | —15 | 4.7 | 2.3 |
| Польшча . . . . . . . . . . . . | +29 | + 3 | 4.5 | 2.3 |
| Прамысловы . . . . . . . . . . | +37 | + 9 | 4.1 | 2.8 |
| Надвазёрны . . . . . . . . . . | +37 | +16 | 3.5 | 2.6 |
| Сярэдня-волжынскі . . . . . . . | +40 | +30 | 3.3 | 2.8 |
| Ніжня . . . . . . . . . | +38 | +35 | 2.7 | 2.6 |
| Уральскі . . . . . . . . . . . . | +47 | +38 | 2.7 | 2.0 |
| Паўночны . . . . . . . . . . . | +37 | — 2 | 2.7 | 1.7 |
| Уся Эўр. Расія . . | +34 | + 5 | 4.3 | 2.9 |

З таблічкі відаць, што у 1883—1900 г. г. найбольш буйных сьвіней (з тэорэтычнай вагай) мелі як-бы заходнія, больш інтэнсыўныя раёны: Заходняя і Усходняя Украіна (6,3 і 6,0 пудоў,) Прыбалтыка (4,8), Польшча (4,5), Літва (4,7), Беларусь (4,7), але між інтэнсыўнымі раёнамі і такія, як цантрова-земляробчы (5,0) і Новарасійскі (4,7), у якіх вага сьвіньні нібы на 1/2 пуда большая, чым у Польшчы!

Затым відаць, што якраз ў інтэнсыўных заходніх раёнах вельмі даражэе сьвіньніна: на Украіне Усходняй на + 45%, на Заходняй + 39%, на Беларусі + 41%; але разам з імі Уральскі раён + 47%, Сярэднявolжанскі + 40% і г. д. Цана-ж на жывых сьвіней ў інтэнсыўных раёнах спадае: Літва — 21%, Беларусь — 15%, Заходняя Украіна — 17%, Прыбалтыка — 2%, або ўзьнімаецца зусім нязначна: Польшча + 3%, Украіна + 3%. Зразумела ўжо цяпер, чаму раптам ўсе сьвіньні з цела спалі (на паперы дасьледчыкаў). Беларуская сьвіньня была цяжэйшая, чым прамысловая, надвазёрная, уральская, сярэдня- і ніжняволжанская, нават польская сьвіньня, і раптам зрабілася лягчэй за іх усіх. Паўднёва-заходняя сьвіньня аддала месца новарасійскай, украінская—цантрова-землярoбчай і г. д. Якраз у гэты час Чалінцаў і пісаў, што Беларусь мае дробных сьвіньней, зразумела, чаму думка яго непраўдзівая.

Значыцца, штучна вылічаную вагу сьвіньні ня можна браць ня толькі для храналягічных параўнаньняў, але і для географічных, ці прасьцей кажучы—зусім ня можна ёю карыстацца [1]).

[1]) Нават калі-б таварнасьць сьвініны і сьвіньні была аднакавая, штучна вылічаная вага ня будзе супраўднай, бо ў цане сьвініны будзе ня толькі цана сьвіньні, але і страты на тое, каб сьвіньню забіць, прыбраць, пасаліць і г. д.

Такім-жа ўкосным спосабам, як вагу сьвіньні, вызначыў Студзенскі вагу рагатае жывёлы: «ведаючы цану вала кормнага і цану гавядзіны, лёгка было азначыць убойную вагу вала па кожнай губэрні» [1])... І тут трэба-б было зрабіць тыя-ж увагі, як і пра сьвіньню. Але таварнасьць гавядзіны і рагатае скаціны бліжэй адна да другой, чым таварнасьць сьвіньні і сьвініны, дык таму штучна вылічаныя вагі вала за два пэрыады не павінны так рэзка разыходзіцца. І усё-ж у некалькіх раёнах разыходжаньне немагчымае:

| РАЁНЫ | Штучна вылічаныя вагі вала | |
|---|---|---|
| | 1883—1900 г.г. | 1909 - 13 г г. |
| Цантр-земл. . . . . . . . | 14,9 | 17,6 |
| Сярэд.-волжанскі . . . . . . | 14,7 | 9,2 |
| Новарасійскі . . . . . . . . | 16,3 | 19,0 |
| Украінскі . . . . . . . . . . | 19.9 | 25,6 |
| Прамысловы . . . . . . . . | 12,1 | 11,7 |
| Паўночны . . . . . . . . . | 16 3 | 12,9 |

Такім чынам, ня можна карыстацца і штучна вылічанай вагай вала. Студзенскі лічыць, што пры дапамозе звычайнай статыстычнай мэтодыкі, якая карыстаецца рознымі натуральнымі, а ня цэнавымі пакажчыкамі, ня можна зразумець будову земляробства і жывёлагадоўл, со «інтэнсыфікацыя сел.-гасп. вытвору йдзе двума шляхамі: зьмяняюцца сел.-гасп. галіны, або павялічваецца іх прадукцыйнасьць. Калі першы шлях як-небудзь і можна азначыць параўнаньнем звычайных натуральных пакажчыкаў сел.-гасп. статыстыкі, то другі шлях вызначыць так зусім немагчыма. Тым часам якраз ён і ёсьць той спосаб, якім пераважна ідзе ўперад інтэнсыўнасьць» [2]). Зусім згаджаючыся з аўтарам і наагул з тым кірункам расійскае сельск.-гасп. эканамічнае думкі, якая лічыць, што эканамічнае ў гаспадарцы пазнаецца толькі праз цану, вітаючы валёрыстычны ўхіл сучаснай сельск. гас. эканоміі,--я мушу заўважыць, што, калі ня будзе пэўнае статыстыкі прадукцыйнасьці ўсіх галін сельск. гасп., да таго часу валёрыстычны ўхіл ня зможа дасягнуць нічога пэўнага, вартага. Ці-ж можна грунтавацца на ўсякіх убочных коэфіцыэнтах, прыклад якіх я толькі што паказаў, ці-ж імі навет у самых грубых рысах можна вызначыць зьмену прадукцыйнасьці? Нікольні. Гэта будзе не масавая статыстыка, а арытмэтыка. І я пэвен, што пад уплывам гаспадарчых патрэб, пад уплывам эканамічнае крытыкі, мы хутка будзем мець статыстыку прадукцыйнасьці.

Канчаючы на гэтым разгляд тых спробаў, якія былі зроблены для вылічэньня народ. прыбытку Эўр. Расіі і СССР, зраблю кароткае падагуленьне, якое-ж значэньне маюць лічбы нац. прыбытку.

**Значеньне нац. прыбытку.** 1. Лічбы нац. прыбытку зьяўляюцца фокусным пакажчыкам стану ўсяе народнае гаспадаркі і яе паасобных галін (у якой-небудзь краіне ці наагул на якой-небудзь частцы абшару) у вядомы момант; крывая нац. прыбытку—гэта лепшая крывая каньюнктуры [3]).

---

[1]) Там-жа, стар. 134.
[2]) „Очерки“ стар. 105.
[3]) Г. Кассель.

2. Нар. прыбытак і яго будова за розныя часы лепшы матар'ял для гісторыі і эвалюцыі гаспадаркі.

3. Будова нар. прыбытку паказвае адносную вагу паасобных галін ува ўсей гаспадарцы краіны (у рэзультатах гаспадарчай дзейнасьці).

4. Будова народнага прыбытку зьяўляецца ўкосным пакажчыкам тыпу гаспадаркі.

5. Народны прыбытак, ў адносінах да зямлі, зьяўляецца меркай выкарыстанасьці прыродных і эканамічных магчымасьцей краю (інтэнсіўнасьць).

6. Народны прыбытак высьвятляе сацыяльна-эканамічную будову грамады.

7. Ен-жа зьяўляецца меркай добрабыту як усяго народу, так і яго паасобных кляс.

8. У зьвязку з гэтым, ен зьяўляецца падставай для падатковае сыстэмы.

9. «Народны прыбытак мае вялікае значэньне для спажывецкае здольнасьці (Konsumtionsfähigkeit) гасп. суб'екту, чаму прыбытак і разглядаецца, як фонд спажываньня ў вядомы пэрыад» [1]), а таму «сам прыбытак ёсьць самая пэўная мерка для вызначэньня пакупной сілы ў суб'екта прыбытку» [2]).

10. Астача народ. прыбытку ад «неабходнага спажываньня» (праўдзівей—фактычнага спажываньня) ёсьць лепшая мерка для магчымасьцей капіталазьбіраньня [3]).

11. Нар. прыбытак можа паказаць месца асобных раёнаў у народнай гаспадарцы якой-небудзь краіны, іх ролю у міжраённым падзеле працы, значэньне, тып. Нар. прыбытак зьяўляецца сканцэнтраваным матар'ялам для параўнаньня гаспадарак дзьвюх краін.

12. Дзеля ўсяго гэтага нар. прыбытак мае вялікае значэньне для практычнай экономічнай палітыкі, як з боку падзелу нацыянальнага прадукту (падатковая сыстэма), так і з боку дапамогі яго стварэньню (рэгуляцыя вытвору).

Усе пералічаныя пункты маюць і практычнае і тэорэтычнае значэньне. Асаблівай-жа цікавасьцю зьяўляецца для тэорыі магчымасьць выявіць увесь рэзультат гаспадарчай дзейнасьці ў рублях.

**Значэньне вылічэньня народн. прыбытку для вывученьня Беларусі.** Значэньне вылічэньня народ. прыбытку для Беларусі, як і для ўсякай іншай краіны, выяўляецца з ужо пералічаных 12 пунктаў. У дадатак можна сказаць яшчэ некалькі меркаваньняў. Недасьледаванасьць усіх бакоў жыцьця Беларусі ёсьць пэўны факт. Ні расійскія ні польскія прадстаўнікі навукі не паклапаціліся аб яе вывучэньні.

Толькі цяпер паўсталі перад часткай Беларусі, перад Савецкай Беларусьсю, шляхі самастойнага гаспадарчага, дзяржаўнага і культурнага будаўніцтва, толькі цяпер і можа быць паважна пастаўлена пытаньне аб усебаковым дасьледаваньні Беларусі, у тым ліку і аб дасьледаваньні экономічным. Але вывучэньне Беларусі пры поўнай адсутнасьці пачаткавага матар'ялу павінна цягнуцца некалькі гадоў, пакуль дасьць багатую спадчыну. Гэта асабліва належыць да вывучэньня экономічнага. Затым лічу, што раблю патрэбную справу, калі па старых, перад вайной сабраных матар'ялах, вылічаю беларускі нацыянальны прыбытак: гэта вельмі экономны спосаб, праўда нявысокі (па незалежных ад дасьледчыка умовах) па якасьці

---

[1]) Р. Мэйер, стар. 286.

[2]) Там-жа, стар. 299.

[3]) „Праца грамады можа павялічывацца толькі разам з павялічэньнем яе капіталаў, а капіталы яе могуць павялічывацца толькі ў залежнасьці ад таго, што можа быць захована з яе прыбыткаў"... А. Сьміт „Исследования", т. II, 266.

(бо нявысока якасьць нашае статыстыкі), але такі, што і нязначныя сілы аднаго чалавека даюць карысныя вынікі.

Дзеля таго, што астатнія блізу паўтараста гадоў, уся Беларусь была пад уладай Расіі, а гэта адбілася і на ўсёй беларускай гаспадарцы і на тым, што статыстычныя крыніцы для Беларусі і Расіі адны,—раблю я вылічэньне прыбытку тым спосабам, якім зроблена лепшае расійскае вылічэньне (Пракаповіча); прымушан да гэтага неабходнасьцю параўнаньня. Ізноў пакажуся на Р. Мэйера: «Па-першае параўнаньні магчымы, калі можна з пэўнасьцю лічыць, што нямінучыя памылкі зроблены ў адным кірунку і сваёю меркаю ня дужа далекі адна ад аднае. Гэта бывае, калі хочуць параўнаць прыбытак аднае і тае-ж народнае гаспадаркі ў розныя ня вельмі далёкія тэрміны. Другі выпадак гэтага парадку бывае тады, калі такія вылічэньні хочуць зрабіць у дзьвюх дзяржавах, з вельмі падобнымі культурнымі адносінамі і аднакавымі статыстычнымі лічбамі»[1]). Ведаю заганы мэтаду Пракаповіча (я разгледзеў іх раней)—але было-б заганою, каб я ў сваіх вылічэньнях гэтых заган не рабіў: параўнаньне тады было-б немагчыма.

Яшчэ адна ўвага у канцы ўступу. Чаму я беларускімі губэрнямі заву шэсць губэрань: Віленскую, Віцебскую, Горадзенскую, Менскую, Магілеўскую і Смаленскую; чаму я разглядаю і тыя губэрні, якія цяпер за кардонам БССР? Першае—ўсе гэтыя губэрні складаюць адзін экономічны раён, і характэрныя беларускія адзнакі лепш выяўляюцца на шасьці губэрнях, чым на трох, чатырох. Другое—калі б узяць сучасныя межы БССР, прышлося-б рабіць пералічэньні ад цэлай губерні на яе часткі (у складзе БССР частка Меншчыны, частка Віцебшчыны, частка Магілеўшчыны), а пры пералічэньнях многіх лічбаў, гдзе няма павятовых ведамасьцей, напр., па транспарту, гандлю, будаўніцтву і г. д., былі-б нямінучы вялікія памылкі.

---

[1]) „Доход", стар. 312.

## Разьдзел першы.

Увесь народны вытвор складаецца з такіх частак: здабываючая прамысловасьць (сельская гаспадарка, лес, рыба, нетракапальная прамысловасьць), апрацоўчая прамысловасьць і прамысловасьць па распарадкаваньню сырызны, сродкаў вытвору і прадукцыі (вытворчыя функцыі гандлю і шляхі зносін); асобна стаіць будаўніцтва, якое часткова увaходзіць у склад пералічаных трох галін вытвору, а часткова мае і самастойныя мэты. Для вылічэньня прыбытку народны вытвор падзяляецца на такія часткі:

| | |
|---|---|
| сельская гаспадарка, | шляхі зносін і сувязі, |
| лес, | будаўніцтва, |
| рыба, | гандаль. |
| прамысловасць, | |

Вылічым, за ўзяты намі час 1900—1913 г.г., прыбытак ад кожнае галіны паасобку.

СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА. Прыбытак ад сельскае гаспадаркі трэба вылічаць таксама па асобных галінах. Іх вылучана некалькі:

поле—культура збожжа (зернят) і гандлёва-прамысловых расьлін,

жывёла,

сад, гарод і пчолы; гэтыя тры галіны дзеля сваёй нязначнасьці надалей будуць звацца разам з прыбыткам ад продажы сена і саломы як «іншыя галіны сельск. гаспадаркі».

Прыбытак ад збожжа вылічаецца гэтак. З выданых Цантровым Статыстычным Камітэтам (скарочана ЦСК) зборнікаў «Урожай» 1896, 97, 98, 99 і 1900 гадоў выбраны штогодныя ведамасьці аб тым, якая ў кожнай беларускай губэрні засеўная плошча пад рознымі культурамі, які сабран ураджай і які быў чысты збор з дзесяціны і са ўсяе засеўнае плошчы. Затым выведзены сярэднія лічбы за 1896—1900 г.г. За гэта-ж пяцігодзьдзе выбіраюцца сярэднія цэны[1]. Множаньне сярэдніх цэн на сярэднія чыстыя зборы дае так званую гуртавую вытворчасьць, ці праўдзівей гуртавую выручку бяз страт на насеньне. Апускаючы дэталі, даём наступную табліцу (№ 1).

---

[1]) „Свод статист. сведений по сельск.-хоз. России к концу XIX века".

Табл. № 1.

Гуртавая вытворчасьць у тысячах рублёў 1896—1900 г.г.

| Культуры | Вілен. | Віцеб. | Горадзен. | Меншч. | Магіл. | Смален. | Уся Беларусь |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Зім. жыта . . | 8.355.5 | 7.031,6 | 9.166,7 | 10.477.5 | 7 868,5 | 11.313,7 | 54 213,5 |
| Ярав. „ . . | 109,8 | 73.5 | 66,5 | 269,2 | 54,5 | 22,7 | 596,2 |
| Зім. пшан. . . | 473,8 | 148,4 | 1.236.5 | 781,8 | 80,6 | 9.8 | 2 730,9 |
| Ярав. „ . . | 135,8 | 98,6 | 87.0 | 345,0 | 295,2 | 138,1 | 1.099,7 |
| Авёс . . . . . | 3.266,4 | 3.361,4 | 3.453,2 | 4.471,6 | 3.039,9 | 4 670,8 | 22.263,3 |
| Ячмень . . . . | 1.723.0 | 1.956,3 | 1.274,1 | 2.059,0 | 966,8 | 986,1 | 8 965,3 |
| Грэчка . . . . | 444,2 | 35,3 | 393,7 | 798,6 | 805,4 | 273,9 | 2 751,1 |
| Проса . . . . | — | — | 59.4 | 278 7 | 176,3 | 11,7 | 526,1 |
| Гарох . . . | 660,0 | 557,2 | 482,4 | 410,1 | 165,9 | 280,9 | 2.556,5 |
| Сачыўка . . . | 16,2 | 3,0 | 22,4 | 13,5 | 8,5 | 1,2 | 64.9 |
| Боб . . | 178,0 | 221,0 | 54,1 | 95.6 | 55,9 | — | 604,6 |
| Разам усе . | 15.362,7 | 13 486,3 | 16.296,0 | 20.000,7 | 13 517,5 | 17.708,9 | 96 372 0 |

З табліцы № 1 відаць, які быў народны прыбытак Беларусі аб збожжа. Лічбы гэтыя трэба павялічыць, бо расійская урадовая статыстыка мела вельмі неўпарадкаваны і няпэўны пачатковы наглядальны апарат (валасныя управы). Але наколькі процантаў павялічваць — няведама, бо для Беларусі няма такой надзейнай падставы для крытыкі урадовай статыстыкі, якой для Расіі была статыстыка земская. Ва ўступе я ўжо казаў, што папраўка ў 10% агулам для ўсіх засеваў і для ўсіх пэрыядаў, якую бярэ Пракаповіч і іншыя дасьледчыкі, магчыма памылковая, бо грунтуецца яна на параўнаньнях земскай і ўрадовай статыстыкі, якія былі зроблены яшчэ ў XIX стогодзьдзі. Але для таго толькі, каб ня зьменшыць прыбытак Беларусі, з мэтай параўнаваньня адносна Расіі (агульны ўхіл маёй працы павялічаць беларускі прыбытак), я пакідаю ў сваіх вылічэньнях тую-ж папраўку у 10%. Засеўную плошчу урадовая статыстыка таксама зьмяншала асабліва для тых культур, якія увесь час ішлі ўгару. Гэта пакажа табліца, № 2, якую мне ласкава падаў праф. А. А. Рыбнікаў з рукапісу свае працы «Крестьянское хозяйство Смоленской губернии»:

Табл. № 2.

% лёну ў ярыні на надзел. зямлі згодна з статыстыкаю:

| | Вязем. пав. 1900 г. | Сыч. пав. | Гжац. пав. 1901 г. | Дарагаб. пав. 1904 — 1905 г. г. | Смал. пав. |
|---|---|---|---|---|---|
| Земскай падворнай . | 39,7 | 60,2 | 25,0 | 18,2 | 12,6 |
| » бягучай . . | 36,4 | 53,0 | 24,7 | 20,2 | 11,5 |
| Ц. С. К. . . . . . . | 32,2 | 48,2 | 19,6 | 11,5 | 6,3 |

Лічбы Ц. С. К., як бачым, усюды зьменшаны, асабліва па тых паветах, дзе лён у засеўнай плошчы мае найменшую долю.

У Пракаповіча агульны збор збожжа вылічан па засеўнай плошчы 1900 году і па чыстым зборы з аднае дзесяціны, сярэднім за 1896—1900 гг., у мяне ж і плошчы і чысты збор сярэднія за пяць гадоў. Ці можна параўноўваць, калі так, беларускія і расійскія прыбыткі ад збожжа? Адказ дасьць табліца № 3, ў якой параўнаны чыстыя зборы на Беларусі, вылі-

чаныя двума спосабамі: чысты збор з дзесяціны абодва разы за 1896—1900 гг., але засеўная плошча спачатку за 1900 год, а затым за 1896—1900 гг.:

Табл. № 3.

Чысты збор збожжа ў тыс. пудоў:

| Культуры | На засеўн. плошчы 1900 г. | 1896-1900 гг | ± тыс пуд | ± тыс. руб. |
|---|---|---|---|---|
| Зімавое жыта . . | 88.497,0 | 86.379,3 | + 2.117,7 | + 1.329,9 |
| Ярнае „ . . . . | 968,4 | 966,0 | + 2,4 | + 1,5 |
| Зімав. пшан. . . . . | 3.098,8 | 3.081,2 | + 17,6 | + 15,6 |
| Ярная „ . . . . | 1.444,8 | 1.427,8 | + 17,0 | + 13,0 |
| Авёс . . . . . . . . | 40.684,3 | 39.568,6 | + 1.115,7 | + 628,1 |
| Ячмень . . . . . . | 13.634,5 | 13.879,7 | — 245,2 | — 158,2 |
| Грэчка . . . . . . | 4.191,9 | 4.288,9 | — 97,0 | — 62,5 |
| Проса . . . . . . . | 967,6 | 992,6 | — 24,6 | — 13,0 |
| Гарох . . . . . . | 4.066,1 | 4.000,7 | + 65,4 | + 39,6 |
| Сачыўка . . . . . . | 153,6 | 162,2 | — 8,6 | — 3,4 |
| Боб . . . . . . . | 592,8 | 604,6 | — 11,8 | — 11,8 |
| Разам . . | — | — | — | + 1.778,6 |

Розьніца, хоць і нязначная, ёсьць; па тых культурах, якія за пэрыяд 1896—1900 г.г. ўзрасталі, яна з плюсам, па тых, якія зьніжаліся (ячмень, грэчка, проса, сачыўка, боб) з мінусам. А наагул розьніца толькі на 1.778,6 тыс. рублёў, або +1,8% да прыбытку 1896—1900 г. г. Настолькі зьменшан беларускі прыбытак параўнавальна з расійскім, але затое ў абодва пэрыяды 1896—1900 г.г. і 1909—13 г.г. ужываецца мною адзін аднакавы мэтад.

Прыбытак ад гандлёва-прамысловых расьлін вылічваецца тым-жа спосабам і па тых-жа першакрыніцах, як і ад збожжа. Ідучы тым шляхам, якім вылічаны прыбытак ад збожжа, маем.

Табл. № 4.

Гуртавая вытворчасьць у тыс. рублёў 1896—1900 г.г.

| Культура прам.-тэхн | Вілен. | Віцеб. | Горадзен | Меншч | Магіл. | Смален. | Уся Беларусь |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Бульба . . . . | 4.655,1 | 3.855,7 | 4.932,4 | 8.820,9 | 5.248,8 | 4.080,0 | 31.592,8 |
| Лён-насен. . | 406,7 | 577,8 | 279,2 | 508,3 | 530,8 | 1.321,5 | 3.624,3 |
| „ -валакно | 1.488,3 | 3.216,2 | 1.267,1 | 1.622,4 | 1.306,3 | 3.260,6 | 12.161,0 |
| Каноп.-насен. . | 49,0 | 35,1 | 40,8 | 111,3 | 423,8 | 825,9 | 1.485,7 |
| „ -валак. . | 232,7 | 130,9 | 244,0 | 450,1 | 949,3 | 1.437,7 | 3.444,6 |
| Разам . . | 6.831,8 | 7.815,7 | 6.763,5 | 11.513,0 | 8.459,0 | 10.925,0 | 52.308,7 |

Як і раней ад збожжа, прыбытак гандлёва-прам. расьлін павялічваецца на 10%.

У другім пяцігодзьдзі—1909—1913 г.г.—спосаб вылічэньня прыбытку ад збожжа застаецца стары. Крыніца для ураджаяў тая самая («Урожай»...). Крыніцы для цэн «. . . . . год в сел.-хоз. отношении», выд. б. міністэрства

земляробства. Усе ведамасьці і вылічэньні зроблены тым-жа шляхам і мы маем такі рэзультат:

Табл. № 5.

Гуртавая вытворчасьць[1]) у тыс. рублёў. 1909—1913 г. г.

| | Вілен. | Віцеб. | Горадзен | Меншч. | Магіл. | Смален. | Уся Беларусь |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Зім. жыта . . | 13.875,2 | 11.279,9 | 14.117,3 | 18.066,5 | 15.304,9 | 16.890,3 | 89.534,1 |
| Ярнае „ . . | 158,6 | 89,5 | 89,7 | 407,5 | 86,4 | 10,3 | 841,9 |
| Зім. пшаніца . | 355,7 | 170,0 | 1.217,9 | 985,3 | 166,5 | 31,1 | 2.926,6 |
| Ярнае „ . | 158,2 | 85,5 | 108,7 | 418,0 | 381,3 | 179,9 | 1.331,6 |
| Авёс . . . . . | 5.060,3 | 4.329,8 | 5.435,1 | 7.971,8 | 4.768,7 | 6.604 8 | 34.170,5 |
| Ячмень . . . . | 2.993,1 | 3.174,2 | 1.925,8 | 3.687,4 | 2.033,4 | 1.574,9 | 15.388,7 |
| Грэчка . . . . | 505,6 | 18,7 | 597,3 | 1.298,5 | 1.166,0 | 228,4 | 3.714,5 |
| Проса . . . . | — | — | 73,5 | 495 5 | 237,1 | 3,3 | 809,4 |
| Гарох . . . . | 1.004,3 | 575,8 | 665,1 | 646,5 | 200,6 | 195,0 | 3.287,3 |
| Сачыука . . | 29,1 | 1,8 | 35,5 | 20,9 | 5,1 | 0,7 | 93,1 |
| Боб . . . . | 234,9 | 269,4 | 46,1 | 178,2 | 88,8 | — | 817,4 |
| Разам . . | 24.375,0 | 19.994,4 | 24.312,1 | 34.076,1 | 24 438,8 | 25.718,8 | 152.914,9 |

Трэба заўважыць значнае скарачэньне засеўнае плошчы пад збожжам:

Табл. № 6.

Засеўная плошча скарацілася на %%.

| Культуры | Вілен. | Віцеб. | Горадзен. | Меншч. | Магіл. | Смален. | Беларусь |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Зімавое жыта . | — 2,8 | + 0,6 | — 2,3 | — 0,4 | + 8,5 | + 1,3 | + 0,8 |
| Ярнае „ . | — 8,6 | — 22,6 | — 22,2 | — 3,4 | — 14,5 | — 70,9 | — 11,4 |
| Зімавая пшан. . | — 30,0 | — 10,0 | — 33,0 | — 21,3 | + 36,1 | + 99,6 | — 20,7 |
| Ярная „ . | + 1,0 | — 36,4 | — 22,4 | — 21,2 | — 12,1 | — 19,9 | — 18,0 |
| Авёс . . . . . | — 6,0 | + 2,0 | — 9,1 | + 4,3 | + 4,6 | — 11,3 | — 3,0 |
| Ячмень . . . | + 8,6 | - 5,3 | — 5,0 | + 13,4 | + 8,5 | — 16 5 | + 1,5 |
| Грэчка . . . . | — 36,6 | - 62,3 | — 30,0 | — 15,9 | — 25,5 | — 30,0 | — 27,1 |
| Пшано . . . . | — | — | — 23,8 | + 1,5 | — 24,6 | — 78,9 | — 12,5 |
| Гарох . . . . | — 6,2 | — 30,2 | — 32,5 | — 22,1 | — 34,9 | — 58 8 | — 25,1 |
| Сачыўка . . . | — 26,0 | — 79,9 | — 15,7 | — 49,5 | — 64,9 | — 76,4 | — 36,1 |
| Боб . . . . | — 17,2 | — 27,0 | — 25,0 | — 14,5 | — 13,6 | — | — 21,5 |
| Усе разам . | — 5,0 | — 2,4 | — 8,3 | — 0,5 | + 2,4 | — 6,1 | - 3,1 |

Найбольш скарацілася засеўная плошча на заходзе Беларусі—у Горадзеншчыне—8,3%, у Віленшчыне—5,0%, і на поўначы-ўсходзе—у Смаленшчыне—6,1%, у Віцебшчыне—2,4%; асяродак Беларусі застаецца кансэрватыўным—Меншчына ледзьва скранулася з месца (—0,5%), а Магілёўшчына навет павялічыла сваю засеўную плошчу (+2,4%), як-бы стварыўшы

[1]) Тэрмін Пракаповіча. Гэта гуртавая выручка па выключэньні кошту насельня.

пераход да Расіі, дзе ўсё яшчэ йдзець экстэнсыўны працэс разьвіцьця гаспадаркі—павялічэньне засеўнае плошчы пад збожжам (+7,9%).

Адначасна шпарка ўзрастае чысты збор з дзесяціны, найлепшы паказчык інтэнсыўнага развіцьця палявой культуры. Гэта відаць з табліцы № 7.

Табл. № 7.

Чысты збор з дзесяціны павялічыўся на %%.

| КУЛЬТУРЫ | Бел. | Э. Рас. |
|---|---|---|
| Зімазое жыта . . . . | 23,0 | 18,2 |
| Ярнае . . . . . . | 22,3 | 23,2 |
| Зімавая пшан . . . . . | 16,5 | 48,1 |
| Ярная . . . . . . | 20,9 | 15,4 |
| Авёс . . . . . . . . | 20,6 | 30,1 |
| Ячмень . . . . . . . | 33,9 | 20,0 |
| Грэчка . . . . . . . . | 40,1 | 58,3 |
| Пшано . . . . . . . . | 14,2 | 18,6 |
| Гарох . . . . . . . . | 15,3 | 8,9 |
| Сачыўка . . . . . . . . | 12,3 | — |
| Боб . . . . . . . . | 14,8 | — |
| Разам . . . | 24,5 | 25,3 |

Чым далей на заход, тым шыбчэй ідуць працэсы інтэнсыфікацыі, тым хутчэй ўзрастае чысты збор з дзесяціны засеву: Гор.+33,0%, Віл.+32,9%, Мен.+32,4%, Маг.+25,1%, Віц+11,4%, Смал.+10,4%.

Гэта сувязь ўзросту ураджая з агульнай інтэнсыўнасьцю раёну заўважаецца вядомымі расійскімі статыстыкамі. Напр., В. Абухаў[1]), вылічаючы коэфіцыэнты карэляцыі між ураджаем і часам (разьвіцьцём сельск.-гаспад. культуры), знайшоў, што «губэрні з высокімі коэфіцыэнтамі карэляцыі, якія паказваюць на пэўнасьць і інтэнсыўнасьць эволюцыі ураджаяў жыта ў бок няўхільнага павялічэньня іх, блізка што ўсе зьмясьціліся на паўночным заходзе, заходзе і поўдні. Мы можам лічыць гэты раён раёнам пэўнай і магутнай эволюцыі ураджаяў жыта»...[2]) Вось вылічаныя В. Абухавым коэфіцыэнты для ураджаяў аднаго жыта па беларускіх губэрнях:

Горадзеншчына . . . . . 0,847
Меншчына . . . . . . . 0,741
Віленшчына . . . . . . . 0,728
Магілеўшчына . . . . . . 0,635
Смаленшчына . . . . . . 0,477
Віцебшчына . . . . . . . 0,395

Беларускія губэрні займаюць першыя месцы між іншымі губэрнямі Эўр. Расіі (выключэньне Смаленшчына і Віцебшчына). Эвалюцыя гэта, кажа далей Абухаў, сьведчыць аб тым, «што імкненьне сялянства да павялічэньня сел.-гасп. культуры, нягледзячы на цяжкія грамадзкія і палітычныя ўмовы, у якіх яно было пры старым рэжыме,—дарма не загінула»...

[1]) Вестник статистики, кн. XV 1923 г. В. Обухов „Эволюция урожайности ржи за период 1883—1915 г г. в Евр Рос.», стар. 78.

[2]) Там-жа, стар. 78. Курсыў мой. Г. Г.

Такія-ж высокія коэфіцыэнты на Беларусі заўважыў і М. Чэрэванін[1]) «Мы па-першае можам вылучыць шэраг раёнаў, якія без перапынку ідуць уперад на працягу ўсяго пэрыяду, які разглядаецца (1889—1912). Гэта—тры раёны ў чарназёмнай паласе—новарасійскі, паўднёва-заходні і украінскі, два раёны у нечарназёмнай—літоўскі і беларускі і адзін на палову чарназёмны—палескі—Валынь і Чарнігаўшчына»[2]).

Трэцьці статыстык, М. Чацьвярыкоў, угледзіў таксама, што полосы павялічэньня і устойлівасьці ураджаяў у нечарназёмных губэрнях ідуць з заходу на ўсход; што грэчка мае найбольшую ўстойлівасьць у губэрнях беларускіх, суседніх з Украінай, або там, дзе яе засевы займаюць найбольшы процант ад агульнае засеўнае плошчы[3]); што і ў ячменю найбольшая ўстойлівасьць на Беларусі. Некаторыя ухіленьні ад агульнага законаўпарадкаваньня ва ўзросьце ураджайнасьці па кірунку з заходу на ўсход паказваюць толькі Віцебшчына і Смаленшчына; пэўна тут выяўляецца уплыў лёну, які вельмі пашыран у гэтых губэрнях, і абніжае ураджай тых расьлін, якія ў севазвароце ідуць пасьля лёну; гэта даўно вядомы дасьледчык эканомікі лёну праф. А. А. Рыбнікаў у працы «Промышленное льноводство»—зборнік лекцыяў па прамысловай і льняной гаспадарцы.

Шыбчэй, чым чыстыя зборы збожжа, ўзрастаюць цэны на яго. Табл. № 8 пакажа належныя лічбы:

Табл. № 8.

Цэны вырасьлі на %%.

| Культуры | Віл. | Віц. | Гор. | Мен. | Маг. | Смал. | Беларусь | Эўр. Расія |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Зімавое жыта . . | 27 | 38 | 24 | 29 | 46 | 40 | 33 | 44 |
| „ пшан. . . | 4 | 24 | 19 | 17 | 23 | 36 | 17 | 33 |
| Ярная „ . . | 11 | 28 | 24 | 24 | 18 | 34 | 24 | 26 |
| Авёс . . . . . . | 24 | 34 | 18 | 32 | 33 | 41 | 33 | 27 |
| Ячмень . . . . . | 22 | 30 | 20 | 24 | 31 | 35 | 27 | 27 |
| Грэчка . . . . . | — | — | — | — | — | — | 30 | 30 |
| Пшано . . . . | — | — | — | — | — | — | 54 | 38 |
| Гарох . | 38 | 44 | 68 | 56 | 53 | 55 | 48 | 41 |
| Усе разам | 27 | 37 | 23 | 30 | 42 | 40 | 32 | — |

Чым далей на ўсход, тым шыбчэйшы ўзрост цэн на збожжа; у Расіі ён вышэй, чым на Беларусі.

Рух цэн ня можна растлумачыць толькі з аналізу экономічных умоў Беларусі, для гэтага трэба было-б спачатку растлумачыць сусьветны рух цэн. Абмяжуемся таму толькі веданьнем фактаў. Разгляд руху адных цэн на паасобныя прадукты безадносна да цэн на другія прадукты таксама мала што можа растлумачыць. Таму пакінем іх у баку.

Ведаючы, як зьмянілася ў кожнай губэрні засеўная плошча, як зьмяніліся чыстыя зборы з дзесяціны, як зьмяніліся цэны,—можна ўжо лягчэй зразу-

[1]) Вест. статистики, № 8—12, 1919 г. Н. Череванин «Эволюция рус земледелия по данным об урожаях», стар. 42

[2]) Пад літоўскімі афіцыяльна разумеюцца беларускія губэрні—Віленшчына і Горадзеншчына і толькі адна запраўды літоўская—Ковеншчына.

[3]) Вестник статистики, кн. XIV, 1923. Н. Четвериков „Колебания урожаев, как фактор, влияющий на устойчивость сел.-хоз. в России“, стар. 27, 28.

мець вось гэту табліцу № 9, ў якой паказана зьмена ў 1909—13 г. г. прыбытку ад збожжа ў процантах к 1896—1900 г.

Табл. № 9.

Зьмена прыбытку ад збожжа:

| Культуры | Віл. | Віц. | Гор. | Мен. | Маг. | Смал. | Беларусь | Эур. Расія |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Зімавое жыта . . | 66,1 | 60,4 | 54,0 | 72,4 | 94,5 | 49,3 | 65 | 69 |
| Ярнае „ . . | 44,4 | 21,8 | 34,9 | 51,4 | 58,5 | − 54,6 | 41 | |
| Зімавая пшан. . . | −24,7 | 14,6 | − 1,5 | 26,0 | 106,6 | 217,4 | 7 | 97 |
| Ярная „ . . | 16,5 | −13,3 | 24,9 | 21,2 | 29,2 | 30,3 | 21 | |
| Авёс . . . . . . | 54,9 | 28,8 | 57,4 | 78,3 | 56,9 | 41,5 | 54 | 72 |
| Ячмень . . . . . | 73,7 | 62,3 | 51,2 | 79,1 | 110,3 | 59,7 | 72 | 145 |
| Грэчка . . . . . | 13,8 | −47,0 | 51,7 | 62,6 | 44,8 | − 16,6 | 35 | 75 |
| Гарох . . . . . | 52,2 | 3,3 | 37,9 | 57,6 | 20,9 | − 30,6 | 29 | 76 |
| Усе разам | 58,7 | 48,3 | 87,8 | 70,4 | 80,8 | 45,2 | 59 | 85 |

Такі параўнальна высокі ўзрост прыбытку на Беларусі ад збожжа залежыць у значнай меры проста ад таго, што цэны на збожжа вырасьлі. Каб пазбавіцца ад іх уплыву, трэба ўвесь чысты збор збожжа аценіць па старых цэнах (1896—1900 г. г.). Толькі тады і выявіцца сапраўднае павялічэньне вытвору. Пераценіць па старых цэнах трэба і па другой прычыне: адно параўнаньне чыстых збораў за два пэрыяды па вялікім раёне з некалькіх губэрняў яшчэ не паказвае ўзросту вытвору, бо ў чыстых зборах ёсьць прадукты рознай каштоўнасьці: павялічэньне збору, напрыклад, на 100 тыс. пудоў у той губэрні, дзе цана была 1 рубель за пуд—вызначае узрост вытвору на 100 тыс. рублёў, а ў той губэрні, дзе цана была 80 кап. за пуд—ўзрост толькі на 80 тыс. рублёў, хоць збор ўзрос на 100 тыс. пудоў, а разам у дзьвюх губэрнях павялічэньне вытвору ня 200 тыс. пудоў; а 180 тыс. рублёў. Табл. № 10 мае абсолютныя лічбы, а табл. № 11 адносныя:

Табл. № 10.

Кошт чыстага збору збожжа 1909—13 г. г. па цэнах 1896—1900 г. г. (тыс. рублёў):

| Культуры | Віл. | Віц. | Гор. | Меншч. | Маг. | Смал. | Беларусь |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Зім. жыта . . | 10.909,2 | 8.148,0 | 11.374,5 | 14 005,0 | 10.477,7 | 12.064,5 | 66.979,0 |
| Яр. „ . . | 124,7 | 64,6 | 72,2 | 315,9 | 59,1 | 7,8 | 644,4 |
| Зім. пшан. . . | 340,2 | 137,3 | 1.140,4 | 835,7 | 135,4 | 22,9 | 2.611,8 |
| Яр. „ . . | 142,3 | 67,0 | 87,5 | 338,0 | 321,4 | 134,3 | 1.090,4 |
| Авёс . . . . . | 4.078,7 | 3.232,9 | 4.607,1 | 6.036,1 | 3.599,0 | 4.692,0 | 26.245,7 |
| Ячмень . . . . | 2.446,3 | 2.435,6 | 1.612,2 | 2.930,1 | 1.557,8 | 1.161,8 | 12.143,8 |
| Грэчка . . . | 363,6 | 13,7 | 464,0 | 923,1 | 902,4 | 168,6 | 2.835,4 |
| Проса . . . . | — | — | 47,7 | 321,5 | 153,8 | 2,1 | 525,1 |
| Гарох . . . . | 727,7 | 399,8 | 395,9 | 413,1 | 130,5 | 125,9 | 2.192,9 |
| Сачыўка . . . | 14,6 | 0,9 | 17,8 | 10,4 | 2,5 | 0,3 | 46,5 |
| Боб . . . . . | 156,6 | 179,6 | 30,7 | 118,8 | 59,2 | — | 544,9 |
| Разам . . | 19.303,9 | 14.679,4 | 19.850,0 | 26.247,7 | 17.398,8 | 18.380,2 | 115.860,1 |

Табл. № 11.

Узрост вытвору збожжа у %%.
(Прыбытак 1909—13 г.г., вылічаны па цане 1896—1900 г.г., адносна прыбытку за 1896—1900 г.г.).

| Культуры | Віл. | Віц. | Гор. | Мен. | Маг. | Смал | Беларусь | Эўр. Рас. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Зімавое жыта . . | 30,6 | 15.9 | 24,1 | 33,7 | 33,2 | 6,6 | 23,5 | 18,2 |
| Ярнае » . . | 13,5 | —12,1 | 8 6 | 17,3 | 8,4 | —65,6 | 1,7 | 8,9 |
| Зімавая пшаніца . | —28,2 | — 7,5 | — 7,8 | 6,9 | 68,0 | 133,7 | — 5,4 | 86,1 |
| Ярная » . | 4,8 | —32,0 | 0.6 | — 2,0 | 8.9 | — 2,8 | — 0,8 | 48,2 |
| Авёс . . . . . . | 25,9 | — 3,8 | 33,4 | 35.0 | 18,4 | 0,4 | 17,9 | 35 |
| Ячмень . . . . . | 42,0 | 24,6 | 26,5 | 42,4 | 61,1 | 17,8 | 35,5 | 83 |
| Грэчка . . . . . | —18,1 | —61,2 | 17,9 | 15,6 | 12,0 | —38,4 | + 0 | 34 |
| Пшано . . . . . | — | — | —19,7 | 15,4 | —12,8 | —82,1 | 3,1 | 21 |
| Гарох . . . . . . | 10,3 | —28,3 | —17,9 | 0,1 | —21,3 | —55,2 | —14 2 | 24 |
| Сачыўка . . . . | — 9,9 | —70,0 | —20,5 | —23,0 | —70,6 | —75,0 | —28.4 | 46,9 |
| Боб . . . . . . . . | —12,0 | —18,7 | — 41,4 | 24,3 | 5,9 | — | — 9,9 | 33,9 |
| Усе разам | 25,7 | 8,8 | 22,4 | 31,2 | 28,7 | 3,8 | 20,2 | 38,8 |

Прыбытак ад тэхнічных расьлін у 1909—13 г.г. вылічаецца ранейшым спосабам, крыніцамі зьяўляюцца тыя, што паказаны для збожжа. Табл. 12 дае патрэбныя лічбы.

Табл. № 12.

Гуртавая вытворчасьць у тыс. рублёў 1909—1913 г.г.

| Культура | Вілен. | Віцеб. | Горадзен | Меншч | Магіл. | Смален. | Беларусь |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Бульба . . . . | 9.552,9 | 5.764,7 | 8.607,6 | 15.318,0 | 10.488,9 | 7.555,7 | 57.287,8 |
| Лён-насен. . . | 680,0 | 1.096,0 | 473,6 | 1.001.6 | 1.216,2 | 3.472,5 | 7.939,9 |
| » -валакно . | 2.097,9 | 5.063,0 | 2.628,2 | 3.855,7 | 3.797,6 | 12.543,7 | 29.986,7 |
| Каноп.-насен. . | 72,1 | 61,2 | 38,6 | 238,7 | 677,2 | 1.154,2 | 2.242,1 |
| » -валак. . | 237,0 | 189,5 | 150,4 | 690,8 | 1.628,2 | 2.045,3 | 4.941.3 |
| Разам . | 12.639,9 | 12.174,4 | 11.899,0 | 21.104,8 | 17.808,2 | 26.771,4 | 102.397,8 |

Зьмена засеўнае плошчы пад тэхнічнымі культурамі яшчэ больш узмацняе думку аб тым, які глыбокі працэс рэарганізаваньня палявой гаспадаркі перажыла Беларусь за 13 гадоў.

Табл. № 13.

Зьмена засеўнае плошчы у %% 1909—13 г.г. к 1896—1900 г.

| Культуры | Віл. | Віц. | Гор. | Мен. | Маг. | Смал | Беларусь | Эўр. Рас. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Бульба . . . . . | 37,6 | 18,6 | 27,2 | 48,6 | 48,4 | 33,0 | 37,6 | 21,0 |
| Лён . . . . . . | —23,9 | —15,4 | — 6,0 | — 2,9 | +27,5 | +62,0 | +11,3 | —13,4 |
| Каноплі . . . . . | —26,7 | —38,8 | —36,5 | — 8,9 | —20,8 | —26,1 | —23,6 | —17.6 |
| Разам . . . | 22,3 | 1,3 | 22,8 | 39,1 | 34,2 | 34,9 | 26.9 | 5,2 |
| З іншымі . . . | | | | | | | | 15,0 |
| Зьмена збожжа . | | | | | | | — 3,1 | + 7,9 |

Гэтыя радкі яскрава сьведчуць аб тым, што беларуская палявая гаспадарка шыбчэй ідзе ў бок інтэнсіфікацыі, чым гаспадарка расійская: тэхнічныя расьліны павялічваюцца на Беларусі ў некалькі разоў хутчэй, чым у Эўр. Расіі, пры адначасным зьмяншэньні плошчы пад збожжам (а ў Расіі—іх экстэнсіўным павялічэньні). Засеў канапель зьмяншаецца скрозь па Беларусі, і чым далей к заходу, тым больш; лён траціць свае значэньне таксама больш на беларускім заходзе, пасуваецца ва ўсходнія губэрні, дзе, відаць, займае моцнае месца ў гаспадарцы, бо навет павялічвае сваю плошчу. Месца канапель і лёну, як і іншых культур, займае скрозь бульба; асабліва значны яе ўзрост у Меншчыне, Магілеўшчыне і Віленшчыне.

Чыстыя зборы прамысловых культур паўзуць угару. Напр., бульба:

Табл. № 14.

Чыстыя зборы бульбы (пудоў з дзесяціны) і зьмена іх у %%.

| Гады | Віл. | Віц | Гор. | Мен. | Маг. | Смал | Беларусь | Э Расія |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1896—1900 . | 313.4 | 307,2 | 303,0 | 342,8 | 391,7 | 373,2 | 336,3 | 342,3 |
| 1909—1913 . | 315,4 | 284,5 | 344.7 | 381,2 | 368,6 | 352,7 | 348,1 | 333,1 |
| ± % . | +0 6 | —7,4 | +13,8 | +11,2 | —5,9 | —5,5 | +3,5 | —6,7 |

Найбольшае ўзрастаньне збору з дзесяціны даюць, як і па збожжу, заходня-беларускія (інтэнсіўныя) губэрні: Горадзеншчына, Меншчына, Віленшчына. Збор лёну-валакна павялічыўся ў Эўр. Расіі на 54,4%, на Беларусі на 43,1%; канапель-валакна (пянькі) ў Расіі+58,7%, на Беларусі+32,8%. Па асобных беларус. губэрнях зьмена чыстых збораў была такая:

| | Лён-валакно | Пянька |
|---|---|---|
| Віленшчына . . . . . . . . | +41,7 | + 0,4 |
| Віцебшчына . . . . . . . . | +40,6 | +62,5 |
| Горадзеншчына . . . . . . | +57,1 | — 7,6 |
| Меншчына . . . . . . . . | +57,8 | +25,8 |
| Магілеўшчына . . . . . . | +36,3 | +48,0 |
| Смаленшчына . . . . . . . | +37,1 | +33,0 |

На лён большы ўзрост у заходніх губэрнях, на пяньку—наадварот.

Агульны чысты збор з усяе засеўнае плошчы вырас вось як (%%):

| | Беларусь | Эўр. Расія |
|---|---|---|
| Бульба . . . . . . . | 42,3 | 29,4 |
| Лён-насеньне . . . . | 43,9 | 37,5 |
| » валакно . . . . | 65,4 | 33,9 |
| Канаплі-насеньне . . | 15,6 | 19,6 |
| Пянька . . . . . . | 1,4 | 30,7 |

Узрост цэн, прыбытку, вытвару (як і кошт збожжавых расьлін па старых цэнах) відаць з табліц №№ 15, 16, 17, 18.

Табл. № 15. Узрост цэн у %%.

| Культуры: | Віл. | Віт. | Гор. | Мен. | Маг. | Смал. | Белар. | Э Рас. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Бульба . . . . | 49,4 | 37,9 | 21,3 | 5,0 | 42,0 | 42,6 | 27,8 | 36,9 |
| Лен-насеньне | 52,6 | 57,9 | 45,9 | 50,7 | 60,6 | 60,7 | 52,4 | 59,3 |
| „ — валакно | 29,2 | 40,2 | 39,4 | 54,6 | 64,2 | 69,5 | 45,3 | 17,6 |
| Каноплі-насен | 43,0 | 48,9 | 57,4 | 36,2 | 28,2 | 29,1 | 29,9 | 28,9 |
| „ валакно | 32,8 | 46,9 | 3,9 | 33,3 | 53,4 | 45,5 | 42,0 | 70,6 |
| Разам . . | 43,1 | 35,9 | 24,1 | 13,3 | 45,0 | 46,8 | 33,8 | 25,2 |
| Узрост цэн на збожжа . . | 27 | 37 | 23 | 30 | 42 | 40 | 32 | — |

Са ўсімі тэхніч Э. Рас. —31,6.

Табл. № 16. Прыбытак вырас на %%.

| Культуры | Віл | Віт. | Гор. | Мен | Маг. | Смал. | Белар | Э. Рас. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Бульба . . . | +105,2 | +49,5 | + 74,5 | + 73,7 | + 99,8 | + 85,2 | + 81,3 | + 77,2 |
| Лен-насеньне . | + 67,2 | +89,7 | + 69,6 | + 97,1 | +129,1 | +162,8 | +119,1 | +119,1 |
| „ валакно | + 41,0 | +57,4 | +107,5 | +137,7 | +190,7 | +284,7 | +146,7 | + 57,7 |
| Каноплі-насен. | + 47,1 | +74,4 | — 5,4 | +114,5 | + 59,8 | + 39,8 | + 50,9 | + 62,0 |
| „ валакно | + 1,7 | +44,7 | — 38,4 | + 53,5 | + 71,5 | + 42,3 | + 43,5 | +123,1 |
| Разам . . | + 85,0 | + 55,8 | + 75,9 | + 83,3 | +110,5 | +145,0 | + 95,8 | + 78,6 |

Са ўсімі тэхніч +90,1.

Табл. № 17. Прыбытак ад тэхнічных расьлінаў па старых цэнах.

| Культуры | Віл. | Віт. | Гор. | Мен. | Маг. | Смал. | Белар. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Бульба . . . . | 6.393,1 | 4 181,4 | 7.093,3 | 14.588,6 | 7.387,8 | 5 298,8 | 44.943,0 |
| Лен насеньне . | 585,8 | 993,9 | 427,7 | 849,7 | 990,5 | 3.231,4 | 7.079,0 |
| » валакно . | 1.623,3 | 3.611,8 | 1.885 1 | 2.493,4 | 2.312,3 | 7 402,3 | 19.328,2 |
| Каноплі-насен. | 50,4 | 41,0 | 34,6 | 175,2 | 529,1 | 894,1 | 1.724,4 |
| » валакно | 178,4 | 128,9 | 144,8 | 518,4 | 1 061,8 | 1.405,9 | 3.438,2 |
| Разам . . | 8.831,0 | 8.957,0 | 9.585,5 | 18.625,3 | 12.281,5 | 18 232,5 | 76.512,8 |

Табл. № 18. Узрост вытвару ў %%.

| Культуры | Віл. | Віт. | Гор. | Мен. | Маг. | Смал. | Белар | Э.Рас. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Бульба . . . | +37,3 | + 8,4 | +43,8 | +65,4 | +40,8 | + 29,9 | +42,3 | 40,1 |
| Лен-насеньне . | +44,0 | +72,0 | +53,2 | +67,2 | +86,6 | +144,5 | +95,3 | 47,0 |
| » валакно | + 9,1 | +12,3 | +48,8 | +53,7 | +77,0 | +127,0 | +58,9 | 43,0 |
| Каноплі-насен. | + 4,9 | +16,8 | —15,2 | +57,4 | +24,8 | + 8,3 | +16,1 | 40,6 |
| » валакно | —13,3 | — 1,5 | —40,7 | +15,2 | +11,9 | — 2,2 | — 0,2 | 55,7 |
| Разам . | +29,3 | +14 6 | +41,7 | +61,8 | +45,2 | + 66,9 | +46,3 | +42,7 |

Усіх тэхн. +44,4.

Толькі пры дапамозе цаны зьявілася магчымасьць скласьці разам бульбу і пяньку, канаплянае насеньне і лён; іншай эканамічнай меркі. апрача цаны, гэтыя натуральныя вялічыні ня маюць.

На Беларусі ёсьць і яшчэ некаторыя прамыслова-тэхнічныя культуры, напр. табака, хмель, рапс, варсавальная шышка, але ўсе яны маюць такую мізэрную долю ў народным прыбытку, што я іх з пад‘агуленьня выкінуў. Усё-ж, для цікавасьці, падаю лічбы аб табацы, бо яны больш поўныя і пэўныя.

| | Засеўны пляц (дзес.) | | Збор (пудоў) | |
|---|---|---|---|---|
| | 1896—1900 | 1909—13 | 1896—1900 | 1909—13 |
| Віленшчына . . . | 62,8 | 15,7 | 5.753,8 | 1.142,0 |
| Горадзеншчына . | 8,2 | 1,8 | 541,0 | 26,8 |
| Меншчына . . . | 44,8 | — | 4.826,6 | — |
| Магілеўшчына . . | 2,0 | — | 160,0 | — |
| Смаленшчына . . | 10,8 | 4,4 | 632,4 | 347,2 |
| Беларусь . | 128,6 | 21,9 | 11.913,8 | 1.516,0 |

Кошт табакі ў 1896—1900 г.г. быў 16.679 рублёў, а ў 1909—13 г.г. толькі 3.032 рублі. Культура бяз будучыні ў беларускіх умовах; хоць усім вядома, які багаты росквіт мела табака у гады натуралізацыі нашае гаспадаркі (1919—22) [1].

Якую-ж ролю маюць паасобныя губэрні Беларусі ўва усебеларускім прыбытку ад усіх палявых культур, збожжа і тэхнічных. Доля кожнай губэрні за абодвы кругабегі выяўлена ў табліцы № 19 (у %%).

Табл. № 19.

Доля асобных губэрань у прыбытку.

| Губэрні: | Прыбытак ад збожжа | | | Прыбытак ад прамыслова-тэхн. расьлін. | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1896—1900 | 1909—1913 | +4%% | 1896—1900 | 1909—1913 | +4%% |
| Віленшчына . | 15,9 | 15,9 | ±0,0 | 13,0 | 12,3 | —0,7 |
| Віцебшчына . | 13,9 | 12,9 | —1,0 | 14,9 | 11,8 | —3,1 |
| Горадзеншчына | 16,9 | 15,9 | —1,0 | 12,9 | 11,6 | —1,3 |
| Меншчына . | 20,8 | 22,3 | +1,5 | 22,1 | 20,6 | —1,5 |
| Магілеўшчына | 14,0 | 16,0 | +2,0 | 16,2 | 17,4 | +1,2 |
| Смаленшчына | 18,4 | 16,9 | —1,5 | 20,9 | 26,3 | +5,4 |
| Беларусь | 100,0 | 100,0 | ± 0 | 100,0 | 100,0 | ± 0 |

У гэтых радкох ня столькі цікавы проценты, якія паказваюць ролю той ці іншай губэрні, колькі зьмены гэтых процантаў. Заходнія беларускія губэрні—Віленшчына і Горадзеншчына, і паўночна-усходнія—Віцебшчына і Смаленшчына—сваю ролю ў прыбытку ад збожжа зьмяншаюць; Магілеўшчына і Меншчына павялічваюць.

Па гандлёва-прамысловых расьлінах адзначаны ухіл выяўляецца йшчэ больш рэзка, нават і Меншчына зьмяншае сваю ролю; а затое ўсходнябеларуская губэрня—Смаленшчына сваю адносную вагу павялічвае вельмі буйна. Гэта сьведчыць аб тым, што асяродак палявой гаспадаркі на Беларусі пасуваецца з заходу на ўсход. Ці ня ёсьць гэта пакажчык таго, што ў такім-жа кірунку—з заходу на усход—павялічаецца роля і ўсёй

[1]) З палявых расьлін не падлічан прыбытак па ўсей Беларусі—у 1909—13 г.г. ад 2351 дзесяціны (пераважна полба на Горадзеншчыне)—гэта ў прыбытку ад поля ня больш 0,02%, значыцца, на вывады ніякага ўплыву ня робіць.

сельскай гаспадаркі, ці ня ёсьць гэта пакажчык таго, у якім кірунку пасуваецца індустрыялізація Беларусі? Аб гэтым далей.—Падзівімся, колькі рублёў прыбытку дае палявая гаспадарка ў абодвы кругабегі на аднаго чалавека. Гэта паказвае табліца № 20 [1]).

Табл. № 20

| Губэрні | | Прыбытак, павялічаны на 10% тыс. руб | | Насельніцтва | На 1 чал. прыбытку руб | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Ад збожжа | Ад гандпрам | | Збожжа | Тэхн. | Разам |
| Віл. | I | 16.898,9 | 7.515,0 | 1.689.450 | 10,0 | 4.8 | 14,8 |
| | II | 26.812,5 | 13.903,9 | 2.075.900 | 12,9 | 5,7 | 18,6 |
| Віц. | I | 14.834,9 | 8.597,3 | 1.600.668 | 9,3 | 5,4 | 14,7 |
| | II | 21.993,8 | 13.391,9 | 1.953.100 | 11,3 | 6,9 | 18,2 |
| Гор. | I | 17.925,6 | 7.439,9 | 1.706.816 | 10,5 | 4,4 | 14,9 |
| | II | 26.743,3 | 13.088,9 | 2.048.200 | 13,3 | 6,4 | 19,7 |
| Мен. | I | 22.000,8 | 12.664,3 | 2.334.790 | 9,4 | 5,4 | 14,8 |
| | II | 37.483,7 | 23.215,3 | 3.035.800 | 12,3 | 7,7 | 20,0 |
| Маг. | I | 14·869,2 | 9.304,9 | 1.839.057 | 8,4 | 5,1 | 13,5 |
| | II | 26.882,6 | 19.589,0 | 2.465.500 | 10,9 | 7,9 | 18,8 |
| Смал. | I | 19.479,8 | 12.018,2 | 1.634.746 | 11,9 | 7,4 | 19,3 |
| | II | 28.893,9 | 29.448,5 | 2.163.600 | 13,1 | 13,6 | 26,7 |
| Беларусь | I | 106.009,2 | 57.539,6 | 10.805.527 | 9,1 | 5,3 | 14,4 |
| | II | 168.206,4 | 112.637,6 | 13.742.200 | 12,2 | 8,2 | 20,4 |

Аднакавасьць вялічынь прыбытку ад збожжа на аднаго чалавека кідаецца адразу ў вочы; па прыбытку ад прамысловых расьлінаў вылучаецца Смаленшчына (уплыў лёну, 45% усебеларускага прыбытку ад якога дае адна гэта губэрня). Прыбытак на аднаго чалавека найбольш узрастае ад тэхнічных культур.

Табл. № 21.

Узрост прыбытку на 1 чалавека ў % да 1896—1900 г. г.

| Губэрні | Збожжа | Тэхн. к. | Разам |
|---|---|---|---|
| Віленшчына | 29 | 17 | 26 |
| Віцебшчына | 22 | 28 | 24 |
| Горадзеншчына | 27 | 45 | 32 |
| Меншчына | 31 | 43 | 35 |
| Магілеўшчына | 30 | 53 | 39 |
| Смаленшчына | 11 | 80 | 36 |
| Уся Беларусь | 34 | 40 | 36 |

Такім чынам, прамыслова - тэхнічныя культуры ня толькі маюць на Беларусі параўнальна з Расіяй большае значэньне ў палявой гаспадарцы, але і ўзрастаюць шыбчэй. Гэта яскрава выяўлена ў табл. № 22.

[1]) Насельніцтва без папраўак за 1900 і 1913 г. I=1896 - 1900 г.г.; II -1909 - 1913 г.г.

Табл. № 22.

Адносіны прыбытку ад тэхнічных расьлін да прыбытку ад збожжа, які прымаецца за 100.

| Губэрні | 1896-1900 г. | 1909-13 г. |
|---|---|---|
| Віленшчына | 44,5 | 51,9 |
| Віцебшчына | 58,0 | 60,9 |
| Горадзеншчына | 41,5 | 48,9 |
| Меншчына | 57,6 | 61,9 |
| Магілеўшчына | 62,6 | 72,9 |
| Смаленшчына | 61,7 | 104,1 |
| Беларусь | 54,3 | 66,9 |
| Эўр. Расія | 26,3 | 27,0 |

Такога вялікага значэньня гандлёва-прам. культур ня можна ўгледзіць з лічбаў складу культур па засеўнаму пляцу. Вось табліца № 23, дзе побач паказан склад культур па прыбытку і па засеўнай плошчы; яна сьведчыць, што толькі вельмі прыблізнае выяўленьне можна мець аб ролі культуры, калі грунтавацца на долі яе ў засеўным пляцы, і што гэта роля выразна вылучаецца на долі культуры ў нац. прыбытку.

Табл. № 23.

Склад культур Беларусі.

| Культуры | 1896-1900 г. | | 1909—13 г. | |
|---|---|---|---|---|
| | % у прыб | % па пл | % у прыб | % па пл. |
| Зімовае жыта | 36,8 | 46,2 | 35,3 | 46,1 |
| Ярнае » | 0,4 | 0,7 | 0,3 | 0,6 |
| Зімовая пшан. | 1,8 | 1,2 | 1,1 | 1,0 |
| Ярная » | 0,7 | 0,7 | 0,5 | 0,6 |
| Авёс | 15,1 | 22,0 | 13,5 | 21,1 |
| Ячмень | 6,0 | 8,1 | 6,0 | 8,2 |
| Грэчка | 1,2 | 5,0 | 1,1 | 3,6 |
| Проса | 0,4 | 0,4 | 0,3 | 0,4 |
| Гарох | 1,7 | 2,3 | 1,3 | 1,7 |
| Сачыўка, Боб | 0,5 | 0,4 | 0,4 | 0,3 |
| Бульба | 21,4 | 8,5 | 22,5 | 11,6 |
| Лён | 10,7 | 3,5 | 14,9 | 4,0 |
| Каноплі | 3,3 | 1,0 | 2,8 | 0,8 |
| Усе | 100 | 100 | 100 | 100 |

Пад тэхнічнымі культурамі ў 1896—1900 г. г. толькі 13,0% засеўн пляцу, супраўдная ж іх роля для гаспадаркі —35,4%, ледзьві ня ў тры разы вышэйшая; ў 1909—13 г. г.—16,4% ад пляцу,—а ад прыбытку 40,2%. Па іншых культурах розьніца таксама значная.

Але пры параўнаньні за розныя часы складу палявых культур—кірунак разьвіцьця палявой гаспадаркі таксама можна угледзіць; мера ж зьмены засеўнага пляцу ня будзе адпавядаць меры супраўднай зьмены эканамічнай ролі культуры. Табл. № 24 зьмяшчае параўнаньне складу засеваў Беларусі і Эўр. Расіі за кругабегі: 1870—74 [1]), 1896 - 1900 [2]) і 1909—13 г. г.

Табл. № 24

| Культура | Беларусь | | | Эўр. Расія | |
|---|---|---|---|---|---|
| | 1870-74 | 1896-1900 | 1909-13 | 1870-74 | 1909-13 |
| Жыта | 44,5 | 46,9 | 46,7 | 35,3 | 30,5 |
| Пшаніца | 4,5 | 1,9 | 1,6 | 17,7 | 23,8 |
| Авёс | 21,8 | 22,0 | 21,1 | 18,5 | 18,0 |
| Ячмень | 9,9 | 8,1 | 8,2 | 7,3 | 10,9 |
| Грэчка | 7,8 | 5,0 | 3,6 | 7,7 | 2,3 |
| Бульба | 4,4 | 8,5 | 11,6 | 1,6 | 3,9 |
| Лён | 3,7 | 3,5 | 4,0 | 2,0 | 1,5 |
| Каноплі | 0,8 | 1,0 | 0,8 | 0,5 | 0,7 |
| Іншыя | 2,6 | 3,1 | 2,4 | 9,4 | 6,6 |
| Усе разам | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 |

І з гэтае табліцы відаць, як хіліцца ўніз значэньне грэчкі, ячменю, пшаніцы, аўса, і як сунецца ўгару бульба на Беларусі; але змяншэньне ці павялічэньне долі культур у засеўным пляцу ня будзе роўнаважна са зьменамі долі у прыбытку.

Таму, што прыбытак ад палявых культур за 1870—74 г. г. мною ня вылічан, падаю ў табл. № 25 натуралістычны пакажчык—павялічэньне агульнага засеўнага пляцу з таго часу да 1896—1900 і 1909—13 г. г.

Табл. № 25.

Узрост засеўн. пляцу ў %%.

| Губэрні | 1870-74 | 1896-1900 | 1909-13 |
|---|---|---|---|
| | тыс. дзес. | ± %% | |
| Віленшчына | 1 040,7 | —2,7 | — 4,6 |
| Віцебшчына | 642,3 | +35,8 | +33,3 |
| Горадзеншчына | 879,9 | — 0,8 | — 6,5 |
| Меншчына | 885,5 | +41,3 | +48,0 |
| Магілеўшчына | 771,7 | +23,7 | +31,1 |
| Смаленшчына | 873,6 | + 9,3 | + 9,3 |
| Беларусь | 5.093,7 | +16,0 | +16,9 |
| Эўр. Расія | 61.830,1 | +16,6 | +26,5 |

Гэтыя лічбы тым цікавы, што паказваюць зьмяншэньне засеўнага пляцу: значыцца, пачатак рэарганізаваньня яго, інтэнсыфікацыі, у заходніх беларускіх губэрнях—Віленшчыне і Горадзеншчыне яшчэ ў 1896—1900 г.г. К 1909—13 г. г. гэты працэс яшчэ больш у іх паглыбляецца і захопливае

[1]) З Янсона «Сравнительная статистика»

[2]) Эўр. Расія толькі за 1870—74 і 1909—13 г. г.

іншыя беларускія губэрні—Віцебшчыну і Смаленшчыну. Меншчына і Магілеўшчына даюць і далей узрост засеўнае плошчы,—праўда, значна слабейшы, чым ў Эўр. Расіі.

Гэтым можна скончыць вылічэньне прыбытку ад поля. Склад прыбытку ад збожжа вялікае вагі ня мае, таму у табл. № 27 дадзен толькі падзел яго на тры часткі—харчовае збожжа, кармавое й інш.

Табл № 26

| Губэрні | % харчовых | | % кармовых | |
|---|---|---|---|---|
| | 1896—1900 | 1909—1913 | 1896—1900 | 1909—1913 |
| Віленшчына | 59,1 | 59.7 | 32.5 | 33.0 |
| Віцебшчына | 54,5 | 58,1 | 39,4 | 37,5 |
| Городзеншчына | 64,8 | 63.9 | 29,0 | 30.3 |
| Меншчына | 59,4 | 58,3 | 32.7 | 34,2 |
| Магілеўшчына | 61,4 | 65,2 | 29,6 | 27,8 |
| Смаленшчына | 64,8 | 66,5 | 31,9 | 31,8 |
| Беларусь | 60,8 | 61,9 | 32,4 | 32,4 |

**Жывелагадоуля.** Ранейшая афіцыяльная статыстіка зьяўлялась ня зусім дакладнай у адносінах да жывёлагадоулі. Лічбы 1900 г. яшче можна лічыць больш менш блізкімі да рэчавістасьці.

Замест лічб 1913 г. мы возьмем дзе гэта магчыма, лічбы 1916 г. як больш пэўныя.

**Коні.** Частка прыбытку ад коняй ужо палічана ў прыбытку ад збожжа і гандлёва-прамысловых культур: гэта той прыбытак, які прыносюць коні сваёю працаю ў сел.-гаспадарцы. Частка прыбытку ад коняй трапіць ў прыбытак хурманачны. Дык асобна ў прыбытак ад коняй будзе залічана толькі вартасьць тых коняй, якіх сяляне прадаюць заграніцу, у гарады і войска. А прадаваць яны павінны ў гарады столькі, колькі трэба для рамонту (прыблізна 1/6 частка ўсяе колькасьці гарадзкіх коняй). Табліца № 27 паказвае, колькі прадаецца коні ў гарады, згодна вайсковаму перапісу коняй у 1900 і 1912 годах.

Табл № 27.

| Губэрні | Кольк гарад. раб. коні | | Купляецца 1/6 ч | |
|---|---|---|---|---|
| | 1900 г | 1912 г. | 1900 г. | 1912 г. |
| Віленшчына | 6868 | 6683 | 1145 | 1114 |
| Віцебшчына | 7342 | 5945 | 1224 | 991 |
| Горадзеншчына | 8674 | 10594 | 1446 | 1766 |
| Меншчына | 11158 | 9561 | 1859 | 1533 |
| Магілеўшчына | 5616 | 6644 | 936 | 1107 |
| Смаленшчына | 5394 | 4018 | 899 | 670 |
| Беларусь | 45052 | 43445 | 7510 | 7221 |

Колькі коняй купіла войска ў той ці іншай губэрні—непасрэдна з справаздач Ваеннага Міністэрства за належныя гады даведацца ня можна; дык з усіх купляных войскам Расіі коняй вылучаю на абшары Беларусі такую долю, якую Беларусь мела ўва ўсім загатаваным фуражы. Крыніцай ведаў аб вывазе за беларускія межы зьяўляюцца выданыя Мін. Фін. «Материалы

к пересмотру торгового договора России с Германией и др. государствами“. Ацэньваюцца коні не па вывазной цане (мытнай), якаа дужа паравялічана, а па сярэдняй цане каня рабочага вясною. Усе матар‘ялы на прыбытку ад коняй у табл. № 28.

Табл. № 28.

| Губэрні | Прадана коні | | | | Усяго прадана | | Цана | | Прыбытак (тыс. р.) | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | у войска | | за межы | | | | | | | | |
| | 1900 | 1913 | 1902 | 1911 | 1900 | 1913 | 1901 | 1913 | 1900 | 1913 | 1913 па ц. 1900 |
| Вілен. . . . | 1000 | 1500 | +1861 | +3461 | 4006 | 6075 | 61 | 92 | 244,4 | 558,9 | 370,6 |
| Віцеб. . . . | 500 | 750 | — 227 | —3346 | 1497 | —1605 | 61 | 100 | 91,3 | — | — |
| Горадзен. . | 1000 | 1500 | +1010 | +1448 | 3456 | 4714 | 66 | 114 | 228,1 | 537,4 | 311,1 |
| Меншч. . . | 500 | 750 | — 62 | — 90 | 2297 | 2253 | 61 | 100 | 140,1 | 225,3 | 137,4 |
| Магіл. . . . | 300 | 400 | — 786 | — 596 | 450 | 911 | 58 | 102 | 26,1 | 92,9 | 52,8 |
| Смален. . . | 285 | 323 | —1756 | + 917 | —572 | 1910 | 61 | 90 | — | 171,9 | 116,5 |
| Беларусь . | 3585 | 5223 | + 40 | +1794 | 11134 | 14258 | 63 | 100 | 730,0 | 1.586,4 | 988,4 |

**Быдла**. Прыбытак ад буйнае рагатае жывелы, або быдла, складаецца з прыбыткаў ад малака, мяса дарослага быдла, цяляціны і скур.

Каб ведаць вытвор малака, трэба ведаць колькасьць кароў і іх сярэднія ўдоі. Статыстыка толькі ў 1916 годзе у першы раз дае лічбы кароў; колькі іх было ў 1900 годзе, можна вылічыць толькі прыблізна, мяркуючы, што ў гэтым годзе процант кароў ад усяго быдла быў такім самым, як у 1916 годзе. Аб удоях кароў пэўных ведаў зусім няма. Абы—якія кавалачкі паведамленьняў аб удоях і прадукцыі жывёлаводзтва наагул раскіданы ў дакладах розных агранамічных арганізацый па губэрнях. Напр., у «Журнале агрономического совещания при Могилевской Г. Зем. Управе» за верасень-месяц 1912 г. зьмешчан даклад спецыялістага па жывёлагадоўлі С. І. Васторгава, у якім чатаем: «пісаць аб становішчы мясцовага жывёлаводзтва—гэта значыць маляваць абразы вялікага заняпаду гэтае галіны сел. гаспадаркі ў Магілеўшчыне. Быдла такое дробнае, што сярэдняя жывая вага не дасягае 12 пудоў... Малочная прадукцыя сялянскае каровы наагул—менш за 50 вёдраў у год»... У «Трудах второго с‘езда представителей и членов сел.-хоз. общ. и зем. кружков, земских деятелей... і г. д.» Віцебшчыны ў сакавіку 1912 году Е. Ф. Алонаў, дакладваючы аб патрэбе дасьледаваньня жывёлаводзтва, казаў: «Сяляне гадуюць: жывёлу не завадзкую, невялічкую ростам, ды такую дробную, што туша рагатае жывёлы з рэзьні бывае вагай ня больш 6—8 пудоў... Звычайны штодзенны ўдой малака—чвэртка вядра й менш таго; за 9 месяцаў даеньня сялянская карова дае 35—60 вёдраў малака...» Ен жа піша: «Наагул усе вывады адносна мясцовага жывёлаводзтва робяцца на падставе агульных нагляданьняў, а ня якаснага дасьледваньня, якога ў Віцебшчыне яшчэ ня было». Вядома, што пазьней праф. Ліскун рабіў дасьледваньне стану жывёлаводзтва на Віцебшчыне, але сабраныя і апрацаваныя матар‘ялы засталіся не надрукаванымі і дагэтуль гібеюць у Ленінградзе у Сельска Гаспадарчым Навуковым Камітэце. Не надрукаваны яшчэ і вынікі досьледу жывёлаводзтва Гомельшчыны ў 1922 г. праф. А. Калантара. Скарыстаць іх я ня змог. Вядомае дасьледваньне Е. І. Бокуна у 1912 г. паказала, што на Меншчыне сялянскае быдла—звычайнае важыць жыуцом 14—15 пудоў, палепшанае 16—18 пуд., а карова сялянская дае малака 46 вёдраў за год. Аб панскай жывёле

ёсьць веды троху большыя і больш пэўныя. Згодна матар'ялу, сабранаму праф. Ліскуном[1], сярэдні ўдой у панскіх гаспадарках быў—Віл.—180 вёдраў, Віцеб.—120, Гор.—110, Менш.—170, Маг.—160, Смал.—180. Т. М. Рыхтэр[2]) сьведчыць, што за 1913/14 г. з 3217 кароў у 9 кантрольных таварыствах Меншчыны сярэдняя давала 1849 кілёграмаў, або 154 вядры за год. А. Бокун лічыць ўдой ад панскіх кароў па Меншчыне ў 130 вёдраў. Пракаповіч для свайго «Опыта» лічыў у 1900 годзе ўдой па ўсіх беларускіх губэрнях за 60 вёдраў, а ў 1916 г. у панскіх гаспадарках 120 вёдраў, у сялянскіх 60 вёдраў. Студзенскі для 1916-ж году прыймае па беларускіх губэрнях—Віцеб., Меншч., Горадзен. і Смаленшчыне 100 вёдраў ва ўсіх гаспадарках наогул, па Віленшчыне і Магілеўшчыне 60 вёдраў. Пакуль у нас няма статыстыкі прадукцыйнасьці, пакуль няма шырокае сеткі сялянскіх кантрольных таварystваў, якія б маглі даць найбольш пэўныя лічбы прадукцыйнасьці, мусім карыстацца тымі кавалачкамі ведаў, няпоўных і няпэўных, якія я падаў з розных крыніц вышэй. Табл. №№ 29, 30 і 31 зьмяшчаюць вылічэньні прыбытку ад малака.

Табл. № 29.

| Губэрні | Колькасьць усіх кароў у 1900 г. | Надой вёдраў | Цана— кап. за вядро | Прыбытак (тыс руб.) |
|---|---|---|---|---|
| Віленшч. . . | 481.525 | 55 | 38 | 10.063,9 |
| Віцебшч. . . | 405.016 | 55 | 35 | 7.796,6 |
| Горадзеншч. . | 383.102 | 60 | 38 | 8.734,7 |
| Меншч. . . . . | 566.289 | 45 | 37 | 9.428,7 |
| Магілеўшч. . . | 438.161 | 45 | 36 | 7.098,2 |
| Смаленшч. . . | 356.510 | 70 | 38 | 9.483,2 |
| Беларусь . | 2.630.603 | — | — | 52.605,3 |

Табл. № 30.

Прыбытак ад панскіх кароў у 1916 г.

| Губэрні | Лік кароў у 1916 г. | % іх ад быдла | Надой вёдраў | Цана— кап. за вядро[1]) | Прыбытак (тыс руб.). |
|---|---|---|---|---|---|
| Віленшч. . . . | 24.884 | 63,25[3]) | 125 | 70 | 2.177,4 |
| Віцебшч. . . . | 25.741 | 61,23 | 120 | 63 | 1.946,0 |
| Горадзеншч. . | 22.067 | 63,25[4]) | 130 | 75 | 2.151,5 |
| Меншч. . . . . | 21.562 | 53,69 | 130 | 58 | 1.625,8 |
| Магілеўшч. . . | 28.939 | 61,02 | 120 | 60 | 2.083,6 |
| Смаленшч. . . | 24.377 | 57,16 | 120 | 71 | 2.076,9 |
| Беларусь . | 147.570 | — | — | — | 12.061,2 |

[1]) Е. Ф. Лискун. «Краткие сведения о животноводстве некоторых рус. хозяйств, по данным, полученным от хозяев» П. 1915 г.
[2]) Отчет о деятельности товариществ контроля скот. дворов» Минск. 1915 г.
[3]) Па трох паветах Віленшчыны.
[4]) Лічбы «Госмолока».

Табл. № 31.

Прыбытак ад сялянскіх кароў.

| Губэрні | Лік кароў у 1916 г. | % іх ад быдла | Надой вёдраў | Цана | Прыбытак (тыс. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| Віленшч. . . . . | 360.566 | 72,98 | 60 | 70 | 14.490,1 |
| Віцебшч. . . . . | 362.255 | 66,86 | 60 | 63 | 13.630,2 |
| Горадзеншч. . . . | 318.477 | 72,98 | 65 | 75 | 13.521,2 |
| Меншч . . . . . | 448.336 | 52,97 | 50 | 58 | 13.001,7 |
| Магілеўшч. . . . | 388.102 | 73,56 | 50 | 60 | 11.643,0 |
| Смаленшч. . . . | 322.071 | 53,93 | 75 | 71 | 17.150,3 |
| Беларусь . | 2.199.807 | — | — | — | 83.436,5 |

Каб ведаць узрост прыбытку і вытвору, у табл. № 32 паказан прыбытак ад малака за 1900 г., 1916 г. па цэнах 1913 г. і 1916 г. па цэнах 1900 г.

Табл. № 32.

Увесь прыбытак ад малака.

| Губэрні | 1900 г. | 1916 г. | 1916 г. па ст. ц. |
|---|---|---|---|
| | тыс. руб. | | |
| Віленшч. . . . | 10.063,9 | 15.698,6 | 8,032,7 |
| Віцебшч. . . . | 7.796,6 | 15.576,2 | 8,688,7 |
| Горадзеншч . | 8.734,7 | 16.641,6 | 8,956,5 |
| Меншч . . | 9.428,7 | 14.627,5 | 9,331,4 |
| Магілеўшч. . . | 7.098,2 | 13.726,6 | 8,236,0 |
| Смаленшч. . . | 9.483,2 | 19.227,2 | 10.289,8 |
| Беларусь . | 52.605,3 | 95.497,7 | 53.534,8 |

**Мяса**. Калі лічыць, што ў 1900 г. зарэзалі на мяса 1/7 ўсяго ліку быдла, а ў 1913 г. 1/6, а цану гавядзіны браць першы раз за 1891—1900 г.г., а другі—за 1913 г. (як робіць аўтар «Опыта», а трэба б было ўзяць цану 1909—13 г.г.), вагу-ж тушы прыняць толькі прыблізнай,—выявім увесь прыбытак у такіх лічбах:

Табл. № 33

Прыбытак ад мяса буйн. раг. скац. у 1900 г.

| Губэрні | Зарэзана 1/7 быдла | Вага тушы пуд | Усяго мяса тыс. п. | Цана | Прыбытак (тыс. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| Віленшч. . . . | 98.584 | 7 | 690,1 | 2,71 | 1.870,2 |
| Віцебшч. . . . | 88.689 | 6 | 532,1 | 2,49 | 1.324,9 |
| Горадзеншч. . | 77.490 | 7 | 542,4 | 3,18 | 1.724,8 |
| Меншч. . . . . | 152.132 | 6 | 912,8 | 2,54 | 2.318,5 |
| Магілеўшч. . . | 88.795 | 6 | 532,8 | 2,55 | 1.358,6 |
| Смаленшч. . . | 93.130 | 7 | 651,9 | 2,77 | 1.826,0 |
| Беларусь | 598.820 | — | 3.862,1 | — | 10.423,0 |

Табл № 34

Прыбытак ад гавядзіны у 1913 г.

| Губерні | Зарэзана шт. | Вага | Усяго мяса тыс. п. | Цана | Прыб тыс. руб. | Прыб. па ст. цане |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Віленшч. . . . . . | 97.314 | 9 | 875,8 | 590 | 5.167 2 | 2.373,4 |
| Віцебшч. . . . . | 147.768 | 7 | 1034,4 | 585 | 6.051,2 | 2.575,7 |
| Горадзеншч. . . . | 109.288 | 9 | 983,6 | 580 | 5.704,9 | 3.127,8 |
| Меншч . . . . . . | 106.632 | 8 | 853,1 | 475 | 4 052,2 | 2.166,9 |
| Магілеўшч . . . . | 110.146 | 8 | 881.2 | 495 | 4.361,9 | 2.247,1 |
| Смаленшч. . . . . | 97.286 | 8 | 778,3 | 425 | 3 307,8 | 2.155,9 |
| Беларусь . | 668.434 | — | 5.406,4 | — | 28.645,2 | 14.646,8 |

**Цяляціна.** Колькі рэжацца цялят, можна вылічыць больш-менш пэўна па перапісу 1916 году. Калі з ліку цялят першага году выкінуць 15 проц. на здохлых і усіх тых, што зарэгістраваны перапісам, лічыць пакінутымі насельнітвам цялятамі да 1 году, то рэшта і будзе—лік зарэзаных цялят па першаму году. Па другому году з пакінутых цялят першага году выкідаецца 10 проц. на здохлых і усе пакінутыя насельнікамі цяляты да 2-х гадоў. У Віленшчыне і Горадзеншчыне, дзе перапіс 1916 году не прайшоў, лік пакінутых цялят до 1 году вызначан па % іх да усяго быдла ў трох паветах Віленшчыны (23,2%), а лік пакінутых цялят да 2-х гадоў па % іх да пакінутых па першаму году у 3-х паветах Віленшчы (59,8%, у Віцебску ж 51,3%). Вага цяляці ўзята за 1¾ пуда; цана лічыцца на 20% вышэйшай ад цаны гавядзіны. На табл. № 54—вылічэньне колькасьці цялят.

Табл. № 35.

Лік цялят у тыс. шт.

| Губэрні | Лік цял. 90% кар | Здохла 15% | Пакінута па 1г. | Здохла па 2 год | Пакін. па 2 год | Зарэз. да 1 год | Зарэз. да 2 гад. | Разам |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Віленшч. . . . | 347,0 | 52,0 | 80,5 | 8,0 | 48,1 | 214,4 | 24,3 | 238,7 |
| Віцебшч. . . | 349,2 | 52,4 | 125,5 | 12,6 | 64,4 | 171,3 | 48,6 | 219,9 |
| Горадзеншч. . | 306,5 | 46,0 | 71,1 | 7,1 | 42,5 | 189,4 | 21,5 | 210,9 |
| Меншч. . . . | 422,1 | 63,3 | 180,2 | 18,0 | 175,5 | 178,6 | — | 178,6 |
| Магілеўшч. . . | 375,3 | 51,3 | 111,0 | 11,1 | 122,7 | 213,0 | — | 213,0 |
| Смаленшч. | 311,8 | 46,8 | 209,8 | 21,0 | 80,0 | 55,2 | 110,6 | 165,8 |
| Беларусь | — | — | — | — | — | 1.021,9 | 205,0 | 1.226,9 |

**Цана** аднаго пуда цяляціны будзе—Віл. 7 р. 08 к., Віц. 7 р. 02 к., Гор. 6 р. 96 к., Менш. 5 р. 70 к., Маг. 5 р. 92 к., Смал. 5 р. 10 к., а ўвесь прыбытак ад цяляціны (у тыс. руб):

Табл. № 36.

| Губэрні | Прыб 1913 г. | % ад пр гавяд. | Прыб 1900 г [1]) | Пр. 1913 па ст. ц. |
|---|---|---|---|---|
| Віленшчына . . . | 2.958,1 | 57,3 | 1.071,6 | 1.360,0 |
| Віцебшчына . . . | 2.702,2 | 44,7 | 592,2 | 1.151,3 |
| Горадзеншчына . . . | 2.568,6 | 45,0 | 776,2 | 1.407,5 |
| Меншчына . . . . | 1.780,2 | 43,9 | 1.017,8 | 951,3 |
| Магілеўшчына . . . | 2.206,7 | 50,6 | 687 5 | 1.137,0 |
| Смаленшчына . . . | 1.480,7 | 44,8 | 818,0 | 2 102,9 |
| Беларусь . . . | 13.696,5 | 47,8 | 4.963,3 | 8.110,0 |

[1]) Па % ад прыбытку гавядзіны ў 1913 г.

Прыбытак ад цяляціны ў Эўр. Расіі даў толькі 23,4% прыбытку ад мяса буйнае раг. жывёлы, на Беларусі ж аж 47,8%. Гэта сьведчыць аб большай інтэнсіўнасьці жывёлаводнай беларускай гаспадаркі наогул і мясной гадоўлі ў тым ліку. Той-жа вывад можна зрабіць, калі ўзяць % цялят, якія рэжуцца толькі на рэзьнях, да ўсяго быдла, што зарэзана на тых жа рэзьнях у 1914 годзе. Гэта можна убачыць для Беларусі з табл. № 37.

Табл. № 37.

Зарэзана на рэзьнях у 1914 г.

| Губэрні | Усяго быдла | Цялят | % цялят |
|---|---|---|---|
| Віленшчына . . . . | 120 080 | 35.995 | 30 0 |
| Віцебшчына . . . | 180.625 | — | — |
| Горадзеншчына . . | 166.419 | 12.613 | 7,6 |
| Меншчына . . . . | 182.192 | 50.134 | 27 5 |
| Магілеўшчына . . . | 117.849 | 42.693 | 36.2 |
| Смаленшчына . . | 126.725 | 22.472 | 17,7 |
| Беларусь . . . | 893.89) | 163.907 | 18 4 |

Параўнаньне Беларусі з некаторымі раёнамі Эўр. Расіі і са ўсёю Эўр. Расіяю даецца ў табл. 38.

Табл. № 38.

Зарэзана на рэзьнях у 1914 г.

| Раены | Усяго быдла | Цялят | % цялят |
|---|---|---|---|
| Чарназём. паласа . . | 2.844.594 | 63.784 | 2,2 |
| Нечарназ. паласа без Беларусі і Прыбалт. | 1.668.831 | 168.859 | 10,1 |
| Беларусь . . . . . . | 893.890 | 163.907 | 18,4 |
| Прыбалтыка . . | 453.622 | 170.990 | 37 7 |
| Уся Эўр. Расія | 5.859.337 | 567.540 | 9,7 |

На Беларусі цяляціна мае падвойнае значэньне параўнальна з Эўр. Расіяй. Прычына—адносная дарагоўля корму для жывёлы на Беларусі. Па той-жа прычыне цяляты рэжуцца ў нас больш маладымі: з усіх зарэзаных цялят у нас маладых, да 1 году, 83,3%, а ў Расіі толькі 43,8%.

**Скуры** Вытвор скур можна вызначыць двумя спосабамі. Можна-б было палічыць, на які кошт перапрацавала сырых скур прамысловасьць і на які кошт іх прывезена ці вывезена з губэрні,—балянс якраз і быў-бы ровен мясцоваму вырабу. Але-ж на Беларусі шмат ёсьць дробных гарбараў-рамесьнікаў і саматужнікаў і колькі іх саміх, колькі яны спажываюць сырых скур—ніхто ніколі ня лічыў і ня ведае. Таму карыстаюся другім спосабам. Колькі зарэзана быдла і цялят у 1900 і 1913 г.—нам вядома. Столькі ж павінна быць скур (штук). Цэн на скуры дэталічных, па розных губэрнях, у расійскай статыстыцы няма; таму бяру для 1900 г. Саратаў-

скія цэны: скура кароўская 5 р. 99 к., а цялячая 1 р. 35 к., а для 1913 г. адэскія—скура кароўская 7 р. 43 к., цялячая 1 р. 79 к. Лічбы сабраны ў табліцу № 39.

Табл. № 39.

Прыб. ад скур.

| Губэрні | 1900 г. | 1913 г. | 1913 г. па ст. ц. |
|---|---|---|---|
| Віленшчына . . . . . | 904,1 | 1106,9 | 892,7 |
| Віцебшчына . . . . . . | 679,4 | 1404,6 | 1132,7 |
| Горадзеншчына . . . . | 657,8 | 1151,0 | 928,2 |
| Меншчына . . . | 1278,6 | 1111,9 | 896,7 |
| Магілеўшчына . . . . | 779,8 | 1199,7 | 967,5 |
| Смаленшчына . . . . . | 634,2 | 821,7 | 662,7 |
| Беларусь . . | 4.933,9 | 6.795,8 | 5.480,5 |

**Авечкі.** Авечкі даюць прыбытак сваёю воўнаю, аўчынамі, мясам і салам. Якая ад іх прадукцыя—пэўных лічбаў таксама няма. Пракаповіч прыблізна прыймае, што авечка простая дае 5 х. воўны, а завадзкая (мэрыносы й інш) 8 хунтаў; мяса-ж з авечкі дастаюць 1,13 пуда, а сала 0,12 пуда. Які процант з усяго статку авец рэжацца, таксама можна толькі меркаваць прыблізна. Аўтар «Опыта» лічыць, што рэжуць 35 проц. усіх простых авечак і 18 проц. авечак завадзкіх.

Розныя аўторы прыймаюць розныя нормы. Затым і прыбыткоўнасьць аднае авечкі, вылічаная за адзін час, некалькімі дасьледчыкамі—розная. Напр., у 1913 г. Пракаповіч і Палфёраў далі такія вылічэньні:

Прыбытак з аднае аўцы:

| | Пракап. | Палфёр.[1]) |
|---|---|---|
| Воўна . . . . . . . . . . . | 1 р. 43 к. | — 73 к. |
| Мяса . . . . . . . . . . . . | 5 р. 39 к. | 2 р. 10 к. |
| Сала . . . . . . . . . . . . | — 80 к. | — |
| Аўчына . . . . . . . . . . | 2 р. — к. | — 60 к. |
| Усё . . . . | 9 р. 62 к. | 3 р. 43 к. |

У другім месцы[2]) Я. Палфёраў вылічае прыбытак ад авечкі за 1888—91 г.г. у 4 р. 40 к., за 1907—11 г.г.—6 р. 40 к., а Чукаеў у тых-жа «Трудах» прыбытак нават ад завадзкой (мэрынос) авечкі лічыць толькі ў 4 р. 41 кап.

Аб стане авечак на Беларусі Палфераў[1]) піша, што ў Смаленшчыне, Магілеўшчыне, Меншчыне і Віцебшчыне «гадуецца выключна простая авечка з грубою воўнаю, выключна для ўжытку яе на ўласныя патрэбы»... Ен-жа падае ў сваім творы цікавую табліцу падзелу гаспадарак па ліку ў іх авечак; матар'ялам для табліцы былі 4.000 анкет, собраных «Торгово-Промышл. газетой»:

[1]) „Современное состояние овцеводства в России" СПБ 1912 г.
[2]) „Труды I всерос с'езда по овцеводству в Москве". 1912 г., стар. 485.

% гаспадарак па ліку авец:

| Раёны: | Без авец | 1 | 2-3 | Зв. 3 |
|---|---|---|---|---|
| Прамысловы . . . . . . . . | 6,3 | 8,9 | 32,3 | 50,0 |
| Паўночна-Усходні . . . . | 1,3 | 5,7 | 38,5 | 54,5 |
| Вышня-Волжынскі . . . . | 10,4 | 21,6 | 41,5 | 26,5 |
| Паўночны . . . . . . . . . | 12,8 | 20,4 | 51,8 | 15,0 |
| Беларускі . . . . . . . . . | 0,4 | 27,0 | 60,6 | 12,0 |

Хоць розныя анкеты і вельмі не надзейны матар'ял, усё-ж карыстацца імі можна. Анкета «Торг.-Пром. Газеты» вельмі яскрава сьведчыць, што з усіх нечарназёмных раёнаў колькасьць авечек у Беларускім—самая мізэрная—пераважна 1—3 авечкі на двор (87,6% усіх гаспадарак). У «Трудах» першага зьезду па гадоўлі авец у 1912 г. аграном І. Яноўскі ў нарысе становішча авечае гаспадаркі на Магілеўшчыне пісаў: «З усіх галін жывёлагадоўлі ў Магілеўшчыне авечкі стаяць на апошнім месцы... Сяляне патрэбу ў мясной ядзе здавальняюць пераважна сьвіньнінай. Кормная сьвіньня, якую забіваюць у восень, цэлы год здавальняе пасоленым салам небагатае існаваньне беларуса-селяніна»..., «нават у багатага селяніна ня знойдзеш у лепшым выпадку больш 2—3 авечак, вельмі мізэрных на выгляд, з жорсткай і грубою воўнай, дробных, ня больш 2-х пудоў вагі, а з убойнай вагай 20—25 хунтаў»...

Таму што Пракаповіч узяў вышэйназваныя нормы аднакавымі для ўсіх губэрняў, мушу і я іх трымацца, бо йначай доля Беларусі, у прыбытку Эўр. Расіі будзе зьменшанай. У табл. № 40 паказан лік усяго прыбытку з авечак:

Табл № 40.

Прыбытак (тыс. руб).

| Губэрні | Воўна | | Сала і мяса | | Аўчыны[1] | | Увесь прыбытак | | 1913 г. па ст. цэнам |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1900 г. | 1913 г | 1900 г. | 1913 г | 1900 г. | 1913 г | 1900 г. | 1913 г. | |
| Вілен. . . | 498,1 | 522,8 | 643,1 | 892,5 | 700,6 | 446,5 | 1.841,8 | 1.861,8 | 1.173,7 |
| Віцеб. . . | 516,9 | 1.391,5 | 582,6 | 2.066,8 | 779,4 | 1.163,2 | 1.878,9 | 4.621,5 | 2.770,3 |
| Горадзен. . | 551,4 | 953,7 | 642,9 | 1.035,2 | 806,0 | 698,9 | 2.000,3 | 2.687,8 | 1.778,8 |
| Меншч . . | 710,5 | 1.318,2 | 735,3 | 1.267,5 | 959,3 | 904,9 | 2.405,1 | 3.490,6 | 2.392,1 |
| Магіл. . . . | 483,8 | 853,6 | 573,3 | 1.604,8 | 739,9 | 1.001,3 | 1.797,0 | 3.459,7 | 2.260,3 |
| Смален. . | 735,1 | 1.354,1 | 1.013,8 | 2.650,9 | 1.163,5 | 1.828,4 | 2.912,4 | 5.833,4 | 4.136,8 |
| Беларусь | 3.495,8 | 6.393,9 | 4.191,0 | 9.517,7 | 5.148,7 | 6.043,2 | 12.835,5 | 21.954,8 | 14.512,0 |

Вылічаны такім чынам прыбытак трэба лічыць бязумоўна перавялічаным. Як было паказана вышэй (параўнаваньне прыбыткоўнасьці аднае авечкі ў Пракаповіча, Палфёрава і Чукаева), нормы Пракаповіча занадта вялікія; падругое % авечак, якіх рэжуць, узят адносна усяго статку, а ня толькі адных дарослых авечак, а таму у 1916 годзе, калі былі зарэгістраваны і ягняты, колькасьць зарэзаных авечак зусім штучна павялічана. Памылка гэта для Беларусі меншая, чым для Расіі, бо ў нас, як у краіне больш інтэнсіўнай, % ягнят меншы; наогул, чым далей на заход Беларусі, тым памылка гэта таксама зьмяншаецца, бо у такім кірунку павялічваецца інтэнсіўнасьць жывёлагадоўлі і зьмяншаецца, значыцца, % ягнят Смален. 54,3, Віц. 56,0, Магіл. 36,1, Менш. 27,8, Вілен. 24,1.

[1]) Цана аўчыны у 1900 і 1913 г.г. Віл 2 р. 43 к., Віц. 2 р. 84 к., Гор. 3 р 01 к., Мен. 2 р. 63 к., Маг. 2 р. 63 к., Смал. 2 р. 93 к.

**Свіньні.** Адносна няпэўнасьці мэтадаў вылічэньня вагі свіньні я ўжо казаў. Каб яшчэ больш падкрэсьліць думку, што карыстацца для вызначэньня сьвіное вагі адносінамі цаны сьвіньні някормнае і цаны сьвіньніны няможна, у табл. № 41 паказваю, якімі будуць гэтак вылічаныя вагі у 1891—1900 г.г. і 1909—13 г.г.

Табл № 41.

Вылічаныя вагі сьвіньні (пудоў).

| Губэрні: | 1891—1900 г | 1909—1913 г |
|---|---|---|
| Віленшчына . . . . | 4,7 | 2,4 |
| Віцебшчына . . . | 4,3 | 2,6 |
| Горадзеншчына . . . | 4,5 | 2,7 |
| Меншчына . . . . . | 5,4 | 2,5 |
| Магілеўшчына . . | 5,1 | 2,4 |
| Смаленшчына . . . | 4,0 | 2,6 |

Табліца не патрабуе тлумачэньня. У табл. № 42 показаны цэны на сала і мяса і вагі сьвіньней, якія я прыймаю для Беларусі.

Табл. 42.

| Губэрні: | Вага сьвіньні у 1900 і 1913 г. пудоў | Цана пуда сьвіньніны | | Цана пуда сала | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | 1891—1900 г. | 1913 | 1891—1900 г. | 1913 г. |
| Віленшчына . . . . | 5,4 | 3,87 | 7, 0 | 6,58 | 10,55 |
| Віцебшчына . . . | 5,4 | 3,44 | 6,65 | 6,25 | 10 55 |
| Горадзеншчына . . . | 7,0 | 4,45 | 7,60 | 6,93 | 10,65 |
| Меншчына . . . . . | 5,7 | 3,39 | 6,15 | 6,70 | 10,40 |
| Магілеўшчына . . . | 5,2 | 3,24 | 5,85 | 6,67 | 9,85 |
| Смаленшчына . . . | 5,6 | 3,62 | 5,65 | 6,66 | 9,15 |

Адносна сьвіньней, якіх што год забіваюць у ўсяго статку, А. Е. Ласіцкі дзеліць Эўр. Расію на тры паласы ў залежнасьці ад трох пакажчыкаў: інтэнсыўнасьці сьвінаводзтва, рыначнасьці і многалічнасці яго. У губэрнях з трымя моцна выяўленымі пакажчыкамі б'юць 60 проц. сьвіньней, з адным пакажчыкам—50 проц., у іншых—45 проц. Беларусь мае два пакажчыкі (інтэнсыўнасьць і многалічнасьць), таму лічым, што забіваецца 50 проц. усіх сьвіньней, або:

Табл. № 43.

Забіта сьвіньней (тыс. шт.).

| Губэрні: | 1900 г. | 1913 г. |
|---|---|---|
| Віленшчына . . . . | 207,9 | 298.6 |
| Віцебшчына . . . . | 172,2 | 227,2 |
| Горадзеншчына . . . | 132,6 | 240,6 |
| Меншчына . . . . . | 300,4 | 455,7 |
| Магілеўшчына . . | 236,9 | 440,5 |
| Смаленшчына . . . | 157,1 | 283,8 |
| Беларусь . . | 1.207,2 | 1.946,4 |

Лічыцца, што палова ўбойнае вагі ідзе на сала, а палова на мяса. Прыбытак будзе такі:

Табл. № 44.

Прыбытак ад сала і мяса (тыс. руб.).

| Губэрні: | Сала | | Мяса | | Разам | | 1913 г. па ст. цэнах |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1900 г | 1913 г. | 1900 г | 1913 г. | 1900 г. | 1913 г. | |
| Віленшчына . . . . . | 3.694,0 | 8.506,8 | 2.172,9 | 5.725,7 | 5.866,9 | 14 232,5 | 8.425,2 |
| Віцебшчына . . . . . | 2.906,7 | 6 470,6 | 1.600,2 | 4.079,4 | 4.506,9 | 10.550,0 | 6 004,9 |
| Горадзеншчына . . . . | 3.215,5 | 8.968 2 | 2.064,7 | 6.400,2 | 5.280,2 | 15 368,4 | 9.582,5 |
| Меншчына . . . . . . | 5.736,1 | 13,507,6 | 2.902,1 | 7.989,3 | 8.638,2 | 21.496,9 | 13.104,9 |
| Магілеўшчына . . . . . | 4.109,2 | 11.282,7 | 1.995,7 | 6.701,6 | 6 104,9 | 17.984,3 | 11.351,4 |
| Смаленшчына . . . . | 2.929,9 | 7.272,0 | 1.592,6 | 4.489,3 | 4.522,5 | 11.761,3 | 8.168,2 |
| Беларусь . | 22.591,4 | 56.007,9 | 12.328,2 | 35 385,5 | 34.919,6 | 91.393,4 | 56.637,1 |

З прыбытку ад мяса і сала сьвіньней трэба вылучыць страты на харчаваньне іх. Пракаповіч прыймае, што на 1 пуд сала траціцца 7 пудоў ячменю. Хоць гэта норма дужа высокая, што я паказаў ва ўступе, жаданьне мець параўнальныя вялічыні і тут прымушае яе прыняць.

Табл. № 45.

Страты на харчаваньне выяўляюцца ў такіх лічбах (тыс. руб.):

| Губэрні | 1900 г. | 1913 г. | 1913 г. па ст. цане |
|---|---|---|---|
| Віленшчыча . . . . . | 2.672,1 | 4.861,6 | 3.837,3 |
| Віцебшчына . . . . | 2.008,2 | 3.625,9 | 2.649,0 |
| Горадзеншчына . . . | 2.325,6 | 5.382,6 | 4.220,4 |
| Меншчына . . . . . | 3.829,9 | 7.300 4 | 5.810,2 |
| Магілеўшчына . . | 2.456,5 | 6.514,6 | 4.567,7 |
| Смаленшчына . . . | 1.940,5 | 4.966,4 | 3.504,8 |
| Беларусь . . | 15.232,8 | 32.651,5 | 24.589,4 |

**Шчэці** можна з кожнае забітае сьвіньні надзерці па 1¼ хунта (таксама няпэўныя лічбы), цана шчэці экспортная ў 1900 г. 1 р. 04 к. пуд., ў 1913 г. 1 р. 40 к.; значыцца, з аднае сьвіньні прыбытак на шчэці ў 1900 г.— 1 р. 30 к., ў 1913 г.—1 р. 75 к. Лічбы прыбытку ад усяе шчэці і ад сьвіньней, пасьля вылучэньня стратаў на корм, у табл. № 46:

Табл. № 46

| Губерні | Прыбытак ад шчэці | | | Увесь прыб. ад сьвіньней | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1900 г. | 1913 г. | 1913 г. па ст. ц. | 1900 г. | 1913 г. | 1913 г. па ст. ц. |
| Віленшчына . . . . . . | 270,3 | 522,6 | 388,2 | 3.465,1 | 9.893,5 | 3.976,1 |
| Віцебшчына. . . . . . . | 223,9 | 397,6 | 295,3 | 2.722,6 | 7.321,7 | 3.651,2 |
| Горадзеншчына . . . | 172,4 | 421,1 | 312,8 | 3.127,0 | 10.406,9 | 5.674,9 |
| Меншчына . . . . . . | 390,5 | 797,5 | 592,4 | 5.198,8 | 14.994,0 | 7.887,1 |
| Магілеўшчына . . . . . | 308,0 | 770,8 | 572,6 | 3.956,4 | 12.240,5 | 7.356,3 |
| Смаленшчына . . . | 204,3 | 496,6 | 368,9 | 2.786,3 | 7.291,5 | 5.032,3 |
| Беларусь . . | 1.569,4 | 3.406,2 | 2.530,2 | 21.256,2 | 62.148,1 | 33.577,9 |

Зараз можна пад'агуліць усе прыбыткі ад асобных галінаў жывёлагадоўлі. Гэта зроблена ў табл. № 47.

Табл. № 47.

Увесь прыбытак ад жывёл (тыс. рублёў).

| Губэрні: | 1900 г. | 1913 г. | 1913 г. па ст. ц |
|---|---|---|---|
| Віленшчына | 19.461,1 | 37 245,0 | 18 179,2 |
| Віцебшчына | 15.085,9 | 37.677,4 | 19.969,7 |
| Горадзеншчына | 17 248,9 | 39 693,2 | 22.184,8 |
| Меншчына | 21.787,6 | 40 281,7 | 23.762,9 |
| Магілеўшчына | 15.703,6 | 37.288,0 | 22 257,0 |
| Смаленшчына | 18.460,1 | 38 134,2 | 24.496,9 |
| Беларусь | 107.747,2 | 230 324,5 | 130.850,5 |

Узрост прыбытку, цэн і вытвару можна ўбачыць з табл. № 48.

Табл. № 48.

Вырасьлі на %.

| Губэрні: | Прыбытак | | | Цэны | | | Вытвар | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Усе жыв. | Малако | Свіньні | Усе жыв. | Малако | Свіньні | Усе жыв. | Малако | Свіньні |
| Віленшчына | 91,4 | 56,0 | 185,5 | 104,9 | 95,4 | 148,9 | — 6,6 | —20,2 | 14,7 |
| Віцебшчына | 149,7 | 99,8 | 168,9 | 88,7 | 79,3 | 100,5 | 32,4 | 11,1 | 34,1 |
| Горадзеншчына | 130,1 | 90,5 | 232,8 | 78,9 | 85,8 | 83,4 | 28,6 | 2,5 | 81,5 |
| Меншчына | 84,9 | 55,1 | 188,4 | 69,5 | 56,8 | 90,1 | 9,1 | — 1,0 | 51,7 |
| Магілеўшчына | 137,4 | 93,4 | 209,4 | 67,5 | 66,7 | 66,4 | 41,7 | 16,0 | 85,9 |
| Смаленшчына | 106,6 | 102,8 | 161,7 | 55,7 | 86,9 | 44,9 | 40,3 | 8,5 | 80,6 |
| Беларусь | 113,8 | 81,5 | 192,4 | 76,0 | 78,4 | 85,1 | 21,4 | 1,8 | 58,0 |
| Эўр. Расія | 108,0 | 85,0 | 202,0 | 64,0 | 46,4 | 88,4 | 27,0 | 2,7 | 60,0 |

Агульны прыбытак ад жывёл на Беларусі вырас трохі больш, чым у Эўр. Расіі, асабліва па губэрнях Віцебскай, Горадзенскай і Магілеўскай. Галоўныя-ж галіны нашага жывёлаводзтва—малочная гаспадарка і сьвіньні далі ўзрост меншы, чым у Расіі. Найбольшы ўзрост прыбытку ад малака далі ўсходнія беларускія губэрні: Смаленшчына (+102,8%), Віцебшчына (+99,8%) і Магілеўшчына (+93,4%). Супраўднае павялічэньне прыбытку з гэтага ўбачыць яшчэ ня можна, бо за гэты час моцна ўзьняліся цэны; на Беларусі ўзрост іх мацнейшы, чым у Расіі, як агульны, гэтак і па малаку; на заходзе Беларусі цэны ўзьняліся вышэй, чым на ўсходзе; асабліва высока ўгару пайшла цана на сьвіньней; яна на захадзе беларускім вырасла вышэй, чым цэны на ўсе жывёлаводзтва, на ўсходзе—наадварот. Вытвар беларускае жывёлаводнае гаспадаркі трохү меншы, чым у Расіі, а малака дык і зусім нікчэмны, параўнальна з Расіяй; па ўсіх галінах усходнія губэрні—Смаленшчына, Магілеўшчына, Віцебшчына ўзьніма-

юць вытвар вышэй заходніх, апрача Горадзешчыны па прыбытку ад сьвіньней.

Як-жа складаецца з асобных галін беларуская жывёлагадоўля, у як бок ідуць зьмены яе складу? Адказ даюць табліцы №№ 49 і 50.

Табл. № 49

Склад прыбытку ад жывёлаводзтва ў 1900 г.

| Губэрні | Малако | Сьвіньні | Гавядзіна | Цяляціна | Скуры | 3, 4, 5 разам | Авечкі | Коні |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| Віленшчына . | 51,7 | 17,8 | 9,6 | 5,5 | 4,6 | 19,7 | 9,5 | 1,3 |
| Віцебшчына . | 51,7 | 18,0 | 8,8 | 3,9 | 4,5 | 17,2 | 12,5 | 0,6 |
| Горадзеншчына | 50,7 | 18,1 | 10,0 | 4,5 | 3,8 | 18,3 | 11,6 | 1,3 |
| Меншчына . . | 43,3 | 23,9 | 10,6 | 4,7 | 5,9 | 21,2 | 11,0 | 0,6 |
| Магілеўшчына. | 45,1 | 25,2 | 8,7 | 4,4 | 5,0 | 18,1 | 11,4 | 0,2 |
| Смаленшчына. | 51,4 | 15,1 | 9,9 | 4,4 | 3,4 | 17,7 | 15,8 | — |
| Беларусь . . | 48,8 | 19,7 | 9,7 | 4,6 | 4,6 | 18,9 | 11,9 | 0,7 |
| Эўр. Расія . | 48,9 | 11,3 | 15,6 | 3,6 | 5,2 | 24,4 | 14,1 | 1,3 |

Табл. № 50.

Склад прыбытку ад жывёлагадоўлі ў 1913 г.

| Губэрні | Малако | Сьвіньні | Гавядзіна | Цяляціна | Скуры | 3+4+5 | Авечкі | Коні |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| Віленшчына . . | 42,1 | 26,6 | 13,9 | 7,9 | 3,0 | 24,8 | 5,0 | 1,5 |
| Віцебшчына . . | 41,3 | 19,4 | 16,1 | 7,2 | 3,7 | 27,0 | 12,3 | — |
| Горадзеншчына | 41,8 | 26,2 | 14,4 | 6,5 | 2,9 | 23,8 | 6,8 | 1,4 |
| Меншчына . | 36,3 | 37,2 | 10,0 | 4,4 | 2,8 | 17,2 | 8,7 | 0,6 |
| Магілеўшчына. | 36,9 | 32,8 | 11,7 | 5,9 | 3,2 | 20,8 | 9,3 | 0,2 |
| Смаленшчына. | 50,4 | 19,1 | 8,7 | 3,9 | 2,1 | 14,7 | 15,3 | 0,5 |
| Беларусь . . | 41,5 | 27,0 | 12,4 | 5,9 | 3,0 | 21,3 | 9,5 | 0,7 |
| Эўр. Расія . | 43,6 | 16,4 | 15,8 | 3,7 | 4,4 | 23,9 | 14,9 | 1,2 |

У 1900 г. малочная гаспадарка займала больш паловы ў прыбытку ад жывёлагадоўлі такіх губэрняў: Віленшчыны, Горадзеншчыны, Віцебшчыны і Смаленшчыны; у Меншчыне і Магілеўшчыне яна мела значэньне меншае (43,3% і 45,1%). Агулам па Беларусі роля малака была такая-ж, як і ва ўсёй Эўр. Расіі (48,8%). У 1913 г. доля малака ў прыбытку як Беларусі ў параўнаваньні з Расіяй, так і паасобных беларус. губэрняў, даволі значна зьменшылася (за выключэньнем Смаленшчыны), пры гэтым у Меншчыне і Магілеўшчыне яна засталася найменшай (ужо толькі 36,3% і 36,9%). Хоць усе прынятыя нормы ўдояў ня маюць пэўнасьці, усё-ж яны былі больш перавялічаны, чым паменшаны, а таму факт адноснага зьніжэньня ролі малака ў прыбытку ад жывёлагадоўлі Беларусі, трэба лічыць праўдзівым (абсолютна малако ўзрастае). Інтэнсіўная малочная гаспадарка—гэта толькі даволі далёкая наша будучыня. Мы будзем падбліжацца да яе разам з узростам асяродкаў прамысловага і гарадзкога жыцьця.

Малатранспартабельнае[1]) малако ня можа разьлічаць на далекія рынкі. Малочныя-ж прадукты Беларусі, перш-наперш масла, ня змогуць вытрымаць канкурэнцыі такіх раёнаў з недарагім маслам, як Сыбір і Паўночны Край Расіі. Аб гэтым даўно ўжо пісаў праф. А. Скварцоў[2]): «Разьвіваць жывёлагадоўлю ім (краінам з інтэнсіўным паляводзтвам з густым насельніцтвам, якія павінны завадзіць інтэнсіўную гадоўлю жывёл. Г. Г.) перашкаджае канкурэнцыя краін дзікае жывёлагадоўлі. У такім стане апынуліся краіны Цантровай і Заходняй Расіі адносна такіх краёў, як Сыбір, які дае вялізны лік масла і гэтым затрымоўвае разьвіцьцё малочнае гаспадаркі ў цантровых і заходніх нечарназёмных краінах. Тыя-ж раёны адчуваюць падобны ўціск адносна дастаўкі мясное (кормнае) скаціны на цантровыя рынкі, пад уплывам такіх краін, як кіргізкія, калмыцкія й інш. стэпы».

Толькі малочныя прадукты, меншттранспартабельныя[3]), для якіх канкурэнцыя далёкіх раёнаў не зьяўляецца пагрозай, бо страты на перавозку зробяць гэту канкурэнцыю немагчымай,—толькі гэтыя прадукты—сыр, твораг, сьмятана—маюць будучыню на Беларусі ў блізкія гады. І яны ўжо пачынаюць мець пераважную ролю ў экспорце Беларусі, шыбкасьць узросту іх вывазу большая, чым масла:

Табл. № 51.

Чысты прывоз (—), ці вываз (+) масла і малоч. прадуктаў (тыс. пуд.).

| Губэрні: | Масла | | | | | Малоч. прадукты | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1902 г. | 1903 г. | 1909 г | 1910 г. | 1911 г. | 1902 г | 1903 г. | 1909 г | 1910 г. | 1911 г |
| Віленшчына . . . | — 11 | — 14 | — 32 | — 29 | — 19 | + 2 | — 6 | — 3 | — 2 | + 2 |
| Віцебшчына . . . | + 30 | + 34 | + 46 | + 43 | + 55 | + 1 | + 4 | + 25 | + 27 | + 36 |
| Горадзеншчына . | + 22 | + 26 | + 18 | + 21 | + 33 | + 50 | + 51 | + 37 | + 31 | + 53 |
| Меншчына . . . | + 34 | + 26 | + 41 | + 28 | + 28 | + 28 | + 38 | + 28 | + 55 | + 74 |
| Магілеўшчына . . | + 14 | + 10 | + 15 | + 22 | + 24 | + 7 | + 8 | + 12 | + 16 | — 3 |
| Смаленшчына . . | + 18 | + 20 | + 19 | + 32 | + 7 | + 83 | + 78 | + 77 | +105 | +126 |
| Беларусь . | +107 | +102 | +107 | +117 | +128 | +171 | +173 | +176 | +232 | +288 |

З табл. № 51 відаць вельмі павольны ўзрост чыстага вывазу масла, тады як вываз малочных прадуктаў, галоўным чынам сыру, расьце шыбчэй і няўхільна з году у год. Кошт чыстага вывазу масла ў 1911 г. я падлічыў у 2.268.2 тысячы рублёў, а сыру й інш. на 2.773.4 тыс. руб.—сыр ужо мае перавагу.

Сьвіньні ў 1900 г. мелі для прыбытку Беларусі большае значэньне, чым для Расіі (19,7% супроць 11,3%), і к 1913 г. значэньне гэта яшчэ больш павялічылася (27,0% супроць 16,4%). Роля сьвіньней значна магла павялічыцца для 1913 г. ужо адным тым, што лік сьвіньней узяты па 1916 году[4]), калі палічаны былі і дробныя свіньні. Табл. № 52 паказвае % дарослых сьвіньней па перапісу 1916 г. і палову парасят, адносіны якіх да ўсяго ліку забітых сьвіньней (які прынят для вылічэньня), пакажуць

[1]) Н. П. Макаров. «Рыночное молочное хозяйство» II 1917.—Грунтуючыся на тарыфе 1909 г. і маскоўскіх цэнах 1909—13 г.г., пабудаваў табліцу, як акупляецца 1 пуд малака рознымі малоч. прадуктамі на розных адлегласьцях ад рынку: на 1500 верст 1 п. малака ў сьвежым відзе дае 74 кап., сьметанаю 88 к., творагом 72 к., сырам 77 к. і маслам 71 к. Найвыгадней сьметана і сыр, а таму, што сьметана псуецца праз 3 дні, застаецца адзін сыр.

[2]) Проф. А. Скворцов. „Основы экономики земледелия". СПБ. 1914 г. Стар. 197. Курсіў мой. Г. Г.

[3]) Н. Макараў, стар. 21, і ранейшая ўвага аб яго табліцы эканом. і натуральнай транспартабельнасьці; 1500 верст—сярэдняя адлегласьць ад Беларусі Эўрап. рынкаў.

[4]) Для Вілен. і Горад. па 1913 г. с % павяліч. ад 1913 г. до 1916 г. у суседніх губ.

максімальную мерку памылкі. Сапраўдная памылка, пэўна-ж, меншая. Пакідаю вылічэньне без паправак, бо йначай параўнаньне з Расіяй будзе немагчыма.

Табл. № 52.

| ГУБЭРНІ | Лік заб. сьвін. | 1/2 мал. і пар. 16 г. | % іх да заб. | % даросл. сьвін. |
|---|---|---|---|---|
| Віленшчына . . . . | — | — | — | 55,7 |
| Віцебшчына . . . | 227,2 | 99.382 | 43.7 | 56,3 |
| Менпчына . . . . . | 455,7 | 190.046 | 41,7 | 58,3 |
| Магілеўшчына . . | 440,5 | 183.297 | 41,6 | 58,4 |
| Смаленшчына . . . | 283,8 | 150.331 | 53,0 | 47,0 |

Процант гавядзіны ў прыбытку за 1900 г. для Беларусі ў паўтары разы меншы, чым для Эўр. Расіі, у 1913 г. ён таксама меншы, але ўжо ў $1^1/_4$ раза. Ці адбіваюць гэтыя лічбы рэальны жыцьцёвы працэс? Лічу, што не, і вось чаму. Для 1913 г. Пракаповіч зьменшыў прыбытак ад мяса Эўр. Расіі; у 1900 г. ён прыняў, што сяляне спажываюць 9 хунтаў гавядзіны ў год, а гарадзкія жыхары 156.7 хунтаў у год на чалавека, а разам усё насельніцтва:

| | |
|---|---|
| У гарадох . . . . . . . . . . . . | 47.203 тыс. пудоў |
| У не-гарадох . . . . . . . | 18.314 » » |
| Усяго . . . . . . | 65.517 тыс. пудоў |

Пабачыўшы, што гэта лічба вялікая, ён іншым спосабам вылічыў спажываньне мяса ў 50 міл. пудоў, значыцца на не-гарадзкую долю засталося толькі 2.800 тыс. пудоў. Для 1913 г. гарадзкое спажываньне аблічана ў 46.900 тыс. пудоў мяса, а сельскае толькі ў 8 млн. пудоў, або 3 хунта на чалавека, разам 54.900.000 пудоў, або толькі на 4,9 млн. пудоў больш, чым у 1900 г., або на 9,8%; на Беларусі-ж узрост вытвору+40,5%, а прыбытку (бяз зьмены цэн) на 174,8%, тады як у Расіі толькі на 110,8%. Значыцца, па Пракаповічу сельскае жыхарства нібы-та павялічыла спажываньне з 2,8 млн. пудоў да 8 млн. пудоў, а гарадзкое нават зьменшыла з 47,2 млн. пудоў да 46,9 млн. пудоў. Факт немагчымы. Прыбытак ад мяса ў 1913 г. у «Опыте» бязумоўна зьменшаны.

Ува ўсякім выпадку з табл. № 50 і 51 відаць, што мяса быдла для Беларусі мае не вялікае значэньне, параўнальна з Расіяй.

Цяляціна—наадварот. Гэта і зразумела (гл. вылічэньне прыбытку цяляціны). Чым далей на захад, тым большае значэньне цяляціна (у 1900 г.) набывае. Авечкі, як і трэба было чакаць, на Беларусі маюць значна меншую ролю, чым у Расіі, і роля іх памяншаецца ў кірунку павялічэньня інтэнсіўнасьці (на захад). Каб больш упэўніць усе выказаныя ўвагі, падаю табл. № 53, у якой паказан склад прыбытку ад жывёлагадоўлі ў 1913 г., пры ацэнцы вытвару па старых цэнах:

Табл. № 53.

| Губэрні | Малако | Сьвіньні | Гавядзіна | Цяляціна | Скуры | 3+4+5 | Авечкі | Коні |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| Віленшчына . | 44,2 | 21,9 | 13,1 | 7,5 | 4,9 | 25,5 | 6,4 | 2,0 |
| Віцебшчына . | 43,4 | 18,3 | 12,9 | 5,8 | 5,7 | 24,4 | 13,9 | -- |
| Горадзеншчына | 40,5 | 25,6 | 14,1 | 6,3 | 4,1 | 24,5 | 8,0 | 1,4 |
| Меншчына . | 39,4 | 32,9 | 9,1 | 4,0 | 3,8 | 16,9 | 10,1 | 0,6 |
| Магілеўшчына . | 37,2 | 33,0 | 10,1 | 5,1 | 4,3 | 19,5 | 10,1 | 0,2 |
| Смаленшчына . | 42,0 | 20,5 | 8,8 | 8,6 | 2,7 | 20,1 | 16,9 | 0,5 |
| Беларусь | 40,8 | 25,7 | 11,2 | 6,2 | 4,2 | 21,6 | 11,1 | 0,8 |
| Эўр. Расія | 48,9 | 14,3 | 13,6 | 3,1 | 4,3 | 21,0 | 14,4 | 1,4 |

Да прыбытку ад жывёлагадоўлі трэба было-б дадаць прыбытак ад птушак. Пракаповіч яго зусім выкідае, бо лічыць, што прыбытак ад птушак і яек пэўна меншы, чым страты на іх. Я не знайшоў у літаратуры сталых вылічэньняў прыбыткоўнасьці птушак. Статыстыкі іх да 1917 г. ніякай ня было. Таму падаю толькі кавалачкі адшуканых ведаў. Н. А. Крукаў[1]) лічыць агульны вытвор ад хатніх птушак і іх прадуктаў на 25 млн. рублёў у межа „Беларуска-Літоўскага" раёну, з вывазам за кардон на 8 міл. рублёў. Па маіх падлічэньнях вывезена з 6 беларускіх губэрняў у 1911 г.:

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| яек | наогул на | 1.040,8 тыс. р., | а з іх у Зах. Эўр. на | 1.009,8 тыс. р. |
| бітых птушак | » | 6,4 » » | » » » » » » | 6,4 » » |
| жывых | » | » 11.260,7 » » | » » » » » » | » 7.447,2 » » |
| А разам | на | 12.307,0 тыс. р., | а з іх закардон на | 8.453,4 тыс. р. |

Уся таварная частка прыбытку ад жывёлагадоўлі Беларусі роўна, як я пакажу пазьней, 52.742,1 млн. рублёў, а прыбытку ад усяе сел. гаспадаркі—130.107, 1 тыс. рублёў; між тым адна продаж птушак і яек заграніцу дае Беларусі 12.307,9 тыс. рублёў, а сюды трэба дадаць ня менш, як столькі ж—продаж на сваім рынку; значыцца, гадоўля птушак дае ня менш, як палову усяго грашовага прыбытку ад жывёлагадоўлі, і ня менш 1/5—1/6 часткі прыбытку ад усяе сел.-гаспадаркі. Для беларускага селяніна прыбытак ад птушак арыгінальная форма дробнага крэдыту, ўсё роўна як продаж малака для падмаскоўнага селяніна. Таму той факт, што дзеля магчымасьці параўнаньня, я прыбытак ад птушак ня прыймаю пад увагу (як тое зрабіў і аўтар «Опыта»), не павінен сьведчыць, нібы я ня бачу ролі птушынага прыбытку ў грашовасьці сялянскае гаспадаркі. Але не магу згодзіцца з аўтарамі, якія лічуць гадоўлю птушак ледзьві не галоўнай падставай гаспадаркі. Напр., Н. М. Сямёнаў[2]) «Чым кажа ён замяніць насельніцтву заробкі ў лесе, якія ўвесь час скарачаюцца? Чым замяніць нявыгадную для сельскіх гаспадароў перагонку бульбы ў сьпірт? Куды пакіраваць працу земляроба»? Гадоўля птушак усё заменіць. І пайшлі звычайныя спасылкі на ваду, на клімат, на глебы. «Палесьсе па кліматычных і глебавых умовах зьяўляецца самаю прыгоднаю мясцовасьцю, каб займацца птушніцтвам і жывелагадоўляй»... Затым некалькі слоў аб гандлёвых умовах і нават такі доказ, што «на Палесьсі маецца яшчэ даволі лесу, каб будаваць будынкі (для птушак—*Г. Г.*), а таксама гатаваць скрынкі для перавозкі птушак і яек»... і г. д.—Я. Палфёраў[3]) не залічае Беларусь у раёны прамысловага птушніцтва.

**Іншыя галіны сел. гаспадаркі.** Сена і салома. Сюды залічаецца толькі прыбытак ад таго сена і саломы, якое сяляне прадалі ў гароды і ў войска. Колькі было гарадзкіх і вайсковых коняў, нам ужо вядома. Спажываньне на 1 каня бярэцца па «табелю фуражного довольствия»—на

[1]) Н. А. Крюков—«Хранение продуктов птицеводства и торговля ими».
[2]) Н М. Семенов—«Птицеводство в Полесье». Мозырь. 1911 г.
[3]) «Рус. промыс. птицеводство в предстоящем пересмотре торг. договоров» II 1916 г.

год 90 пудоў сена і 36 пудоў саломы. Цэны з «Стат. Временник № 3. 1888 г.», з павялічэньнем к 1913 г. па росту цаны аўса. Вынікі ў табл. № 54.

Табл. № 54.

Прыбытак ад сена і саломы (тыс. руб.).

| Губэрні | Лік гар. і вайск. коняй | | Цана сена кат. | | Цана саломы | | Прыбытак | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1900 г. | 1913 г. | 1900 г. | 1913 г. | 1900 г. | 1913 г. | 1900 г. | 1913 г. | 1913 г. па ст. ц. |
| Віленшчына . . | 7.868 | 8.183 | 38 | 47 | 26 | 32 | 350,9 | 450,9 | 365,0 |
| Віцебшчына . . | 7.842 | 6 695 | 36 | 48 | 21 | 28 | 320,0 | 364,2 | 273,2 |
| Горадзеншчына | 9.674 | 12.094 | 43 | 51 | 23 | 27 | 463,4 | 685,7 | 579,3 |
| Меншчына . . | 11.658 | 10 311 | 31 | 41 | 15 | 20 | 395,2 | 463,0 | 349,5 |
| Магілеўшчына | 5.916 | 7 044 | 30 | 40 | 16 | 21 | 197,6 | 312,8 | 235,3 |
| Смаленшчына | 5.679 | 4.341 | 28 | 39 | 17 | 24 | 181,7 | 194,0 | 138,9 |
| Беларусь . . | 48.637 | 48.668 | — | — | — | — | 1.908,8 | 2.470,6 | 1.941,2 |

**Пчолы.** Матар'ял для вылічэньня прыбытку ад пчол таксама не даволі пэўны. Для 1900 г.—гэта твор А. Чэфранава[1]), для 1913 г. «Сборник» Мін. Земляробства з лічбамі за 1910 г. Аб „Беларуска-Літоўскім“ раёне А. Чафранаў кажа так: «Пчалярства на Літве (разумеецца Беларусь—Літва —*Г. Г.*) у часы сівое старадаўшчыны было адным з самых найпаважнейшых і прыбыткоўных промыслаў. І лясы гэтай стараны ў былыя часы гучэлі пчоламі. Ці гэта было таму, што клімат раней больш спрыяў пчолам, быў не такі суровы, як цяпер, ці таму, што прырода краю з дзікае ператварылася ў культурную»? Пэўна, апошняя думка больш праўдзівая.

Усе лічбы аб прыбытку ад пчол сабраны ў табл. № 55 (тыс. руб.):

Табл № 55

| Губэрні | 1900 г. | 1910 г. | 1919 г. па ст. ц. |
|---|---|---|---|
| Віленшчына . . . | 70,8 | 104,4 | 86,0 |
| Віцебшчына . . . | 89,2 | 134,8 | 109,6 |
| Горадзеншчына . | 53,1 | 77,2 | 64,5 |
| Меншчына . . . | 159,8 | 223,2 | 192,1 |
| Магілеўшчына . . | 184,5 | 266,3 | 211,7 |
| Смаленшчына . . | 132,6 | 240,0 | 190,0 |
| Беларусь . . | 690,0 | 1.045,8 | 853,9 |

За гэты час колькасьць вульлёў павялічылася з 307.878 да 333.361 шт., вульлі-калоды сваю долю зьменшылі вельмі мала—з 86% да 82,9%; найбольшае памяншэньне іх было ў заходніх беларускіх губэрнях: Віл.—з 80 да 68,1%, Гор.—з 92 да 61,0%; за імі ў Смален.—з 80 да 67,9%, Віц.—з 85 да 72%; Магілеўшчына ледзьві скранулася з 88 да 87%, а ў Меншчыне лік калод нават пабольшаў—з 92 да 96,3%. Збор з вульля мёду з 9,38 х. вырас на 12,4 хунты, а воску ад 1,91 х. да 2,1 х. Цана пуду воску засталася на месцы (18 р. 16 к.), а меду ўзьнялася з 5 р. 18 к. да 7 р. 04 к.

**Сад.** Вось што пішацца аб садох Беларусі ў «Очерке современного состояния плодоводства, огородничества»..., выд. Гал. Упр. Земляробства і Земляўпарадкаваньня ў 1914 г.: «Шырокага прамысловага значэньня раён яшчэ не набыў, дзеля таго, што «любительское» садоўніцтва да гэтага часу зьяўляецца тут пераважным, і прамысловы сартымэнт не даволі апра-

[1]) Русская пчелопромышленность к началу XX века. 1901 г.

цаваны». «У літоўскіх губэрнях» (значыцца, Віленшчыне, Горадзеншчыне і Ковеншчыне—*Г. Г.*) пладоўніцтва разьвілося даволі добра і забясьпечвае Ленінградскі рынак, перамагаючы з посьпехам канкурэнцыю Прыбалтыцкага раёну і Польшчы». Якасную характарыстыку садоўніцтва Беларускага, больш ці меньш поўную, яшчэ можна адшукаць у творах вучоных садаведаў, розных устаноў і г. д. Але колькасную пазьней 1887 году мы ня маем. Ды й якасная характарыстыка больш тэхнычная, адзінкавая. Аб вытвары-ж дзесяціны саду, аб вытвару розных гатункаў, аб прыбытку гуртавым і чыстым—ёсьць толькі няпоўныя, малыя лікам, неаднакавым спосабам сабраныя веды. Матар'ялы такіх грунтоўных досьледаў, як досьлед садоўніцтва Меншч. галоўнага інструктора садоўна-гародніцтва пры б. Д-це Земляробства Пашкевіча, гдзесь гібеюць у нетрах ЦСУ Беларусі і ня бачаць сьвету. Перапісам 1917 г. я не магу карыстацца, бо ён не захапіў усяе Беларусі.

Таму прыбытак ад садоўніцтва за 1900 г. і 1913 г. вылічаў я такім убочным спосабам. Пляц садоў і прыбытак з дзесяціны пляцу узяў за 1887—88 г. г.[1]). Вылічыўшы прыбытак ад садоў у 1888 г., падзяліў яго на лік насельніцтва ў тым жа годзе. Мяркуючы, што спажываньне на аднаго чалавека рэзка не магло ўхіліцца, па норме ўжытку 1888 году і па ліку ўсіх жыхароў у 1900 і 1913 г. г. — вызначыў прыблізны прыбытак і для гэтых гадоў. Для Расіі прыбытак вылічаецца таксама па спажываньню, а само спажываньне па бюджэтах... аднаго Старабельскага павету Харкаўскай губэрні. Такая пакуль што «статыстыка». Матар'ялы сабраны утабл. № 56:

Табл. № 56.

| Губэрні | Плошча садоў у 1887-88 г. | Прыб. з дзес. руб | Прыб. 87 г. у тыс. р. | На 1 чел. кап. | Прыб. 1900 г. | Прыб. 1913 г. ст. ц. | 1913 г. с пав. цаны |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Віленшчына . . | 6.440 | 110 | 708,4 | 53 | 881,8 | 1.100,2 | 1.643,7 |
| Віцебшчына . . . | 4.713 | 120 | 565,6 | 44 | 692,6 | 859,4 | 1.185,1 |
| Горадзеншчына . | 6 008 | 110 | 660,9 | 48 | 806,6 | 983,1 | 1.192,5 |
| Меншчына . . . | 5 666 | 104 | 589,3 | 34 | 775,6 | 1 032,2 | 1.083,8 |
| Магілеўшчына . . | 5.561 | 90 | 500,5 | 38 | 684,1 | 936,9 | 1.330,4 |
| Смаленшчына . . | 3.053 | 110 | 335,8 | 25 | 402,0 | 540,9 | 771,3 |
| Беларусь . . | 31 441 | — | 3.360,5 | 41 | 4.242,7 | 5.451,9 | 7.206,8 |

Павялічэньне цаны ўзята, як і ў гародніцтве, а павялічэньне цэн на прадукты гародніцтва прынята роўным павялічэньню цаны на бульбу. Ці ёсьць сувязь ва ўзросьце цэн на бульбу і на прадукты садоўніцтва—гэта трэба было-б давесьці. Але што-ж рабіць, калі на садовіну няма цэн хоць бы на некалькіх беларускіх рынках за некалькі гадоў. Аўтары кніжкі „Сельское хозяйство БССР и мероприятия по его восстановлению" падлічылі прыбытак ад садоўніцтва ў 1913 г. у трох губэрнях—Менскай, Магілеўскай і Віцебскай—на 4 мільёны рублёў, па маіх вылічэньнях лічба троху іншая—3.599,3 тыс. рублёў. З досьледаў Пашкевіча аб выкарыстаньні ураджаяў садоў з 623 панскіх гаспадарак—403, або 64,7 проц.—аддаюць сады ў арэнду. За арэнду паны бяруць па 150 рублёў з дзесяціны, сяляне, пэўна, менш. Калі лічыць, што плата за арэнду панскіх садоў прыблізна роўна прыбытку (у народным разуменьні) з дзесяціны сада, дык усіх садоў на Меншчыне к 1913 году павінна быць 7.225 дзесяцін.

**Гарод.** Той жа названы «Очерк соврем. состояния плодоводства, огородничества»... піша аб беларускіх гародах: «Гародніцтва на Беларусі паступова павялічваецца пры падбліжэньні да цантровых губэрняў; харак-

[1]) Обследование поземел. собственности 1887 - 88 г. — Положение садоводства в России. СПБ 1901.

тарныя рысы яго — слабое разьвіцьцё хатніх гародаў і дробнае прамысловае гародніцтва... каля гарадоў». Прыбытак вылічаецца таксама, як і ад садоў; прыбытак з дзесяціны палічан роўным прыбытку з дзес. бульбы.

Табл. № 57.

| Губэрні | Плошча гарод. у 1887 г. | Прыб. з дзес. | Прыб. у 87—88 г. | На 1 чел. | Прыбыт. 1900 г. | Прыбыт. 1913 г. | Прыбыт. 1913 г. па ст. ц. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Віленшчына . . . | 54.849 | 54,53 | 2.990,9 | 2,26 | 3 760,2 | 6.859,7 | 4.691,5 |
| Віцебшчына . . | 57.455 | 63,28 | 3.635,8 | 2,81 | 4.423,1 | 7.568.2 | 5.488,2 |
| Горадзеншчына . . . | 33.515 | 53,93 | 1 807,5 | 1,32 | 2.218,1 | 3 279,5 | 2.703,6 |
| Меншчына . . . . . | 57.739 | 68,56 | 3.258,6 | 2,27 | 5.178,0 | 7 238.0 | 6 891,3 |
| Магілеўшчына . . . | 69.561 | 63,46 | 4 414,3 | 3,34 | 6 012.7 | 11 693,8 | 8.235,1 |
| Смаленшчына . . . | 65.086 | 80,61 | 5 254,6 | 3,95 | 6.350,9 | 12 186,9 | 8.546,2 |
| Беларусь | 338.205 | (62,89) | 22 061,7 | 2 63 | 27.943,0 | 48 826,1 | 36.555,9 |

Колькі даюць прыбытку сена й салома, пчолы, сад і гарод разам— відаць з табл. № 58.

Табл. № 58.

Прыбытак ад іншых галін сел. гасп.

| Губэрні | 1900 г. | 1913 г. | 1913 г. па ц. 1900 г. |
|---|---|---|---|
| Віленшчына . . . . | 5.063,7 | 9.058,7 | 6.242,7 |
| Віцебшчына . . . | 5.524,9 | 9.252,2 | 6.730,4 |
| Горадзеншчына . . . | 3.541,2 | 5.234,9 | 4.330,5 |
| Меншчына . . . . . | 6.508,6 | 9.008,0 | 8.465,1 |
| Магілеўшчына . . . | 7.078,9 | 13.603,3 | 9.619,0 |
| Смаленшчына | 7.067,2 | 13.392,3 | 9.416,0 |
| Беларусь . . | 34.784,5 | 59.549,3 | 44.803,7 |

**Увесь прыбытак ад сел. гаспадаркі.** Цяпер можна зрабіць падлічэньне, колькі-ж прыбытку дае ўся сел. гаспадарка. Паказвае гэта табл. № 59.

Табл. № 59.

Прыбытак ад усёй сел. гасп.

| Губэрні | 1900 г. | 1913 г. | 1913 г. па ст. ц. |
|---|---|---|---|
| Віленшчына . . | 48.938,7 | 87.020,1 | 55.370,1 |
| Віцебшчына . . . | 44.043,0 | 82.315,3 | 52.700,4 |
| Горадзеншчына . . . | 46.155,8 | 84.765,3 | 58.894,3 |
| Меншчына . . . . | 62.961,3 | 109.988,7 | 81.588,3 |
| Магілеўшчына . . . | 46.956,5 | 97.362,9 | 64.524,3 |
| Смаленшчына . . . | 57.025,3 | 109.265,3 | 74.186,8 |
| Беларусь . | 306.080,6 | 570.717,6 | 387.264,2 |
| Эўр. Расія . | 2.985.067,0 | 5.630.227,5 | 3.995.036,2 |

З табл. № 60 відаць, як шыбка расьце прыбытак ад сел. гаспадаркі; цэны на яе прадукцыю і вытвар.

Табл. № 60.

| Узрост па °/₀°/₀ | Віл. | Віц. | Гор. | Менш. | Маг. | Смал. | Бел. | Э. Рас. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Прыбытку . . . . | 77,8 | 86,9 | 83,6 | 74,7 | 107,3 | 91,6 | 86 5 | 88,5 |
| Цэн . . . . . . . | 54,5 | 56,3 | 44,0 | 34,8 | 51,0 | 47,3 | 47,1 | 40,9 |
| Вытвору . . . . | 13,1 | 19,7 | 27,6 | 29,6 | 37,4 | 30,1 | 26,5 | 33,8 |

Прыбытак ад сел. гаспадаркі расьце шыбчэй ў Эўр. Расіі, чым на Беларусі; толькі дзьве нашы ўсходнія губэрні—Смаленшчына і Магілеўшчына выяўляюць такі-ж магутны ўзрост (+91,6°/₀ і +107,3°/₀ супроць расійскіх+88,5%). Прыбытак павялічыўся не праз павялічэньне вытворчасьці ў такой вялікай меры, а праз тое, што цэны за гэтыя 13 гадоў страшэнна пайшлі ўгару, і найбольш шыбка якраз у беларускіх губэрнях (47,1°/₀ супроць 40,9°/₀). Вытвар-жа на Беларусі (параўнальна з Расіяй) ўзьняўся дзеля таго менш, чым прыбытак. Заходнія беларускія губэрні слабей павялічваюць вытвар, чым усходнія (Віл.+13,1°/₀, Гор.+27,6°/₀ — супроць Магіл.+37,4°/₀, Смал.+30,1%).

У зьмене цэн якбы няма ніякай законаўпарадкаванасьці — Віцеб. і Магілеўшчына павялічваюць іх больш, чым ім трэба гэта рабіць, як губэрням усходнім—але тут прычынай можа быць нязвычайнае чугуначнае будаўніцтва за кругабег 1900—1913 г. у Віцебшчыне (з 500 вёрст чугунак да 1142 в.) і Магілеўшчыне (з 459 верст чугункі да 708 в.), дзякуючы чаму мясцовыя цэны і ўзьняліся ў іх так высака ў параўнаньні з Меншчынай (чугункі ў 1900 г.—1096 в., у 1912 г.—толькі 1138 в.) і Смаленшчынай (не пабудована ні аднае вярсты).

Вельмі добрым пабочным матар'ялам для меркаваньня аб тыпе сельскае гаспадаркі тае ці іншае краіны зьяўляецца склад прыбытку ад сел. гаспадаркі.

Склад яго ў беларускіх губэрнях можна ўбачыць з табл. № 61.

Табл. № 61.

Склад сел.-гасп. прыбытку: °/₀°/₀.

| Губэрні | 1900 г. | | | | 1913 г. | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Збожжа | Гандл.-тэхн. кул. | Жывелы | Сад, гарод, пчолы і інш. | Збожжа | Гандл.-тэхн. кул. | Жывелы | Сад, гарод, пчолы і інш. |
| Віленшчына . . | 34,5 | 15,4 | 39,8 | 10,3 | 30,8 | 16,0 | 42,8 | 10,4 |
| Віцебшчына . . | 33,7 | 19,5 | 34,3 | 12,5 | 26,7 | 16,3 | 45,8 | 11,2 |
| Горадзеншчына . | 38,8 | 16 1 | 37,4 | 7,7 | 31 5 | 15,4 | 46,9 | 6,2 |
| Меншчына . . . | 34,9 | 20.1 | 34,7 | 10,3 | 34,1 | 21,1 | 36.6 | 8,2 |
| Магілеўшчына . . | 31,7 | 19,8 | 33,4 | 15,1 | 27,6 | 20,1 | 38,3 | 14.0 |
| Смаленшчына . . | 34,2 | 21,1 | 32,3 | 12,4 | 25.9 | 27,0 | 34,8 | 12.3 |
| Беларусь . . | 34,6 | 18,8 | 35,2 | 11,4 | 29.5 | 19,7 | 40,4 | 10,4 |
| Эўр. Расія . | 48.9 | 12,9 | 27,9 | 10,3 | 47,9 | 13.0 | 30,7 | 8,4 |

Склад прыбытку 1913 г. з пералічэньнем на старыя цэны — у табл. № 62.

Табл. № 62.

| Губэрні | Збожжа | Гандл.-тэхн. кул. | Жывелы | Іншыя |
|---|---|---|---|---|
| Віленшчына . . . . | 38,3 | 17,5 | 32,9 | 11,3 |
| Віцебшчына . . . | 30,6 | 18,7 | 37,9 | 12,8 |
| Горадзеншчына . . . | 37,1 | 17,9 | 37,6 | 7,4 |
| Меншчына . . . . . | 35,4 | 25,1 | 29,1 | 10,4 |
| Магілеўшчына . . | 29,7 | 20,9 | 34,5 | 14,9 |
| Смаленшчына . . | 27,3 | 27,0 | 33,0 | 12,7 |
| Беларусь . | 32,9 | 21,8 | 33,8 | 11,5 |
| Эўр. Расія | 50,7 | 13,9 | 26,4 | 9,0 |

З параўнаньня складу прыбытку ад сел. гаспадаркі Беларусі Эўр. і Расіі сама выглядае думка, што Беларусь з боку сел.-гаспадарчага моцна адрозьніваецца ад Эўр. Расіі: збожжа на Беларусі, што далей, траціць сваю ролю,—у Расіі вытвар збожжа павялічваецца, даючы палову ўсяго сел.-гасп. прыбытку (на Беларусі толькі трацьціна); гандлёва-тэхн. расьліны па свайму значэньню у сел.-гасп. Расіі застаюцца на адным месцы (12,9%, 13,0%, 13,9)%),—на Беларусі значэньне іх расьце (18,8%, 19,7%, 21,8%), хоць і ня дужа значна; роля жывёлагадоўлі ў расійскай сел. гаспадарцы павялічваецца вельмі паступова (27,9%, 30,7),—у беларускай сел. гасп. хоць троху, але шыбчэй (35,2%, 40,4%), а галоўнае—адноснае значэньне жывёлагадоўлі на Беларусі большае (35,2% супроць 27,9%, потым 40,4% супроць 30,7% расійскіх); іншыя галіны—(гарод і сад галоўным чынам), для Беларусі, як краю больш інтэнсіўнага, маюць таксама большую ролю, чым для Расіі. Расія—гэта раён з пераважным вытварам збожжа, з залежнаю ад яго жывёлагадоўляю (экстэнсіўна-мяснога быдла і харчова-малочнага, або малочна-экстэнсіўна-дзікага), з нязначнай роляю прамыслова-тэхнічных культур і гандлёва-прамысловых галін (сад, гарод). Беларусь — край інтэнсіўнае сельскае гаспадаркі, з адноснай перавагай жывёлагадоўлі над іншымі галінамі (паасобку) з выдатнай роляю гандлёва-прамысловых расьлін, а паміж іх бульбы, са значным разьвіцьцём садоўніцтва і гародніцтва. Беларусь—край з залежнай роляю збожжа, якое даводзіцца толькі да харчовае нормы; край з інтэнсіўнымі формамі жывёлагадоўлі (сьвіньні, цяляты), пакуль што мясной; з харчоваю малочнаю гаспадаркаю, у якой ужо зьяўляюцца пакуль што дужа слабыя рыначныя ухілы (сыр).—Вядомы стары беларусазнаўца А. Уласаў троху памыляўся, калі казаў: «Беларуска-літоўскі край—пераважна землягробчы,—«землепашество»—ёсьць падстава дабрабыту краю»[1]). Памыляюцца і аўтары „Сельского хозяйства БССР“, якія лічуць, нібы „пакуль што асноўнаю галінаю сучаснае сел. гаспадаркі Беларусі зьяўляецца земляробства, арганізацыя жывёлагадоўлі дапасоўваецца да яго патрэбаў“[2]). Я застанаўлюся яшчэ на гэтым пытаньні пры разглядзе таварнасьці гаспадаркі.

Калі параўноўваць склад прыбытку паасобных беларускіх губэрняў, дык асноўныя вывады застануцца тымі-ж самымі, як і адносна ўсяе Бела-

[1]) «Стат.-эк. очерки областей, губерний и городов России», под ред. проф. Яснопольского, А. Власов. «Белоруссия и Литва», ст. 353. Киев 1913 „Беларусь і Літва“ А. Уласава

[2]) «Сел. хоз. БССР», стар. 22.

русі: жывёлагадоўля зьяўляецца ў 1913 г. пераважнай над усімі іншымі галінамі ўва ўсіх губэрнях, у 1900 г. яна ня была пераважнай толькі ў Смаленшчыне; у Горадзеншчыне і Меншчыне лічбы прыбыткаў яе і збожжа вельмі блізкі. Асабліва высокае значэньне мае жывёлагадоўля у Горадзеншчыне (46,9% ад усяго с.-г. прыбытку), Віцебшчыне (45,8%), Віленшчыне (42,8%), значыцца, на поўначы-заходзе. Гандлёвыя культуры найбольшае ролі дасягаюць, наадварот, на ўсходзе Беларусі (Смал. 27,0, Магіл. 20,1, Мен. 21,1), як у 1913 годзе, гэтак і ў 1900 г., і асабліва яскрава відаць гэта ў 1913 г. пры пералічэньні прыбытку на ст. цэны. Роля збожжа зьмяншаецца па ўсіх губэрнях, працэс зьмяншэньня асабліва хутка ідзе на ўсходзе Беларусі – у Смаленшчыне, Магілеўшчыне, Віцебшчыне: відаць, на заходзе палявая гаспадарка прыдбала больш сталыя формы. Ня вычэрпываючы з табліцаў усіх вывадаў,—на гэтым канчаю з прыбыткам сел. гаспадаркі [1]).

**Лес.** Што лес меў і мае вялікае эканамічнае значэньне для Беларусі, усім добра вядома. Але якая мера гэтага значэньня? Адказ можа даць пэўна вылічаны нацыянальны прыбытак ад лесу (а ня чысты лясны даход, які вылічаўся б. Лясным Дэпартамэнтам). Каб вылічыць прыбытак, трэба ведаць колькасьць усіх лясоў, якімі нацыя карыстаецца, колькасьць фактычна праданай лясной масы (з аднае дзесяціны і з ўсяго пляцу) і прадажную цану лясной масы на мясцовым рынку, бо ў нар. прыбытак ад лесу залічаецца і вартасьць людзкой працы па узгадаваньню, нагляду, эксплёатацыі лесу і перавозу яго на мясцовы рынак.

Ведамасьці аб колькасьці ўсіх лясоў можна лічыць здавальняючымі. Аб колькасьці эксплёатаваных скарбовых лясоў, аб ліку фактычна праданае з іх лясной масы ведамасьці ёсьць вельмі добрыя — гэта справаздачы Ляснога Дэпартамэнту. «Аб панскіх лясох няма нічога ў нашай статыстыцы», сказаў, ужо 50 гадоў таму мінула, Янсон [2]). Словы яго праўдзівы і для таго часу, за які я вылічаю лясны прыбытак. А вядома, што панскіх лясоў на Беларусі было 75.01 %, а скарбовых толькі 17.49 %, і вядома, што паны нішчылі лясы страшэнна. Меру зьніштажэньня панскіх лясоў цяжка выявіць нават і прыблізна. «На жаль, у нас нямя больш-менш пэўных ведаў, каб характарызаваць той ухіл да зьніштажэньня лесу ў паласе ля кардону, які быў у кругабег 1891—1912 г. г. у лясох панскага ўладаньня,—мы можам толькі адзначыць той бязумоўны факт, што лес старанна высякаўся. Гэты ухіл, да вядомай мяжы, адбіўся і на скарбовай лясной гаспадарцы»..[3]) На гэтай думцы і пабудована вылічэньне прыбытку ад лесу.

У табл. № 63 сабраны лічбы аб колькасьці скарбовых прыгодных лясоў за 1913 г. і ліку ў куб. сажнях фактычна праданае з іх лясное масы жывога лесу за той-жа год.

---

[1]) Падзел прыбытку ад сел. гаспадаркі—на прыбытак ад збожжа, гандлева-прамысловых расьлін, жывелы і іншых, я рабіў ня толькі дзеля мэтаў параўнаньня з Расіяй, але й таму, што традзіцыйны падзел на земляробства і жывёлагадоўлю, пры чым у земляробства залічаецца ўся палявая гаспадарка, сенажаці і нават садоўніцтва і гародніцтва, не адпавядае эканамічнай сутнасьці і ролі асобных галін сел. гасп. Калі-ж „земляробствам“ як і раней зваць куламесу з рознародных галін, то ўсе мае ўвагі аб А. Уласаве і „Сел хоз БССР“—трацяць моц, калі браць усю Беларусь, і захоўваюць яе пры развагах адносна Горадзеншчыны і Віцебшчыны (у 1913 г.)

[2]) «Сравнительная статистика», т. II, стар. II.

[3]) Г. Касперович «Лесное дело, лес. торговля и лесопромышленность в России в связи с пересм. торгов. договоров» II. 1916 г., ст. 51. Курсіў мой Г. Г.

Табл. № 63

| Губэрні | Прадана куб. саж. | Лік лесу дзес. | З 1 дзес. куб. саж. |
|---|---|---|---|
| Віленшчына | 126.225 | 259.804 | 0,4859 |
| Віцебшчына | 84.765 | 164.530 | 0,5152 |
| Горадзеншчына | 129.744 | 279.981 | 0 4634 |
| Меншчына | 238.587 | 478.032 | 0.4991 |
| Магілеўшчына | 71.873 | 107.297 | 0,6698 |
| Смаленшчына | 33.831 | 85.536 | 0.3954 |
| Беларусь | 685.025 | 1.375.180 | 0,4981 |

Цану 1 куб. саж. лесу Пракаповіч узяў з «Ежегодника Лес. Д-та» за 1913 г. тую, па якой лясныя ўстановы прадавалі лес, загатаваны гаспадарчым спосабам. Лічу такую цану вельмі ненадзейнай, бо выведзена яна, як сярэдняя па 13 губэрнях ад продажы толькі 60,4 тыс. куб. саж., а пашырана аж на 29.127,7 тыс. к. саж. Для Беларусі такія цэны ёсьць толькі па Горадзеншчыне – сярэднія ад продажу ўсяго 207 куб сажняў. Карыстацца імі, пэўна-ж, немагчыма. Таму я продажную рыначную цану для 1913 г. вылічыў, узяўшы асноўнай цаной расійскую і памнажаючы яе на адносіны да расійскай продажнай цаны фактычна праданага лесу такое-ж цаны ў беларускіх губэрнях. Продаж лесу ў 1900 г. для Расіі прынята такая-ж, як і ў 1913 годзе; тое самае зрабіў я адносна Беларусі. Узрост цэн па Віл. і Гор. +37,4%, па Мен. і Маг. +45,5, па Віц. і Смал. +31,8%. Вылічэньні прыбытку ў табл. № 64.

Табл. № 64.

Прыбытак ад лесу (тыс. руб.).

| Губэрні | Прадана куб. саж са ўсех лясоў | Цана к. с. кап. 1913 г. | Прыбытак | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1900 г. | 1913 г. | 1913 г. па ст. ц. |
| Віленшчына | 441.512 | 29,12 | 9.357,2 | 12.856,8 | 9.357,2 |
| Віцебшчына | 514.188 | 23 44 | 9.144,6 | 12.052,6 | 9.144,6 |
| Горадзеншчына | 343.043 | 37,42 | 9.342,6 | 12.836,7 | 9.342,6 |
| Меншчына | 1.489.320 | 25,72 | 26.326,7 | 38.305,3 | 26.326,7 |
| Магілеўшчына | 663.166 | 23,71 | 10.806 7 | 15 723,7 | 10.806,7 |
| Смаленшчына | 491.010 | 18,67 | 6.955,4 | 9.167,2 | 6.955,4 |
| Беларусь | 3.942.239 | 25,61 | 71.933,2 | 100.942,3 | 71.933,2 |

Паўстае пытаньне, ці блізкі так вылічаны прыбытак да супраўднага. Для адказу на яго вызначым лічбу проданага з Беларусі лесу іншым спосабам. В. І. Майер ў артыкуле „Распределение лесов Евр. России по районам и областям, установленным Госпланом“[1]) вылічыў нормы спажываньня для Беларусскага раёну: дроў 0,24 куб. саж. на гарадзкога жыхара і 0,12 на вясковага, будаўнічых матар'ялаў на чалавека 0,035 к. с. Калі ўзяць

[1]) «Труды Госплана», кн. II. М., 1913.

гэту норму і насельніцтва Беларусі за 1913 год (усяго 13.742,2 тыс. чал.; сел. 11.791,5 тыс., гарад. 1.950,7 тыс. чал.), прыняць пад увагу экспорт з Беларусі лясной масы ў 1913 г. 439.840 тыс. пудоў, або 1.293.650 куб. сажняў,—то баланс можна будзе выявіць так:

| | | |
|---|---|---|
| Спажываньне дроў . . . . | 1.883.148 | куб. саж. |
| „ буд. мат. . . | 481.000 | „ „ |
| Чысты вываз . . . . . . . . | 1.293.650 | „ „ |
| Разам . . . | 3.657.798 | куб. саж. |
| А выраб . . | 3.942.239 | „ „ |
| | + 284.441 | куб. саж. |

Розьніца, як бачым, невялікая. Калі браць нормы не Майера, а Н. А. Маркава [1])—0,141 міл. куб. саж. на 1 міл. абшару, то адно толькі спажываньне на месцы павінна забраць 4.117 тыс. куб. саж.; а па норме Сурожа—0,5 куб. саж. на чалавека—спажываньне Беларусі павінна быць аж на 6.871.1 тыс. куб. саж. Вось яшчэ адзін абразок поўнай нягоднасьці для вылічэньня прыбытку розных норм. Але нормы Маркава і Сурожа, відаць адразу, занадта грубыя. Выкарыстоўваць для вызначэньня ляснога прыбытку анкеты Асобнае Нарады па апалу [2]) немагчыма, бо яны захопліваюць толькі 4 бел. губэрні: Віт., Мен., Магіл. і Смал., і належаць па ўсіх лесавых матар'ялах толькі да скарбовых лясоў, а да прыватных—толькі па адных дровах.

**Рыба.** У розных апісальных творах аб Беларусі даволі часта выказваецца думка, што яе рэчкі і вазёры, яе ваднае багацьце, вельмі спрыяюць рыбнай гаспадарцы. Але фактычных ведаў аб нашай рыбнай гаспадарцы ў літаратуры няма — і ці выкарыстоўваюцца гэтыя спрыяючыя ўмовы для гаспадарчай дзейнасьці,—невядома. У справаздачы экспэдыцыі на Беларусь пад кіраўніцтвам проф. Зографа [3]) у 1904 г. можна прачытаць: «Вялікія абшары Беларуска-Літоўскага краю ўкрыты тысячамі вазёр, сярод якіх ёсьць такія, як воз. Нароч, якія па вялічыні сваёй толькі праз непаразуменьне не апісаны ў геаграфіі... Вазёры маюць вялікае прамысловае значэньне і могуць мець яшчэ больш значнае. У багатай расійскай і польскай літаратуры, аб паўначы—заходнім [4]) краі мы знайшлі толькі невялічкія ўвагі аб досьледзе вады Літвы і Беларусі... Дасьледчыкі (экспедыцыі 1904 г. Г. Г.) чулі сябе, як выплатчыкі доўгу перад старанаю, якою ўладалі два культурных народы—расійцы і палякі—і аб вывучэньні якой не паклапаціліся ні польскія, ні расійскія прадстаўнікі навукі... Усяго было дасьледвана 95 вазёр. Справаздачы паказваюць поўную неўпарадкаванасьць вадзяное гаспадаркі ў краі, чаму дапамагаюць і людзі і адсутнасьць законаў і абмінаньне тых законаў, якія ёсьць, і часткова сама прырода». Але і ў справаздачы Зографа нічога няма аб эканамічным стане і выніках рыбнае гаспадаркі. Нічога няма і ў творах Станевіча, Б. К. Гіндуэ і інш. В. А. Кеўдзін [5]) якраз у час перад вайною вызначыў увесь вытвар «паўночна-заходняга краю бяз Фінляндыі—(губ. Алонец., б. Петраград., Ноўгарод., Пскоўск., Цьвер., Віцебск., Вілен., Ковен., Эстл., Ліфл. і Курляд.») у 5 міл. пуд.

[1]) «Жел. дор. транспорт лес. материалов для экспорта заграницу». СПБ. 1914 г., стар. 81.
[2]) «Известия Упр. Деп. Особого Совещания по топливу» № 4. 1917—18 г.
[3]) «Рыболовство и рыбоводство в С-З. крае».
[4]) Беларусь—па тэрміналёгіі аўтара. Курсіў мой Г. Г.
[5]) Современное рыболовство России М. 1915.

Сюды залічана й рыба, якая ловіцца ў такіх вазёрах, як Анескае, Ладаскае, Чудзкае, Ільменскае, Белае і г. д. Значыцца, на абедзьве беларускія губэрні—добра, калі выпадае з 5 міл. хоць 300 тыс. пудоў. Кеўдзін піша, што вельмі значная частка рыбы, якая ловіцца ў рэчках і вазёрах, нідзе не рэгіструецца. У такім разе і справаздачы губэрнатараў трэба лічыць зусім нягоднымі крыніцамі. Але іншых, хоць бы якіх-небудзь, няма. Таму выкарыстоўваю іх. Прыбытак па Горадзеншчыне і Віленшчыны прыймаем за палову Меншчыны, Магілеўшыны—роўным прыбытку Смаленшчыны. Лічбы губэрнатарскіх справаздач, як зьменшаныя, павялічваем удвая. Вылічэньні сабраны ў табл. № 87. Пэўнасьць лічбаў па Смаленшчыне відаць з таго, што ў 1925 г. Смаленскае ГубЗУ зарандавала 6254 дзес. вазёр за 5000 рублёў, што складае прыблізна 10 ад усяго прыбытку ад рыбы, які ровен, значыцца 50.000 р.; па справаздачы губэрнатара прыбытак лічыўся у 46,7 тыс. рублёў.

Табл. № 65.

| Губэрні | 1900 г. | 1913 г. | 1913 г па ст. ц |
|---|---|---|---|
| Віленшчына . . . | 57,6 | 164,7 | 57,6 |
| Віцебшчына . | 339,9 | 679,8 | 339,6 |
| Горадзеншчына . | 57,6 | 164 7 | 57,6 |
| Меншчына . . . | 115,1 | 329,3 | 115,1 |
| Магілеўшчына . | 100 0 | 93,3 | 100,0 |
| Смаленшчына . | 100,0 | 93,3 | 100,0 |
| Беларусь . . | 770,2 | 1525,1 | 770,2 |

Па губэрнях: Віленшчыне, Гарадзеншчыне і Магілеўшчыне прыбытак, як бачым, толькі прыблізны, вылічаны з невялікаю пэўнасьцю.

**Прамысловасьць.** Уся прамысловасьць падзелена ў «Опыте» на такія галіны: 1) нетракапальная, 2) фабрычна-заводзкая, або тая, што акцызам не абкладалася, 3) прамысловасьць, якая акцызам абкладалася, 4) рамесьніцкая і 5) саматужная, хатняя.

Такі падзел грунтуецца больш за ўсё на становішчы, на такім жа падзеле, офіцыяльных матар'ялаў і справаздач па прамысловасьці. Навуковую-ж клясыфікацыю такі падзел не здавальняе. Таму я падаю ўсе лічбы аб прыбытку дэталічна па асобных галінах, каб жадаючыя маглі пазьней ствараць з іх, згодна сваіх мэтаў, розныя комбінацыі.

Веды аб некаторых галінах прамысловасьці ў параўнаньні з сел. гаспадаркай больш пэўныя.

Нетракапальная прамысловасьць. Непасрэдных ведаў аб гуртавой выручцы гэтае прамысловасьці і аб гаспадарчых стратах у справаздачах горных установ няма. З «Ежегодника М. Финансов» за 1903 г. даведваемся, колькі ў 1901 г. было з залезнае руды выплаўлена чугуна і залеза ў Віленшчыне, колькі здабыта фасфарытаў на Смаленшчыне; ацэньваем вытвор Вілен. губ. на 177,1 тыс. руб., Смален. на 8,3 тыс. руб. Да нетракапальнай прамысловасьці трэба яшчэ далучыць выраб тых асоб, якія здабываюць вапну, алебастар, торф і г. д. Аб ліку іх даведваемся з перапісу 1897 г. На 1913 год павялічваем іх лік згодна агульнаму павялічэньню насельніцтва. Здабычу залеза і чугуна на 1913 г. па Віленшчыне ацэньваем на 52,9 тыс. руб., фасфарытаў на Смаленшчыне на 5,0 тыс. руб. Вылічэньні сабраны ў табл. № 66.

Табл. № 66.

| Губерні | Лік раб у нетр. пр. | | Іх выраб [1]) | | Здоб. і перапр. руд. | | Увесь прыбытак | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1900 г | 1913 г. | 1900 г. | 1913 г. | 1900 г. | 1913 г. | 1900 г. | 1913 г. | 1913 г. па ст. ц. |
| Віленшчына | 109 | 137 | 48,2 | 87,5 | 177,1 | 52,9 | 225,3 | 140,4 | 75,7 |
| Віцебшчына | 53 | 67 | 15,9 | 41,2 | — | — | 15,9 | 41,2 | 35,5 |
| Горадзеншч. | 46 | 57 | 16,4 | 31,5 | — | — | 16,4 | 31,5 | 28,0 |
| Меншчына | 83 | 115 | 29,0 | 65,5 | — | — | 29,0 | 65,5 | 59,6 |
| Магілеўшчына | 85 | 129 | 35,4 | 81,2 | — | — | 35,4 | 81,2 | 70,9 |
| Смаленшчына | 51 | 63 | 18,1 | 44,7 | 8,3 | 5,0 | 26,4 | 49,7 | 39,3 |
| Беларусь | 427 | 568 | 163,0 | 351,6 | 185,4 | 57,9 | 348,4 | 409,5 | 309,0 |

Фабрычная прамысловасьць. Найлепшай крыніцай ведамасьцяй аб гэтай прамысловасьці зьяўляюцца выданые М-вам Фін. пад рэд В. Е. Варзара „Статистические сведения о фабриках и заводах по производствам, необложенным акцизом за 1900 г.“, затым выданыя пад рэд. Варзара М-вам Гандлю і Прам. „Статистические сведения по обрабатывающей фаб.-зав. пром. Р. И. за 1908 г.“ і нарэшце выданьне таго ж М-ва «Фаб.-зав. промышленность Евр. России в 1910—1912 г.» (11 выпускаў і 12-ты – пад‘агуленьне). З гуртовага вырабу ў 1900 годзе выкідаю страты на асьвятленьне, апал, рамонт будынкаў і сырызну; такім чынам маем чысты вытвор; знаходзім % яго да вытвору гуртовага. Вылічэньні чыстага вытвору і яго адносін да гуртовага робім і для 1908 году. У 1912 годзе ў статыст. матар‘ялах ёсьць толькі лічбы гуртовага вырабу; таму чысты вытвор вызначаем па % яго ў 1908 годзе. Потым дзелім чысты вытвор прамысловасьці 1900 г. і 1912 г. на лік рабочых за гэтыя гады, чым азначаем чыстую вытворчасьць аднаго рабочага. А таму, што ў названых выданьнях палічаны ня ўсе рабочыя, бярэм іх колькасьць па „Сводному отчету фабричных инспекторов“ за 1900 г. і 1913 г. (усе рабочыя мінус рабочыя, якія працуюць у галінах, што абкладаюцца акцызам), і множаньнем чыстага вытвору 1 раб. на лік усіх рабочых вызначаем чысты вытвор усяе фабрычнае прамысловасьці. Належныя лічбы сабраны ў табл. № 67 і наст.

Табл. № 67.

Гуртавы вытвор фабрычнае прамысловасьці 1900 г. (тыс. руб.).

| Галіны | Вілен. | Віцеб. | Горадз. | Меншч. | Магілеў. | Смален. | Белар. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| I. Апрац. бавоўны | 158,4 | 5,0 | — | — | — | 3.159,9 | 3.323,3 |
| II. „ воўны | 13,9 | 40,0 | 6.679,7 | 140,3 | — | — | 6.873,9 |
| III. „ шоўку | — | — | 444,5 | 33,6 | — | — | 478,1 |
| IV. „ лёну, пянькі, джуту | — | 116,6 | 6,9 | — | 79,9 | 605,3 | 808,7 |
| V. „ мешан. вал | 495,7 | 98,7 | 258,2 | — | — | 12,8 | 865,4 |
| VI. Выраб. паперы | 1.753,1 | 693,1 | 354,7 | 357,1 | 1.731,5 | 124,1 | 5.013,6 |
| VII. Апрац. дрэва | 945,0 | 555,4 | 359,6 | 2.785,4 | 370,7 | 2.110,7 | 7.126,7 |
| VIII. „ мэталю | 549,7 | 158,6 | 259,9 | 370,2 | 383,0 | 17,0 | 1.738,4 |
| IX. „ мінэралю | 1.190,1 | 342,6 | 601,6 | 531,4 | 593,0 | 831,2 | 4.089,9 |
| X. „ жывёл. прад. | 3.916,0 | 1.124,3 | 1.370,1 | 649,2 | 115,5 | 570,7 | 7.745,8 |
| XI. „ харчов. „ | 976,1 | 619,5 | 691,7 | 540,9 | 1.049,1 | 3.444,6 | 7.321,9 |
| XII. Выраб. хімічны | 145,2 | 180,0 | 1,6 | 101,8 | 57,9 | 2,7 | 489,2 |
| Усё разам | 10.143,2 | 3.933,7 | 11.028,5 | 5.509,9 | 4.380,7 | 10.879,0 | 45.874,9 |

[1]) Выраб аднаго рабочага роўны вырабу раб. у фаб.-зав. пр-ці. Гл. пазьней.

Табл. № 68.

Чысты вытвор фабрычнае прамысловасьці 1900 г. (тыс. руб.).

| Галіны | Вілен | Віцен. | Горадз | Менш. | Магілеў. | Смален. | Белар. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| I. Апрац. бавоўны | 5,6 | 1,0 | — | — | — | 882,5 | 889,1 |
| II. „ воўны | 13,6 | 9,7 | 2 729,5 | 45,1 | — | — | 2.797,9 |
| III. „ шоўку | — | — | 216,0 | 29,5 | — | — | 245,5 |
| IV. „ лёну, пянькі, джуту | — | 43,8 | 2,4 | — | 14,9 | 42,3 | 103,4 |
| V. „ мешан. вал. | 199,9 | 25,4 | 80,2 | — | — | 6,3 | 311,8 |
| VI. Выраб. паперы | 711,8 | 202,1 | 142,5 | 143,6 | 981,8 | 75,8 | 2.257,6 |
| VII. Апрац. дрэва | 268,1 | 155,8 | 110,4 | 628,9 | 146,3 | 1.130,5 | 2.440,0 |
| VIII. „ мэталю | 112,7 | 49,5 | 148,8 | 152,8 | 30,4 | 4,3 | 498,5 |
| IX. „ мінэралю | 709,7 | 164,3 | 318,9 | 297,0 | 257,3 | 480,8 | 2 227,9 |
| X. „ жывёл. прад | 699,7 | 225,6 | 297,5 | 119,6 | 23,4 | 64,1 | 1.429,9 |
| XI. „ харчов. „ | 267,8 | 143,5 | 96,1 | 124,2 | 197,5 | 402,8 | 1.231,9 |
| XII. Выраб. хімічны | 45,4 | 32,1 | 0,1 | 8,1 | 2,9 | 1,0 | 89,6 |
| Разам усё | 3.034,2 | 1 052,8 | 4 142,4 | 1.548,8 | 1.654,5 | 3.090,4 | 14.523,1 |

Табл. № 69.

Гуртавая вытворчасьць фабрычнае прамысловасьці 1908 г. (тыс. руб.).

| Галіны | Вілен. | Віцеб. | Горадз. | Меншч. | Магілеў. | Смален. | Белар. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| I. Апрац. бавоўны | 326,3 | — | 36,2 | — | 622,6 | 5.229,5 | 6.214,6 |
| II. „ воўны | 225,1 | 69,2 | 8.704,1 | 145,7 | — | — | 9.144,1 |
| III. „ шоўку | — | — | 1.156,3 | 23,8 | 13,1 | — | 1.193,2 |
| IV. „ лёну, пянькі, джуту | — | 1.286,5 | 9,1 | — | 515,7 | 699,5 | 2.510,8 |
| V. „ мешан. вал. | 473,9 | 127,0 | 336,0 | — | — | 5,7 | 942,6 |
| VI. Выраб. паперы | 2.035,9 | 821,3 | 350,6 | 692,7 | 3 238,7 | 141,7 | 7.280,9 |
| VII. Апрац. дрэва | 1.345,6 | 499,4 | 666,4 | 3.463,9 | 798,7 | 1 738,2 | 8 512,2 |
| VIII. „ мэталю | 826,3 | 671,4 | 648,8 | 349,9 | 363,7 | 29,3 | 2.889,4 |
| IX. „ мінэралю | 1.113,4 | 567,5 | 394,1 | 974,5 | 681,3 | 908,1 | 4.638,9 |
| X. „ жывёл. прад | 3 607,7 | 1.547,1 | 1.140,6 | 683,2 | 120,4 | 752,5 | 7.851,5 |
| XI. „ харчов. „ | 1.692,1 | 863,5 | 1.093,7 | 707,9 | 940,3 | 3.968,3 | 9.265,8 |
| XII. Выраб хімічны | 267,8 | 271,2 | 70,0 | 115,0 | 446,4 | 34,3 | 1.204,7 |
| Усё разам | 11.914,1 | 6.724,1 | 14.605,9 | 7.156,6 | 7.740,9 | 13 507,1 | 61.648,7 |
| 1900 г. | 10.143,2 | 3.933,7 | 11.028,5 | 5.509,9 | 4.380,7 | 10 879,0 | 45.874,9 |

Табл. № 70.

Чыстая вытворчасьць фабр.-зав. прамысловасьці 1908 г. (тыс. руб.).

| Галіны | Вілен. | Віцеб. | Горадз. | Меншч. | Магілеў. | Смален. | Белар. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| I. Апрац. бавоўны | 41,3 | — | 10,8 | — | 150,5 | 1.252,3 | 1.454,9 |
| II. „ воўны | 83,1 | 27,3 | 2.763,3 | 44,4 | — | — | 2.918,1 |
| III. „ шоўку | — | — | 627,3 | 18,8 | 5,5 | — | 651,6 |
| IV. „ лёну, пянькі, джуту | — | 729,5 | 2,1 | — | 106,6 | 88,2 | 926,4 |
| V. „ мешан. вал. | 258,4 | 67,6 | 120,9 | — | — | 5,7 | 452,6 |
| VI. Выраб. паперы | 844,9 | 314,0 | 169,4 | 350,3 | 1.710,5 | — 244,4 | 3 194,7 |
| VII. Апрац. дрэва | 394,9 | 211,4 | 230,5 | 1.499,6 | 369,9 | 781,4 | 3.487,7 |
| VIII. „ мэталю | 389,6 | 338,4 | 331,8 | 143,4 | 136,8 | 13,1 | 1.353,1 |
| IX. „ мінэралю | 688,7 | 322,5 | 225,4 | 602,5 | 358,5 | 491,7 | 2 689,3 |
| X. „ жывёл. прад | 876,1 | 367 7 | 285,4 | 137,1 | 25,8 | 92,6 | 1.784,6 |
| XI. „ харчов. „ | 590,3 | 159,2 | 259,1 | 169,8 | 268,7 | 728,3 | 2.175,3 |
| XII. Выраб. хімічны | 52,6 | 75,4 | 23,6 | 34,5 | 161,4 | 25,7 | 373,2 |
| Усё разам | 4.269,9 | 2 612,9 | 5 049,6 | 3 000,4 | 3.294,2 | 3.234,6 | 21.461,5 |

Табл. № 71.

Процант чыстае вытворчасьці да гуртавое ў 1908 г.

| Галіны | Вілен. | Віцеб. | Горадз. | Меншч. | Магілеў. | Смален. | Белар. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| I. Апрац. бавоўны | 12,65 | — | 30,0 | — | 24,20 | 24,0 | 23,4 |
| II. „ воўны | 36,91 | 39,4 | 31,75 | 30,47 | — | — | 31,9 |
| III. „ шоўку | — | — | 54,25 | 78,99 | 41,99 | — | 54,8 |
| IV. „ лёну, пянькі, джуту | — | 56,70 | 23,08 | — | 20,67 | 12,61 | 36,9 |
| V. „ мешан. вал. | 54,53 | 53,23 | 35,98 | — | — | 100 | 48,0 |
| VI. Выраб. паперы | 43,96 | 38,23 | 48,32 | 50,57 | 52,81 | —172,48 | 43,9 |
| VII. Апрац. дрэва | 29,34 | 42,33 | 34,60 | 43,29 | 46,31 | 44,95 | 41,0 |
| VIII. „ мэталю | 47,15 | 50,40 | 51,14 | 40,97 | 37,61 | 44,71 | 46,8 |
| IX. „ мінэралю | 61,86 | 56,83 | 57,19 | 61,83 | 52,62 | 54,15 | 58,0 |
| X. „ жывёл. прад. | 24,29 | 23,76 | 25,02 | 20,07 | 21,43 | 12,30 | 22,7 |
| XI. „ харчов. „ | 34,89 | 18,43 | 23,69 | 23,99 | 28,58 | 18,35 | 23,5 |
| XII. Выраб хімічны | 19,64 | 27,80 | 33,71 | 30,00 | 36,16 | 74,93 | 30,8 |
| Усе разам | 35,8 | 38,9 | 35,3 | 32,1 | 42,6 | 24,0 | 34,9 |

Табл. № 72.

Гуртавая вытворчасьць фаб.-зав. прам. 1912 г. (тыс. руб.).

| Галіны | Вілен. | Віцеб. | Горадз. | Меншч. | Магілеў | Смален. | Белар. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| I. Апрац. бавоўны | 101,5 | — | 117,9 | — | 323,1 | 18 682,1 | 19 224,6 |
| II. „ воўны | 58,3 | 14,0 | 11.849,6 | 116,3 | — | — | 12.038,2 |
| III. „ шоўку | — | — | 1 516,5 | 34,1 | — | — | 1.550,6 |
| IV. „ лёну, пянькі, джуту | — | 1.858,9 | 6,7 | — | 807,6 | 1 074,9 | 3.748,1 |
| V. „ мешан. вал. | 1.429,6 | 67,8 | 672,4 | 145,0 | — | — | 2.314,8 |
| VI. Выраб. паперы | 1.779,5 | 1 313,1 | 579,6 | 703,7 | 3.354,3 | 67,2 | 7.797,3 |
| VII. Апрац. дрэва | 1.824,3 | 1.050,1 | 1.163 0 | 5.398,3 | 1.834,3 | 2 423,1 | 13.693,1 |
| VIII. „ мэталю | 1.563,4 | 710,2 | 993,5 | 963,8 | 582,9 | 12,5 | 4.826,3 |
| IX. „ мінэралю | 1 404,0 | 858,7 | 391,6 | 1.234,0 | 868,3 | 1.116,3 | 5.872,9 |
| X. „ жывёл. прад. | 2.872,2 | 2.228,1 | 1.370,8 | 975,3 | 124,4 | 503,0 | 8.073,8 |
| XI. „ харчов. „ | 2.115,7 | 980,7 | 910,3 | 750,6 | 835,9 | 5.412,8 | 11.006,0 |
| XII. Выраб. хімічны | 342,6 | 62,8 | 119,9 | 192,4 | 357,2 | 12,0 | 1.087,0 |
| Усё разам | 13.491,1 | 9.144,4 | 19.691,8 | 10.513,5 | 9.088,0 | 29 303,9 | 91 232,7 |

Табл. № 73.

Чыстая вытворчасьць фаб.-зав. пром. 1912 г. (тыс. руб). па % яе да гуртавое ў 1908 г.

| Галіны | Вілен. | Віцеб. | Горадз | Менш. | Магіл. | Смал. | Белар. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| I. Апрац. бавоўны | 12,8 | — | 35,4 | — | 78,2 | 4.483,7 | 4.610,1 |
| II. „ воўны | 21,5 | 5,5 | 3.762 3 | 35,4 | — | — | 3 824,7 |
| III. „ шоўку | — | — | 822,7 | 26,9 | — | — | 849,6 |
| IV. „ лён, пян., джут. | — | 1 054,0 | 1,6 | — | 166,9 | 135,5 | 1.358,0 |
| V. „ меш. валакн. | 779,6 | 36,1 | 241,9 | 52,2[1]) | — | — | 1.109,8 |
| VI. Выраб. паперы | 782,3 | 502,0 | 280,1 | 355,9 | 1.771,4 | 35,5[2]) | 3.727,2 |
| VII. Апрац. дрэва | 535,2 | 444,2 | 402,4 | 2.336,9 | 849,5 | 1.089,2 | 5 657,4 |
| VIII. „ металю | 737,1 | 357,9 | 508,1 | 394,9 | 219,2 | 5,6 | 2.222,8 |
| IX. „ мінэралю | 868,5 | 488,0 | 224,0 | 763,0 | 536,9 | 604,5 | 3.484,9 |
| X. „ жывёл. прад. | 697,7 | 529,4 | 343,0 | 195,7 | 26,7 | 61,9 | 1.854,4 |
| XI. „ харч. прад. | 738,2 | 180,7 | 215,7 | 180,1 | 238,9 | 993,3 | 2.546,9 |
| XII. Выраб. хімічны | 67,3 | 17,5 | 40,4 | 57,7 | 129,2 | 9,0 | 321,1 |
| Усе разам | 5.240,2 | 3.615,3 | 6.877,6 | 4.398,7 | 4.016,9 | 7.418,2 | 31.566,6 |

[1]) Па % Горад.—36,0%.
[2]) Па % Мен.—52,81%.

Ня можна не заўважыць нязвычайнага ўзросту прамысловасьці за 13 гадоў перад вайною. У ніжэй паданай табл. № 74 **паказан** узрост ліку рабочых і гуртавое вытворчасьці да 1908 г. і 1912 г. у %%.

Табл. № 74.

У з р о с т у %%.

| Гады \ Галіны | | I | II | III | IV | V | VI | VII | VIII | IX | X | XI | XII | Усе |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Лік рабоч. | 1908 г. | 32,9 | 5,3 | – 4,9 | 94,4 | 22,6 | 6,3 | 58,1 | 106,8 | 11,3 | — 3,6 | 1,9 | 102,5 | 27,8 |
| | 1912 г. | 44,8 | 11,3 | – 0,9 | 72,1 | 158,7 | 2,3 | 95,6 | 145,9 | 20,9 | —14,6 | —12,1 | 14,7 | 31,5 |
| Гурт. выт. | 1908 г | 87,0 | 33,0 | 149,6 | 210,5 | 8,9 | 45,2 | 19,4 | 66,2 | 13,4 | 1,4 | 26,5 | 146,3 | 34,4 |
| | 1912 г | 478,5 | 75,1 | 224,3 | 363,5 | 167,5 | 55,5 | 92,1 | 177,6 | 43,6 | 4,2 | 50,3 | 122,2 | 98,9 |

Гуртавая вытворчасьць расьце значна шыбчэй, чым лік рабочых,—у гэтым адбіваецца тэхнічнае паляпшэньне нашае прамысловасьці. Асабліва шыбкі узрост выяўляюць такія галіны: апрацоўка бавоўны (+478,5%), апрацоўка лёну, пянькі й джута (+363,5%), апрацоўка шоўку (+224,3%), значыцца, найболей тэкстыльны выраб; далей ідзе—апрацоўка мэталю (+177,6%), мешаных валакняных матар'ялаў, значыцца, ізноў тэкстыльны выраб (+167,5%), хімічны выраб (+122,2%), апрацоўка дрэва (+92,1%): усе гэтыя галіны сваім узростам выперадзілі ўзрост прыбытку ад сельскае гаспадаркі (+86,5%).

Паасобныя губэрні гэтак разьвівалі сваю фабрычную прамысловасьць:

Табл. № 75.

У з р о с т з 1900 г. на %%.

| Г у б э р н і | Лік рабоч. | | Гуртав. вытвор. | |
|---|---|---|---|---|
| | 1908 г. | 1912 г. | 1908 г. | 1912 г. |
| Віленшчына . . . . | 10,6 | 19,6 | 17,5 | 33,0 |
| Віцебшчына . . . . | 54,4 | 67,6 | 70,9 | 132,5 |
| Горадзеншчына . . . | 0,6 | 7,0 | 32,4 | 78,6 |
| Меншчына . . . . . | 52,1 | 72,1 | 29,9 | 90,8 |
| Магілеўшчына . . . | 63,4 | 60,6 | 76,7 | 107,5 |
| Смаленшчына . . . | 15,3 | 20,3 | 24,2 | 169,4 |
| Беларусь . | 27,8 | 31,5 | 34,4 | 98,9 |

Заўважаецца паступовае павялічэньне ўзросту ў кірунку з заходу на ўсход.

Ці ня выклікан такі імклівы ўзрост прамысловасьці проста ўзростам цэн?—меркаваць можна толькі прыблізна. Ацаніць увесь выраб фабрычнай прамысловасьці па цэнах 1900 года (якія можна адшукаць у Варзара) немагчыма ня столькі таму, што праца гэта дужа марудная і патрабуе шмат пераацэнак, колькі таму, што фабрычная статыстыка не выяўляе вырабу прамысловасьці ў аднародных адзінках: пуд сел.-гасп. машын, пуд тканінаў, пуд мэблі, скрынак, бандарскага посуду і г. д. Часта тыя тавары, якія ёсьць на Беларусі ў 1912 годзе, у 1900 г. у нас зусім не выраблялiся, і цэн на іх няма ні ў Варзара, ні тым болей у «Своде товарных цен», бо ў «Свод» не траплялі цэны ані з воднага беларускага рынку.

Для цэлай старой Расіі, або яе Эўрапэйскай часткі, з вядомымі памылкамі пераацэнку ўсе-ж было магчыма зрабіць. Вывады падае Пракаповіч такія:

Узрост цэн па асобных галінах вырабу з 1900 г. да 1912 г. на %.

| | | | |
|---|---|---|---|
| Апрацоўка бавоўны . . . . | +27,0 | Апрац. дрэва . . . . . | + 0 |
| » воўны . . . . . | +21,5 | » мэталю . . . | —12,4 |
| » шоўку . . . . . | +11,5 | » мінэралю . . | +15,6 |
| » лёну . . . . . . | +25,8 | » жывёл. прад. . | +59,1 |
| » меш. валакна . | +21,4 | » харч. » | +34,4 |
| Выраб паперы . . . . . . . | —13,6 | Выраб хімічны . . . | — 4,0 |
| | | Уся фаб.-зав. прам. . . | +11,74 |

Значыцца, імклівы рост тэкстыльнага вырабу тлумачыцца да вядомай мяжы ўзростам цэн. А наймацнейшы рост цэн ў прамысловасьці, якая перарабляе жывёльныя і харчовыя прадукты, толькі сьведчыць, што гэтыя ґаліны фактычна яшчэ больш зьнізілі сваю ролю, чым было паказана на табл. № 74 (рабочых—14,6% і—12,1%; гурт. вытвар+4,2% і+50%).

Цэны на сел.-гасп. прадукты вырасьлі ў некалькі разоў больш, чым цэны на прадукты фабрычнай прамысловасьці (ў Эўр Расіі+40,9% супроць +11,74%). У дзьвюх суседніх краінах павінна быць сувязь ва ўзросьце цэн у сел. гаспадарцы і прамысловасьці; калі палічыць, што цэны на прадукты прамысловасьці на Беларусі вырасьлі ў столькі-ж разоў вышэй за расійскі узрост, як і цэны прадуктаў сельска-гаспадарчых,—дык можна будзе скласьці такую табліцу:

Табл. № 76.

Узрост цэн з 1909 г. да 1913 г.

| Краіны | У сел. гасп | Пав быць у прамысл | Пав. быць у гандлю |
|---|---|---|---|
| Эўр Расія . . . . . . . | +40,9 | +11,74[1] | +24 |
| Беларусь . . . . . . . | +47,1 | +13,5 | +27,6 |
| Віленшчына . . . . . | +54,5 | +15,6 | +32,0 |
| Віцебшчына . . . . . . | +56,3 | +16,2 | +33,0 |
| Горадзеншчына . . . . | +44,0 | +12,6 | +25,8 |
| Меншчына . . . . . . | +34,8 | +10,0 | +20,4 |
| Магілеўшчына . . . . . | +51,0 | +14,6 | +29,9 |
| Смаленшчына . . . . . | +47,3 | +13,6 | +27,8 |

Супраўдны рост цэн, пэўна-ж, не павінен быць цалком такім, як вылічана, але ўсё-ж вельмі блізкім. На % узросту цэн я зьмяншаю чыстую вытворчасьць аднаго рабочага, калі вылічаю прыбытак фабрычнай прамысловасьці ў 1913 г. па старых цэнах.

Зараз можна ўжо падлічыць прыбытак фабрычнай прамысловасьці.

Табл. № 77.

| Губэрні | Лік раб па „Своду" | | Раб. у галін, абл. акц | | Лік раб. у ф-зав. пр | | Прыб. ф.-зав. пр. (тыс. руб.) | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1900 г | 1913 г. | 1900 г | 1913 г | 1900 г. | 1913 г. | 1900 г | 1913 г. | 1913 г. па ст. ц. |
| Віленшчына . | 10.785 | 12.291 | 1.676 | 1.663 | 9.109 | 10.628 | 4.027,7 | 6.785,2 | 5.869,6 |
| Віцебшчына . | 7.139 | 8.440 | 1.3[illegible]2 | 1.228 | 5.837 | 7.212 | 1.751,8 | 4.435,8 | 3.817,4 |
| Горадзеншчына | 17.358 | 17.874 | 2.696 | 2.845 | 14.662 | 15.029 | 5 18,2 | 8.300,2 | 7.371,4 |
| Меншчына . | 7.507 | 12.848 | 3.699 | 4.265 | 3.808 | 8.583 | 1.332,3 | 4 890,4 | 4.445,8 |
| Магілеўшчына | 5.557 | 8.3[illegible]7 | 1.362 | 1.810 | 4.195 | 6 497 | 1.747,4 | 4.090,6 | 3.569,8 |
| Смаленшчына | 10.311 | 13.420 | 1.274 | 1.30 | 9 037 | 12.117 | 3.210,1 | 8 590,1 | 7.561,7 |
| Беларусь | 58.657 | 73.180 | 12.009 | 13.114 | 46.648 | 60.066 | 17 287,5 | 37.092,3 | 32 635,4 |

[1]) Супраўдны узрост.

Як шыбка расла прамысловасьць перад самаю вайною, можна было-б убачыць з параўнаньня ліку рабочых і гуртавога вытвору за гады 1908, 09, 10, 11, 12.

Заўважым, што ў 1900 г. чысты вытвор 1 рабочага на Беларусі быў ніжэй, чым ў Эўр. Расіі на 7,7%, а ў 1912 г. ужо вышэй на 5,1%: гэты факт сьведчыць аб значных тэхнічных дасягненьнях у беларускай прамысловасьці.

Прамысловасьць, якая абкладаецца акцызам. Веды аб гэтай прамысловасьці вельмі пэўныя[1]). Прадукцыя бярэцца з «Статистики произв. облаг. акцизом», цэны 1900 г. па Варзару, 1912 г. на «Фабр.-зав. пром. Евр. России», чыстая вытворчасьць па % яе ад гуртавой у досьледзе Варзара за 1908 год. Належныя вылічэньні у табл. № 78 і г. д.

Табл № 78.

Гуртавая вытворчасьць пр-ці, якая абкл. акцызам у 1900 г. (тыс. руб).

| Галіны | Вілен. | Віцебш. | Горадз. | Менш. | Магілеў. | Смал. | Беларусь |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Браварніцтва . . | 869,4 | 305,2 | 900,4 | 2.033,6 | 908,1 | 436,8 | 5.453,5 |
| Выраб. дражджэй | 741,5 | — | 167,5 | 554,1 | 144,5 | — | 1.607,6 |
| „ гарэлкі . | — | 1,7 | — | — | — | 29,2 | 30,9 |
| „ піва . . . | 945 6 | 416,0 | 482,5 | 243,0 | 258,6 | 654,0 | 2.999,8 |
| „ мёду . . . | 3,4 | — | 34 9 | 9,7 | — | 21,9 | 69,9 |
| „ табакі . . | 1 002,9 | 564 5 | 3.416,8 | 586,3 | 204,8 | 345 1 | 6 120,4 |
| „ сярнічак . | 16,1 | 273,1 | — | 896,8 | 196,0 | 277,3 | 1.659,3 |
| Перапр. нафты | — | 14,7 | 4,5 | — | — | 3,1 | 22,2 |
| Усё . . . . | 3.578,9 | 1.575,2 | 5 006,6 | 4 323,5 | 1.712,0 | 1.767,4 | 17.963,6 |

Табл № 79.

Гуртавая вытворчасьць у 1913 г. (тыс. руб.).

| Галіны | Вілен. | Віцебш. | Горадз. | Менш. | Магілеў. | Смал. | Беларусь |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Браварніцтва . | 1.247,4 | 593,4 | 1.683,3 | 3.453,6 | 2.017,6 | 947,4 | 9.942,7 |
| Выраб. дражджэй | 844,2 | 109,1 | 729,2 | 1.583,4 | 512,2 | — | 3.778,1 |
| „ гарэлкі . | — | 1,0 | — | — | — | 1,9 | 2,9 |
| „ піва . . . | 2.127,9 | 920,7 | 1.084,5 | 596,8 | 834,5 | 1.484,4 | 7 048,7 |
| „ мёду . . . | 10 0 | — | 47,9 | 29,7 | 1,0 | 35,6 | 124,2 |
| „ табакі . . | 907,5 | 868,1 | 6.559,8 | 55,7 | 1 070,8 | 614,2 | 10.076,1 |
| „ сярнічак . | 58,1 | 602,6 | 174,7 | 2.790,8 | 200,2 | 395,2 | 4.221,6 |
| Апрац. нафты . . | — | 45,9 | 25 0 | — | — | 0,8 | 71,7 |
| Усё . . . . | 5.195,1 | 3.140,8 | 10 304,4 | 8 510,0 | 4 636.3 | 3 479,5 | 35 266,0 |

[1]) «Статистика производств, облагаемых акцизом».

Табл. № 80.

% чыстае вытворчасьці да гуртавое ў 1908 г.

| Галіны | Віл. | Віт. | Гор. | Мен. | Маг. | Смал. | Белар. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Выраб сьпірту | 16,73 | 31,03 | 18,19 | 21,99 | 23,36 | 22,81 | 21,37 |
| » дражджэй | 46,85 | — | 33,34 | 41,25 | 44,70 | — | 42,29 |
| » гарэлкі | — | 13,17 | — | — | — | 19,60 | 17,02 |
| » піва | 50,41 | 57,88 | 40,32 | 56,63 | 37,47 | 47,09 | 48,31 |
| » меду | — | — | — | 24,48 | 24,08 | — | 24,43 |
| » сярнічак | 53,60 | 48,34 | — | 51,43 | 44,60 | 28,81 | 47,25 |
| » табакі | 40,13 | 19,61 | 41,58 | 34,31 | 52,66 | 28,59 | 38,00 |
| Апрац. нафты | — | — | — | 8,07 | 15,34 | — | 11,03 |
| Усе разам | — | — | — | — | — | — | — |

Табл. № 81.

Чыстая вытворчасьць у 1900 г.

| Галіны | Віл. | Віт. | Гор. | Мен. | Маг. | Смал. | Белар. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Выраб сьпірту | 145,5 | 94,7 | 163,8 | 447,2 | 207,1 | 99,6 | 1.157,9 |
| » дражджэй | 347,4 | — | 55,8 | 228,6 | 64,6 | — | 696,4 |
| » гарэлкі | — | 0,3 | — | — | — | 5,7 | 6,0 |
| » піва | 446,7 | 240,8 | 194,6 | 137,6 | 96,9 | 313,3 | 1.429,9 |
| » мёду | 0,8 | — | 8,5 | 2,3 | — | 5,4 | 17,0 |
| » табакі | 402,5 | 110,7 | 1.420,7 | 201,2 | 107,8 | 98,7 | 2.341,6 |
| » сярнічак | 16,1 | 273,1 | — | 896,8 | 196,0 | 277,3 | 1.659,3 |
| Апрац. нафты | — | 1,6 | 0,5 | — | — | 0,3 | 2,4 |
| Усе разам | 1.359,0 | 721,2 | 1.843,9 | 1.913,7 | 672,4 | 800,3 | 7,310,8 |

Табл. № 82.

Чыстая вытворчасьць у 1913 г.

| Галіны | Віл. | Віц. | Гор. | Мен. | Маг. | Смал. | Беларусь |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Выраб сьпірту | 208,7 | 184,1 | 306,2 | 759,4 | 460,2 | 216,1 | 2.134,7 |
| „ дражджэй | 395,5 | 45,0 | 243,1 | 653,2 | 229,0 | — | 1.565,8 |
| „ гарэлкі | — | 0,2 | — | — | — | 0,4 | 0,6 |
| „ піва | 1.072,7 | 532,9 | 437,3 | 338,0 | 312,7 | 711,0 | 3.404,6 |
| „ мёду | 2,4 | — | 11,7 | 7,2 | 0,2 | 8,7 | 30,2 |
| „ табаку | 364,2 | 170,4 | 2.727,6 | 19,1 | 563,9 | 175,6 | 4.020,8 |
| „ сярнічак | 31,1 | 291,3 | 93 6 | 1.435,3 | 89,3 | 113,9 | 2.054,5 |
| Апрац. нафты | — | 5,1 | 2 8 | — | — | — | 7,9 |
| Увесь выраб | 2.074,6 | 1.229,0 | 3.822,3 | 3.212,2 | 1.655,3 | 1.225,7 | 13.219,1 |

Табл. № 83.

Чыстая вытварчасьць 1913 г. па старых цэнах.

| Галіны | Віл. | Віц. | Гор. | Мен. | Маг. | Смал. | Беларусь |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Выраб сьпірту . . | 193,8 | 166,6 | 277,5 | 692,4 | 419,1 | 194,5 | 1.943,9 |
| „ дражджэй | 256,0 | 28,1 | 151,9 | 408,2 | 143,1 | — | 987,3 |
| „ гарэлкі . | — | 0,1 | — | — | — | 0,2 | 0,3 |
| „ піва . . . | 1.206,1 | 540,7 | 402,3 | 236,5 | 232,9 | 690,9 | 3.309,4 |
| „ мёду . . . | 2,4 | — | 11,7 | 7,2 | 0,2 | 8,7 | 30,2 |
| „ табаку . . | 364,2 | 170,4 | 2.727,6 | 19,1 | 563,9 | 175,6 | 4.020,8 |
| „ сярнічак | 15,7 | 147,0 | 47,2 | 726,1 | 45,0 | 57,5 | 1.038,5 |
| Апрац. нафты . . | — | 5,1 | 2,8 | — | — | — | 7,9 |
| Разам усе . . | 2.038,2 | 1.058,0 | 3.621,0 | 2.089,5 | 1.404,2 | 1.127,4 | 11.338,3 |

Рамесьніцкая прамысловасьць. Само разуменьне «рамесьніцкая прамысловасьць», таксама як і «саматужная-хатняя» прамысловасьць да гэтага часу ня вызначана ў эканамічнай літаратуры; і ў апошні час эканамістыя нават і ня ўжываюць такога падзелу, залічаючы абедзьве гэтыя галіны ў адно месца—«дробная прамысловасьць». Найбольш прынята вызначаць саматужнікамі вясковых жыхароў, якія займаюцца промыслам толькі ў вольны ад сел.-гаспадарчых заняткаў час; рамесьнікам-жа—найчасьцей гарадзкога або местачковага жыхара, для якога промысел—галоўны занятак. Гэтак умоўна і я ужываю ў сваёй працы гэтыя разуменьні. Сколькі ў нас на Беларусі рамесьнікаў, ніхто стала і па ўсім беларускім абшары ніколі ня лічыў. Ёсьць абы-якія кавалачкі ведаў аб яўрейскім рамесьніцтве на Беларусі, але не па ўсіх прафэсіях[1]); есьць лічбы рамесьнікаў па некаторых беларускіх гарадох—па Магілеву, Гомлю, Пінску, Смаленску, Рославу, Навазыбкаву і Почапу. Але-ж меркаваць па % рамесьнікаў у гэтых гарадох аб рамесьніцтве на ўсёй Беларусі ніяк няможна. Ёсьць абы-якія агульныя, прыблізныя лічбы аб беларускім рамястве. Напр., А. Уласаў, стары беларускі эканаміст-піанэр, вызначае лік рамесьнікаў у паўмільёна чалавек[2]); гэту ж лічбу называе А. Бурбіс[3]); А. Смоліч[4]) больш асьцярожна кажа „Па ўсёй-жа Беларусі пэўна будзе каля 200 тыс. рамесьнікаў“. Больш-менш можна вызначыць лічбу рамесьнікаў такім спосабам. З перапісу 1897 году вядома, колькі чалавек на усёй Беларусі было самастойна-занятых у апрацоўчай прамысловасьці, калі з іх ліку выкінуць колькасьць рабочых і саматужнікаў—мы будзем мець прыблізную (і самую найбольшую) лічбу рамесьнікаў. У табл. № 84 паказаны належныя вылічэньні. Для 1913 г. лік рамесьнікаў павялічан па агульнаму ўзросту насельніцтва.

[1]) Стат.-эк. очерки областей, губерний и городов России. «Есьць яшчэ ў чырце аселасьці поўмільенная армія рамесьнікаў», стар. 360.

[2]) Нар. хоз. Бел. № 4, 1922 г., стар. 9.

[3]) «Беларусь», 1924 г, стар. 56

[4]) «Материалы и исследования о еврейской ремесл. промышленности». II. 1915.

Табл. № 84.

| Губэрні | Занята ў апрац. пр-ці ў 1897 г. | Лік раб. у 1900 г. | Саматужнікі | Рамесьнікі ў 1900 г. | Рамесьнікі ў 1913 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| Віленшчына . . . . | 43.611 | 10.785 | 1.107 | 31.719 | 41.362 |
| Віцебшчына . . . . | 34.382 | 7.139 | 5.299 | 21.944 | 28.527 |
| Горадзеншчына . . . | 56.735 | 17.358 | 1.851 | 37.526 | 47.508 |
| Меншчына . . . . . | 55.591 | 7.507 | 3.551 | 44.533 | 62.702 |
| Магілеўшчына . . . | 32.647 | 5.557 | 15.863 | 11.227 | 16.212 |
| Смаленшчына . . | 29.694 | 10.311 | 9.910 | 9.473 | 13.215 |
| Беларусь . . | 252.660 | 58.657 | 37.581 | 156.422 | 209.526 |

Такім чынам, лічбы Смоліча блізкі да супраўднасьці. Большая частка рамесьнікаў у 1900 г. складалася з шаўцоў—іх было 96 тысяч чалавек. Чыстая вытворчасьць аднаго рамесьніка прыймаецца роўнай вытворчасьці фабрычнага рабочага, як і у «Опыте». Гэта мусіць павялічаная вытворчасьць, бо ў «Материалах и исследованиях о еврейск. ремесл. промышленности» спатыкаюцца лічбы сярэдняга заробку рамесьніка—рабочага ў тыдзень у Вільні 8 р. 36 к., у Гомлі 5 р. 31 к., гаспадара ў тых жа гарадох—20 р. 27 к. і 12 р. 16 к., або 400—300 руб. для рабочага ў год і 960—600 руб. для гаспадара (у 1912 г.). Пад'агуленьне прыбытку рамесьнікаў у табл. 85.

Табл. № 85.

Прыбытак рамесьнікаў.

| Губэрні | 1900 г. | 1913 г. | 1913 г. па ст. ц. |
|---|---|---|---|
| Віленшчына . . . . . | 14.025,0 | 26 407,0 | 22.843,0 |
| Віцебшчына . . . . . . | 6 586,0 | 17 546,0 | 15.100,0 |
| Горадзеншчына . . . . | 13 356,0 | 26.238,0 | 23 302,0 |
| Меншчына . . . . . . . | 15.580,0 | 35.726,0 | 32 478,0 |
| Магілеўшчына . . . . . | 4 676,0 | 10.207,0 | 8.907,0 |
| Смаленшчына . . . . . | 3 365,0 | 9.369,0 | 8 247,0 |
| Беларусь . . | 57.588,0 | 125.493,0 | 110.877,0 |

**Саматужнікі.** Аб саматужніках лічбы зусім ня пэўныя, тады як адны дасьледчыкі, напр. Г. П. Пятроў [1]), лічаць, што на Беларусі „хатнія промыслы наогул распаўсюджаны няшырока і ня маюць разнастайнасьці ў сваім выглядзе, а па тэхніцы прымітыўны, другія, напр. проф. М. В. Доўнар-Запольскі [2]), наадварот, кажуць, што «хатняя прамысловасьць Меншчыны, а пэўна і ўсяе Беларусі, зусім не знаходзіцца у такім першабытным стане, як аб тым звычайна мяркуюць», што «калі зьвярнуць увагу на прычыны, па якіх паусталі хатнія промыслы у Расіі, дык можна знайсьці, што і ў нашым краі яны ня толькі ёсьць, але ў некаторых выпадках яшчэ мацней выяўляюцца, чым у губэрнях фабрычных або чарназёмных. Сапраўды-ж, мы тут спатыкаем тую ж нястачу зямельнага надзела, неўрадлівасьці глебы,

[1]) „Промысл кооперация и кустарь“.
[2]) „Исследования и статьи. Т. I. Кустар. промыслы Мин губ.“, ст. 479. Курсіў мой Г. Г.

доўгі вольны ад працы ў полі час, ды йшчэ да ўсяго таго далучаецца адсутнасьць фабрык і гут... і наогул нязначнасьць адходнага промыслу». А. Смоліч выказвае дужа цікавую думку, што ў вясковых хатніх промыслах ня было і патрэбы, «бо існавала і выпаўняла аналёгічную працу вялізная кляса местачковых і мясцовых рамесьнікаў[1]). Гэты фактар, здаецца мне, пэўна-ж, меў сваю ролю, але галоўная прычына непашыранасьці ў нас хатняе прамысловасьці—мусіць ў адсутнасьці на Беларусі буйна разьвітай прамысловасьці. Як паказаў М. Туган-Бараноўскі[2]), пахаджэньне саматужных промыслаў падвойнае: старыя саматужныя промыслы вынiклі з хатняй прамысловасьці, новыя-ж галоўным чынам з фабрыкі буйнай майстэрні, а такіх новых промыслаў 50% ад усіх промыслаў цантровага раёну. Вось гэтыя новыя промыслы і не маглі разьвіцца на Беларусі.— Лік саматужнікаў вызначаю па таму процанту, які яны мелі ад сельскіх жыхароў па Менш. і Віленшч. у 1900 г., па Віцебш. у 1907 г., Магіл. у 1908 г., Смаленш. у 1909—12 гг.[3]).

Табл. № 87.

| Губэрні | Год дан. | Лік сел прам. | На 10.000 сел жых. | Лік саматужн у 1900 г. | Лік саматужн у 1913 г. | Сярэд зараб. самат. р[5]) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Віленшчына . . . . . . | 1900 | 1.007 | 6,8 | 1.107 | 1.199 | 100 |
| Віцебшчына . . . . . . . | 1907 | 6.256 | 41.4 | 5.299 | 6.673 | 31,6 |
| Горадзеншчына . . . . . | — | — | (13,6)[4]) | 1.851 | 2.260 | 78,4 |
| Меншчына . . . . . | 1900 | 3.758 | 18,4 | 3.551 | 4.951 | 40,5 |
| Магілеўшчына . . . . . . | 1908 | 19.800 | 101,6 | 15.863 | 21.971 | (53,8) |
| Смаленшчына . . . | 1909—12 | 13.816 | 69,3 | 9.910 | 13.182 | (53,8) |
| Беларусь . . . | — | — | 13,6 | 37.581 | 50.236 | 53,8 |

У табл. № 88 зроблена падлічэньне прыбытку ад хатніх промыслаў.

Табл. № 88.

Прыбытак ад хатніх промыслаў (тыс. руб.)

| Губэрні | 1900 г. | 1913 г. | 1913 г., па стар ц. |
|---|---|---|---|
| Віленшчына . . . . | 185,1 | 226,0 | 185,1 |
| Віцебшчына . . . . | 167,4 | 210,9 | 167,4 |
| Горадзеншчына . . . | 145 1 | 177,2 | 145,1 |
| Меншчына . . . . | 143,8 | 200,5 | 143,8 |
| Магілеўшчына . . . | 853,8 | 1.182,0 | 853,8 |
| Смаленшчына . | 533,2 | 709,2 | 533,2 |
| Беларусь | 2.028 4 | 2.705,8 | 2.028,4 |

---

[1]) Беларусь, стар. 56.
[2]) Рус фабрика, стар. 247.
[3]) Праф. А. А. Рыбников. „Мелкая пром. России" М. 1923 г. В. Е. Варзар «Материалы о куст. пром. за 1900 г.».
[4]) На Вілен. і Меншч.
[5]) Па Варзару.

Прыбытак ад усяе прамысловасьці. Абсолютныя лічбы па кожнай галіне, такім чынам, вызначаны. Зараз табл. № 89 пакажа іх агульны падрахунак:

Табл. № 89.

Прыбытак ад усяе прамысловасьці (тыс. руб.).

| Губэрні | 1900 г. | 1913 г. | 1913 г. па ц. 1900 г. |
|---|---|---|---|
| Віленшчына . . . . | 19.822,1 | 35.633,2 | 31.052,5 |
| Віцебшчына . . . . | 9.242,3 | 23.462,9 | 20.021,8 |
| Горадзеншчына . | 20.579,6 | 38.569,2 | 34.499,6 |
| Меншчына . . . . | 18.998,8 | 44.094,6 | 39.273,4 |
| Магілеўшчына . . . | 7.985,0 | 17.216,1 | 15.133,6 |
| Смаленшчына . . | 7.935,0 | 19.943,7 | 17.684,6 |
| Беларусь . . . | 84.562,8 | 178.919,7 | 157.865,5 |

Разгледзім, як вырасьлі прыбытак, цэны і вытвор ува ўсёй прамысловасьці і ў яе галоўных галінах с фабрычнай і абкладзенай акцызам. Належны матар'ял дае табл. № 90.

Табл. № 90

| Галіны / Губэрні | Узрост прыбытку | | | Узрост цэн | | | Узрост вытвару | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Уся прам. | Фаб.-зав. п. | Абкл. акц. | Уся прам. | Фаб.-зав. п. | Абкл. акц. | Уся прам. | Фаб.-зав. п. | Абкл. акц. |
| Віленшчына . . . . . . | 79,8 | 68,4 | 52,7 | 14,8 | 15,6 | 1,8 | 56,7 | 45,7 | 50,0 |
| Віцебшчына . . . . . . | 153,9 | 153,2 | 70,4 | 17,2 | 16,2 | 16,2 | 116,6 | 117,9 | 46,7 |
| Горадзеншчына . . . . | 87,4 | 59,1 | 107,3 | 11,8 | 12,6 | 5,6 | 67,6 | 41,3 | 96,4 |
| Меншчына . . . . . . | 132,1 | 267,1 | 67,9 | 12,3 | 10,0 | 53,7 | 106,7 | 234,5 | 9,1 |
| Магілеўшчына . . . . . | 115,6 | 134,2 | 146,2 | 13,8 | 14,6 | 17,9 | 89,5 | 104,3 | 108,9 |
| Смаленшчына . . . . . | 151,3 | 167,6 | 53,2 | 12,8 | 13,6 | 8,8 | 122,9 | 35,5 | 40,9 |
| Беларусь . | 111,6 | 114,6 | 80,8 | 13,3 | 13,5 | 16,6 | 86,7 | 88,8 | 55,1 |
| Эўр. Расія . | 83,0 | 98,1 | 23,3¹) | 12,5 | 11,74 | — 9 | 62,2 | 77,3 | 35,7 |

Беларуская прамысловасьць буйна разьвівалася за кругабег 1900—1913 г.г., папярэдзіўшы Эўр. Расію як цалком па усёй прамысловасьці, гэтак і асабліва па абкладзенай акцызам (80,8% супроць 23,3%). Часткова, але зусім нязначна, такі ўзрост тлумачыцца ўзвышэньнем цэн, асабліва ў галінах, абкладзеных акцызам (па Беларусі + 16,6%, у Расіі— 9%): наогул-жа і вытвор беларускае прамысловасьці (дзе ўплыў цэн выключан) узрастае шыбчэй, чым расійскае. Маладая з боку прамысловага жыцьця краіна, дзе індустрыяльнаму разьвіцьцю перашкаджала ў даўнейшыя гады палітыка царскага ураду, Беларусь цьвёрда стала на шлях індустрыялізацыі, пры гэтым разьвіваючы па першае тыя галіны, якія грунтуюцца на мясцовай сырызьне. Гэта пакажуць табл. № 91 і 92.

¹) У Расіі малы % таму, што зьнізілася цукровая прамысловасьць.

Табл. № 91.

Узрост галін прамысл., апрацоўваючых пераважна мясц. сырызну (тыс. руб.) і гуртавога вытвару для галін.

| Галіны | Беларусь | | Эўр. Расія | | Узрост ± % | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1900 | 1913 | 1900 | 1913 | Бел. | Эўр. Рас. |
| I. Апрац. лену, пян., дж. | 808,7 | 3.748,1 | 55.514,4 | 108,588 | 363,5 | 95,6 |
| II. Выраб паперы . . . . | 5.013,6 | 7.797,3 | 69.639,4 | 119,336 | 55,5 | 71,4 |
| III. Апрац. дрэва . . . . | 7.126,7 | 13 693,1 | 87.062,6 | 151,243 | 92,1 | 63,7 |
| IV. » мінэралю . . . | 4.089,9 | 5.872,9 | 70.505,7 | 136,392 | 43,6 | 93,4 |
| V. » жывел. прад. . | 7.745,8 | 8 073,8 | 95.443,1 | 163,228 | 4,2 | 71,0 |
| VI. » харч. » . | 7.321,9 | 11 006,0 | 338.913,6 | 636,343 | 50,3 | 87,7 |
| VII. Выраб сьпірту . . . . | 5 453,5 | 9.942,7 | 43.214,0 | 101,970 | 82,3 | 135,9 |
| VIII. » дражджэй . . | 1.607,6 | 3.778,1 | 6 599,0 | 12,561 | 135,1 | 90,3 |
| IX. » піва і меду . . | 3 069,7 | 7.172,9 | 39.075,0 | 70,364 | 133,7 | 80,1 |
| X. » запалак . . . | 1.659,3 | 4 221,6 | 4 273,0 | 12,554 | 154,4 | 193,8 |

Табл. № 92.

Чысты вытвор (тыс. руб.).

| Галіны | Беларусь | | Эўр Расія | | Узрост ± % | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1900 | 1913 | 1900 | 1913 | Бел. | Эўр. Рас. |
| I. Апрац. лену, пяньки . | 103,4 | 1.358,0 | 15 662,6 | 32.902 | 1213,0 | 109,9 |
| II. Выраб паперы . . . . | 2.257,6 | 3.727,2 | 28 252,1 | 47.734 | 65,1 | 68,9 |
| III. Апрац. дрэва . . . . | 2 440,0 | 5.657,4 | 27.127,4 | 44.768 | 131,9 | 55,1 |
| IV. » мінэралю . . | 2.227,9 | 3.484,9 | 38.893,5 | 68 605 | 56,4 | 76,4 |
| V. » жывел. прад . | 1.429,9 | 1.854,4 | 16.677,3 | 28.402 | 29,7 | 70,3 |
| VI. » харч. » . | 1 231,9 | 2 546,9 | 43.399,5 | 59 816 | 106,7 | 37,8 |
| VII. Выраб сьпірту . . . . | 1 157,9 | 2.134 7 | 13 585,9 | 31.286,7 | 84,4 | 131,0 |
| VIII. » дражджэй . . | 696,4 | 1 565,8 | 2.111,6 | 4 019,2 | 124,9 | 90,3 |
| IX. » піва і меду . | 1.446,9 | 3.434,8 | 14.326,6 | 25.488,1 | 137,4 | 67,5 |
| X. » запалак . . . | 768,7 | 2.054,5 | 1.734,8 | 5.096,9 | 167,3 | 193,8 |

Найбуйней ідзе росквіт прамысловасьці, якая скарыстоўвае беларускую-ж сырызну, пераважна сельска-гаспадарчую: апрацоўка лёну і пянькі, выраб дражджэй, піва, мёду, сьпірту, харчовых прадуктаў; потым ідзе прамысловасьць, якая выкарыстоўвае мясцовы лясны матар'ял: выраб сярнічак, апрацоўка дрэва, выраб паперы і г. д. Такое пашырэньне сельска-гаспадарчай апрацоўчай прамысловасьці павінна было вельмі спрыяюча адбіцца і на разьвіцьці сельскае гаспадаркі.

Але зараз па адных лічбах узросту прамысловасьці казаць што небудзь аб індустрыялізацыі краю ня можна. Меркаваць аб гэтым трэба па агульнай ролі прамысловасьці ў нац. прыбытку.

Застановімся на складзе прамысловае прадукцыі (табл. № 93).

Табл. № 93.

| Губэрні | 1900 г. | | | | | 1913 г. | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Рамесьн. | Хатн. прам. | Нетрак. | Фаб.-зав. | Абкл. акц. | Рамесьн. | Хатн. прам. | Нетрак. | Фаб.-зав. | Абкл. акц. |
| Віленшчына | 70,8 | 0,9 | 1,1 | 20,3 | 6,9 | 74,2 | 0,6 | 0,4 | 19,0 | 5,8 |
| Віцебшчына | 71,2 | 1,8 | 0,2 | 19,0 | 7,8 | 74,8 | 0,9 | 0,2 | 18,9 | 5,2 |
| Горадзеншчына | 64,8 | 0,7 | 0,1 | 25,4 | 9,0 | 68,0 | 0,5 | 0,1 | 21,5 | 9,9 |
| Меншчына | 82,0 | 0,8 | 0,1 | 7,0 | 10,1 | 81,0 | 0,5 | 0,1 | 11,1 | 7,3 |
| Магілеўшчына | 58,6 | 10,7 | 0,4 | 21,9 | 8,4 | 59,2 | 6,9 | 0,5 | 23,8 | 9,6 |
| Смаленшчына | 42,4 | 6,7 | 0,3 | 40,5 | 10,1 | 47,0 | 3,6 | 0,2 | 4[illegible],1 | 6,1 |
| Беларусь | 68,2 | 2,4 | 0,4 | 20,4 | 8,6 | 70,1 | 1,5 | 0,2 | 20,8 | 7,4 |
| Эўр. Расія | 24,1 | 14,5 | 17,8 | 36,1 | 7,5 | 23,8 | 11,3 | 20,7 | 39,1 | 5,1 |

З табліцы відаць пераважна рамесьніцка-саматужны тып беларускае прамысловасьці (у 1900 г. 70,6% супроць расійскіх 38,6%, а ў 1913 г. 71,6% супроць 35,1%). Рамесьніцтва найбольшую вагу мае на захадзе і поўначы Беларусі (Віл., Мен., Віцэб.), хатнія промыслы—на ўсходзе (Смал., Магіл.). Нетракапальная прамысловасьць мае мізэрную долю ў агульным прыбытку. Прамысловасьць, якая абкладаецца акцызам, на Беларусі ў прамысловым прыбытку займае больш значнае месца, чым у Расіі, але каб сапраўды зразумець яе ролю для Беларусі, трэба паглядзець на адносіны яе да фабрычнае прамысловасьці (табл. № 94).

Табл. № 94

Адносіны пры6. пр-ці абкл. акц. да пры6. фабр. пр-ці (%).

| Губэрні | 1900 г. | 1913 г. |
|---|---|---|
| Віленшчына | 3[illegible],9 | 30,5 |
| Віцебшчына | 41,1 | 27,5 |
| Горадзеншчына | 35,0 | 46,1 |
| Меншчына | 144,3 | 65,8 |
| Магілеўшчына | 38,4 | 40,3 |
| Смаленшчына | 24,9 | 14,2 |
| Беларусь | 41,9 | 35,6 |
| Эўр. Расія | 20,8 | 13,1 |

На Беларусі гэтыя адносіны ўдвая вышэй, чым ў Эўр. Расеі, асабліва на Меншчыне і Магілеўшчыне. З часам роля прамысловасьці, абкладзенай акцызам, зьніжаецца, але на Беларусі зьніжэньне ідзе значна павольней, чым ў 50 губ. Расеі (у 1900 г. адносіны прам. абкл. акц. да фабр.-зав. былі у Расеі 20,8, на Беларусі 41,9, або ў 2 разы вышэй, а ў 1913 г. — 13,1 і 35,6, або вышэй ужо ў 2½ раза).

Калі дадаць, што прамысловасьць, абкладзеная акцызам, перапрацоўвае пераважна мясцовую сел.-гасп. сырызну, значэньне яе ў беларускіх умовах будзе зразумелым. Даволі падзівіцца на табл. № 95,

колькі сел.-гасп. сырызны (тыс. руб.) апрацована ў гэтай прамысловасьці ў 1908 годзе [1]).

Табл. № 95. Спажыта сырызны на тыс. руб.

| Губэрні | Бравары | Выраб драждж. | Піваварні | Выраб гарэлкі | Медаварні | Усе разам |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Віленшчына | 1.257,6 | 327,6 | 597,1 | — | — | 2.182,2 |
| Віцебшчына | 330,7 | — | 160,4 | 14,0 | — | 505,1 |
| Горадзеншчына | 1.295,8 | 166,6 | 467,8 | — | 24,5 | 1.954,7 |
| Меншчына | 2.460,0 | 383,9 | 94,7 | — | 23,5 | 2.962,1 |
| Магілеўшчына | 1.566,9 | 54,3 | 119,5 | -- | — | 1.740,7 |
| Смаленшчына | 766,8 | — | 388,4 | 20,0 | — | 1.175,2 |
| Беларусь | 7.677,8 | 932,4 | 1.827,9 | 34,0 | 48,0 | 10.520,0 |

Сельская гаспадарка Беларусі мела ў прамысловасьці, абкладзенай акцызам, сталы унатраны рынак, які забіраў 10 - 11 мільёнаў яе прадукцыі. Што гэта вельмі паважаны спажывец, будзе відаць з таго, якую гэта долю складае ад усяе таварнае часткі сел.-гасп. прыбытку: у 1913 г. сельская гаспадарка Беларусі аддала на рынак 130.107,1 тыс. сваёй прадукцыі, у тым ліку—збожжа на 15.824,0 тыс. руб., гандлёва-прамысл. культур на 39.122,7 тыс. руб.—значыцца, на прамысловасьць ішла $^1/_{10}$ таварнага сел.-гасп. прадукта, або $^2/_3$ ад збожжа і $^1/_4$ ад тэхнічных расьлінаў (лён і пянька спажываліся, апрача таго, у беларускай тэкстыльнай прамысловасьці—у 1908 годзе на 1.481,8 тыс. руб).

**Шляхі зносін і сувязі.** Сюды залічаецца прыбытак ад:

1) чыгунак,
2) рэчнага флёту,
3) сухаземнага коннага транспарту (хурманкі) і
4) ад почты і тэлеграфу.

Падлічэньне прыбытку ад транспорту найболей цяжка, чым ад усіх галін і найболей павінна выклікаць спрэчак. Бо беларускія чыгункі, напр., пераважна транзітавыя, і колькі ад іх прыбытку трэба залічыць на долю Беларусі — невядома. Падзяліць-жа беларускі прыбытак між бел. губэрнямі правільна зусім немагчыма: флёт не падзяляецца па губэрнях, чыгункі абслугоўваюць некалькі губэрняў, станцыі, якія стаяць у межах аднае губэрні, прынімаюць тавары (а значыцца—атрымоўваюць і прыбытак) з другое губэрні і г. д.

Чыгункі. Табл. № 96 паказвае даўжыню чыгунак у розных губэрнях [2]) (вёрсты):

Табл. № 96

| Губэрні | Ліб.-Ромен. | Палескія | СПБ-Варшаўск. | 1-а грам пад'езд. шлях | Рыга Арл. | Маск.-Бярэсц | Прывіслін | Паўд-Зах. | Раз.-Урал. і інш. | Разам | 1913 г. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Віленшчына | 152 | 125 | 320 | 145 | — | — | — | — | — | 742 | 1075 |
| Віцебшчына | — | -– | 136 | — | 364 | - | — | — | — | 500 | 1142 |
| Горадзеншч. | — | 318 | 198 | — | … | 171 | 60 | 289 | — | 1036 | 1322 |
| Меншчына | 275 | 558 | — | — | - | 263 | — | — | — | 1096 | 1138 |
| Магілеўшчына | 149 | 77 | — | — | 65 | 168 | — | — | — | 459 | 708 |
| Смаленшчына | — | — | — | — | 201 | 298 | — | — | 272 | 831 | 819 |
| Беларусь | 576 | 1078 | 654 | 145 | 630 | 900 | 60 | 289 | 272 | 4664 | 6204 |

[1]) Па Варзару.

[2]) В. Ф. Мейен „Россия в дорож отнош.“ СПБ. 1902 г. Назвы чугунак тагочасныя.

З «Ежегодника М-ва Финансов» за 1903 г., а для 1913 г. с такога ж «Ежегодника» за 1914 г. даведываемся аб гуртавым прыбытку на 1 вярсту па кожнай з чыгунак, што цягнуцца па Беларусі; з гуртавога прыбытку выкідаем страты на 1 вярсту чыгуначнага шляху на дагляд і рамонт за будынкамі, шляхам, тэлеграфам і тэлефонам, ходам паяздоў, рухомымі вагонамі і т. д. Такім чынам, вылічаем «чысты» прыбытак з аднае вярсты, а множаньнем яго на даўжыню чыгункі, якая падае на беларускія абшары, прыбытак ад тэй ці іншай чыгункі ў межах беларус. губэрняў.

Страты на 1 вярсту чыгункі ў 1900 г. ўзяты такімі ж, як і ў 1911 г. з паніжэньнем на агульнарасійскі % (—12,05%). Таму, што падзелу пабудаваных пасьля 1900 году чыгунак па губэрнях я не знайшоў, прыймаю іх прыбытак на 1 вярсту роўным сярэдняму прыбытку ад усіх чыгунак па гэтай губэрні. Табл. № 97 і 98 зьмяшчаюць належныя лічбы (тыс. руб.).

Табл. № 97.

Прыбытак чыгунак у 1900 г.

| Чыгункі | Чыст. прыб на 1 вярсту | Віл. | Віц | Гор | Мен. | Маг. | Смал. | Беларусь |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Лібава-Ромен . . . . | 5.787 | 879,6 | — | — | 1.591,4 | 862,3 | — | 3.333,3 |
| Палескія . . . . . . | 4.690 | 586,3 | — | 1.491,4 | 2.617,0 | 361,1 | — | 5,055,8 |
| С-П. Варшаўск. . . . . | 5.179 | 1.657,3 | 704,3 | 1 025,4 | — | — | — | 3.387,1 |
| Рыга-Арлоўс. . . . . . | 7.490 | — | 2 726,4 | — | — | 486,9 | 1.505,5 | 4.718,7 |
| 1-е т-ва пад'язд. шл. . . | 9.841 | 1.426,9 | — | — | — | — | — | 1.426,9 |
| Маск.-Берасьц. . . . . | 5.830 | — | — | 996,9 | 1.533,3 | 979,4 | 1.737,3 | 5.247,0 |
| Прывісьлінскія . . . . | 18.347 | — | — | 1 100,8 | — | — | — | 1.100,8 |
| Паўд.-Заходнія . . | 3.176 | — | — | 917,9 | — | — | — | 917,9 |
| Разана-Урал і інш. . . | 3.150 | — | — | — | — | — | 888,8 | 888,3 |
| Разам усе . | — | 4.550,1 | 3.430,7 | 5.532,4 | 5.741,7 | 2.689,7 | 4 131,6 | 26 076,8 |

Табл. № 98.

Прыбытак ад чыгунак у 1913 г.

| Чыгункі | Прыб. на 1 вярсту | Віл. | Віц. | Гор. | Мен. | Маг. | Смал. | Белар. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Лібав.-Ромен. . | 11.178,2 | 1 699,1 | — | — | 3.074,0 | 1.665,5 | — | 6.438,5 |
| Палескія . | 3 881,7 | 484,0 | — | 1.231,3 | 2.160,6 | 298,1 | — | 4.174,0 |
| С.-П. Варшаўс. | 8.580,7 | 2.745,9 | 1.167,0 | 1 699,0 | — | — | — | 5.612,0 |
| Рыга-Арлоўск | 11 252,6 | — | 4.096,1 | — | — | 731,4 | 2.261,9 | 7.089,4 |
| І-е т-ва пад. шл. | 2.268,9 | 329,0 | — | — | — | — | — | 329,0 |
| Маск.-Берасц. | 9 649,5 | — | — | 1.650,0 | 2 537,7 | 1.621,0 | 2.875,4 | 8 684,1 |
| Прывісьлін. . . | 9.664,8 | — | — | 579,9 | — | — | — | 579,9 |
| Паўд.-Заходнія | 12 864,1 | — | — | 3.717,7 | — | — | — | 3 717,7 |
| Разана - Урал. і інш . . . | 6 010,8 | — | — | — | — | — | 1.635,0 | 1 635,0 |
| Разам . . . | — | 5.258,0 | 5.263,1 | 8877,9 | 7.772,3 | 4.316,0 | 6.772,3 | 38.259,6 |
| Прыбытак на 1 вяр. руб. | | 1.628,7 | 4 608,7 | 6 715,5 | 6 829,8 | 6 096,0 | 8.269,0 | — |
| Пабудов. новых чыгун. вяр. . . . . . . . . . | | 4.891,1 | 642 | 286 | 42 | 249 | —12 | 1.540 |
| Прыбыт. з нов чыгун. . | | 333 | 2.985,8 | 1 920,6 | 286,9 | 1.517,9 | — | 8 312,9 |
| Увесь прыб 1913 г. . | | 6.886,7 | 8.221,8 | 10.798,5 | 8.059,2 | 5.833,9 | 6 772,3 | 46 572,5 |

За гэтыя 13 гадоў фрахты узьняліся на 28,2%. Калі пакінуць іх такімі, як у 1900 г., тады прыбытак ад чыгунак будзе:

Табл. № 99.

| Губэрні | Прыбыт. у 1913 г. |
|---|---|
| Віленшчына | 4.983,1 |
| Віцебшчына | 5.949,3 |
| Горадзеншчына | 7.813,7 |
| Меншчына | 5.831,5 |
| Магілеўшчына | 4 221,3 |
| Смаленшчына | 4 900,4 |
| Беларусь | 33 699,3 |

Рэчны флёт. Па перапісу 1900 г. аб рэчным флёце басэйнаў, у склад якіх уваходзіць Беларусь, былі здабыты гэткія веды.

Табл. № 100.

| Басэйны | Усіх судоў | Іх пад'ём здольн. (т. пуд.) | Першапачатковы кошт (т. руб.) | На іх служыла чалавек |
|---|---|---|---|---|
| Дняпро | 2.561 | 32.857 | 21.470 | 3.837 |
| Зах. Дзьвіна | 881 | 3.087 | 4.194 | 771 |
| Нёман | 448 | 2 470 | 833 | 107 |
| Разам | 3.890 | 38.414 | 26 497 | 4.715 |

Паўстае пытаньне, як вылучыць долю Беларусі? Есьць некалькі магчымасьцяў. Можна вылучыць: 1) па агульнаму пляцу басэйна, 2) па судаходнай даўжыні рэчак, 3) па вазе перавезеных грузаў, 4) па колькасьці пудавёрст, 5) па вартасьці грузаў. Першы спосаб самы грубы і відавочна няварты каб ім карыстацца; трэці спосаб можна б было ужыць толькі для басэйнаў з аднакавым складам грузаў па кошту і аднакавым прабегам грузаў—але калі узяць лічбы перавозак па вадзе у 1900 г. па „Ежегоднику М. Ф. за 1903 г.“ і кошт перавозак па Мейену, адразу можна заўважыць, што па Дняпру перавозяцца найбольш каштоўныя грузы, пераважна збожжа, па З. Дзьвіне, Сожу, Дзясьне, Нёмну—вельмі танныя, блізка што выключна дровы ды лясавыя матар'ялы — значыцца і трэці спосаб ня годны; пяты—самы лепшы, але ацэнкі грузаў па губэрнях няма і таму выкарыстаем другі і чацьверты спосабы. Вось якая судаходная даўжыня басэйнаў прыпадае на беларускія абшары:

Табл. № 101.

| Басэйны | Агульная даўжая судоход. | Віл. | Віц. | Гор. | Мен. | Маг. | Смал. | Беларусь | Прыбл. доля Бел |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Немна . . . . . . | 1021 | 494 | — | 140 | 144 | — | — | 778 | 0,8 |
| Зах. Дзьвіны . . . . | 1442 | (70)[1] | 819 | — | — | — | 150[3]) | 969 | 8,7 |
| Дняпра . . . . . . . | 4690 | — | — | — | 1182[2]) | 986 | 361 | 2529 | 0,5 |
| Разам . | 7153 | 494 | 819 | 140 (1008[4]) | 1326 | 986 | 511 | 4276 | — |

Якая частка з названых басэйнаў належыць да Беларусі па колькасьці пудавёрст, відаць з табл. № 102 (па «Сборник М.П.С. вып. 120).

Табл. № 102.

Лік пудавёрст у мільёнах у 1912 г.

| Басэйны | Белерус. частка басэйну | Увесь бас. | Бел. частка | % бел. |
|---|---|---|---|---|
| Немна . . . . . . . . . | Да суточкі р. Мерачанкі . | 33.663,1 | 17.381,9 | 51,6 |
| Заход. Дзьвіны . . . | Да Краслаўкі . . . . . | 42.269,2 | 21.100,0 | 49,9 |
| Дняпра . . . . . . . . . | Да суточкі Прыпяці . . | 74.792,8 | 31.308,7 | 41,8 |

Таму, што па Дняпру на Украіне ідуць больш дарагія тавары, а таксама мажліва па Нёмну і Дзьвіне каля іх утокаў, бярэм ад Нёмна і Дзьвіны на Беларусь палову іх рэчных флётаў, а ад Дняпра траціну. Прыбытак гаспадароў флёту прыймаем за 20% ад першапачатковага кошту судна, заробак матросаў і інш. Служачых у флёце, як і фабр. рабочага — 190 руб. Між губэрнямі прыбытак распарадкуем так: Нёман між Віл. і Горад. пароўні, Дзьвіну—цалком Віцебшчыне, Дняпро—1/8 частка Смаленшч., 1/3—Магіл., 13/24—Меншчыне.

Табл. № 103

Лічбы прыбытку ў табл. (тыс. руб.)

| Губэрні | 1900 г. | 1913 г. | 1913 г па ц. 1900г.[5]) |
|---|---|---|---|
| Віленшчына . . . . . | 46,7 | 90 8 | 61,3 |
| Віцебшчына . . . . . | 490,7 | 953,4 | 643,2 |
| Горадзеншчына . . . | 46,7 | 90,8 | 61,3 |
| Меншчына . . . . . . | 903,8 | 1.752,4 | 1.182,3 |
| Магілеўшчына . . . . . | 558,1 | 1.080,5 | 729 0 |
| Смаленшчына . . . . . | 212,3 | 408 6 | 275,7 |
| Беларусь . . | 2 258,2 | 4.376,6 | 2 952,8 |

[1]) Па мяжы з Віцеб.
[2]) Па мяжы з Магіл. 230 верст.
[3]) Зах. Дзьвіна, Обша, Межа.
[4]) Горадзен. у бас. Віслы
[5]) Узрост фрахтаў агульны з Расіей.

Почта й тэлеграф. Прыбытак ад почты й тэлеграфа даецца належнай статыстыкай толькі па ўсёй б. імперыі. Доля Беларусі вылічаецца ў 1900 г. па % лістоў, якія ідуць у беларус. губэрні, а ў 1913 г. па % грашовых пераводаў.

Табл № 104.

Прыбытак ад пошты й тэлеграфа (тыс. руб.)

| Губэрні | % ад Э. Р. | 1900 г. | % ад Э. Р. | 1913 г. |
|---|---|---|---|---|
| Віленшчына | 1,94 | 550,0 | 1,49 | 1.048,5 |
| Віцебшчына | 1,48 | 419,6 | 1,08 | 760,0 |
| Горадзеншчына | 2,44 | 691,7 | 1,24 | 872,6 |
| Меншчына | 1,68 | 476,3 | 1,71 | 1.203,4 |
| Магілеўшчына | 1,12 | 317,5 | 1,05 | 738,9 |
| Смаленшчына | 1,11 | 314,7 | 0,90 | 633,4 |
| Беларусь | 9,77 | 2 769,8 | 7,47 | 5.256,8 |
| Эўр. Расія | 100 | 28.349,0 | 100 | 70.372,4 |

Сухаземны конны транспорт. Лік асоб, занятых хурманачным промыслам, вызначаем па перапісу 1897 г., а для 1913 г. павялічваем яго па % павялічэньня ўсіх насельнікаў. Вытвор хурмана лічым роўным вытворчасьці фабрычнага рабочага. Вылічэньні ў табл. № 105.

Табл № 105

| Губэрні | Лік хурм. 1900 г. | Лік хурм. 1913 г. | Прыб. 1900 г. | Прыб 19.3 г. | Пр. 1913 г. па ст. ц. |
|---|---|---|---|---|---|
| Віленшчына | 3.551 | 4.630 | 1.570,0 | 2.956,0 | 2.557,0 |
| Віцебшчына | 3 082 | 4.007 | 925,0 | 2.465,0 | 2.121,0 |
| Горадзеншчына | 3 289 | 4.164 | 1,171,0 | 2 300,0 | 2.042,0 |
| Меншчына | 5.992 | 8.437 | 2 096,0 | 4 807,0 | 4 370,0 |
| Магілеўшчына | 2.632 | 3.801 | 1.096,0 | 2 393,0 | 2 088,0 |
| Смоленшчына | 1 376 | 1.920 | 489,0 | 1 361,0 | 1.198,0 |
| Беларусь | 18 922 | 26 959 | 7.347,0 | 16 282,0 | 14 376,0 |

Увесь прыбытак ад транспарту. Лічбы прыбытку ад усіх відаў шляхоў зносін і сувязі сабраны ў табл. № 106 (тыс. руб.).

Табл. № 106

| Губэрні | 1900 г. | 1913 г. | 1913 г па ц. 1900 г. |
|---|---|---|---|
| Віленшчына | 6 716,8 | 10 982,6 | 8 649,9 |
| Віцебшчына | 5.266,0 | 12 400,4 | 9 473,5 |
| Горадзеншчына | 7.441,8 | 14 061,9 | 10 789,6 |
| Меншчына | 9.217,8 | 15 822,0 | 12 587,2 |
| Магілеўшчына | 4 661,3 | 10 046,3 | 7 777,2 |
| Смаленшчына | 5.147,6 | 9 177,3 | 7 007,5 |
| Беларусь | 38.451,3 | 72 489,8 | 56 284,9 |

**Будауніцтва.** У прыбытак ад будаўніцтва залічаецца прыбытак ад карыстаньня пабудаванымі дамамі і прыбытак ад будаўнічае працы. Лічбы прыбытку ад ўсёй гарадзкой маемасьці за 1900 г. бяруцца з «Опыта приблизительного исчисления размеров народного дохода по различным его источникам», а за 1913 г. па выданьню Д-та абкл. збораў «Статистика прямых налогов за 1912 г. Промысловый налог»[1]). Лік рабочых у будаўніцтве вызначаецца па перапісу 1897 г. і ўзросту насельніцтва; вытвор аднаго рабочага лічыцца, як і ў фабрычнай прамысловасьці. Каб пазбавіцца ад павялічэньня цэн прыбытак ад дамоў 1900 г. павялічываецца на % узросту дамоў[2]). Вылічэньні аб'яднаны ў табл. № 107.

Табл. № 107.

| Губэрні | 1900 г. | 1913 г. | 1913 г. па ст. ц. | ±% |
|---|---|---|---|---|
| Віленшчына . . . . . . | 3.834,9 | 5.921,2 | 4.205,4 | 54,4 |
| Віцебшчына . . . . . . | 2.021,8 | 3.714,2 | 3.337,1 | 83,7 |
| Горадзеншчына . . . . | 2.454,7 | 5.397,8 | 4.498,2 | 119,9 |
| Меншчына . . . . . . | 2.272,3 | 4.424,9 | 3.435,5 | 94,9 |
| Магілеўшчына . . . . | 2.025,7 | 2.895,7 | 2.439,5 | 42,9 |
| Смаленшчына . . . | 2.604,6 | 2.127,7 | 2 075,8 | —18,3 |
| Беларусь . . | 15.214,0 | 24.481,5 | 19.991,5 | 60,9 |

У «Опыте» павялічэньне вытвору ад будаўніцтва зроблена па сярэдняму % узроста дамоў і кватэр. У табл. № 108 і для Беларусі паданы лічбы аб дамох і кватэрах і іх узросьце.

Табл. № 108.

| Губэрні | Лік дамоў | | Лік кватэр | | Узрост +% | | На 1 д кват. у 1912 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1901 г. | 1912 г. | 1901 г. | 1912 г | дамоў | кват. | |
| Віленшчына . . . . . | 7.936 | 11.180 | 21.676 | 42.574 | 40,8 | 96,4 | 3,8 |
| Віцебшчына . . . . . | 16.695 | 18.586 | 33.349 | 35.243 | 11,3 | 5,7 | 1,9 |
| Горадзеншчына . . . | 14.115 | 16.943 | 45.976 | 47.090 | 20,0 | 2,4 | 2,8 |
| Меншчына . . . . . | 17.815 | 19.737 | 37.996 | 48.950 | 10,8 | 28,8 | 2,5 |
| Магілеўшчына . . . . | 14.894 | 17.445 | 22.552 | 26.773 | 17,1 | 18,7 | 1,5 |
| Смаленшчына . . . | 12.166 | 12.465 | 18.513 | 19.595 | 2,5 | 5,8 | 1,6 |
| Беларусь . . . | 83.711 | 96.365 | 180.062 | 220.225 | 15,1 | 22,3 | 2,3 |

У Расіі колькасьць дамоў вырасла на 50%, а кватэр на 28%—больш, чым на Беларусі. Дамы на Беларусі вырасьлі болей ўсяго ў заходніх губэрнях, што стаіць безумоўна ў сувязі з разьвіцьцём гарадзкога жыцьця. Аб характары гарадоў беларускіх яскрава сьведчыць апошні радок—сколькі кватэр у доме. Чым бліжэй да Заходняй Эўропы, тым глыбей індустрылізацыя губэрні, чым шыбчэй растуць старыя гарадзкія асяродкі,—тым большымі будуюцца дамы (бо гарадзкая зямля падаражэла), тым больш у іх кватэр. Гэта ізноў падкрэсьлівае тую думку, што ўсе бакі грамадзкага

[1]) У Пракаповіча тут зноў недакладнасьць: за 1900 г. бярэцца прыбытак са ўсяе гарадзкое маемасьці, а за 1912 г. толькі прыбытак з дамоў. Параўнаваньні тут немажлівы.

[2]) „Ежегодник М. Ф." за 1903 і 1914 г.

жыцьця цесна зьвязаны і што любая соцыялёгічная функцыя можа быць пакажчыкам эканамічнага разьвіцьця і добрабыту краіны.

У табл. № 109 з гуртаваны лічбы аб прыбытку будаўнічых рабочых.

Табл. № 109.

| Губэрні | Лік буд. раб | | Вытвар 1913 па ст. ц. на 1 рабоч. | | Прыбытак (тыс. руб.) | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1900 г. | 1913 г. | руб | к. | 1900 г. | 1913 г. | 1913 па ц. 1900 |
| Віленшчына . . . . . . | 7.124 | 9.290 | 552 | 28 | 3.150,0 | 5.931,0 | 5.130,7 |
| Віцэбшчына . . . . . . | 9.608 | 12.490 | 529 | 31 | 2.883,6 | 7.682,1 | 7.140,4 |
| Горадзеншчына . . . . | 6.500 | 8.229 | 490 | 48 | 2.313,4 | 4.544,7 | 4.036,2 |
| Меншчына . . . . . | 6.891 | 9.702 | 517 | 98 | 2.410,9 | 5.528,0 | 5.025,4 |
| Магілеўшчына . . . . . | 5.315 | 7.675 | 549 | 40 | 2.213,9 | 4.832,3 | 4.216,6 |
| Смаленшчына . . . . . | 5.774 | 8.055 | 624 | 06 | 2.051,0 | 5.710,4 | 5 026,8 |
| Беларусь . . . . | 41.212 | 55.441 | 540 | 81 | 15.022,8 | 34.228,5 | 30.576,1 |

А ўвесь прыбытак ад будаўніцтва падлічан у табл. № 110 (тыс. руб.).

Табл. № 110.

| Губэрні | 1900 г. | 1913 г. | 1913 г. па ст. ц | +проц. |
|---|---|---|---|---|
| Віленшчына . . . . . . | 6.984,9 | 11.852,2 | 9.336,1 | 69,7 |
| Віцебшчына . . . . . | 4.905,4 | 11.396,3 | 10.477,5 | 132,3 |
| Горадзеншчына . . . . | 4.768,1 | 9.942,5 | 8.534,4 | 108,5 |
| Меншчына . . . . . . | 4.683,2 | 9.95?,9 | 8.460,9 | 112,5 |
| Магілеўшчына . . . | 4.639,6 | 7.728,0 | 6.656,1 | 82,3 |
| Смаленшчына . . . . . | 4.655,6 | 7.838,1 | 7.102,2 | 68,4 |
| Беларусь . . . | 30.236,8 | 58.710,0 | 50.567,6 | 94,2 |

Засталося падлічыць прыбытак толькі ад аднае галіны гаспадаркі—гандлю.

**Гандаль.** Гандлёвы нар. прыбытак складаецца з прыбытку ад таварнага гандлю і дзяржаўнага манапольнага гандлю гарэлкаю і сьпіртам. Веды аб таварным гандлю знаходзім у выд. М. Ф. Д-ту гандлю і мануфактур „Статист. результаты процентного и раскладочного сборов за 1896, 97 и 98 г г.» і ў выд. М. Ф. «Статистика прямых налогов и пошлин. Госуд. промысловый налог за 1912 год». Адтуль бярэм лічбы гандлёвага звароту, прыбылі і % прыбылі. Паказаную ў статыстыцы прыбыль Пракаповіч падвойвае—і гэта лічыць народ. прыбыткам ад гандлю. Пералічэньні на старыя цэны робіцца па тых коэфіцыэнтах, якія паказаны ў табл. № 77.

Табл. № 109.

Прыбытак ад гандлю таварнага ў 1900 г. (тыс. руб.).

| Губэрні | Зварот | Прыбыль | % пр. | Нар прыбыт. |
|---|---|---|---|---|
| Віленшчына . . . . | 79 900,6 | 3.816,8 | 4,8 | 7.633,6 |
| Віцебшчына . . . | 49.047,9 | 2.575,3 | 5,3 | 5.150,6 |
| Горадзеншчына . . . | 29.711,3 | 2.276,0 | 7,7 | 4.552,0 |
| Меншчына . . . | 46.548,6 | 4.561,5 | 9,8 | 9.123,1 |
| Магілеўшчына . . . | 18.936,6 | 1.597,8 | 8,4 | 3.195,7 |
| Смаленшчына . . . | 33.097,6 | 1.683,6 | 5,1 | 3.367,2 |
| Беларусь | 257.242,6 | 16.511,0 | 6,4 | 33.022,2 |

Табл. № 110 зьмяшчае лічбы прыбытку тавар. гандлю за 1913 год.

Табл. № 111.

| Губэрні | Зварот | Прыбыль | % пр. | Нар. прыб. | Пав.звар. | Пав прыб.пер. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Віленшчына . . . | 60.388,4 | 5 094,6 | 8,4 | 10.189,2 | −24,4 | 33,5 |
| Віцебшчына . . . . | 98.876,1 | 4.567,7 | 4,6 | 9.135,4 | 101,6 | 77,4 |
| Горадзеншчына . . | 59.831,4 | 6.497,6 | 10,9 | 12.995,2 | 101,4 | 185,5 |
| Меншчына . . . . . | 95.067,8 | 4.532,8 | 4,8 | 9.065,6 | 104,2 | −0,6 |
| Магілеўшчына . . . | 38.373,3 | 3.281,9 | 8,6 | 6.562,8 | 102,6 | 105,4 |
| Смаленшчына . . . | 59.594,7 | 3 768,5 | 6,3 | 7.537,0 | 80,1 | 123,8 |
| Беларусь . | 412.131,2 | 27.743,0 | 6,7 | 55.485,2 | 60,2 | 68,0 |

Згодна «Статистики казенной винной операции», або «Статистики по казенной продаже питей»—працавала ў скарбовай манаполіі:

Табл. № 112.

| Губэрні | Служ. ў акц упр. | | Служ. на склад. | | Прадаюць | | Рабочыя | | Усіх | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1903 г | 1913 г. | 1903 г. | 1913 г. | 1903 г. | 1913 г. | 1903 г | 1913 г. | 1903 г | 1913 г |
| Віленшчына . . | 4 | 4 | 62 | 35 | 331 | 284 | 221 | 208 | 618 | 531 |
| Віцебшчына . . . | 4 | 4 | 73 | 65 | 397 | 363 | 270 | 308 | 744 | 740 |
| Горадзеншчына . | 4 | 4 | 66 | 58 | 350 | 288 | 231 | 201 | 654 | 551 |
| Меншчына . . . | 6 | 4 | 107 | 44 | 579 | 540 | 351 | 285 | 1043 | 873 |
| Магілеўшчына . . | 4 | 4 | 88 | 66 | 470 | 371 | 260 | 292 | 822 | 733 |
| Смаленшчына . | 4 | 2 | 99 | 91 | 576 | 509 | 520 | 394 | 1199 | 996 |
| Беларусь . | 26 | 22 | 495 | 359 | 2703 | 2355 | 1856 | 1688 | 5080 | 4424 |

Чыстую вытворчасьць аднаго працаўніка лічым такою-ж, як у прамысловасьці. У такім разе ўся іх вытворчасьць будзе выяўлена лічбам табл. № 113.

Табл. № 113.

Вытвор скарб. продажы гарэлкі і сьпірту.

| Губэрні | 1900 г. | 1913 г. | 1913 г. стар. ц. |
|---|---|---|---|
| Віленская . . . . . . . | 273,3 | 339,0 | 293,3 |
| Віцебская . . . . . . . | 223,3 | 455,1 | 391,7 |
| Горадзенская . . . . . | 232,8 | 304,3 | 270,3 |
| Менская . . . . . . . | 364,1 | 497,4 | 452,2 |
| Магілеўская . . . . . . | 342,4 | 461,5 | 402,7 |
| Смаленская . . . . . . | 425,9 | 706,1 | 621,6 |
| Беларусь . . . . | 1.862,5 | 2.763,8 | 2 431,7 |

Табл. № 114.

А ў табл. № 114 пад‘агулім увесь прыбытак ад гандлю.

| Губэрні | 1900 г | 1913 г. | 1913 г. стар. ц. |
|---|---|---|---|
| Віленская . . . . . . . | 7 906,9 | 10.528,2 | 8 012,3 |
| Віцебская . . . . . . . | 5 373,9 | 9 590,5 | 7.260,5 |
| Горадзенская . . . . . | 4 784,9 | 13 299,5 | 10 600,3 |
| Менская . . . . . . . | 9 888,0 | 9 563,0 | 7.981,8 |
| Магілеўская . . . . . . | 3 538,1 | 7.024,3 | 5 455,7 |
| Смаленская . . . . . . | 3.793,1 | 8 243,1 | 6.517,6 |
| Беларусь . . . . | 33 884,9 | 58.248,6 | 45 828,1 |

Я сумысьля не падаю ў апошніх некалькіх галінах вырабу адносных лічбаў аб узросьце прыбытку, цэн і вытвару, — з тым, каб паказаць іх у параўнаваньні з усімі галінамі народнае гаспадаркі. Гэта ўжо можна зрабіць зараз.

# Разьдзел другі.

**Увесь прыбытак народнае гаспадаркі.** Абсолютныя лічбы народнага прыбытку паасобку па кожнай галіне лічу непатрэбным выпісваць нанова, бо яны ўжо былі паданы ў тэксьце. У табл. № 115 зьмяшчаю гэтыя лічбы па ўсяму народнаму прыбытку, разам па ўсіх галінах:

Табл. № 115.

Увесь народн. прыбытак (тыс. руб.).

| Губэрні | 1900 г | 1913 г. | 1913 г. па стар. ц. |
|---|---|---|---|
| Віленская . . . . . | 99.784,2 | 169.037,2 | 121.835,7 |
| Віцебская . . . . | 78 315,1 | 151 897,7 | 109.618,2 |
| Горадзенская . . . . | 93 128,7 | 173 639,8 | 132.718,4 |
| Менская . . . . . | 131.790 9 | 228 055,8 | 176.333,4 |
| Магілеўская . . . . | 78 287,2 | 155 194,6 | 110.453,6 |
| Смаленская . . . . | 85 612,0 | 163 728,0 | 119 554,5 |
| Беларусь . . | 566.918,1 | 1.041 553,2 | 770.513,7 |
| Эўр. Расія . . | 6 579 633,0 | 11 805.545,0 | 9.170.298,0 |

Нацыян. прыбытак Беларусі за кругабег 1900 — 1913 г. г. вырас з шасьцісот мільёнаў рублёў да 1 мільярду 100 мільёнаў! З 8,9% ад агульнарасійскага да 9,0%. Параўнаем рост прыбытку па асобных галінах і па асобных губэрнях. Гэта можна зрабіць па лічбах табл. № 116.

Табл. № 116.

Узрост нар. прыбытку з 1900 г. да 1913 г. у %%.

| Галіны | Віл | Віц | Гор | Мен. | Маг. | Смал | Бел. | Э. Расія |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Сельская гаспадар. . . | 77,8 | 86,9 | 83,6 | 74,7 | 107,3 | 91,6 | 86,5 | 88,5 |
| Лес . . . . . . . . . . | 37,4 | 31,8 | 37,4 | 45,5 | 45,5 | 31,8 | 40,3 | 32,1 |
| Рыба . . . . . . . . . | 185,9 | 100,0 | 185,9 | 186,1 | 6,7 | — 6,7 | 98,0 | — 33,7 |
| Прамысловасьць . . . . | 79,8 | 153,9 | 87,4 | 132,1 | 115,6 | 151,3 | 111,6 | 83,0 |
| Шляхі зносін і сувязі | 63,5 | 135,5 | 89,0 | 71,6 | 115,5 | 78,3 | 88,5 | 98,9 |
| Будаўніцтва . . . . | 69,7 | 132,3 | 108,5 | 112,5 | 82,3 | 68,4 | 94,2 | 78,1 |
| Гандаль . . . . . . . | 33,2 | 78,4 | 177,9 | 0,8 | 38,6 | 117,3 | 71,9 | 74,6 |
| Уся нар. гаспадарка . | 69,4 | 93,9 | 86,4 | 73,1 | 98,3 | 91,3 | 83,7 | 79,4 |

Параўнальна з Расіяй на Беларусі шыбчэй узрастае прыбытак ад лесу, прамысловасьці, будаўніцтва, рыбы і троху цішэй ад сельскае гаспадаркі і ад гандлю; агульны-ж прыбытак шыбчэй на 4—5%. У абедзьвюх краінах наймацней узрастаюць будаўніцтва, шляхі зносін, прамысловасьць, потым-жа сельская гаспадарка,—гэта значыць, што роля сельскае гаспадаркі павінна зьмяншацца, што абедзьве краіны ідуць па шляху гаспадарчага прогрэсу, індустрыялізацыі. З паасобных беларускіх губэрняў найбольшы гаспадарчы росквіт выяўляюць ўсходнія: Магіл.+98,3%, Віцебшчына +93,9%, Смаленшчына+91,3%. Вылучыць, якая частка прыбытку павялічана шляхам экстэнсіфікацыі, якая — шляхам інтэнсіфікацыі, немагчыма па ўсіх галінах; але пэўна можна сказаць, што гаспадарчы ўзрост усходу Беларусі—гэта экстэнсіўны ўзрост. Па ўсіх губэрнях найвялікшы ўздым дае прамысловасьць, будаўніцтва, шляхі зносін; уздым сельскае гаспадаркі—найбольшы на Ўсходзе. Табл. №№ 117, 118 паказваюць, як узрасьлі цэны і вытвор.

Табл. № 117.

Цэны (± %).

| Галіны | Віл. | Віц. | Гор. | Мен. | Маг. | Смал. | Бел. | Расія |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Сельск. гаспадар. . . . | 54,5 | 56,3 | 44,0 | 34,8 | 61,0 | 47,3 | 47,1 | 40,9 |
| Лес . . . . . . . . . . | 37,4 | 31,8 | 37,4 | 45,5 | 45,5 | 31,8 | — | 32,1 |
| Рыба . . . . . . . . . | 185,9 | 100,0 | 185,9 | 186,1 | — 6,7 | — 6,7 | + 98,0 | — 18,3 |
| Прамыслов. . . . . . . | 14,8 | 17,2 | 11,8 | 12,3 | 13,8 | 12,8 | 13,3 | 12,5 |
| Шляхі зносін . . . . . | 27,0 | 30,9 | 30,3 | 25,7 | 29,2 | 31,0 | 28,8 | 31,5 |
| Будаўніцтва . . . . . | 26,9 | 8,8 | 16,5 | 17,6 | 16,1 | 10,3 | 16,1 | 19,7 |
| Гандаль . . . . . . . . | 31,4 | 32,1 | 25,4 | 19,8 | 28,8 | 26,4 | 27,1 | 24,5 |
| Разам . . . . | 37,9 | 38,6 | 30,0 | 29,4 | 40,5 | 36,9 | 35,2 | 28,7 |

Табл № 118.

Вытвор (± %).

| Галіны | Віл. | Віц. | Гор. | Мен. | Маг. | Смал | Бел. | Расія |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Сельск. гаспадар. . . . | 13,1 | 19,7 | 27,6 | 29,6 | 37,4 | 30,1 | 26,5 | 33,8 |
| Лес . . . . . . . . . . | — | — | — | — | — | — | — | — |
| Рыба . . . . . . . . . . | — | — | — | — | — | — | — | — |
| Прамыслов. . . . . . . | 56,7 | 116,6 | 67,6 | 106,7 | 89,5 | 122,9 | 86,7 | 62,2 |
| Шляхі зносін . . . . . | 22,8 | 79,9 | 44,9 | 36,5 | 66,9 | 36,1 | 46,4 | 51,4 |
| Будаўніцтва . . . . . | 33,7 | 113,6 | 79,0 | 80,7 | 57,0 | 52,6 | 67,2 | 48,8 |
| Гандаль . . . . . . . | 1,4 | 35,1 | 121,6 | — 15,9 | 54,2 | 71,8 | 35,3 | 40,7 |
| Разам . . . . . | 22,1 | 40,0 | 42,5 | 33,8 | 41,1 | 39,7 | 36,1 | 39,4 |

Калі ня прымаць пад увагу ўзрост цэн на рыбу (бязумоўна, значна перавялічаны і няпэўны), дык можна папершае ўбачыць, што ў абедзьвюх краінах цэны на сел.-гасп. прадукцыю далёка папярэдзілі ўсе іншыя, а найбольш цэны на прамысловыя вырабы. Быў якбы ўхіл да стварэньня «нажнічак наадварот», ухіл вельмі характэрны для ўсяе сусьветнае гаспадаркі перад вайною. За сельскай гаспадаркай па ўздыму цэн ідзе лес, потым шляхі зносін, гандаль, будаўніцтва, прамысловасьць. Такую-ж самую законаўпарадкаванасьць можна заўважыць і па асобных беларускіх губэрнях.

Зразумелымі таму становяцца і лічбы табл. № 118. Рост вытвару, дзе ўжо няма ўплыву цэн, найбольшы ў тых галінах, дзе цэны вырасьлі найслабей: прамысловасьць (на Беларусі +86,7%, ў Расіі +62,2%), будаўніцтва (+67,2% і +48,8%), шляхі зносін (46,4% і 51,4%), гандаль (31,1% і 40,7%) і потым ужо сельская гаспадарка (26,5% і 33,8%). А таму што на Беларусі, дзе рыначныя ўмовы, дзякуючы блізкасьці заходня-эўрапэйскага рынку, найбольш спрыяюць цэны, вырасьлі шыбчэй, чым у Расіі,—рост вытвару ў ей наогул меншы, чым у Расіі (+35,8% супроць +39,4%), але не на гэткі вялікі %, каб даць падставы для пэсімізму. Тым больш, што ў рэальных экономічных узаемаадносінах старонак рэальнасьцю зьяўляецца рубель прыбытку, сучасная цана, сучасны прыбытак; а ён, як было відаць з табл. № 166, вырас нават больш, чым у 50 губэрнях Эўр. Расіі.

Калі мы падзелім увесь вытвар 1900 г. і 1913 г. на колькасьць працаўнікаў за гэтыя гады, мы будзем мець лічбы вытворчасьці працы, коэфіцыэнт росту якіх для цэлае стараны, народу, галіны і г. д. мае нязвычайна вялікае і паказальнае значэньне. Пракаповіч кажа: «гэты коэфіцыэнт мусіць быць найпаважнейшы для краіны»¹). Аб вылічэньні яго—пазьней.

Заўважыўшы, што вытвор, гэтак-жа як і прыбытак, узрастае найбольш на ўсходзе Беларусі (выключэньне—Горадзеншчына), падзівімся, які быў склад народ. прыбытку ў 1900 г., 1913 г. і 1913 г. з пералічэньнем на цэны 1900 г.—табл. №№ 119, 120, 121.

Табл. № 119.

Склад народн. прыбытку ў 1900 г.

| Галіны | Віл. | Віц. | Гор. | Мен. | Маг. | Смал. | Беларусь | Расія |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Сельск. гасп. | 49,0 | 56,2 | 49,6 | 47,8 | 60,1 | 66,6 | 54,1 | 45,4 |
| Лес | 9,4 | 11,7 | 10,0 | 20,0 | 13,8 | 8,2 | 12,7 | 7,3 |
| Рыбы | 0,1 | 0,4 | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 2,2 |
| Прамыслов. | 19,9 | 11,8 | 22,1 | 14,4 | 10,1 | 9,3 | 14,9 | 21,3 |
| Шляхі зносін | 6,7 | 6,8 | 8,0 | 7,0 | 6,0 | 6,0 | 6,8 | 8,1 |
| Будаўніцтва | 7,0 | 6,2 | 5,1 | 3,5 | 5,4 | 5,4 | 5,4 | 7,2 |
| Гандаль | 7,9 | 6,9 | 5,1 | 7,2 | 4,5 | 4,4 | 6,0 | 8,5 |
| Разам | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 |

¹) „Опыт"..., стар. 68

Табл. № 120.

Склад народн. прыбытку ў 1913 г.

| Галіны | Віл. | Віц. | Гор | Мен. | Маг. | Смал. | Беларусь | Расія |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Сельск. гасп. | 51,5 | 54,2 | 48,9 | 48,3 | 62,7 | 66,7 | 54,8 | 47,8 |
| Лес | 7,6 | 7,9 | 7,4 | 16,8 | 10,1 | 5,6 | 9,7 | 5,4 |
| Рыба | 0,1 | 0,4 | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 0,8 |
| Прамыслов. | 21,1 | 15,5 | 22,2 | 19,3 | 12,2 | 12,2 | 17,2 | 21,7 |
| Шляхі зносін | 6,5 | 8,2 | 8,1 | 6,9 | 5,6 | 5,6 | 7,0 | 8,9 |
| Будаўніцтва | 7,0 | 7,5 | 5,7 | 4,4 | 4,8 | 4,8 | 5,6 | 7,1 |
| Гандаль | 6,2 | 6,3 | 7,6 | 4,2 | 5,0 | 5,0 | 5,6 | 8,3 |
| Разам | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 |

Табл. № 121.

Склад народн. прыбытку Беларусі у 1913 г. па цане 1900 г.

| Галіны | Віл. | Віц. | Гор. | Мен. | Маг. | Смал | Бел. | Расія |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Сел. гасп. | 45,4 | 48,2 | 44,4 | 46,3 | 60,4 | 62,0 | 50,3 | 43,5 |
| Лес | 7,7 | 8,3 | 7,0 | 14,9 | 9,8 | 5,8 | 9,3 | 5,2 |
| Рыба | 0,1 | 0,3 | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 1,3 |
| Прамысл | 25,5 | 18,4 | 26,0 | 22,3 | 13,7 | 14,8 | 20,5 | 24,9 |
| Шляхі зносін | 7,1 | 8,6 | 8,1 | 7,1 | 7,1 | 5,9 | 7,3 | 8,8 |
| Будаўніцтво | 7,6 | 9,6 | 6,5 | 4,8 | 6,0 | 5,9 | 6,6 | 7,7 |
| Гандаль | 6,6 | 6,6 | 7,9 | 4,5 | 4,9 | 5,5 | 5,9 | 8,6 |
| Разам | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 |

З гэтых табліц можна зрабіць некалькі вывадаў. З параўнаваньня складу прыбыткаў Беларусі і Расіі ва ўсіх трох табліцах першае, што заўважаецца, гэта пераважная роля сельскае гаспадаркі ў народнай гаспадарцы абедзьвюх старонак; другое, што роля гэта на Беларусі большая, чым у Расіі; трэцяе, што значэньне сельскае гаспадаркі ў народным вытворы (табл. № 121) з часам зьмяншаецца, але вельмі паціху; чацьвертае, што зьмянішэньне гэта на Беларусі больш шыбкае, чым у Расіі (з 54,1% да 50,3%, або на 7,3%, а ў Расіі з 45,4% да 43,5%, або на 4,2%); а пятае, што дзякуючы магутнаму росту цэн на сельска-гаспадарчую прадукцыю доля сельскай гаспадаркі ў п р ы б ы т к у ня толькі не зьмяншаецца, а нават павялічваецца (павялічэньне ў Расіі большае—роля сел.-гасп. цішэй зьніжаецца).

Прамысловасьць мае ў народ. прыбытку Беларусі значэньне меншае, чым у расійскім прыбытку (14,5% супроць 12,3%), але з часам значэньне гэта на Беларусі павялічваецца шыбчэй, чым у 50 губэрнях (к 1913 г. узрост з 14,9% да 17,2%, або на +15,4, а ў Расіі з 21,3% да 21,7%, або на +1,9%); у прыбытку 1913 г. з пералічэньнем ня старыя цэны прамысловасьць беларуская мае 20,5%, значыцца, узрост яе долі на 37,6%, расійская—24,9% ,павялічэньне на + 14,8%). У зьвязку з тым, што й сельская гаспадарка ў беларускім прыбытку траціць адноснае значэньне шыб-

чэй, чым у расійскім,—гэтыя лічбы сьведчаць аб больш хуткім працэсе індустрыялізацыі Беларусі, чым усяе Эўр. Расіі цалком. Вывод гэты неспадзяваны, але адпавядае супраўднасьці. Пры вылічэньні прыбытку ад прамысловасьці, абкладзенай акцызам, мы мелі пэўныя лічбы; вытворчасьць хатніх промыслаў вызначана без аніякага ўхілу павялічаць; памылка ў падлічэньні прыбытку нетракапальнае прамысловасьці ніякага ўплыву зрабіць не магла; лік рамесьнікаў вызначан мною па падставе перапісу 1897 году хутчэй зьменшаным, чым пабольшаным, і значная памылка магла быць толькі ў азначэньні вытворчасьці аднаго рамесьніка, бо вытворчасьць гэта прынята такою-ж самаю, як у фабрычнага рабочага,— але такім жа спосабам падлічан і расійскі прыбытак, значыцца, магчымая памылка пры параўнаньні траціць сваю вагу; прыбытак жа фабрычнае прамысловасьці бязумоўна паменшан, бо лік рабочых у ей мы вызначалі згодна лічбаў фабрычнае інспэкцыі (з якіх адкідаўся лік рабочых у галінах, на якія накладаўся акцыз), а ведама, што фабрычныя інспэктары зьбіралі веды не аб усёй прамысловасьці, а толькі аб больш буйнай. Вось доказ—у памянёных «Стат.-эконом. очерках областей, губерний и городов России» пад рэдак. праф. Л. М. Яснапольскага паказаны вось якія лічбы ўсіх рабочых і тых, якія стаяць пад наглядам фабрычнае інспэкцыі:

Табл. № 122.

| Губэрні | Які год | Лік усіх рабочых | Пад нагл. фабр. інсп. |
|---|---|---|---|
| Віленшчына . . . | 1908 | 13.000 | 9.000 |
| Віцебшчына . . . | 1909 | 9.200 | 6.176 |
| Горадзеншчына . . . | 1909 | 20.000 | 13.518 |
| Меншчына . . . | 1909 | 10.307 | 9.399 |
| Магілеўшчына . . . | 1908 | 12.3 8 | 7.364 |
| Смаленшчына . . | 1909 | 14.276 | 11.049 |
| Беларусь . | 1908 -09 | 79.101 | 56.506 |

Толькі самае шчодрае падлічэньне рамесьніцкае прамысловасьці, куды павінны былі трапіць і рабочыя, што не стаялі пад наглядам інспэкцыі, можа пазбавіць ад паказанай у табл. № 122 памылкі—зьмяншэньня ліку рабочых. А што ў мяне лічбы рамесьнікаў ня «шчодрыя», пакажа параўнаньне па трох губэрнях ліку рамесьнікаў у 1908—9 г.г. па праф. Яснапольскаму[1]) і ў 1913 г. на маіх падлічэньнях:

| | 1908—09 г.г. | 1913 г. |
|---|---|---|
| Віленшчына . . . . . | 30,5 тыс. рамес. | 41,4 тыс. |
| Горадзеншчына . . . | 60,25 » » | 47,5 » |
| Меншчына . . . . . | 50,0 » » | 62,7 » |
| Разам . . | 140,75 тыс. рамес. | 151,6 тыс. |

За пяць гадоў лік рамесьнікаў павінен быў-бы значна больш вырасьці, чым на 11 тысяч (гэта без дадатку ліку рабочых, зьменшаных фабр. інспэкцыяй, а з дадаткам разьніца будзе зусім невялікая).

З усіх гэтых доказаў відаць, што прыбытак Беларусі ад прамысловасьці не павялічан; значыцца, той неспадзяваны вывад, нібы ў беларускіх губэрнях працэс індустрыялізацыі ідзе шыбчэй, чым ў Эўр. Расіі,—трэба лічыць праўдзівым.

[1]) Гэтыя лічбы А. Смоліч у «Беларусі» заве належачымі А. Бурбісу і супраўдная-ж крыніца—Яснапольскі.

Убочным доказам той-жа думкі зьяўляецца параўнаньне долі гарадзкога жыхарства на Беларусі і ў Расіі за 1897 г. і 1913 г.

Табл. № 123.

Лік насельнікаў (тыс. чел).

| Краіны | Усіх насельн. | | Гарадзкіх | | % гарад. | | Пав % гар. нас. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1897 г. | 1914 г. | 1897 г. | 1914 г. | 1897 г. | 1914 г. | |
| Беларусь . . . . . | 10.127,9 | 13.742,2 | 1.171,5 | 1.768,1 | 11,5 | 12,9 | + 12,2 |
| Эўр. Расія . . . . . | 94.215,4 | 127.776,5 | 11.830,5 | 18.448,7 | 12,9 | 14,4 | + 11,6 |

Доля гарадзкога жыхарства на Беларусі павялічваецца шыбчэй, чым у Расіі, хоць абсолютны лік гарадзкіх насельнікаў узрос на Беларусі на + 50,9%, а ў Расіі на + 55,9%. Наогул-жа індустрыялізацыя абедзьвюх старонак пасуваецца наперад занадта паважна, а калі меркаваць па долі сел. гаспадарк ў прыбытку 1900 г. і 1913 г. без пералічэньня на старыя цэны, тады нават наадварот—ідзе «сельска-гаспадарызацыя». Але такі вывад, які за цэнамі ня бачыць рэальнага вытворчага працэсу, быў-бы павярхоўным.

Далей з параўнаньня складу прыбытку Беларусі і Расіі можна ўбачыць вось што: лес паступова траціць сваю адносную вагу; на Беларусі роля яго ў прыбытку падвойная адносна Эўр. Расіі; рыбная гаспадарка ў беларускіх губэрнях мае мізэрную долю ў народ. прыбытку; шляхі зносін і будаўніцтва ў Расіі займаюць у народ. гаспадарцы больш паважнае месца, чым на Беларусі—гэта і зразумела, калі заўважым, што крыніцамі расійскага прыбытку зьяўляюцца такія дадатковыя галіны, як морскі транспорт; гандаль на Беларусі меў у 1900 г. большую долю ў прыбытку, чым у Расіі, ў 1913 г. доля яго зьнізілася, але нязначна.

Калі-ж параўноўваць паасобныя беларускія губэрні, то першае, што трэба выразна адзначыць, гэта вялікая законаўпарадкаванасьць у тым, як зьмяняюцца долі сельскай гаспадаркі і прамысловасьці ў кірунку з заходу на ўсход:

| | | Горад. | Вілен. | Менш. | Віцеб. | Магіл | Смал |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 19 3 г. па ц. 1900 г. | Сел гасп. . | 44,4 | 45,4 | 46,3 | 48,2 | 60,4 | 62,0 |
| | Прамысл. . . . | 26,0 | 25,5 | 22,3 | 18,4 | 13,7 | 14,8 |
| 1913 г. | Сел. гасп. . . | 48,9 | 51,5 | 48,3 | 54,2 | 62,7 | 66,7 |
| | Прамысл. . . . | 22,2 | 21,1 | 19,3 | 15,5 | 12,2 | 12,2 |
| 1900 г. | Сел гасп. . . | 49,6 | 49.0 | 47,8 | 56,2 | 60,1 | 66,6 |
| | Прамысл. . . | 22,1 | 19,9 | 14,4 | 11,8 | 10,1 | 9,3 |

З невялічкімі ўхіламі гэта законаўпарадкаванасьць выяўляецца за абодва кругабегі. Далей, калі мы будзем разглядаць гэографію інтэнсіўнасьці усяе народкае гаспадаркі, ізноў спаткаецца гэта законаўпарадкаванасьць; тады застановімся на яе магчымых прычынах. Цяпер адзначым, што шляхі зносін і гандаль часткова выяўляюць той жа ўхіл.

| | | Горадз. | Вілен. | Менш | Віцеб. | Магіл. | Смал. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1913 г. па ц. 1900 г. | шляхі зносін | 8,1 | 7,1 | 7,1 | 8,6 | 7,1 | 5,9 |
| | гандаль | 7,9 | 6,6 | 4,5 | 6,6 | 4,9 | 5,5 |
| 1913 г. | шляхі зносін | 8,1 | 6,5 | 6,9 | 8,2 | 5,6 | 5.6 |
| | гандаль | 7.6 | 6,2 | 4,2 | 6,3 | 5,0 | 5,0 |
| 1900 г. | шляхі зносін | 8,0 | 6,7 | 7,0 | 6,8 | 5,4 | 5,4 |
| | гандаль | 5,1 | 7,9 | 7,2 | 6,9 | 4,5 | 4,4 |

Але ў гэтых радкох ужо ёсьць многа выключэньняў. Ды й павінны быць. Шляхі зносін, а за імі і гандаль больш зьменлівыя часткі гаспадаркі чым сел.-гаспадарка і прамысловасьць; для вызначэньня тыпу гаспадаркі, яны маюць таксама меншую вагу.

Лес найбольшую долю ў прыбытку мае ў Меншчыне, Магілеўшчыне, Віцебшчыне; рыба ў Віцебшчыне.

Абсалютныя лічбы нац. прыбытку мала што могуць казаць. Яны тады толькі пераходзяць на родную мову, калі робяцца адноснымі. Да чаго? Або 1) да народ. прыбытку за другі кругабег, 2) або часткі народ. прыбытку адна да другое (склад, структура), 3) або да ўсіх людзей, якія здабылі гэты прыбытак, ці да ўсіх, хто ім карыстаецца, або 4) да ўсяе прыгоднае зямлі, на якой жыве народ, што здабыў гэты прыбытак, або 5) да ўсяе нац. маемасьці і г. д. Адносіны пад п. п. 1 і 2 былі ужо разгледжаны. Таму пачнем разглядаць адносіны пад п. п. 3 і 4. Для гэтага трэба перш-на-перш ведаць лік людзей.

Насельніцтва. Становішча расійскае статыстыкі насельніцтва дужа дрэннае. Коні ёю падлічаны куды лепш, чым людзі. Фактычна поўны і паўсюдны перапіс насельнікаў быў толькі адзін—у 1897 годзе. З таго часу колькасьць людзей за кожны год ЦСК вылічаў, грунтуючыся галоўным чынам на натуральным узросьце жыхарства (нарадзілася мінус памёрла). «Мэханічны-жа рух насельнікаў—кажа В. Ґ. Міхайлоўскі [1])—то браўся пад увагу (па некаторых гарадох, дзе выкарыстоўваліcь паліцэйскія лічбы з справаздачаў губэрнатараў, і дзеля Сыбіры, для губэрняў якой большай часткай падлічаўся рух перасяленцаў, то адкідаўся». Такім чынам людзі, якія выяжджалі ў гарады, лічыліся два разы: у сябе ў вёсках, дзе іх з агульнага ліку вясковых насельнікаў не адкідалі і ў гарадох, дзе іх лічылі ўжо, як гарадзкіх жыхароў; а людзі, якія ішлі ў эміграцыю за межы б. імпэрыі, або на перасяленьне ў Сыбір, Новаросію, Каўказ, Украіну і г. д.—часам (калі ехалі ў Сыбір) таксама лічыліся падвойна, а часам усё роўна лічыліся па хатніх сьпісах, хоць былі яны далёка за межамі бацькаўшчыны і ніякае сувязі з ею ня мелі. Значыцца, лік сельскіх жыхароў ЦСК бязумоўна перавялічваў. Але наколькі? Пэўнага адказу няма і ня можа быць, бо няма матар'ялаў, на якіх можна грунтавацца, каб шукаць памылку. Пракаповіч знайшоў папраўку такім парадкам. Па перапісу 1916 году ўзяў лік мужчын і жанчын (без уцякачак) ва ўсім сельскім насельніцтве (абсьледаваным і неабсьледаваным) па 41 губэрні; таму што многа мужчын пайшло на вайну і колькасьць іх дужа зьменшылася. Пракаповіч вылічыў «нормальную» іх колькасьць на падставе адносін жанчын да мужчын па перапісу 1897 г. Дадаўшы да ліку сельскіх жанчын і мужчын лік гарадзкога жыхарства ў сярэдзіне 1916 г., ён вылічыў колькасьць усіх насельнікаў 41 губ. у 1916 г.; параўнаваўшы гэту колькасьць з лі-

[1]) Труды ЦСУ, т. I, вып. I. Предварит. итоги переписи населения 28 августа 1920 г. М. 1920.

кам людзей у 1897 г. па 41 губ., ён знайшоў сярэдні штогодні прырост (па складаных процантах) 1,35%. Такі-ж % прыросту палічыў ён і для іншых 9 губэрань Эўр. Расіі. Вылічанае Пракаповічам насельніцтва разыйшлося з лічбамі ЦСК у 1900 г. на 2,38%, а ў 1913 г. на 9,68%. Такі спосаб праверкі сам Пракаповіч палічыў немагчымым выкарыстаць для некалькіх губэрань, у тым ліку 3-х беларускіх — Віленшчына, Віцебшчына, Меншчына, бо ў гэтых губэрнях частка людзей ня была перапісана, частка-ж у зьвязку з вайною выехала. Значыцца, у «Опыте» па 4-х беларускіх губэрнях—Віл., Віц., Горад. і Меншч.—прыбаўка насельніцтва палічана па агульнарасійскаму %—1.35%. В. Г. Міхайлоўскі для 1916 году па ўсёй Расіі знайшоў ужо іншую папраўку—толькі 5%. Пэўна-ж, можна сказаць, што больш дэталічная новая крытыка лічбаў ЦСК знойдзе яшчэ новую папраўку. Таму я бяру лік насельнікаў па ЦСК бяз усякіх папраўак, як для Беларусі, гэтак і для Эўр. Расіі: дзеля мэтаў параўнаньня, гэта лепш, чым ужываць агульнарасійскі коэфіцыэнт. А што на Беларусі коэфіцыэнт узросту насельніцтва будзе зусім іншы, чым у Расіі, пакажуць лічбы табл. № 124.

Табл. № 124.

Узрост насельніцтва у %% за кругабегі [1]).

| Губэрні | З 1886 г. да 1897 г. | З 1891 г. да 1895 г. | З 1896 г. да 1900 г. | З 1891 г. да 1900 г. | З 1900 г. да 1913 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| Віленшчына . . . . . . | +20,1 [2]) | +15,9 | +15,6 | +15,8 | +22,8 [2]) |
| Віцебшчына . . . . . | +16,0 | +17,6 | +17,8 | +17,7 | +22,0 |
| Горадзеншчына . . . . | +17,8 | +13,6 | +15,9 | +14,8 | +20,0 |
| Меншчына . . . . . . . | +23,8 | +20,0 | +20,8 | +20,4 | +30,0 |
| Магілеўшчына . . . | +29,4 | +22,3 | +22,1 | +22,2 | +34,1 |
| Смаленшчына . . . . . | +16,7 | +15,8 | +16,2 | +16,0 | +32,4 |
| Беларусь . . | +20,8 | — | — | — | +21,9 |
| Эўр. Расія . | +10,3 | +12,7 | +17,5 | +15,1 | +27,6 |

Насельніцтва ўзрастае на Беларусі значна шыбчэй, чым у Расіі, і браць аднакавы процант—значыць штучна палепшыць дабрабыт гаспадарчы беларускіх губэрняў. Спрабуем аднак адшукаць сярэдні % узросту для Беларусі па мэтоду Пракаповіча.

Табл № 125.

Па перапісу 1916 г. было насельнікаў у сельскіх мясцовасьцах.

| Губэрні | Дасьледаваньне на сел. | | | | Неда-след. | Усіх дасьл. і недас. | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Муж. | Жанч. | Усе | На 100 м. | | Муж. | Жанч. |
| Віцебшчына . . . . | 466.261 | 606.983 | 1.073.244 | 130,2 | 81.000 | 501.448 | 652.796 |
| Меншчына . . . . . | 790.891 | 984.629 | 1.775.520 | 124,5 | 400.000 | 969.065 | 1.206.455 |
| Магілеўшчына . . . | 649.715 | 840.233 | 1.489.948 | 129,3 | 46.200 | 669.863 | 866.285 |
| Смаленшчына . . . | 645.442 | 904.457 | 1.549.899 | 140,1 | 19.576 | 653.595 | 915.880 |

[1]) Сярэднія ўзросты за пяцёхгодкі з В. Аленіцына „Население и прирост его в Евр. России в десятилетие 1891—1900 г.г.“. Ежегодник России 1905 г.

[2]) %%.

Табл. № 126.

Павінна быць усяго насельнікаў.

| Губэрні | На 100 м. жан у 1897 г. | Пав быць у 1916 г. | | | Разам с гары | Узрост з 1897 г. | Сярэд. % узросту |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Муж. | Жан. | Усіх | | | |
| Віцебшчына . . | 103,7 | 629.504 | 652.796 | 1.282.300 | 1.625.400 | + 8,15 | +0.42 |
| Меншчына . . | 100,8 | 1.196.880 | 1.206.455 | 2.403.335 | 2.709 435 | +25,66 | +1,21 |
| Магілеўшчына . | 103,8 | 834.571 | 866.285 | 1.700.856 | 2 005 256 | +29,28 | +1,24 |
| Смаленшчына . | 111,8 | 819 203 | 915.880 | 1.735.083 | 1.959 283 | +14,71 | +0,73 |
| | | | | | Э. Расія | +30,13% | 1,35% |

Ніякія ўмовы, ад якіх залежыць узрост насельніцтва, не маглі гэтак раптоўна зьмяніцца, каб выклікаць такую раптоўную зьмену ў сярэднім % прыросту. Або сам спосаб няварты, або матарьялы перапісу 1916 г. не надзейныя. Толькі сталы самастойны досьлед у будучыне высьвятліць пытаньне аб узросьце насельніцтва Беларусі. Калі будзе адшуканы коэфіцыэнт памылкі лічб ЦСК, давалі будзе памножыць яго на лічбы табл. № 128 і 129, каб іх тым самым выправіць. Таму і застанавіўся я на статыстыцы ЦСК без паправак Табл. 127 паказвае абсалютную колькасьць жыхарства, якая выкарыстана ў гэтай працы, за 1900 і 1913 г.г. (на 1. I. 1901 і 1914 г.г.) у тыс. чал.

Табл. № 127.

| Губэрні | 1900 г. | 1913 г. | + % |
|---|---|---|---|
| Віленшчына . . . . . | 1.689,5 | 2 075,9 | 22,8 |
| Віцебшчына . . . . | 1 600,7 | 1.953,1 | 22,0 |
| Горадзеншчына . . . . | 1.706,8 | 2 048,2 | 20,0 |
| Меншчына . . . . | 2 334,8 | 3.035,8 | 30,0 |
| Магілеўшчына . . . . | 1 839,1 | 2.465,6 | 34,1 |
| Смаленшчына . . . | 1.634 7 | 2 163,6 | 32,4 |
| Беларусь . . . . | 10 805 5 | 13.742,2 | 21,9 |

Прыбытак на 1 чалавека. Адносінамі нац. прыбытку да ліку насельніцтва вымяраецца багацьце ня толькі асоб, але і ўсяе нацыі цалком. Ці багата-ж наша Беларусь? Паэты беларускія, глыбока адчуваючы ня толькі разумовы, але й матар'яльны стан народаў Беларусі, ужо даўно далі адказ. Лічбы табл. №№ 128 і 129 скажуць, ці ён праўдзівы.

Табл № 128 Прыбытак на 1 чал. у 1900 г.

| Губэрні | Сел. гасп. | Лес | Рыба | Промыс. | Шляхі зн. | Будаўніцтв | Гандаль | Усе разам |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Віленшчына . . . . . . | 29,66 | 5,67 | 0,04 | 12,01 | 4,07 | 4,23 | 4,68 | 60,36 |
| Віцебшчына . . . . . . | 28,18 | 5,85 | 0,22 | 5,91 | 3,36 | 3,14 | 3,36 | 50,02 |
| Горадзеншчына . . . . | 27,69 | 5,61 | 0,04 | 12,35 | 4,47 | 2,86 | 2,81 | 55,81 |
| Меншчына . . . . . | 26,97 | 11,28 | 0 05 | 8,14 | 3,95 | 2,01 | 4,06 | 56,46 |
| Магілэўшчына . . . . | 25,53 | 5,88 | 0,05 | 4,34 | 2,53 | 2,30 | 1,92 | 42,55 |
| Смаленшчына . . . . . | 34,88 | 4,25 | 0,06 | 4,85 | 3,15 | 2,85 | 2,06 | 52,1 |
| Беларусь . . | 28,32 | 6.66 | 0,07 | 7,82 | 3,56 | 2,80 | 3,13 | 52,36 |
| Эўр. Расія . . . | 29,80 | 4,77 | 1,47 | 14,00 | 5,31 | 4,73 | 5,61 | 65,69 |

Табл. № 129.

Прыбытак на 1 чал. у 1913 г.

| Губэрні | Сел. гасп. | Лес | Рыба | Промысл | Шляхі зн. | Будаўніцтв | Гандаль | Усе разам |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Віленшчына . . . . . . | 41,93 | 6,19 | 0,08 | 17,16 | 5,29 | 5,71 | 5,07 | 81,43 |
| Віцебшчына . . . . . | 42,15 | 6,17 | 0,35 | 12,01 | 6,35 | 5,83 | 4,91 | 77,77 |
| Гарадзеншчына . . . | 41,38 | 6,27 | 0,08 | 18,83 | 6,87 | 4,85 | 6,49 | 84,77 |
| Меншчына . . . . . . | 36,23 | 12,62 | 0,11 | 14,52 | 5,21 | 3,28 | 3,15 | 75,12 |
| Магілеўшчына . . . . | 39,49 | 6,38 | 0,04 | 6,98 | 4,08 | 3,13 | 2,85 | 62,95 |
| Смаленшчына . . . . . | 50,50 | 4,23 | 0,04 | 9,22 | 4,24 | 3,62 | 3,81 | 75,66 |
| Беларусь . . . | 41,54 | 7,34 | 0,11 | 13,02 | 5,27 | 4,27 | 4,24 | 75.79 |
| Эўр. Расія . . . | 44,06 | 4,94 | 0,77 | 20,08 | 8,27 | 6,59 | 7,68 | 92, 3 |

Ужо толькі з параўнаваньня Беларусі і Расіі відаць, што Беларусь значна бяднейшая (на 20,0 у 1900 г. і на 18,0 у 1913 г.). Каб зрабіць думку гэту больш выразнай, параўнуем прыбытак беларускага жыхара з прыбыткамі іншых народаў.

Табл. № 130.

Прыбытак на 1 чал. рублёў [1]).

| Краіны | 1900 г. | 1913 г. | + % |
|---|---|---|---|
| Аўстралія . . . . . . . | 374 | — | — |
| Злуч. Штаты . . . . . | 346 | — | — |
| Злуч. Брытан карал. . | 273 | 463 | + 70 |
| Францыя . . . . . . . | 233 | 355 | + 52 |
| Нямеччына . . . . . . | 184 | 292 | + 59 |
| Аўстрыя . . . . . . . | 127 | 287 | + 80 |
| Італія . . . . . . . . . | 104 | 230 | +109 |
| Балкан. дзяржавы . . . | 101 | — | — |
| Эўр. Расія . . . . . | 67[2]) | 101 | + 51 |
| Беларусь . . . . . . . | 54 | 83 | + 55 |

Прыбытак беларускага насельніка зусім мізэрны ў параўнаньні з прыбыткам жыхароў Амэрыкі і Заходняй Эўропы. І з часам аднасна іх ён робіцца яшчэ больш мізарнейшым, бо ўзрост яго цішэйшы, чым у замежных народаў.

Але, як можна убачыць з параўнаньня табл. № 130, 118 і № 128, узрост прыбытку і вытвару на Беларусі значна папераджае ўзрост насельніцтва. Мальтузіанству няма месца на Беларусі.

Тлумачэньняў да табліцаў № 128 і 129, лічу, дадаваць ня трэба, бо абедзьве табліцы сьцьвярджаюць ранейшыя вывады. Зварочваю ўвагу на законаўпарадкаванасьць зьмены прыбытку на 1 чал. ад сел. гасп., прамысловасьці, шляхоў зносін і ад усіх галінаў разам—ў кірунку з заходу на ўсход.

---

[1]) Прыбытак іншых краін па Пракаповічу з ангел. эканоміста Мелгола. Mulhall, Industries and Wealth of nations, 1896, p. 391" і Ekonomist,a (перадр. у № 1 „Вестника Финансов" за 1916 г.).

Калі палічыць, што ЦСК зрабіў у падрахунку насельніцтва аднакавую памылку, як у Расіі, гэтак і на Беларусі,—тады можна скласьці гэткую параўнальную табліцу прыбыткаў у абедзьвюх старонках:

Табл. № 131.

Нар. прыбытак на 1 чал. рублеў.

| Галіны | 1900 г. | | 1913 г. | |
|---|---|---|---|---|
| | Белар. | Расія | Белар. | Расія |
| Сел. гасп. . . . . . | 28,99 | 30,51 | 45,56 | 48,34 |
| Лес і рыба . . . . . | 6,89 | 6,40 | 8,17 | 6,27 |
| Прамысл. . . . . | 8,01 | 14,33 | 14,28 | 22,03 |
| Шляхі знасін . . . | 3,64 | 5,43 | 5,78 | 9,06 |
| Будаўніцтва . . . . | 2,87 | 4,84 | 4,68 | 7,23 |
| Гандаль . . . . . . | 3,20 | 5,74 | 4,65 | 8,42 |
| Разам усе . . | 53,61 | 67,25 | 83,13 | 101,35 |

Вытворчасьць працы. Узрост прыбытку на 1 чал. не азначае, што адначасова на столькі-ж узрастае колькасьць сродкаў матэр'яльнага добрабыту; не азначае ён і меркі ўзросту вытворчасьці працы. Толькі пералічыўшы ўвесь прыбытак (на аднаго чалавека) па цане першага кругабегу, можна вызначыць і тое і тое. Але па многіх галінах вырабу мы ня маем зусім цэн за абодва кругабегі, або маем цэны на неаднародныя групы тавараў (як у прамысловасьці); за другі кругабег няма пэўнай лічбы насельнікаў;—пры гэткіх умовах вылічыць вытворчасьць працы немагчыма. Аб вытворчасьці працы у прамысловасьці ёсьць больш пэўныя лічбы.

Табл. № 132.

Вытворчасьць 1 рабочага (рублёў).

| Галіны | 1900 г. | | 1903 г. па ц. 1900 г. | | Узрост вытвар прам. | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Белар | Эўр Расія | Белар. | Эўр. Расія | Белар. | Эўр. Расія |
| Фабр.-завод прамысл. . | 371,36 | 402,30 | 540,81 | 522,8 | +45,6% | +30,0% |
| Прам., якая абклад. акц. . | 608,08 | 540,08 | 864,08 | 681,2 | +42,1% | +26,0% |

Яскрава відаць, што вытворчасьць працы ў прамысловасьці, абкладзенай акцызам, расьце і ў Расіі і на Беларусі цішэй (яна ў абсалютных лічбах значна вышэй) чым у фабр.-зав. прамысловасьці; наогул-жа на Беларусі вытворчасьць працы у обедзьвюх галінах прамысловасьці ўзрастае шыбчэй, чым у Расіі. У табл. 132 можна раўнаваць ня толькі узрост вытворчасьці працы за два кругабегі, але і абсалютныя лічбы вытворчасьці 1 рабочага ў прамысловасьці дзьвюх краін за адзін кругабег.—Статыстычныя матар'ялы даюць магчымасьць, хоць і невялікую, зрабіць такое-ж параўнаваньне і для сельскае гаспадаркі. З перапісу 1897 г. бярэм колькасьць асоб (мужчын і жанчын) ад 15 гадоў і вышэй, якія працуюць у сельскай гаспадарцы (земляробства, пчалярства, шаўкоўніцтва і жывёлагадоўля. — Дзелім на гэты лік сел.-гасп. працаўнікоў увесь прыбытак ад сельскае гаспадаркі 1900 году. Табл. № 133 дае належны матар'ял для параўнаваньня-

Табл. № 133.

| Губерні | Лік прац. у с.-г. на пер. 1897 г. | | | Увесь прыб. ад сел.-гасп. у 1900 г. | Вытворч. 1 прац. зв. 15 г. | Усіх прац. | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Усіх | Самастоят | Звыш. 15 гадаў | | | На 1 сам. | На 1 чдарослага працаў |
| Віленшчына . | 1.161.667 | 228.225 | 700.160 | 48.938,7 | 69,89 | 5,09 | 1,66 |
| Віцебшчына . | 1.091.364 | 201.481 | 647.273 | 44.043,0 | 68,05 | 5,41 | 1,69 |
| Горадзеншчына | 1.100.479 | 204.105 | 658.271 | 46.155,8 | 70,12 | 5,39 | 1,67 |
| Меншчына . . | 1.596.701 | 272.067 | 921.642 | 62.961,3 | 68,31 | 5,87 | 1,73 |
| Магілеўшчына | 1.335.540 | 238.820 | 745.425 | 46.956,5 | 62,99 | 5,60 | 1,79 |
| Смаленшчына . | 1.271.907 | 220.637 | 738.468 | 57.025,3 | 77,22 | 5,77 | 1,72 |
| Беларусь . . | 7.557.658 | 1.365.335 | 4.411.239 | 306.080,6 | 69,39 | 5,54 | 1,71 |
| Эўр. Расія | — | 13.116 004 | 41.035.931 | 2.985.057,0 | 72,74 | — | — |

Вытворчасьць аднаго працаўніка (звыш 15 гадоў) і на Беларусі і ў Расіі вельмі блізкія (69 р. 39 к. і 79 р. 74 к.); высокая, параўнавальна з Расіяй, інтэнсіўнасьць сельскае гаспадаркі Беларусі ня зьніжыла вытворчасьць працы беларускага сельскага гаспадара адносна расійскага: інтэнсіфікацыя не абавязкава выклікае зьніжэньне вытворчасьці працы. Аб гэтым сьведчуць і лічбы вытворчасьці працы па асобных губэрнях: калі ня лічыць Смаленшчыну, дык вытворчасьць працы найбольшая у губэрнях, дзе інтэнсіўнасьць гаспадаркі найвялікшая: Горадз.—70 р. 12 к., Віл.—69 р. 89 к., Меншч. — 68 р. 31 к., Віцебш.—68 р. 05 к. і Магіл. — 62 р. 99 к.

Інтэнсіўнасьць народнае і сельскае гаспадаркі. Аднэю з магчымых мерак інтэнсіўнасьці зьяўляецца велічыня ўсяго нацыянальнага прыбытку ў адносінах да ўсяе зямлі, якою карыстаецца нацыя (значыцца некарысная зямля, т. зв. няўдобіца, або няўжыткоўнасьці з агульнага пляцу зямлі выкідаецца). На жаль, сталыя веды аб ужыткоўнасьцях мы маем толькі за 1887 год. З таго часу лік няўдобіцы, некарыснае зямлі ўжо к 1900 году павінен быў значна зьмяніцца, а пазьней (як гэта часткова паказаў перапіс 1917 г. і досьлед ЦСУ 1922 г.) няўжыткі зьменшыліся аж на палову, але вельмі ня аднакава ў розных раёнах (найбольш за ўсё ў раёнах інтэнсіўных). Дык зразумела, што карыстацца для 1913 г. лічбамі аб ужыткоўнасьцях за 1887 г. ніяк немагчыма. Таму ў табл. № 134 падаю прыбытак адносна аднае карыснае зямлі толькі за 1900 г., а асобна да ўсяе зямлі—і за 1900 г. і 1913 г.

Табл. № 134.

| Губэрні | Карыснае зямлі 1887 г. дзесяцін | | Усяе зямлі □ верст | Увесь прыб. на 10 вяр. | | Прыб. 1900 г на 1 дзес. карыс зямлі | Прыб. ад с г.1900г. к 1 д карыс. з. бяз лесу |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Усяе | Бяз лесу | | 1900 г. | 1913 г. | | |
| Віленшчына . | 3 075 268 | 2.085.481 | 36.825,3 | 2 709,6 | 4 590,2 | 32.45 | 23.47 |
| Віцебшчына . | 3.149.367 | 1.930.894 | 38.649,5 | 2 026,3 | 3.930.1 | 24.87 | 22 81 |
| Гарадзеншч. . | 2 874 171 | 2 097.693 | 33.900,8 | 2 747.1 | 5.120,0 | 32 41 | 22.01 |
| Меншчына . | 6.022.456 | 2 920 064 | 80 152,3 | 1 644,3 | 2 845 3 | 21.88 | 21.56 |
| Магілеўшчына | 3.533.707 | 1.980.401 | 42.134,6 | 1.857,0 | 3 683,3 | 22.15 | 23.71 |
| Смаленшчына | 4.378 150 | 2 514 987 | 53 053,8 | 1 613,7 | 3 086,1 | 19 55 | 22.67 |
| Беларусь . | 23 033.119 | 13.529 520 | 284.716,3 | 1.991,2 | 3 658,0 | 24,61 | 22.62 |
| Эўр. Расія . | 365.340 800 | 165.780 463 | 4 238 711,7 | 1 552,3 | 2.785,2 | 18,01 | 18.01 |

Параўнавальна з Расіяй Беларусь нязвычайна высока выкарыстоўвае сваю зямлю (больш інтэнсіўна) і пляц пад с.-г. культурамі дае ў беларускіх губэрнях больш прыбытку з зямельнае адзінкі.

Незразумела толькі, чаму сел.-гасп. прыбытак на 1 дзес. карыснае зямлі (бяз лесу) выявіў такую малую дыфэрэнцаванасьць і незаконаўпарадкаваньне? Зноў варт падкрэсьліць, як за абодвы кругабегі паступова зьмяншаецца высокае выкарыстаньне зямлі ў кірунку з заходу на ўсход; адносна прыбытку ад сел. гаспадаркі гэту законаўпарадкаванасьць заўважыў Г. Студзенскі па ўсёй Эўр. Расіі[1]).

На гэтым скончым вылічэньні адносінаў нац. прыбытку. Вельмі цікавыя адносіны яго да ўсяе народ. маемасьці ня могуць быць вылічаны, бо няма матар‘ялаў.

---

[1]) «Очерки с.-х. экон.», стар 303–304.

## Разьдзел трэці.

**Дадатковыя вылічэньні.** Падзел народнага прыбытку. Пытаньне, як дзеліцца народны прыбытак між рознымі клясамі грамады, у якім кірунку зьмяняецца гэты падзел, мае вялікае і практычнае і навуковае значэньне. Але становішча статыстычых крыніц не дае магчымасьці зрабіц нават прыблізныя вылічэньні. Асабовы мэтад, хоць у яго пакуль што і многа заган, зьяўляецца усё ж лепшым для вызначэньня соцыяльна-экономічнага падзелу грамады. А таму што ў Заходняй Эўропе, з яе гострымі соцыяльнымі супярэчкамі, падзелам народу на клясы больш цікавіліся, чым падзелам гаспадаркі на галіны,—таму рэальным мэтодам вылічэньня прыбытку там ўсе менш і менш карыстаюцца.

На падставе расійскае статыстыкі можна вылічыць падзел народнага прадукту толькі між дзьвюма соцыяльнымі групамі т. зв. «клясамі незаможнымі, працоўнымі» і «клясамі непрацоўнымі, заможнымі».—Прыбытак ад збожжа можна падзяліць між сялянамі і прыватнымі ўладарамі, (панамі і г. д.) грунтуючыся на перапісе 1916 г., які пад сялянствам разумеў якраз працоўнае сялянства. Для усёй Беларусі коэфіцыэнтам падзелу зьяўляецца падзел засеўнага пляцу між названымі групамі па «Беларускаму раёну» (уся Беларусь без забранай немцамі часткі). Лічбы ўложаны ў табліцу № 135.

Табл. № 135.

Падзел прыбытку ад збожжа ў 1909—13 г.

| Культуры | Увесь пр. (тыс. р.) | Прыб. сялян | % сел. ц. пр. | % паноў Бел. | % паноў Расія |
|---|---|---|---|---|---|
| Зімовае жыта . . . . | 89.534,1 | 82.640,0 | 92,3 | 7,7 | 6,9 |
| Жыта—ярыца . . . | .841,9 | 786,3 | 93,4 | 6,6 | 8,4 |
| Зімовая пшаніца . . . | 2.926,6 | 2.312,0 | 79,0 | 21,0 | 23,0 |
| Пшаніца—ярыца . . . . | 1.331,6 | 1.275,7 | 95,8 | 4,2 | 6,6 |
| Авес . . . . . . . . . | 34.170,5 | 29.625,8 | 86,7 | 13,3 | 12,0 |
| Ячмень . . . . . . . . | 15.388,7 | 14.634,6 | 95,1 | 4,9 | 10,0 |
| Грэчка . . . . . . . | 3.714,5 | 3.558,5 | 95,8 | 4,2 | 5,1 |
| Пшано . . . . . . . . | 809,4 | 793,2 | 98,0 | 2,0 | 9,2 |
| Гарох . . . . . . . . . | 3.287,3 | 3.063,7 | 93,2 | 6,8 | 18,6 |
| Сачывіца . . . . . . . | 93,1 | 92,2 | 99,0 | 1,0 | 4,2 |
| Боб . . . . . . . . . . | 817,4 | 804,3 | 98,4 | 1,6 | 53,0 |
| Усе . . . | 152.914,9 | 139.586,3 | 90,4 | 9,6 | 9,5 |
| З пав. на 10% | 168.206,4 | 153.544,9 | — | — | — |

[1]) «Предварительные итоги с.-х. переписи 1916 г.».

Панская доля ў прыбытку ад збожжа і ў Расіі і на Беларусі аднакавая (9,6%). Самымі панскімі культурамі зьяўляюцца: зімовая пшаніца—21,0%, авёс—13,3%, жыта—7,7%. Цікава, што на Беларусі паны маюць зусім невялічкую долю ў прыбытку ад «бабовых» (боб, сачыўка, гарох), а ў Расіі іх доля ад гэтых культур 53%—18,6%—4,2%: у гэтым ізноў адбіваецца больш прогрэсіўны тып палявое гаспадаркі ў беларускага сялянства.

Прыбытак ад гандлёва—прамысловых расьлінаў дзеліцца таксама на падставе перапісу 1916 году.

Табл. № 136.

| Расьліны | Увесь прыб. | Прыб. сялян | % сел. у пр. | % паноў | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Белар | Расія |
| Бульба | 57.287,8 | 53.735,9 | 93,8 | 6,2 | 7,7 |
| Лен—насеньне | 7.939,9 | 7.797,0 | 98,2 | 1,8 | 3,1 |
| Лен—валакно | 29.986,6 | 29.446,9 | 98,2 | 1,8 | 3,1 |
| Каноплі—насеньне | 2.242,1 | 2.204,0 | 98,3 | 1,7 | 1,5 |
| Каноплі—валакно | 4.941,3 | 4.101,3 | 98,3 | 1,7 | 1,5 |
| Разам | 102.397,8 | 97.285,0 | 95,0 | 5,0 | 18,5 |
| З пав. на 10% | 112.637,5 | 107.013,0 | — | — | — |

У працаёмістых гандлёва-прамысловых расьлінах доля паноў на Беларусі ў два разы меншая, чым доля ў збожны: 5% супроць 9,6%; асабліва-ж мізэрная роля паноў у прыбытку ад тэхнічных (лён і каноплі), гэта на 98%—мужыцкія культуры. Доля працоўных клясаў у прыбытку ад прамысловых расьлін на Беларусі вышэй, чым у Расіі, як па асабных культурах, гэтак і ўва ўсіх разам: 95% супроць 81,5%; гэта таму, што такія культуры, як цукровыя буракі, хмель, рапс—у Расіі пераважна панскія—81,5%, 81,5% і 76,7%. Гэты факт павінен быў адбіцца і ў пасьля—рэвалюцыйным будаўніцтве: адраджэньне прамысловых расьлін у Расіі павінна быць значна цяжэйшым і больш ціхім, чым на Беларусі.

Прыбытак ад жывёлагадоўлі дзеліцца таксама па перапісу 1916 года; прыбытак ад малака быў падзелен адразу, пры вылічэньні; прыбытак ад продажу каняй лічыцца цалком панскім. Табл. № 137 зьмяшчае належныя лічбы.

Табл. № 137.

Прыбытак ад жывелагадоўлі—падзел на соц. групы.

| Галіны | Увесь прыб. | Прыб. сялян | % сел. | % испыт. | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Бер. | Рас. |
| Малако | 95 497,7 | 83.436,5 | 87,4 | 2,6 | 7,0 |
| Мяса гаў'яды | 42.341,7 | 39 674,2 | 93,7 | 6,3 | 5,8 |
| Сьвіньні | 62 148,1 | 60 470,1 | 97,3 | 2,7 | 5,1 |
| Авечкі | 21.954,8 | 21.625,5 | 98,5 | 1,5 | 5,6 |
| Скуры | 6.795,8 | 6 367,7 | 93,7 | 6,3 | 5,8 |
| Коні | 1.586,4 | — | — | 100 | 100 |
| Разам | 230 324,5 | 211 574,0 | 91,9 | 8,1 | 7,3 |

Доля паноў у жывёлагадоўлі троху большая, чым у прамысловых расьлінах, і меншая, чым у збожжы. На Беларусі агульная—панская доля вышэй, чым у Расеі; вышэй яна ў прыбытку ад мяса рагатае жывёлы; але прыбытак ад авечак, сьвіньней і малака на Беларусі больш сялянскі, чым у Расеі. Ад чаго залежыць такі падзел? Мусіць, адсутнасьць рынку для сьвежага малака, вялікія панскія абшары для пашы і танныя харчы ад перапрацоўкі бульбы, больш выгадныя цэны—зрабілі панскую жывёлаводную гаспадарку на Беларусі, параўнальна з сялянскаю больш мясною, чым малочнаю. Вось які % кароў да ўсяго быдла быў у 1916 годзе ў сялян і паноў.

| | У паноў | У селян |
|---|---|---|
| Віленшчына . . . . | 63,25 | 72,98 |
| Віцебшчына . . . . | 61,23 | 66,86 |
| Меншчына . . . . . | 53,69 | 52,97 |
| Магілеўшчына . . . | 61,02 | 73,56 |
| Смаленшчына . . . | 57,16 | 53,93 |

Толькі ў Смаленшчыне, дзе малочная гаспадарка прыдбала ў паноў сталае значэньне, % кароў у панскім статку большы, чым у сялянскім; па Меншчыне розьніца невялічкая, і яе можна тлумачыць тым, што і ў сялян гадоўля быдла (у Палесьсі) мае выключную ролю.

Прыбытак ад садоў і гародаў дзеліцца між панамі і сялянамі па пляцу гэтых ужыткаў у 1887 г.; сялянская доля з гэтага часу да 1913 г. вырасла бязумоўна больш, чым панская, але адсутнасьць статыстыкі прымушае карыстацца старымі адносінамі. Прыбытак ад продажы сена і саломы дзеліцца так, як падзелен прыбытак пераважна панскай культуры—зімовае пшаніцы. Падзел пчалярскага прыбытку зроблен пры самым вылічэньні. Агульны падзел прыбытку ад іншых галін даецца табліцаю № 138.

Табл. № 138.

| Галіны | Увесь прыб. | Прыб. сялян | % сялян | % паноў | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Бел. | Расія |
| Сады . . . . . . | 7.206,8 | 3.113,3 | 43,2 | 52,4 } 23,3 | 20,7 |
| Гароды . . . . . | 48.826,1 | 39.890,9 | 81,7 | 18,3 } | |
| Пчолы . . . . . | 1.045,8 | 870,1 | 83,2 | 16,8 | 18,5 |
| Сена й салома . . | 2.470,6 | 1.951,8 | 79,0 | 21,0 | 23,0 |
| Разам . . | 59.549,3 | 45.826,1 | 77,0 | 23,0 | 20,7 |

А зараз з табл. № 139 можна ўбачыць падзел прыбытку і ад усяе сельскае гаспадаркі.

Табл. № 139

| Галіны | Увесь прыб. | У сялян | % сялян | % испыт. Бел. | % испыт. Э Р. |
|---|---|---|---|---|---|
| Збожжа . . . . . . . . | 168 206,4 | 153 544,9 | 90,4 | 9,6 | 9,5 |
| Ганд. прам. рас. . . . | 112.617,5 | 107.013 0 | 95,0 | 5,0 | 18,5 |
| Жывёлагадоўля . . . . | 230 324,5 | 211.574,0 | 91,9 | 8,1 | 7,3 |
| Іншыя . . . . . . . . | 59.549,3 | 45.826,1 | 77,0 | 23,0 | 20,7 |
| Уся сельск. гасп. | 570.717,6 | 517.958,0 | 90,8 | 8,2 | 10,9 |

Прыбытак ад лесу дзеліцца па лясному пляцу у ўладаньні розных групаў. Потым з панскае долі адкідаецца і да селянскае далучаецца заробак асоб, якія сякуць лес, возяць, сплаўляюць; такіх асоб у 1897 г. было 7613 чалавек; таму што выкарыстаньне лесу не павялічылася, пакідаем таку-ж колькасьць і на 1913 год; сярэдні заробак, як і фабрычнага рабочага, 271,5 р., —а ўсіх 2.066,9 тыс. руб. Апрача самастойна занятых лясным промыслам, як галоўным заняткам, ім-жа займаецца пабочна ва ўсёй Беларусі 26.604 чалавек, заработак іх прыраўнуем да заробку саматужніка—35,8 р. за год на аднаго чалавека, на ўсіх 1.431,3 тыс. р. А наогул зарабляюць сяляне ў лесе 3.498,2 тыс. рублёў. Падзел прыбытку ад лесу відаць з табл. 140.

Табл № 140.

| Групы | Пляц подлеж. | % | Прыбыток | Падзел | % Бел. | % Расія |
|---|---|---|---|---|---|---|
| У сялян . . . . . . . . | 399.830 | 5,09 | 5.138,0 | 8.636,2 | 8,6 | 46.0 |
| » паноў . . . . . . | 5 897.666 | 75,01 | 75.716,8 | 72 218,6 | 71,5 | 27,9 |
| » скарбу . . . . . . . | 1.375 180 | 17 49 | 17 654,8 | 17.654,8 | 17,5 | 26,1 |
| » іншых . . . . . . . | 189 874 | 2.41 | 2.432,7 | 2.432.7 | 2,4 | |
| Усе разам . . . . | 7 862.550 | 100 | 100 942,3 | 100 942,3 | 100 | 100 |

Тры чверткі прыбытку ад лесу забіралі ў свае лапы беларускія паны, сялянам з іх уласных лясоў і з іх цяжкае працы ў лесе не выпадала і дзесятай часткі прыбытку і ў Эўр. Расеі наадварот—сяляне забіралі ледзьве не палову—46,0%, паны толькі 27,9%.

Занятых рыбацтвам самастойна на Беларусі наяічана ў 1897 г. 1813 чал., з заробкам 492,2 тыс. руб. (па 271,5 руб. на чал.), і пабочна 5030 чал., з заробкам 270,6 тыс. руб. (па 53,8 руб. на чалавека, як саматужнікі), а разам 762,8 тыс. руб., або як-раз 50% усяго прыбытку ад рыбы.

З ўсяго прыбытку ад прамысловасьці працоўнаю доляю зьяўляецца заробчая плата. У фабрычнай прам. у 1908 г. адзін рабочы зарабляў 190 руб., а чыстая вытворчасьць яго была 429 р. 45 к. і ў 1912 г. чыстая вытворчасьць вырасла да 613 р. 83 к., або на 42,9%, прыблізна на такі % павінна была ўзьняцца і зароб. плата, значыцца, быць для 1912 г. па 271,5 руб. на чалавека. У прам., абкладзенай акцызам, заробчая плата ад гуртавое прадукцыі мела 6,06% у 1908 г. па Варзару, прымем і ў 1913 г. такі-ж %. Увесь прыбытак рамесьнікаў і саматужнікаў лічым працоўным. Заробак рабочых нетракапальнай прамысловасьці бярэцца такі-ж,

як і рабочых фабрычых; лік працаўнікоў-нетракальнікаў у 1913 г. 568 чалавек. Агульны падзел прыбытку ад усіх галін прамысловасьці замешчан у табл. № 141.

Табл. 141.

| Галіны | Увесь прыб. | Прыб. рабочых | % прац. | % непрац. | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Бел. | Расія |
| Нетракапальн. . . . . | 409,5 | 154,2 | 37,7 | 62,3 | 38,5 |
| Фабрычная . . . . . . | 37.092,3 | 17.025,4 | 45,9 | 54,1 | 56,4 |
| Абкладзен. акц. . . . . | 13 219,1 | 2.136,9 | 16,2 | 83,8 | 75,0 |
| Хатняя . . . . . . . . | 2.705,8 | 2 705,8 | 100 | — | — |
| Рамесьніцкая . . . . | 125.493,0 | 125.493,0 | 100 | — | — |
| Уся разам . . | 178.919,7 | 147.515,3 | 100 | 17,6 | 33,8 |

Малая адносна Расіі доля прыбытку непрацоўных клясаў Беларус тлумачыцца тым, што наша прамысловасьць больш належыць да рамесьніцка-саматужнага тыпу, чым прам. Расіі. У фабрычнай прамысловасьці долі непрацоўных аднакавы ў абэдзьвюх краінах, а ў прамысловасьці, абкладзенай акцызам, на Беларусі значна вышэй; наогул—гэта прамысловасьць найбольш панская з усіх іншых.

Прыбытак ад будаўніцтва падзелен быў яшчэ пры вылічэньні; рабочыя ад буданіцтва мелі 34.228 тыс. руб., або 58,3%, а ў Расіі 48,4%; у Расіі будаўніцтва—больш капіталістычная прамысловасьць, чым на Беларусі.

Прыбытак ад шляхоў зносін і сувязі дзеліцца так: увесь прыбытак хурманачны лічыцца працоўным; па прыбытку ад чугунак, почты і тэлеграфа бярэцца агульна-расейскі коэфіцыэнт; з прыбытку ад рэчнага флёту працоўнай часткай лічыцца заробак усяе судовае каманды. Матар'ялы згуртованы у табл. № 142.

Табл № 142.

| Галіны | Увесь прыб. | Прыб. прац. | % прац. | % непрац. | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Бел. | Расія |
| Чыгункі . . . . . . . . | 46.572,5 | 17.930,4 | 38,5 | 18,8 | 18,8 |
| Вадзян. шляхі . . . . . | 4.376,5 | 2.866,6 | 65,5 | 34,5 | 59,0 |
| Хурманы . . . . . . . | 16.282,0 | 16.282,0 | 100 | — | — |
| Почта-тэлеграф . . . . | 5.256,8 | 1.892,4 | 36,0 | — | — |
| Разам . . | 72.489,8 | 38.971,4 | 53,8 | 14,2 | 22,0 |

Гандлярскай дзейнасьцю было самастойна занята ў 1897 г. 114.864 чалі (ва усей Эўр. Расіі 1.286.576 чал.), калі іх заробак лічыць удвая супроць фабрычнага рабочага (як зроблена ў «Опыте», або па 543 рублі на чалавека, а на ўсіх 58.580,1 тыс. руб., тады ўвесь прыбытак ад гандлю трэба лічыць працоўным. З асьцярожнасьці палічым заробак рабочых у гандлю такім самым, як і рабочага на фабрыцы,—271,5 руб.; у такім разе іх прыбытак 31.185,3 тыс. рублёў, а разам з заробкам рабочых па скарбовай продажы гарэлкі й сьпірту (2.431,7 тыс. руб.)—33.617,0 тыс. рублёў, або 57,7%. Але параўноўваць з расійскімі лічбамі (70% на долю працоў-

ных) можна толькі першыя вылічэньні—100% гандлёвага прыбытку на долю працоўных. Такая вялікая доля тлумачыцца тым, што 1) з аднаго боку рабочымі ў гандлю палічаны ўсе «самастойна занятыя», значыцца і гаспадары, а 2) што заробак працаўнікоў у гандлю палічан нязвычайна вялікі. З параўнаньня долі працоўных у гандлёвым прыбытку Беларусі і Расіі, відаць, што ў беларускіх губэрнях перавагу мае дробны, «працоўны» гандаль. Аб тым-жа кажуць непасрэдныя лічбы аб гандлёвых зваротах за 1912 год у гандлёвых прадпрыёмствах Расіі і Беларусі—у табл. № 143.

Табл № 143.

| Губэрні | Лік гандл установ | Зварот (тыс. руб). | Зварот 1 устан рублі | % прыб. |
|---|---|---|---|---|
| Віленшчына | 6.663 | 60.388,4 | 9.063 | 8,4 |
| Віцебшчына | 6.519 | 98.876,1 | 15.167 | 4,6 |
| Горадзеншчына | 9.425 | 59.831,4 | 6.348 | 10,9 |
| Меншчына | 7.269 | 95.067,8 | 13.078 | 4,8 |
| Магілеўшчына | 6.190 | 38.373,3 | 6.199 | 8,6 |
| Смаленшчына | 5.300 | 59.594,2 | 11.244 | 6,3 |
| Беларусь | 41.366 | 412.131,2 | 9.939 | 6,7 |
| Эўр Расія | 511.647 | 8.928.633,3 | 17.451 | 6,0 |

Гандлёвыя прадпрыёмствы на Беларусі на зваротах два разы драбней, чым у Расеі, але % прыбылі ў іх вышэйшы, чым у Расіі. Цікава, што чым драбней былі прадпрыёмствы па звароту, тым большы быў у іх % прыбылі. Мусіць, тут робіць уплыў шыбкасьць звароту (эканомія на стратах па захаваньню тавараў і на % на капітал), а ведама, што шыбкасьць зваротаў дробных прадпрыёмстваў большая; на Беларусі, як гэта вызначыў А. Уласаў («Беларусь і Літва»), гандлёвы зварот шыбчэйшы, чым у Расіі.

Пад'агуленьне падзелу прыбытку між працоўнымі і непрацоўнымі клясамі зроблена ў табл. № 144.

Табл. № 144.

| Галіны | Увесь приб. | Приб прац | % прац. Бел. | % прац. Э. Р. | % не прац Бел. | % не прац Рас. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Сел. гасп. | 570.717,6 | 517.958,0 | 90,8 | 89,1 | 8,2 | 10,9 |
| Лес | 100.942,3 | 8.636,2 | 8,6 | 48,5 | 71,5 | 27,9 |
| Рыба | 1.525,1 | 762,8 | 50,0 | | 50,0 | |
| Прамысл. | 178.919,7 | 147.515,3 | 82,4 | 66,2 | 17,6 | 33,8 |
| Шляхі зносін | 72.489,8 | 38.971,4 | 53,8 | 49,2 | 14,2 | 22,0 |
| Будаўніцтва | 58 710,0 | 34.228,5 | 58,3 | 48,4 | 41,7 | 51,6 |
| Гандаль | 58.248,6 | 33.617,0 | 57,7 | 70,0 | 42,3 | 30,0 |
| Разам | 1.041 553,2 | 634.689,2 | 60,9 | 73,6 | — | 22,4 |

Па сельскай гаспадарцы, прамысловасьцы, шляхам зносін, будаўніцтву і гандлю беларускі прыбытак быў больш працоўны, чым расійскі; па лесу—наадварот, таму й агулам у прыбытку панская доля на Беларусі была вышэй, чым у Расіі.

Калі-б мы ведалі пэўны і больш дэталічны падзел прыбытку па сацыяльных групах; ды каб ведалі яшчэ спажываньне кожнае групы,—мы-б пабачылі ролю кожнае групы у капіталазьбіраньні цэлага народу. Роля паноў, напрыклад, выявілася-б тады ў іншым лічбовым асьвятленьні. Забіраючы ня менш 128.740,5 тыс. руб. (52.759,6 тыс. рублеў ад сел. гасп., 72.218,6 тыс. руб. ад лесу, 762,3 тыс. ад рыбы і каля 3 міл. з вырабу сьпірту) ад усяго нац. прыбытку, яны забіралі ў свае рукі, пэўна, трацізну ўсіх вольных капіталаў цэлага народу. А распарадкуючы іх па ўласной сваёй волі, г. зн. найчасьцей не зьвяртаючы іх назад у нацыянальны вытвор, яны зьяўляліся фактарам гаспадарчым на Беларусі больш магутным, чым гэта можна ўбачыць з простага падзелу усяго нар. прыбытку па групах. На жаль, няма статыстычнай магчымасьці вызначыць т. зв. «вольны прыбытак», г. зн. астачу нар. прыбытку пасьля фактычнага спажываньня. «Вольны прыбытак» ня можна вылічыць нават для ўсяго народу, а ня тое што для паасобных клясаў. А між тым — «вольны прыбытак» — гэта фонд для магчымага капіталазьбіраньня, значыцца, для магчымага пашырэньня вытвору. Чым больш спажываньне, тым менш вольная частка прыбытку.

Народнае харчаваньне. Вылічыць усў спажываньне народу— па стану расійскае статыстыкі зусім немагчыма. Дык спрабуем вылічыць толькі страты на одно харчаваньне, якія займаюць у стратах на ўсё спажываньне найбольшую частку. Мэтай вылічэньня зьяўляецца не само харчаваньне, а той процант, які яно мае адносна ўсяго нац. прыбытку. У якой краіне гэты % вышэй, у той — менш магчымасьцяй для капіталазьбіраньня, для пашырэньня вырабу.

Вылічаюцца страты на харчаваньне так. З чыстые продукцыі народу адкідаецца частка, якая ідзе для харчаваньня жывёлы і тэхнічнае перапрацоўкі (увесь авёс, частка бульбы, ячменю, уся кукуруза) і частка, якая вывезена з краіны; дадаецца да чыстае прадукцыі усё, што прывезена з-замежаў. Ацэнка прадукцыі па мясцовых цэнах, калі іх няма — па прывозных, ці вывазных. Крыніцамі зьяўляліся: «Производство, перевозки и потребление хлебов», «Перевозки по рус. ж. д.», «Внешняя торговля России», «Сборники ст. эк. сведений по с. х.». Тэрмінамі, да якіх належаць лічбы, зьяўляюцца: для збожжа—1909—13 г.г., для прадуктаў жывёлы— 1913 г., для іншых—1911 год.

Усе матар'ялы сабраны ў табліцы № 145.

Табл. № 145.

Спажыта харч. прадуктаў (тыс. руб.)

| Назвы прад | Беларусія | Э. Расея | на 1 чел. | |
|---|---|---|---|---|
| | | | Бел. | Рас. |
| Збожжа | 128.008,3 | 1.935 985,1 | 9,31 | 15,2 |
| Бульба | 54.319,6 | 303.214,2 | 4,0 | 2,4 |
| Сад-гародн. пр. | 56.032,9 | 399 054,7 | 4,1 | 3,0 |
| Мяса ўсякае | 106 946,5 | 711.274,0 | 7,8 | 5,6 |
| У тым ліку сьвініна | 58.470,2 | 284.100,0 | 4,2 | 2,2 |
| Масла, малако і інш. молоч. прадукты | 90.456,1 | 730.555,2 | 6,6 | 5,7 |
| Масла насеннае | 10.880,9 | 89.927,9 | 0,8 | 0.7 |
| Рыба ўсякая | 9 804,0 | 126 929,6 | 0,7 | 1,0 |
| У тым ліку селядцоў | 6 619,8 | 49 348,6 | 0,5 | 0,4 |
| Цукер—рафінад | 9.045,4 | 48 997,0 | 0.7 | 0,4 |
| » пясок | 4.326,4 | 203 675.0 | 0,3 | 1,6 |
| Увесь цукер | 13 371,8 | 252 672,0 | 1,0 | 2,0 |
| Разам | 469 820,1 | 4.549.612,7 | 34,2 | 35,6 |
| Сьпірт (гарэлка) | 47 764,1 | 762 997,9 | 3 6 | 6,0 |

На адно толькі спажываньне харчовых прадуктаў (бяз сьпірту і рысу) траціцца ў Расіі 38,5% прыбытку, а на Беларусі 45,1%, каліж залічыць і сьпірт—тады адносіны страт на харчаваньне да прыбытку будуць—на Беларусі 49,7%, у Расіі 45,0%. Пэўна-ж, каб спажываньне лічылася па асобных соцыяльных клясах, тады-б гэтыя % былі для розных кляс зусім іншымі: у сялян і рабочых на харчаваньне ідзе, бязумоўна, больш за палову ўсяго прыбытку, у заможных клясаў менш і г. д. Параўнўваць, як быццам, можна толькі спажываньне аднародных соцыяльных групаў у дзьвюх старонках, напр. харчаваньне сялян на Беларусі і ў Расіі, харчаваньне рабочых і г. д. Гэта так, але як давеў Р. Кабо[1]) «харчаваньне гарадзкога жыхарства выяўляе залежнасьць ад умоваў таго эканомічнага раёну, у якім яно жыве», а па-другое—дзеля нас цікава ня якасная характарыстыка спажываньня, а вылучэньне «вольнага прыбытку». І ужо на падставе паданых лічбаў можна казаць, што магчымасьцяй для капіталазьбіраньня ў Расіі больш, чым на Беларусі.

Каб скончыць з харчаваньнем, выкарыстаем троху паўней лічбы табл. № 144. З іх відаць, што тып гаспадаркі адбіваецца і ў тыпе харчаваньня. На Беларусі, як краіне інтэнсіўнай жывёлагадоўлі і інтэнсіўнае палявое гаспадаркі, мы бачым параўнальна з Расіяй большае спажываньне мяса, асабліва сьвініны; меншае спажываньне збожжа (9,3 рублі на чалавека супроць 15,2 руб. ў Эўр. Расіі), затое значна павялічаны ужытак бульбы. Агульныя-ж страты на харчаваньне аднаго чалавека ў беларускіх губэрнях і ў Расіі вельмі блізкі: відаць, гэта норма 34—35 рублёў на чалавека блізка да нормы «неабходнага харчаваньня», якое і ў малым прыбытку застаецца аднакавым па велічыні. Наадварот, такія «не неабходныя страты», як купляньне сьпірту і гарэлкі, вельмі элястычны: на Баларусі яны ледзьве ня ў два разы меншыя, чым у Расіі[2]).

Адкінуўшы ад прыбытку страты на харчаваньне, нам трэба было-б ісьці і далей ў адшуканьні «вольнага прыбытку»: г. зн. ізноў адкінуць страты на іншае спажываньне, усе падаткі і дзяржаўны прыбытак, выключыўшы з яго тую частку, якая ідзе на спажываньне людзкога апарату дзяржавы і г. д. Але адсутнасьць статыст. матар'ялу прымушае спыніцца толькі на падлічэньні % дзяржаўнага прыбытку. Затым-жа, што вельмі важна ведаць, якую частку прыбытак дзяржавы забірае ад усяго грашовага товарнага прыбытку, застановімся раней на вызначэньні таварнасьці гаспадаркі.

Таварная частка прыбытку. Вылічэньне таварнае часткі прыбытку мае і сваё асобнае самастойнае значэньне. Ведаючы таварнасьць і склад таварнага прыбытку, можна мець: 1) дадатковы матар'ял для вызначэньня тыпу гаспадаркі, 2) матар'ял дла меркаваньня аб месцы народнае гаспадаркі ва ўсясьветным падзеле працы, аб вытворчых і гандлёвых сувязях краіны, 3) мерку таго, ці моцна зьвязана гаспадарка з рынкам, значыцца, адказ на тое, ці хутка і як будзе адгукацца гаспадарка на загады рынку.

[1]) Потребление городского населения России. М. 1918.

[2]) Беларусы, як гэта заўважана многімі ўжо дасьледчыкамі, бязумоўна адзін з самых цьвярозых народаў б. Рас. імпэрыі. У 1910—12 г.г. і ў 1913 г. было спажыта на душу сьпірту і гарэлкі ведраў у 40°:

| | 1910—12 г. | 1913 г. |
|---|---|---|
| Віленшчына | 0,32 | 0,36 |
| Віцебшчына | 0,38 | 0,45 |
| Гарадзеншчына | 0,38 | 0,44 |
| Меншчына | 0,41 | 0,45 |
| Магілеўшчына | 0,39 | 0,47 |
| Смаленшчына | 0,64 | 0,81 |
| Беларусія | 0,42 | 0,49 |

З 50 губ. Эўр. Расіі за гэты час толькі адна Ковеншчына спажывала менш беларускае нормы - 0,42 вядры. Мусіць, таму, што беларусь бядней, чым другія народы.

Адзінаю крыніцаю для вылічэньня таварнасьці зьяўляюцца статыстычныя справаздачы аб перавозках тавараў па вадзе і чыгунках. Але і яны — не надзейная крыніца. Бо тавары статыстыкаю перавозак рэгіструюцца без паказаньня месца пахаджэньня (паказваецца толькі месца пагрузкі), і столькі разоў, колькі тавар грузіцца, хоць-бы і некалькі разоў (пры перагрузках. Перавозка коньмі статыстыкі ня мае. Значыцца, падлічыць, сколькі прадавалася тавараў на дробных параскіданых рынках, напр., па мястэчках беларускіх, куды тавары звазіліся пераважна коньмі, немагчыма. Мо шырокая сетка бюджэтаў па усёй Беларусі калі-небудзь стала вызначыць мерку таварнасьці беларускае гаспадаркі. Пакуль што толькі прыблізныя вылічэньні. Таварнасьць збожжа паказана у табл. № 146; крыніцаю зьяўляецца «Производство, перевозки и потребление хлебов».

Табл. № 146.

| Культуры | Чысты збор (тыс. п.) | Прыбыт. (тыс. р.) | Вываз. (тыс. п.[1]) | Кошт вывозу (тыс р) | % таварн. Бел. | % таварн. Рас. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Жыта . . . . . . . | 118.935,4 | 99.414,0 | 4.944,4 | 4.133,5 | 4,2 | 10,6 |
| Пшаніца . . . . . . | 4.646,0 | 4.684,0 | 2.111,4 | 2.172,6 | 46,3 | 45,2 |
| Авес . . . . . . . . | 50.931,1 | 37.588,0 | 1.060,0 | 780,2 | 2,1 | 25,9 |
| Ячмень . . . . . . . | 20.701,2 | 16.927,6 | 1.069,0 | 874,4 | 5,2 | 32,0 |
| Грэчка . . . . . . . | 4.856,7 | 4.086,0 | 210,7 | 177,2 | 4,3 | 46,0 |
| Пшано . . . . . . . | 1.089,8 | 890,3 | 201,3 | 164,3 | 1,2 | 19,1 |
| Гарох . . . . . . . | 3.813,7 | 3.616,0 | 234,4 | 202,2 | 5,6 | 40,5 |
| Хвасоль, боб, сачыўка | 727,4 | 1.002,0 | 59,6 | 59,6 | 5,9 | 48,5 |
| Разам . . | 205.701,3 | 168.207,9 | 9.890,8 | 15.584,0 | 9,3 | 27,5 |

На Беларусі збожжа, якое наш земляроб выробляе толькі дзеля харчовых патрэбаў, мае таварнасьць у тры разы меншую, чым у Расіі. Адна толькі пшаніца, мусіць, таму, што гэта пераважна панская культура, дасягае вялікай таварнасьці (46,3%). Але і такі % рыначнасьці, бязумоўна, перавялічан, бо ў адпраўках магло палічыцца і прывознае збожжа, якое толькі перагружалася на Беларусі.

Таму, што бульба мае вялікае значэньне ў беларускай сел. гаспадарцы, вылічаю яе таварнасьць па асобных губэрнях і за два кругабегі: 1896—1900 г.г. і 1909—13 г.г.—табл. №№ 147 і 148.

Табл. № 147.

Таварнасьць бульбы ў 1896—1900 г.г.

| Губэрні | Чысты збор (тыс. п.) | Прыб. (тыс. руб.) | Перапрац. у броварох (тыс п.) | % перат. | % зас.пл. |
|---|---|---|---|---|---|
| Віленшчына . . . . | 29.429,0 | 5.120,6 | 2.708,1 | 9,2 | 8,4 |
| Віцебшчына . . . . | 20.589,0 | 4.241,3 | 729,5 | 3,5 | 6,9 |
| Горадзеншчына . . . | 30.471,4 | 5.425,6 | 3.287,5 | 10,8 | 10,5 |
| Меншчына . . . . | 48.514,8 | 9.703,0 | 6.233,4 | 12,8 | 10,3 |
| Магілеўшчына . . . | 35.639,0 | 5.773,7 | 2.619,6 | 7,4 | 9,8 |
| Смаленшчына . . . | 20.777,9 | 4.488,0 | 795,6 | 3,8 | 5,5 |
| Беларусь . | 185.421,5 | 34.752,2 | 16.373,8 | 8,8 | 8,5 |

[1]) Ня чысты вываз, а толькі выпраўленае збожжа з беларускіх станцыяў.

Табл. № 148.

Таварнасьць бульбы ў 1909—13 г.г.

| Губэрні | Чысты збор | Прыбытак | Перапр. у бровах пуд. | % пер. | Вываз | Перапрац. + вываз. пуд. | Кошт. тав. долі | % тав. | % зас. пл. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Віленшчына . . . | 40.416,2 | 10.508,2 | 4.863,5 | 12,0 | 213,0 | 5.076,5 | 1.319,9 | 12,6 | 11,8 |
| Віцебшчына . . . | 22.327,9 | 6.341,2 | 1.320,6 | 5,9 | 380,6 | 1.401,2 | 397,9 | 6,3 | 8,4 |
| Горадзеншчына . | 43 835,2 | 9.468,4 | 6.102,5 | 13,9 | 1.061,4 | 7.163,9 | 1.568,9 | 16,6 | 14,0 |
| Меншчына . . | 80.237,1 | 16.849,8 | 12.029,4 | 15,0 | 768,8 | 12.798,2 | 2 688,6 | 15,9 | 14,6 |
| Магілеўшчына . . | 50.164,2 | 11.537,8 | 7.555,0 | 15,1 | 569,2 | 8.124,2 | 1.868,6 | 16,2 | 12,2 |
| Смаленшчына . . | 26.984,5 | 8.311,3 | 1.801,7 | 6,7 | 24,0 | 1.825,7 | 562,3 | 6,8 | 7,3 |
| Беларусь . | 263.965,1 | 63.016,7 | 33.672,7 | 12,8 | 2 717,0 | 36.389,7 | 8.404,2 | 13,3 | 11,6 |

Таварнасьць бульбы значна ўзрасла, але не ў аднакавай меры з узростам долі бульбы ў засеўным пляцу. Рынкам для бульбы зьяўляецца выключка сел.-гасп. апрацоўчая прамысловасьць. Толькі ў Горадзеншчыне вываз бульбы дасягнуў значнай лічбы. Гэта вываз у Заходнюю Эўропу,—у 1911 годзе туды з Беларусі пайшло 3.560 тыс. пудоў, або 18,1% ад вываза за-межы з усяе Эўр. Расеі. Таварнасьць бульбы ў Эўр. Расіі (19.1%) вышэй, чым на Беларусі (13,3%). Тлумачыцца гэта тым, што ў Расіі на крахмальна-патачныя заводы і ўнутраны рынак (сталіцы й інш.) ідзе якраз палова таго, што перакурана у расійских броварах; калі-ж браць толькі бульбу, якая ідзе на выраб сьпірту, дык і на Беларусі і ў Расіі таварнасьць будзе аднакавай (12,8% і 13,0%). Ад усяго чыстага збору бульбы у Расіі Беларусь мае 21,6%, ад перапрацованае ў браварох 21,2%, ад перавезенай па чугунках толькі 7,8%. З ўсіх паданых лічбаў відаць, што браварніцтва мела вялікае значэньне для пашырэньня культуры бульбы, але што не адно яно выклікала гэты працэс; заняпад браварніцтва (якое ішло на 50—60% на панской бульбе) можа толькі часова і нязначна адбіцца на ўзросьце культуры бульбы.

— У 1911 г. з Беларусі вывезьлі за межы 2.779 тыс. жмакаў; каб мець 70 пудоў жмакаў, трэба перабіць 100 пудоў насеньня — значыцца праз жмакі сталіся таварнымі 3.970 пудоў канапель і льнянога насеньня, ды вываз за межы алейнага насеньня быў 2.569 т. пуд. (па Л. Бурбісу),— такім чынам, таварная частка прыбытку ад насеньня — 99,1%, у Расіі 65,7%. Чысты вываз лёну за некалькі гадоў відаць з табл. № 149.

Табл. № 149.

Чысты вываз (+) ці прывоз (—) лену (тыс. пуд.).

| Губэрні | 1900 г. | 1903 г. | 1909 г. | 1910 г. | 1911 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| Віленшчына . . . . . . | + 135 | + 172 | + 175 | + 168 | + 104 |
| Віцебшчына . . . . . . | + 1.730 | + 2 167 | + 1.580 | + 1 439 | + 1.051 |
| Гарадзеншчына . . . . | + 6 | — 7 | + 4 | — | — 2 |
| Меншчына . . . . . . | + 81 | + 120 | + 72 | + 73 | + 139 |
| Магілеўшчына . . . . . | + 378 | + 794 | + 812 | + 590 | + 773 |
| Смаленшчына . . . | + 1 533 | + 2.538 | + 1.948 | + 1.704 | + 1.987 |
| Беларусь . . . . | + 3 862 | + 5.784 | + 4 591 | + 3.974 | + 4 052 |

Выразную законаўпарадкаванасьць убачыць на гэтых лічбах ня можна. Увесь заход Беларусі нібы зьмяншае вываз, усход нязначна павялічвае. Сярэдні чысты вываз за 1909—11 г.г. быў 4.206,0 тыс. пудоў коштам 18.338 тыс. рублеў, або 55,6% ад прыбытку. Пянькі вывезена 330 т. пуд. на 1.280,4 тыс. руб., разам з лёнам на 19.618,4 тыс. руб., або 51,1%. У Расіі гэты %—65,7, але ён вызначан не самастойна, а умоўна палічылі яго такім, як % таварнасьці ў насеньня, дык параўнаньне немагчыма.

Усе матар'ялы па вылічэньню таварнасьці гандл.-прам. культур згуртованы ў табл. № 150.

Табл. № 150.

| Культура | Увесь прыб. | Таварн частка | % тавар Бел | % тавар Рас. |
|---|---|---|---|---|
| Бульба | 63.016,7 | 8.404 2 | 13,3 | 19,1 |
| Насеньне | 11.200,2 | 11.100,2 | 99,1 | 65,7 |
| Пянька | 5.435,4 | 1.280,4 | 23,6 | 65,7 |
| Лён | 32 985,4 | 18 338,0 | 55,6 | |
| Разам | 112 637,8 | 39.122,7 | 34,7 | 51,9 |

Таварнасьць-жа толькі тых расьлін, якія ёсьць на Беларусі, ў Расіі будзе 38,8%. Але гэты % штучна павялічан—трэба лічыць, што гандлёва-прамысловыя расьліны маюць большую таварнасьць на Беларусі (параўнальна з Расіяй).

Тварнымі лічуцца з прадуктаў мясное жывёлагадоўлі ўсе тыя, якія дае жывёла зарэзаная ў рэзьнях. Таму, што Беларусь зьяўляецца раёнам інтэнсіўнае мясное жывёлагадоўлі, вылічым таварнасьць па асобных губэрнях. Па іншых галінах жывёлагадоўлі таварнасьць вылічаем па ўсёй Беларусі, разам па ўсіх губэрнях.

Табл. № 151.

Таварнасьць мяса ў 1913 г.

| Губэрні | Зарезана на рэзьнях быдла штук | Кошт (тыс. р.) | Забіта целят | Кошт |
|---|---|---|---|---|
| Віленшчына | 84.085 | 4.464,9 | 35.995 | 509,0 |
| Віцебшчына | 180 625 | 7 396,6 | — | — |
| Горадзеншчына | 153.806 | 9 564,8 | 12 613 | 153,6 |
| Меншчына | 132 158 | 5 018,2 | 50.134 | 500,3 |
| Магілеўшчына | 75.156 | 2 976,2 | 42.693 | 442,3 |
| Смаленшчына | 104 253 | 3.544,6 | 22 472 | 200,7 |
| Беларусь | 729.983 | 32.965 3 | 163.907 | 1.805,9 |

Да кошту мяса з разніц трэба дадаць кошт жывелы, якая вывезена за межы Беларусі; тады будзем мець поўную таварную долю.

Табл. № 152.

Поўная таварная доля.

| Губэрні | Вывоз чисты быдла 1911 г. | Цена 1 шт. руб. | Кошт (тыс. руб) | Тавар доля прыб. ад рн. ск. | Прыб. ад гавяд у 1913 г. | Прыб. ад гавяд і целяціна 1913 г. | Тавар доля гавяд.—целяц | % тав. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Віленшчына | — 8.889 | 65 | — 577,8 | + 3.887,1 | + 5.167,2 | 8 125,3 | 4.396,1 | 54,1 |
| Віцебшчына | + 2.659 | 54 | + 143,6 | + 7.540,2 | + 6.051,2 | 8.753,2 | 7.540,2 | 86,1 |
| Горадзен. . | + 8.576 | 95 | + 814,7 | +10.379,5 | + 5.704,9 | 8.273,5 | (10.533,3) | 100 |
| Меншчына | + 14.488 | 79 | + 1.144.6 | + 6 162,8 | + 4 052,2 | 5 832,4 | (6 663,1) | 100 |
| Магілеўшч. | — 695 | 65 | — 45,2 | + 2.931,0 | + 4.361,9 | 6 568,6 | 3.373.3 | 51,3 |
| Смаленшч. | + 2.997 | 56 | + 167,8 | + 3 712,0 | + 3.707,8 | 4.788,5 | 3.913,1 | 81,7 |
| Беларусь | + 19.136 | — | + 1.647,7 | +34.612,0 | +28.645,2 | 42.341,7 | (36.418,9) | 78,7 |
| | | | | | | | 33 328,6 | — |
| | | | | | | | Э. Расея | 71,9 |

З гэтае табліцы відаць, што таварная доля прыбытку ад гавядзіны (34.612 тыс. руб.) вышэй, чым увесь прыбытак ад мяса буйнае рагатае жывёлы (28.645,2 тыс. руб.) Гэта значыць, што прынятая мною норма бракоўкі (1/6 частка ўсяго статку) малая, асабліва для губэрань. Гарадзенскай і Менскай і розная на асобных губэрнях. Мясны ўхіл жывёлагадоўлі зьяўляецца там (у Меншч. і Гарадзен.) яшчэ больш моцным, чым гэта было паказана (табл. № 71). Таварнасьць прыбытку ад мяса быдла на Беларусі вышэйшая, чым у Расіі (78,7% і 71,9%). З табл. № 152 можна пабачыць, як зьмяняецца чысты вываз ці прывоз рагатае жывёлы з часам; лічбы паданы за 1874 год, 1900 і 1911; крыніцай для 1900 г. зьяўляецца праца Бліоха «Влияние ж. д. на экономическое состояние России» (т. III), для 1900 г. «Ежегодник М. Фин. за 1911 г.», для 1911 г. «Материалы к пересмотру торговых договоров».

Табл. № 153.

Чысты вываз (+) ці прывоз (—) раг. жывелы—штук.

| Губэрні | 1874 г | 1900 г. | 1911 г. |
|---|---|---|---|
| Віленшчына . . . . . | — 4 785 | — 12.731 | — 8 889 |
| Віцебшчына . . . . . | — 1 494 | + 285 | + 2 659 |
| Горадзеншчына . . . . | + 29 | + 12.321 | + 8.576 |
| Меншчына . . . . . . | + 4 564 | — 3.460 | + 14.488 |
| Магілеўшчына . . . . . | — 1 026 | — 4.434 | — 695 |
| Смаленшчына . . . . . | + 231 | — 667 | + 2.997 |
| Беларусь . . . | — 2.481 | — 8.587 | + 19 136 |

Бязумоўна паданага матар'ялу не давалі, каб зрабіць сталыя вывады: надзейнымі зьяўляюцца толькі лічбы 1874 і 1911 г.; грунтуючыся на іх, можна казаць аб павялічэньні вывозу быдла з Беларусі: Горадзеншчына, Меншчына, Смаленшчына вывозяць у 1911 г. у некалькі разоў болей,

чым вывазілі ў 1874 г.; Віцебшчына, замест прывозу, почынае даваць чысты вываз, адна Віленшчына толькі павялічыла прывоз. Мусіць, паварот асяродку стэповае жывёлагадоўлі з поўдня на поўдня-усход і ўсход— вызваліў Беларусь ад канкурэнцыі паўднёвых раёнаў на польскім, а нават расійскім сталічным рынкам, чым даў магчымасьць павялічыць экспорт нашае жывёлы, з больш дарагім сабекоштам.

У табл. № 154 сабраны лічбы аб таварнасьці прыбытку свіньней.

Табл. № 154.

| Губэрні | Забіта свіней | Чыстый вывоз свіней | Прадаец-ца разам | Кошт. продан. свін | % тав. |
|---|---|---|---|---|---|
| Вліеншчына . . . . | 22.830 | 5.650 | 28.480 | 1.357,4 | 14,5 |
| Віцебшчына . . . . | 19.689 | 1.832 | 21.521 | 999,4 | 14,4 |
| Горадзеншчына . . | 21.191 | 23.806 | 44.997 | 2.874,0 | 28,8 |
| Меншчына . . . . . | 48.087 | 17.473 | 65.524 | 3.090,8 | 21,9 |
| Магілеўшчына . . | 3.129 | — 853 | 2.227 | 92,9 | 0,8 |
| Смаленшчына . . . | 14.637 | + 168 | 14.805 | 613.5 | 9,0 |
| Беларусь . | 129.563 | 48.040 | 177.603 | 9.028.0 | 15,4 |
| | | | | Эўр. Расія | 22,8 |

На Беларусі таварнасьць сьвіней меншая, чым у Расії: у Магілёўшчыне і Смаленшчыне яна зусім мізэрная (08% і 9,0%), і толькі Горадзеншчына з Меншчынай, у якіх жывёлагадоўля наогул носіць яскрава выяўлены мясны і таварны ўхіл, таварная доля дасягае 1/5 — 1/3 часткі прыбытку ад сьвіней. Шчэць у гэта падлічэньне ня ўзята.

Табл. № 155.

Таварнасьць авечак на Беларусі нязначная:

| Губэрні | Забіта на бойн. | Кошт (тыс. р.) | % тов. |
|---|---|---|---|
| Віленшчына . . . | 29.311 | 183,2 | 20,5 |
| Віцебшчына . . . . | 52.404 | 340,6 | 16,5 |
| Горадзеншчына . . . | 27.717 | 159,6 | 15,4 |
| Меншчына . . . . . | 26.218 | 130,3 | 10,3 |
| Магілеушчына . . . | 10.676 | 57,9 | 3.6 |
| Смаленшчына | 33.051 | 180,8 | 6.8 |
| Беларусь . | 179.377 | 1.052.4 | 11,1 |
| | | Эўр. Расія | 31,4 |

Табл. № 156.

Зараз зробім падрахунак таварнасьці мяса.

| Галіны | Увесь прыбыт. | Тавар. частка | % Бел | % Рас. |
|---|---|---|---|---|
| Гавядзіна і цяляціна . | 42.341,7 | 33.328,6 | 78,7 | 71.9 |
| Сьвініна (і сала) . . | 58.741,9 | 9.028,0 | 15,4 | 22,8 |
| Бараніна (і сала) . . | 9.517,7 | 1.052,4 | 11,1 | 31,4 |
| Разам . . | 110.601,3 | 43.409,0 | 39,2 | 47,0 |

Масла с Беларусі з 1911 г. вывезена 128 тыс. пудоў, што роўназначна 5.120 ведрам малака; сыру і інш малочных прадуктаў 288 тыс. пуд., для чаго трэба было перапрацаваць 2.160 тыс. ведраў малака; значыцца, праз вываз масла, сыру і малочных прадуктаў зрабіліся таварнымі 7.280 тыс. вёдзер малака, коштам вядро па 76 коп. (на 15% вышэй мясцовай цаны —66 к.), а разам 5.532,8 тыс. руб., ці 5,8% ад усяго прыбытку з малака.

Таварнасьць воўны, шчэці і аўчын відна з табл. № 157.

Табл. № 157.

| Назовы | Вывезена | Кошт. таварн. | Прыбытак | %тав | %тав. Э.Рас. |
|---|---|---|---|---|---|
| Воўны . . . . . | 53 т. п. | 795,0 | 6.393,6 | 12,4 | 48,3 |
| Шчэць . . . . . | — | 3.406,2 | 3.406,2 | 100% | 100% |
| Аўчыны . . . . . | 15 т. п. | 216,9 | 5.148,7 | 4,2 | 35,0 |
| Разам . . | – | 4.418,1 | 14.948,8 | 29,6 | 42,5 |

Прыбытак з коняй і скур лічыцца цалком таварным. Падзел усяго прыбытку ад жывёлагадоўлі на таварную і натуральную частку даецца табл. № 158.

Табл. № 158.

| Галіны | Увесь прыб. | Таварн. частка | % тав | |
|---|---|---|---|---|
| | | | Бел. | Расія |
| Мяса . . . . . . . . | 110.601,3 | 43.409,0 | 39,2 | 47,0 |
| Малако . . . . . . | 95.497,7 | 5.532,8 | 5,8 | 14,2 |
| Воўна, шчэць, аўчыны | 14.948,8 | 4.418,1 | 29,6 | 48,9 |
| Скуры . . . . . . . | 6.795,8 | 6.795,8 | 100 | 100 |
| Коні . . . . . . . . | 1.586,4 | 1.586,4 | 100 | 100 |
| Разам . . | 230.324,5 | 61.742,1 | 26,8 | 33,0 |

Прыбытак з пчол, з сена й саломы лічыцца цалком грашовым. У прыбытку ад саду й гароду, за адсутнасьцю матар'ялу аб перавозках, прыймаецца таварная частка такая-ж, як па Эўр. Расеі.

Таварнасьць усяе сел. гаспадаркі выяўляецца лічбамі табл. № 159.

Табл. № 159.

| Галіны | Увесь прыб. | Таварн. частка | % тав. | |
|---|---|---|---|---|
| | | | Бел. | Расія |
| Збожжа . . . . . . | 168.206,3 | 15.584,0 | 9,3 | 27,5 |
| Гандл.-прам. . . . . | 112.637,5 | 39.122,7 | 34,7 | (38,8) |
| Жывёлагад. . . . . | 230.324,5 | 61.742,1 | 26,8 | 33,0 |
| Сена і саломы . . | 2 470,6 | 2.470,6 | 100 | 100 |
| Сад-гарод . . . . . | 56.032,9 | 10.141,9 | 18,1 | 18,1 |
| Пчолы . . . . . . . | 1.045,8 | 1.045,8 | 100 | 100 |
| Уся сел гасп. . | 570.717,6 | 130.107,1 | 22,8 | 32,6 |

Таварнасьць беларускае сельскае гаспадаркі вельмі невялікая ў параўнаньні нават з такою натуральнаю гаспадаркою, як расійская. Пэўна-ж, тут робіць уплыў розны тып гаспадаркі. Беларусь, як край інтэнсіўнай жывёлагадоўле і палявой гаспадаркі, не прападае збожжа, якое да 27,5% з усяго грашовага прыбытку ад збожжа ў Расіі; не прадае так шмат воўны, авечак, аўчын і г. д. У такіх-жа прадуктах інтэнсіўнае гаспадаркі, як мяса, сьвініна (у Горадзеншчыне і Меншчыне), гандлева-прамысловыя культуры —таварная доля на Беларусі або вышэй, або вельмі блізка да расійскай. І усе-ж трэба лічыць таварнасьць нашае сельскае гаспадаркі вельмі малою. На аднаго сельскага жыхара на Беларусі сельская гаспадарка дае толькі 10—11 рублёў, а ў Рассіі 16—17 рублёў грашовага прыбытку, з іх селянін павінен заплаціць усе падаткі, зрабіць такія грашовыя страты, як купля мануфактуры, селядцоў, цукру, газы, сярнічак, гарэлкі і г. д. На капіталазьбіраньне ў селяніна пойдуць лічаныя капейкі, асабліва калі ўзяць пад ўвагу, што значная частка захованых сялянскіх капіталаў трацілася на купляньне зямлі ў паноў. Цясьней зьвязаць сельскую гаспадарку Беларусі з рынкам, павялічыць таварнасьць—гэта адно з асноўных заданьняў эканамічнае політыкі.

Для вылічэньня таварнасьці прыбытку ад лесу трэба вызначыць, сколькі лясное масы было вывезена з Беларусі. Па «матер'ялах к пересмотру торговых договоров» бярэм колькасьць вывезеных на чугунцы лесавых матар'ялаў за 1911 г.; па часопісі «Известия особого совещания по топливу» №5 за 1917 г.—колькасьць вывезеных па чугунцы дроў і лесавых матар'ялаў па вадзяных шляхах ласкава падалі мне С. А. Здановіч і А. Л. Ярашчук з свае нарыхтаванае да друку працы аб перавозках сел.-гасп. тавараў на абшарах Беларусі за 1911—13 г.г. Матар'алы згуртаваныу т абл № 160

Табл. № 160.

| Губэрні | Вываз на чуг. (тыс.п.) | | | Вываз па вадзе | | | Агульны вываз | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Лесав. мат | Дроў | Разам | Лесов мат. | Дроў | Разам | Разам | Агульн. | % тав. |
| Віленшчына . | 14.066 | 844 | 14.910 | 87.080 | 5.989 | 93.059 | 107.969 | 317.558 | 71,9 |
| Віцебшчына . | 6.516 | – 649 | 5.867 | 27.184 | --1 356 | 25.828 | 31.695 | 93.221 | 18,1 |
| Горадзеншчына | 11.387 | 1.806 | 13.193 | 18.033 | —890 | 17.143 | 30.336 | 89.224 | 26,0 |
| Меншчына . . | 49.922 | 7.702 | 57.624 | 79.084 | 25.648 | 104.732 | 162.356 | 477.521 | 32,1 |
| Магілеўшчына | 20.894 | 2.996 | 23.890 | 25.770 | 3.741 | 29.511 | 53.401 | 157.063 | 23,7 |
| Смаленшчына | 20.197 | 7.687 | 27 884 | 25.666 | 533 | 26.199 | 54.083 | 159.069 | 32,4 |
| Беларусь | 122.980 | 20.386 | 143.368 | 262.807 | 33.633 | 296.472 | 439.840 | 1.293.657 | 32,8 |
| | | | | | | | | Эўр. Расія . . | 23,3 |

Таварнасьць лесу, як і трэба было загадзя лічыць, на Беларусі прыблізна ў паўтары разы вышэй, чым у Расіі. Параўнаем вываз лясных матар'ялаў і дроў за гады 1911—13 і 1994—99 г.г.[1]) (тыс. пудоў).

Табл. № 161.

| Кругабегі | Віл | Віц. | Гор. | Мен | Маг. | Смал. | Белар. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1894 – 99 г.г. . | 20.733,5 | 20 098,0 | 13 140,0 | 55.379,4 | 42.659,3 | 45.190,4 | 170.920,6 |
| 1911—13 » . | 107.969 | 31.695 | 30.336 | 162.356 | 53,401 | 54.083 | 439.840 |

[1]) З Менска «Россия в дорожном отношении» СПБ 1903.

За 13 гадоў чысты вываз лясной масы вырас у два разы; асабліва значнае павялічэньне выявілася на заходзе Беларусі—у Віленшчыне у 5 разоў, Гарадзеншчыне шмат разоў, бо прывоз перарабіўся на вываз, на Меншчыне ў 3 разы, на Віцебшчыне у паўтары і г. д.

Рыбы ўсякае вывезена з Беларусі 267 тыс. пудоў, па 3 р. 04 к. пуд., агулам на 811,7 тыс. рублеў, або на 32,1% ад прыбытку; у Расіі таварнасьць рыбы 75,5%—значыцца у нашых губэрнях рыба ідзе пераважна на ўласныя патрэбы, або прывозіцца коньмі ў мястэчкі (бяз усякае рэгістрацыі).

Прыбытак ад іншых галін вырабу лічыцца цалком таварным. Падзел усяго народ. прыбытку на грашовы і натуральны даецца ў табл. № 162.

Табл № 162.

Таварнасьць нац. пры б. Беларусі.

| Галіны | Увесь прыб. | Тавар. частка | % тавар. | |
|---|---|---|---|---|
| | | | Бел. | Расія |
| Сел. гаспадар. | 570.717,6 | 130.107,1 | 22 8 | 32,6 |
| Лес | 100 942,3 | 33.109,1 | 32,8 | 23,3 |
| Рыба | 1.525.1 | 811,7 | 32,1 | 75,5 |
| Прамысл. | 178.919,7 | 178.919,7 | 100 | 100 |
| Будаўніц. | 58.710,0 | 58.710,0 | 100 | 100 |
| Транспарт | 72 489,8 | 72 489,8 | 100 | 100 |
| Гандаль | 58 248,6 | 58.248,6 | 100 | 100 |
| Разам | 1 141 553,1 | 532.396,0 | 51,1 | 63,5 |
| Сел гасп. лес, рыба | 673.185,0 | 164 027,9 | 24,1 | 32,2 |

А цяпер разгледзім склад таварнае часткі прыбытку—табл. № 163

Табл № 163

| Галіны | Беларусь | Эўр. Расея |
|---|---|---|
| Сельск. гаспад. | 23,4 | 24,4 |
| Лес | 5 9 | 2,0 |
| Рыба | 0,1 | 1,0 |
| Прамысл. | 32,2 | 34,2 |
| Шляхі зносін | 13,0 | 11,2 |
| Будаўніцтва | 10,5 | 14,1 |
| Гандаль | 14,9 | 13,1 |
| Разам | 100 | 100 |

У грашовай частцы народ ага прыбытку роля сельскае гаспадаркі, лесу й рыбы нязвычайна зьніжаецца (наогул роля здабываючай прамысловасьці). А таму што з часам у народным прыбытку павялічваецца адносная роля прамысловасьці, а ня сел. гаспадаркі,— павінна з часам узра-

стаць і таварнасьць усяе народнае гаспадаркі.— Разгледзім склад таварнае часткі прыбытку толькі ад сел. гаспадаркі—табл. № 164.

Табл. № 164.

| Галіны | Беларусь | Эўр. Расея |
|---|---|---|
| Збожжа | 12,0 | 40,5 |
| Гандл.-прам. кул. | 30,1 | 20,6 |
| Жывёлагадоўлі | 47,5 | 30,9 |
| Іншыя | 10,4 | 8,0 |
| | 100 | 100 |
| Мяса быдла | 33,4 | 15,6 |
| Малако | 4,2 | 5,9 |
| Сьвіньні | 6,9 | 3,1 |

Усім выразна адбіўся тып абедзьвюх краін. Расія — старана экстэнсіўнага вырабу збожжа; Беларусь—старана інтэнсіўнай жывёлагадоўлі і інтэнсіўных палявых культур. У Расіі большую адносна частку грашовага прыбытку дае збожжа (40,5%), на Беларусі—жывёлагадоўля (47,5%); тэхнічна-прамысловыя расьліны ў Расіі даюць толькі 1/5 таварнага прыбытку, на Беларусі 1/3. Сьвіньні і ў Расіі і ў Беларусі маюць малую долю ў прыбытку грашмі, але на Беларусі % падвойны (6,9 супроць 3,1). Молочная рыночная гаспадарка ў абедзьвюх старонках прыносіць дужа невялічкую частку прыбытку, але адносіны яе да рынгачнае гадоўлі сьвіней у Расіі як 2 да 1, на Беларусі толькі як 2 да 3,—у нас сьвіньні даюць прыбытку грашмі ў паўтара разы больш, чым каровы малаком.

Дзяржаўны, земскі і гарадзкі прыбытак на Беларусі. Цяпер, калі ўжо ведама, які ў нас грашовы прыбытак, можна падаць і лічбы дзяржаўнага і земска-гарадзкога прыбыткаў, пры гэтым цікавы ня самыя абсолютныя лічбы прыбыткаў, а адносіны іх да таварнае часткі народнага прыбытку, а йшчэ да т. зв. «вольнага прыбытку».

Вось абсолютныя вялічыні дзяржаўнага прыбытку за 1913 г. (тыс. руб.)—табл. № 165.

Табл. № 165.

| | Віл. | Віц. | Гор. | Мен | Маг. | Смал. | Белар. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Увесь дзярж приб. | 17.070,0 | 14.248,5 | 23.214,9 | 14.142,7 | 20.159,0 | 19.258,4 | 108.093,5 |
| У тым ліку: | | | | | | | |
| З казен. він. апэрац. | 6.403,8 | 7.565,3 | 10.913,2 | 9.322,3 | 8.239,5 | 15.021,9 | 57.466,0 |
| » збораў з піцьця | 1.422,0 | 772,2 | 827,1 | 936,8 | 454,5 | 402,9 | 4.815,5 |
| » прыбыт. ад лесу | 2.382,6 | 1.265,7 | 4.158,2 | 1.161,1 | 3.014,5 | 385,1 | 12.367,2 |
| » » » табакі | 543,2 | 400,5 | 3.190,7 | 165,2 | 99,8 | 274,2 | 4.673,6 |
| » » » запалак | 42,4 | 342,7 | 137,4 | 1.938,5 | 41,7 | 350,5 | 2.853,2 |
| » падат. зямельных | 598,2 | 354,7 | 592,9 | 497,5 | 302,5 | 244,9 | 2.590,7 |
| » » прамысл. | 1.119,3 | 817,9 | 1.075,6 | 810,8 | 679,5 | 527,3 | 5.030,4 |

Adносіны дзяржаўнага прыбытку і стратаў да насельніцтва, да пляцу зямлі, да ўсяго прыбытку і асобна да таварнага прыбытку—зьмешчаны у табл. №№ 166 і 167.

Табл. № 166.

| Н а з в ы | Уся Беларусь | Эўр. Расея | На 1 чал. руб. | |
|---|---|---|---|---|
| | | | Беларусь | Расея |
| Дзярж. прыбытак . . . . . . . . . . | 108.093,5 | 1.852.710,8 | 7,9 | 14,5 |
| Усе дзярж. страты . . . . . . . . . . | 156.136,9 | 1.682.259,4 | 11,4 | 13,2 |
| Вайсковыя страты . . . . . . . . . . | 41.347,3 | 347.294,5 | 3,1 | 2,7 |
| Дзярж. страты без вайсковых . . . | 114.789,6 | 1.334.964,9 | 8,3 | 10,5 |
| Дзярж. страты без вайск. і надзвыч. . | 101.970,6 | — | 7,4 | — |

Табл. № 167.

| К р а і н ы | Дзярж. прыб. з 1 кв. вяр. | % дзярж. прыб да тав. нар. прыб. | % дзярж. прыб. да тав нар. прыб. | % дзярж. прыб. да прыб. без. спенываны |
|---|---|---|---|---|
| Беларусь . . . . . . . . | 375,7 | 10,4 | 20,3 | 18,9 |
| Эўр. Расея . . . . . . . | 435,8 | 15,7 | 24,7 | 25,5 |

Паданыя лічбы ні ў якім разе не паказваюць цяжару падаткаў у дзьвюх краінах. Яны толькі даводзяць, што велічыня дзяржаўнага прыбытку залежыць ад вялічыні ўсяго народ. прыбытку. І толькі паміж іншым заўважу я, што думка, нібы царскі ўрад больш траціў на Беларусі, чым браў з яе прыбыткаў, непраўдзіва. Калі адкінуць з дзяржаўных стратаў на Беларусі ўсе вайсковыя і надзвычайныя, тады будзе відаць, што страты на аднаго чалавека былі 7,4 рублі, а дзярж. прыбытак 7,9 руб., значыцца, прыбытак больш [1]). На чые патрэбы ішлі страты (без вайсковых і надзвычайных), я не разглядаю, але і з паданай унізе таблічкі відаць, што пераважна на патрэбы самога дзяржаўнага апарату, а не мясцовага жыхарства.

Гарадзкі і земскі бюджэт на Беларусі таксама адносна насельніцтва невялікі—ізноў адбіваецца беднасьць народу, параўнавальна з Эўр. Расіяй.

Табл. № 168.

| | 1914 г. | | 1915 г. | | 1914 г. на 1 | | 1915 г. на 1 | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Бел. | Расія | Бел. | Расія | Бел. | Расія | Бел. | Расія |
| Бюджэт гарадоў . . | 8.474,1 | 252.154,9 | 10.560,7 | 286.365,7 | 0,60 | 1,93 | 0,75 | 2,16 |
| » земстваў | — | — | 22.477,6 | 339.336,6 | — | — | 1,60 | 2,52 |

[1]) Вось які быў склад стратаў у 1913 г. на Беларусі:

| | |
|---|---|
| вайсковае і морскае м-ва . . . . . . . . . | 26,5% |
| фінансаў м-ва . . . . . . . . . . . | 20,5% |
| шляхаў зносін м-ва . . . . . . . . . | 20,0% |
| унутраных спраў м-ва . . . . . . . . | 7,4% |
| народ асьвета . . . . . . . . . . . . | 5,6% |
| сельская гаспадарка . . . . . . . . . | 5,4% |
| юстыцыя . . . . . . . . . . . . . | 3,1% |
| сінод . . . . . . . . . . . . . . . | 2,7% |
| дзярж. кантроль і крэдыт . . . . . . . | 0,5% |
| гандаль . . . . . . . . . . . . . | 0,1% |
| надзвычайныя страты . . . . . . . . | 8,2% |

У складзе дзяржаўнага прыбытку таксама павінен адбіцца народны прыбытак, пэўна-ж, толькі прыблізна.

Табл. № 169.

Склад дзярж. прыбытку 1913 г. (%).

| Назовы | Віл. | Віц. | Гор. | Мен. | Маг. | Смал. | Бел. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Увесь прыбытак . . . | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 |
| У тым ліку: | | | | | | | |
| Ад каз. він. апэр. . . . | 37,5 | 53,1 | 47,0 | 65,9 | 40,9 | 78,0 | 53,2 |
| Збор піцейны . . . . . | 8,3 | 5,4 | 3,6 | 6,6 | 2,3 | 2,1 | 4,5 |
| Ад лесу . . . . . . . | 14,0 | 8,9 | 17,9 | 8,2 | 15,0 | 2,0 | 11,4 |
| Ад табакі . . . . . . . | 3,2 | 2,8 | 13,7 | 1,2 | 0,5 | 1,4 | 4,3 |
| Ад запалак . . . . . . | 0,3 | 2,4 | 0,6 | 13,7 | 0,2 | 1,8 | 2,6 |
| Падаркі зямел . . . . . | 3,5 | 2,5 | 2,6 | 3,5 | 1,5 | 1,3 | 2,4 |
| » прамыслов. . . | 6,6 | 5,7 | 4,6 | 5,7 | 3,4 | 2,7 | 4,7 |

Па першае, ў дзяржаўным прыбытку адбіваецца той соцыяльна-эканамічны парадак, аборонцам якога зьяўляецца дзяржава; але, як кажуць лічбы гэтай табліцы, — адбіваюцца і геаграфічныя асаблівасьці народ. гаспадаркі, значыцца і народ. прыбытку[1]).

Тып народнае гаспадаркі Беларусі. Непасрэднае свае мэтымая праца ўжо дасягнула—падлічэньне народнага прыбытку Беларусі, параўнальна з Эўр. Расіяй, па мэтоду С. М. Пракаповіча, зроблена. Растлумачыць, чаму прыбытак такі, а ня іншы, адшукаць і вытлумачыць законаў—парадкаванасьці ў яго зьменах, г.-ё даць тэорыю разьвіцьця народнае гаспадаркі Беларусі вельмі складанае тэорэтычнае заданьне, якое зараз не пастаўлена перада мною.

У дадатак да вылічэньня прыбытку я магу толькі на падставе згуртованага тут матар'ялу выказаць некалькі думак аб тыпу народнае гаспадаркі Беларусі, параўнальна з Расіяй, калі разглядаць усю дзяржаву, як адзін тып (не зважаць на раённыя асаблівасьці).

1. І. Беларусь і Расія зьяўляюцца краінамі пераважна здабываючай прамысловасьці з вельмі слаба выяўленай індустрыялізацыяй.

| Дом ў нар. прыбыт. галінаў | 1900 г. | | 1913 г. | | 1913 г. па цан. 1900 г. | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Бел | Рас | Бел. | Рас. | Бел. | Рас. |
| Здабываючай прамысл. | 66,9 | 59,9 | 64,6 | 54,0 | 59,7 | 50,0 |
| Апрацоўчай » | 14,9 | 21,3 | 17,2 | 21,7 | 20,5 | 24,9 |

[1]) Аб складзе сучаснага бюджэту БССР і таго, які быў перад вайною, «Очерки по нар. хозяйству и финансам Белоруссии», стар. 175—177. Там жа параўнаньне абсалютных лічбаў.

| | 1913/14 г. | 1923/24 г. | 1924/25 г. |
|---|---|---|---|
| Увесь прыбытак БССР . . . . . . . . . . | 35.652,0 | 26.846,9 | 37.926,8 |
| Усе страты БССР . . . . . . . . . . . . | 48.974,2 | 16.084,4 | 27.267,7 |
| Прыбытак больш (+) ці менш (—) стратаў. | —13.322,2 | +12.762,5 | +10.659,1 |

«В доходы СССР Белоруссия вносит... в 1923/24 год. больше половины, а в 1924/25 г. больше трети всех своих доходов, абсолютно же сумму почти постоянную —12,5 и 13,5 мил. р.» (133).

«Чрезвычайно быстрый рост доходов совет. бюджета... что соответствует общему восстановительному процессу всего нар. хоз. Республики» (175).

2. З галінаў здабываючай прамысловасьці перавагу мае сельская гаспадарка. Тый яе ў абедзьвюх старонах розны. На Беларусі—інтэнсіўны, у Расіі—экстэнсіўны: прыбытак ад сел. гасп. 1900 г. на 1 дзес. карыснае зямлі бяз лесу—у Расіі 18 руб. 1 коп., на Беларусі 22 р. 62 кап., на 1 дзес. усяе карыснае зямлі—8,2 руб. і 13,3 руб.

Больш выразна тып сел. гаспадаркі адбіваецца ў складзе с.-г. прыбытку. Грунтуючыся на ім (табл. 82, 83), можна вызначыць Беларусь, як край жывёлагадоўлі і інтэнсіўных палявых культур, Расію—як старану экстэнсіўнай палявой гаспадаркі (збожжа).

| Доля у с г. прыбытку | 1900 г. | | 1918 г. | | 1913 ст. ц. | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Бел. | Расія | Бел. | Расія | Бел. | Расія |
| Збожжа . . . . . . . . | 34,6 | 48,9 | 29,5 | 47,9 | 32,9 | 50,7 |
| Гандл-прам. расьлін . . | 18,8 | 12,9 | 19,7 | 13,0 | 21,8 | 13,9 |
| Жывелагадоўлі . . . . | 35,2 | 27,9 | 40,4 | 30,7 | 33,8 | 26,4 |

Ва ўсясьветным падзеле працы Беларусь вызначаецца, ізноў-жа, як край жывёлгадоўлі і інтэнсіўных прамыслова тэхнічных культур, Расея—як старана збожжа.

| Доля у таварным прыбытку галінаў | 1913 г | |
|---|---|---|
| | Бел | Расея |
| Збожжа . . . . . . . . | 12,0 | 40,5 |
| Ганд.-прам. расьл. . . . | 30,1 | 20,6 |
| Жывелагад. . . . . . . | 47,5 | 30,9 |

У гандлёва прамысловых культурах на Беларусі перевагу мае бульба, што сьведчыць аб больш высокім разьвіцьці палявое гаспадаркі, незалежна ад севазвароту %о бульбы ў прыбытку ад прамысловых у 1909—13 г.г. на Беларусі 55,9% ў Эўр. Расеі толькі 40,1%. Нават з прыбыткам ад цукровых буракоў бульба ў Расіі дае толькі 57% прыбытку ад тэхнічных расьлін, але-ж цукр. буракі не зьвязваюць так цесна палявую гаспадарку з жывёлагадоўляю, як гэта робіць бульба, і апрача таго цукровыя буракі на 81,5%—панская культура, бульба ж—на 92,3% ў Расеі і 93,8% на Беларусі—селянская расьліна. Значыцца выраб гандлёва-прамысловых культур у м а с е гаспадарак мае у беларускіх губэрнях больш інтэнсіўны характар.

Жывёлагадоўля на Беларусі выяўляе выразна інтэнсіўны мясны тып, у Расіі—мясны экстэнсіўны.

| Доля ў приб. ад жывёлагадоўлі | 1900 г. | | 1913 г | | 1913 па ст ц. | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Бел | Расія | Бел. | Расія | Бел | Расія |
| Малако . . . . . . | 48,8 | 48,9 | 41,6 | 43,6 | 4[illegible],8 | 48,9 |
| Сьвіньні . . . . . . . | 19,7 | 11,3 | 27,0 | 16,4 | 25,7 | 14,3 |
| Гавядзіна . . . . . . | 9,7 | 15,6 | 12,4 | 15,8 | 11,2 | 13,6 |
| Цяляціна . . . . . . | 4,6 | 3,6 | 5,9 | 3,7 | 6,2 | 3,1 |
| Авечкі . . . . . . . | 11,9 | 14,1 | 9,5 | 14,9 | 11,1 | 14,4 |

іМалочная гаспадарка мае прыблізна аднакавую долю ў жывёлагадоўл абедзьвюх кр аін, і там і тут—гэта ледзьве ня выключна харчовая гаспадарка. Экстэнсіўны-ж від жывёл, як авечкі, рагатая жывёла маюць большыя долі ў Расіі, інтэнсіўны від—сьвіньні, цяляты (маладыя на мяса)—на Беларусі; значэньне прыбытку ад сьвіньней і цялят у беларускіх губэрнях падвойнае параўнальна ⁿ Расіяй.

Значыцца, і ў разглядзе паасобных галін сел. гаспадаркі выяўляецца, што тып яе на Беларусі інтэнсіўны, у Расіі экстэнсіўны.

3. Саматужніцка-рамесьніцкі тып прамысловасьці зьяўляецца пераважным на Беларусі і даволі значным у Расеі:

| | Беларусь. | | Расея. | |
|---|---|---|---|---|
| Доля рамесьнікаў і саматужнікаў ў прыбытку ад пр-ці . . . . . . | 70,6% | 71,6% | 38,6% | 35,1% |

Грунт для разьвіцьця буйнае капіталістычнае прамысловасьці ў Расіі больш спрыяючы, чым на Беларусі: ёсьць належная сырызна, вольныя капіталы, ёмісты мясцовы рынак (падвойная пакупецкая здольнасьць расійскага жыхара супроць беларускага), спрыяючая політыка; на Беларусі-ж замест буйнае фабрычнае прамысловасьці больш разьвіта прамысловасьць, абкладзеная акцызам, якая перапрацоўвае пераважна мясцовую сырызну: адносіны яе да фабр.-завадзкое на Белаусі 36%, а ў Расеі толькі 13%.

Што тып беларускае народнае гаспадаркі, а асабліва сельскае, вызначан праўдзіва, пакажа параўнаньне складу сельскае гаспадаркі беларускіх губэрняў—Меншчыны, Магілеўшчыны і Віцебшчыны—за 1900, 1913 і 1923/24 г. г.

Табл. № 170.

| Галіны | Меншчына | | | Магілёўшчына | | | Віцэбшчына | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1900 г. | 1913 г. | 1923/24 | 1900 г. | 1913 г | 1923/24 | 1900 г | 1913 г | 1923/24 |
| Збожжа . . . . . | 34,9 | 34,1 | 24,5 | 31,7 | 27,6 | 29,4 | 33,7 | 26,7 | 30,9 |
| Гандл.-прам расьл. . | 20,1 | 21,1 | 20,0 | 19,8 | 20,1 | 21,1 | 19,5 | 16,3 | 21,7 |
| Жывелагадоўля . . | 34,7 | 36,6 | 48,1 | 33,4 | 38,3 | 42,0 | 34,3 | 45,8 | 36,9 |
| Іншыя . . . . . . | 10,3 | 8,2 | 7,4 | 15,1 | 14,0 | 7,5 | 12,5 | 11,2 | 9,5 |
| Уся сел. гасп. . . | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 |
| У т. ліку бульба . | 9,6 | 7,7 | 15,7 | 12,3 | 11,8 | 12,9 | 15,4 | 15,4 | 16,0 |

Вылічэньне прыбытку за 1923/24 г. зроблена ЦСУ БССР па мэтаду, вельмі падобнаму да мэтада Пракаповіча (надрукована ў кнізе «Очерки по нар. хоз. и финансам Белоруссии»). Параўнаньне цалком усіх адносных лічбаў немагчыма, бо і мэтад ня зусім аднакавы, а галоўнае—абшары губэрняў розныя. Але асноўны ўхіл параўноўваць можна: ён застаўся ў сучаснай Беларусі такі-ж, як быў да вайны: жывёлагадоўля мае перавагу над усімі іншымі галінамі, а па Меншчыне жывёлагадоўля дае больш прыбытку, чым нават усё «земляробства» (збожжа + гандл.-промысл. расьліны даюць 45,5% прыбытку, а жывёлагадоўля 48,1%). Вывад будзе аднакавым, хоць бы мы залічылі ў «земляробства» сад і гарод (да жывёлагадоўлі ў такім выпадку мы павінны залічыць прыбытак ад птушак і пчол); вось лічбы:

Прыбытак па Меншчыне у 1923/24 с.-г. (тыс. чырв. руб.)

| | | | |
|---|---|---|---|
| Збожжа . . . . . . . . | 16.607,7 | Жывёлагадоўля . . . . | 32.625,3 |
| Гандлев.-прам. расьліны . | 13.522,1 | Птушкі і яйкі . . . . | 2.004,7 |
| Сад . . . . . . . . | 2.063,7 | Пчолы . . . . . . . . . | 411,4 |
| Гарод . . . . . . . . . | 2.573,4 | Разам . . | 35.041,4 |
| Разам . . | 34.766,9 | | |

Значыцца, тыпам сельскае гаспадаркі Беларусі зьяўляецца не «зерновая система с трехпольным севооборотом», як мяркуюць аўторы «Очерков по нар. хоз. и фин. Бел.» (стар. 6), а сыстэма мясной жывёлагадоўлі і інтэнсіўнай палявой гаспадаркі; сыстэма гаспадаркі не залежыць ад севазвароту.

Разгледзім склад прыбытку ад жывёлагадоўлі так, як ён падлічан ЦСУ БССР,—табл. № 171.

Табл. № 171.

Склад прыбытку ад жывёлагадоўлі.

| Галіны | Меншчына | | | Магілеўшчына | | | Віцебшчына | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1900 | 1913 | 1923/24 | 1900 | 1913 | 1923/24 | 1900 | 1913 | 1923/24 |
| Малако . . . . . . . . | 43,3 | 36,3 | 38,7 | 45,1 | 36,9 | 42,6 | 51,7 | 41,3 | 42,9 |
| Свіньні . . . . . . . | 23,9 | 37,2 | 42,0 | 25,2 | 32,8 | 40,2 | 18,0 | 19,4 | 35,3 |
| Гавядзіна . . . . . . | 10,6 | 10,0 | 7,2 | 8,7 | 11,7 | 5,5 | 8,8 | 16,1 | 7,6 |
| Цяляціна . . . . . . . | 4,7 | 4,4 | 3,5 | 4 4 | 5,9 | 4,2 | 3,9 | 7 2 | 4,4 |
| Авечкі . . . . . . . . | 11,0 | 8,7 | 7,5 | 11,4 | 9,3 | 5,4 | 12,5 | 12 3 | 8,6 |
| Скуры . . . . . . . . | 5,9 | 2,8 | 1,1 | 5,0 | 3,2 | 1,1 | 4,5 | 3,7 | 1,2 |
| Коні . . . . . . . . . | 0,6 | 0,6 | 0 | 0,2 | 0,2 | 0 | 0,6 | — | 0 |
| Разам . . . | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 |

Роля прыбытку ад сьвіньней ў агульным прыбытку ад жывёлагадоўлі няўхільна ўзрастае; роля малака й авечак зьніжаецца. Адноснае значэньне мяса (па Меншчыне нават аднае сьвініны) па усіх губэрнях вышэй, чым значэньне малака. Значыцца, кірунак беларускае жывёлагадоўлі—мясны, інтэнсіўны (роля сьвіньней).

Усе паданыя матар'ялы сьведчылі аб адным—што тып беларускае сел. гаспадаркі—мясная жывёлагадоўля і інтэнсіўныя палявыя культуры. Тып яе ў блізкай будучыне той-жа самы, толькі павінны яшчэ больш павялічыцца інтэнсіўныя элементы жывёлагадоўлі і палявых культур (павялічэньне ролі бульбы, зніжэньне ролі лёну і канапель). Малочная гаспадарка будзе узростаць разам з павялічэньнем яе рыначнасьці, а будзе ісьці гэты працэс вельмі павольна. Зразумела, што разумная эканамічная політыка павінна будавацца па-першае ў залежнасьці ад тыпу гаспадаркі: адсюль—практычная цікавасьць гэтага пытаньня.

Гандлевыя і вытворчыя сувязі Беларусі. Зараз, калі тып гаспадаркі Расіі і Беларусі прыблізна вызначан, а тып гаспадаркі Заход. Эўропы будзем лічыць індустрыяльным, з інтэнсіўнай рыначнай сел. гаспадаркай (жывёлагадоўля), не здавальняючай патрэб тамтэйшага рынку,—зараз можна разгледзіць гандлёвыя сувязі Беларусі. Яны пакажуць, да якіх краін, або якія краіны зьяўляюцца дадаткам да гаспадаркі Беларусі. Разгледзім гаспадарчыя сувязі з трох бакоў: 1) з боку рэалізацыі беларускае прадукцыі на чужаземных рынках, 2) з боку рэалізацыі чужаземнае прадукцыі на беларускім рынку, 3) з боку рэалізацыі людзкое рабочае сілы Беларусі. У табліцах зьмешчаны натуральныя вялічыні чыстага прывозу, або вывазу, і іх кошт. Ў адным радку балянс Беларусі агульны, у другім—балянс з Заходнай Эўропай. Падлічаны ня усе тавары, а толькі галоўныя, па якіх былі ведамасьці за 1911 год.

Табл. № 172.

Беларусь прадавала ў 1911 годзе:

| Назва прадуктаў | Агулам | | | У Заход. Эўр. Расіі | |
|---|---|---|---|---|---|
| | Колькасьць | Цана | Кошт (т р.) | Колькасьць (тыс. руб.) | Кошт (т. р.) |
| Лен і кудзеля . . . . | 4.194 | 4 р. 44 к. | 18 621,4 | 3.611 | 16.032.8 |
| Пянька і паскат. . . . | 328 | 4 » 23 » | 1.387.4 | 196 | 824,9 |
| Насеньне масьл і вык. . | 2.446 | 1 » 92 » | 4.696,3 | 2.842 | 5 456,6 |
| Тэхнічна-валаж. . . . . | — | — | 24.705.1 | — | 22.314,3 |
| Бульба . . . . . . . . . | 3.591 | — р. 25 к. | 897,8 | 3.560 | 890,0 |
| Сьпірт . . . . . . . . | 9 801,6 т.в. | 84 » 07 » | 8.386,7 | 625,6 | 529,9 |
| Масла насен. . . . . . | 471 | 6 » 78 » | 319,3 | 307,0 | 208,1 |
| Жмакі . . . . . . . . . | 2 779 | 1 » 08.7 | 3 020,8 | 2.381 | 2.588,1 |
| Насеньне сеяных траў . | — 3 | 1 » 59 » | — 4,7 | 391 | 621,7 |
| Крухмаль і муха бульб. | 198 | 1 » 40,1 | 277,2 | 138 | 193,3 |
| Разам . . . . . | — | — | 37.602 2 | — | 27.345,3 |

З прадуктаў палявой гаспадаркі Беларусь прадавала выключна прадукты інтэнсіўных культур, з якіх ¹/₄ частку займала бульба і вырабы з яе, а ³/₄—тэхнічна-валакняныя расьліны. Рынкам для такіх прадуктаў маглі стаць толькі староны з разьвітаю прамысловасьцю і інтэнсіўнай жывёлагадоўляй—г. зн. староны Заход. Эўропы; толькі адзін сьпірт вывазіўся пераважна ў Расею, ня так для тэхнічных патрэбаў, як для людзкога спажываньня.

А вось што з прадуктаў палявое гаспадаркі Беларусь купляла.

Табл. № 173.

| Назва прадуктаў | Куплялася наогул | | | Балянс з Зах. Эўр (+)(—) | |
|---|---|---|---|---|---|
| | Колькасьць | Цана | Кошт (т. р.) | Колькасьць (тыс пуд) | Кошт. (т. р.) |
| Жыта . . . . . . . . . | 3.760 | 90 | 3.384,0 | + 552 | + 496,8 |
| Пшаніца . . . . . . . | 214 | 113 | 241,8 | + 22 | + 24,9 |
| Авес . . . . . . . . . . | 7.525 | 77 | 5.794,3 | + 214 | + 164,8 |
| Ячмень . . . . . . . . | 837 | 85 | 711,5 | + 330 | + 280,5 |
| Мука пшанічная . . . . | 12.945 | 193 | 14.627,9 | — 93 | — 105,1 |
| » жытняя . . . . . | 451 | 90 | 405,9 | — 188 | — 169,2 |
| Высеўкі (отруби) . . . | 1.298 | 72 | 934,6 | + 574 | + 413.3 |
| Усё збожжа . . . . . . | — | — | 26.100,0 | — | + 1.106,0 |
| Крупы роз. і солад. . . | 6.918 | 84,1 | 5.818 0 | + 198 | + 166,5 |
| Цукер—рафінад . . . | 1.820 | 4,97 | 9 045,4 | + 3 | + 14,9 |
| » —пясок . . . . . | 1.063 | 4,07 | 4.326,4 | — 6 | — 24.4 |
| Разам усе . . . . | — | — | 45.289,8 | — | + 1.203,0 |

Тут выключную перевагу мае збожжа (2/3), якое прывазілася адтуль, дзе яго выраб найбольш танны, г. зн. з Расіі. Прыблізна 1/5—1/4 са ўсяго прывознага збожжа мелі кармавыя прадукты (авёс, высеўкі, ячмень). Вываз збожжа ў Заходнюю Эўропу з Беларусі зусім малы (1/20—1/25 ад вывазу гандлёва-прамысловых расьлінаў).

Чым далей будзеісьці інтэнсіфікацыя сельскае гаспадаркі Беларусі, тым большы будзе прывоз збожжа. І зараз ужо прывозны хлеб спажываюць ня толькі гарады, а часткова і сялянства. Гэта відаць з табл. № 174

Табл. № 174.

Прывоз збожжа на Беларусь (тыс. пуд.).

| Губэрні | 1875 г. | 1895—1899 г.г. | 1909—1913 г г. | Узрост % з 1899 г. | Узр. гар. жых. з 1900 г. до 1913 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| Віленшчына | — 135 | — 2.623,6 | — 5.206,2 | + 98,4 | + 43,6 |
| Віцебшчына | + 99 | — 3.962,8 | — 6.868,6 | + 73,3 | + 48,2 |
| Горадзеншчына | +2.954 | — 2.699,0 | — 4.943,5 | + 83,2 | + 45,2 |
| Меншчына | +1.111 | — 912,6 | — 3.641,5 | + 299,0 | + 29,9 |
| Магілеўшчына | — 415 | — 227,0 | — 3.822,9 | +1.584,1 | + 80,4 |
| Смаленшчына | —1.854 | — 3.104,4 | — 7.798,6 | + 151,2 | + 85,0 |
| Беларусь | +1.760 | —13.529,4 | —32.281,3 | + 138,6 | + 50.9 |

Па ўсіх губэрнях прывоз збожжа па ўзросту з 1895—99 г.г. да 1909—13 г.г. паперадзіў узрост гарадзкога жыхарства з 1900 г. да 1913 г Калі нават браць абсолютныя лічбы ўзросту гарадзкіх насельнікаў—каля 850 тысяч чалавек, і норму харчаваньня 1 жыхара гарадзкога ў паўтары разы вышэй ад сельскага, знача ў 15 пудоў, дык і ў такім выпадку прывоз у беларускія гарады павялічыўся бы толькі на 12—13 мільёнаў пудоў А фактычнае павялічэньне было, як бачым з табліцы, 18—19 мільёнаў значыцца частка збожжа прывознага з-за межаў Беларусі купляецца нашым селянствам.

Ці на вялікія грошы вывозіць Беларусь за свае межы прадуктаў жывёлагадоўлі, пакажа табл. № 174.

Табл. № 175.

| Назвы прад. | Агульны чысты вываз | | | У Зах. Эўропу | |
|---|---|---|---|---|---|
| | Кольkасьць | Цана | Кошт (тыс. р.) | Кольkасьць | Кошт |
| Быдла жывое | 19.137 | 69 р. — к | 1.320,5 | 2.767 | 190,9 |
| Коні » | 1.798 | 60 „ — „ | 107,9 | 4.078 | 244,7 |
| Свіньні » | 48.040 | 26 „ — „ | 1.209,0 | 10.936 | 284,3 |
| Авечкі » | 1.806 | 4 „ 15 „ | 7,5 | 612 | 2,5 |
| Мяса ўсякае, апрача сьвіногa | 685 | 4 „ 48 „ | 3.068.8 | 195 | 873,6 |
| Сьвініна і сала свін. | 48 | 8 „ 73 „ | 419,0 | 69 | 602,4 |
| Птушкі бітыя | 1 | 6 „ 40 „ | 6,4 | 1 | 6,4 |
| Яйкі | 208 | 5 „ 10 „ | 1.040,8 | 198 | 1.009,8 |
| Масла кароўе | 128 | 17 „ 72 „ | 2.268,2 | 68 | 1.205 0 |
| Сыр, тварог і інш. | 288 | 9 „ 63 „ | 2.773,4 | 46 | 443,0 |
| Птушкі жывыя | 877 | 12 „ 84 „ | 11.260,7 | 580 | 7.447.2 |
| Аўчыны, скуры, інш. | 23 | 16 „ 05 „ | 369,2 | 7 | 112,4 |
| Разам | — | — | 23.891,4 | — | 72.422,2 |

Ужо з ранейшага выкладаньня было вядома, што таварнасьць жывёлагадоўлі значна ніжэй, чым таварнасьць гандлёва-тэхнічных (26,8% супроць 34,7%) расьлін; пры гэтым для таварнасьці мяса, як было паказана, вялікую ролю меў унутраны рынак, а для таварнасьці гандлёва-тэхнічных расьлін, асабліва валакняных—пераважнае значэньне было за замежным рынкам. Тое ж выяўлена і ў табл. № 175. Прадуктаў жывёлагадоўлі вывозіцца за межы ў два разы менш, чым прадуктаў прамысловых культур. Замежны эўропэйскі рынак, асабліва далёкі, Беларусь выкарыстоўвае вельмі слаба; гэта—наогул для продажу продуктаў жывёлагадоўлі, а для продажу мясных прадуктаў далекі замежны рынак для Беларусі як бы ня існуе: усіх іх вывезена толькі на 2.198,4 тыс. рублёў, г. зн. у 3—4 разы менш, чым вываз адных жывых птушак; а малочных прадуктаў вывезена яшчэ менш—толькі на 1.648 тыс. рублёў! Значыць, і па складу экспорту Беларусь трэба лічыць краінай больш мясной жывелагадоўлі, чым малочнай: вываз агульны мясных прадуктаў на 6.172 тыс. руб., малочных—на 5.041,6 тыс. руб., вываз у Зах. Эўропу—мясных на 2.198,4 тыс. руб., малочных на 1.648 тыс. руб. Для рэалізацыі мясное прадукцыі Беларусі цыдатную ролю мае Польша.

Прывозіць Беларусь з жывёльных прадуктаў, розную рыбу і селядцы на 8.278,9 тыс. руб. (з Зах. Эўропы на 6.926,5 т. р.); скур нявырабленых на 6.317,8 тыс. руб., з Зах. Эўр. на 2.167.6 т. р.

Такім чынам для рэалізацыі прадукцыі інтэнсіўных галін сел. гаспадаркі для Беларусі переважную ролю мае Заход. Эўропа: на 2/3 прадукцыі, а калі-б дадаць да эўрапэйскага рынку польскі—то пэўне на 3/4. На Беларусі-ж мае для сябе рынак (на збожжа) Эўр. Расія.

Дзе прадаваўся лес — добра ведае ўсякі грамадзянін. Але мерку ўдзелу Заход.-Эўроп. рынку можна пабачыць толькі з лічбаў.

Табл. № 176.

| Назвы прадуктаў | Агульны вываз | | | У Зах Эўропы | |
|---|---|---|---|---|---|
| | Колькасьць | Цана руб. | Кошт | Колькасьць | Кошт |
| Дошкі, брускі, балькі . | 62.739 | 0,485 | 30.428,4 | 29.163 | 14.144,1 |
| Клепкі разныя . . . . | 3.251 | 0,871 | 2.831,6 | 1.950 | 1.698,5 |
| Іншыя гатункі па тарыфу I катэгорыі . . . . | 6 100 | 0,485 | 2 958 5 | 836 | 405,5 |
| Шпалы розныя . . . . | 1.577 | 0,399 | 764,8 | 659 | 319,6 |
| Інш. гат., па тар. II кат. | 10.906 | | 4 351,5 | 1.895 | 756,1 |
| Дручкі, калы, круглякі і інш. (III кат.) . . . | 38.408 | | 15 324,8 | 20.493 | 8.176,7 |
| Вугаль з дрэва . . . . | 2 934 | 0,53 | 1.555,0 | 1.019 | 540,1 |
| Кара лазовая і інш. . . | 257 | 0,59 | 151,6 | 2 | 1.2 |
| Тэрпэнт. і шпігінар . . | 674 | 3,40 | 2 291,6 | 613 | 2.084,2 |
| Вар дрэўны і смала . | 11 | 0,80 | 8,8 | 29 | 23,2 |
| | — | — | 60 666,6 | — | 28.149,2 |

Кошт экспорту лясных матар'ялаў вызначан па мытнай цане, таму ён значна перавялічаны. З 60-мільённага экспорту приблізна палова—28 мільёнаў—ідзе ў Заход. Эўропу; адзін кошт вывезенага з Беларусі лесу даваў большую суму грошаў, чым якая патрэбна для куплі ўсяго збожжа; але роля гандлёва-прамысловых культур і прадуктаў жывелагадоўлі ўсё-ж

была ня меншай у беларускім экспорце, чым роля лесу (62 млн. і 61 млн.) а ў вывазе ў Заходнюю Эўропу нават большай: (40 мільёнаў супроць 28 млн.).

Галоўныя матер'ялы, патрэбныя для прамысловасьці, Беларусь прывозіла вось якія:

Табл. № 177.

| Назвы | Наогул | | | З Зах. Эўропэ | |
|---|---|---|---|---|---|
| | Кольк (т. п.) | Цана | Кошт (т р) | Кольк. | Кошт |
| Камен. вугаль, кокс, брыкэты | 31.311 | 0,12 | 3.757,3 | 842 | 101,0 |
| Залеза і сталь | 3 479 | 1,41 | 4 905,4 | 50 | 70,5 |
| Медзь, латунь і інш | 42 | 16,68 | 700 6 | + 20 | + 333,6 |
| Цамэнт | 3.800 | 0.30 | 1.140,0 | 551 | 165,3 |
| Газа, бэнзін | 2.698 | 1,45 | 3 906,7 | 8 | 11,6 |
| Сода ўсякая | 410 | 0,65 | 266 5 | 5 | 3,3 |
| Глаубэрава соль | 468 | 0,85 | 397 8 | 242 | 205,7 |
| Кісьлі розныя | 331 | 0,50 | 165 5 | 80 | 40,0 |
| Дрэўная маса (цэлюлёза) | 832 | — | 715,5 | 511 | 439,5 |
| Бавоўна | 387 | 15.42 | 5.967,5 | 48 | 740,2 |
| Воўна | 210 | 38,25 | 8 032,5 | 125 | 4 780,3 |
| Разам | — | — | 29.955,3 | — | 6.224,8 |

Значыцца, ледзьве ня ўсю прамысловую сырызну й апал (на 4/5) Беларусь прывозіла з Расіі, а не з Заход. Эўропы; толькі бавоўна і воўна ішлі ў значнай долі праз Заход (блізка паловы). Адносна Зах. Эўропы Беларусь зьяўляецца тыповай аграрнай краінай (вывозіць туды сырызну й апал—лен, пяньку, лес), адносна Расіі мае элемэнты, тыповай індустрыяльнай (прывозіць сырызну, апал і харчаваньне—збожжа з Расіі)[1]).

Гатовыя вырабы немагчыма ацаніць, дзякуючы неаднароднасьці складу іх адзінак вагі. Таму падаю ў табл. № 178 натуральныя вялічыні (тыс. п.) вырабаў, якія на Беларусь прывазіліся.

---

[1]) Падаю паміж іншым табліцу прывозу каменнага вугальля на Беларусь за два кругабегі—1895—99 г.г. (I) і 1909—11 г.г. (II), як паказчык узросту прамысловасьці (тыс. пуд.).

Табл. № 178.

| | (I) | (II) |
|---|---|---|
| Віленшчына | 576,6 | 4.159 |
| Віцебшчына | 898,8 | 4.376 |
| Горадзеншчына | 855,6 | 6.730 |
| Меншчына | 113,8 | 4.552 |
| Магілеўшчына | 184,0 | 2.680 |
| Смаленшчына | 115,6 | 3.023 |
| Беларусь | 2.743,6 | 25.520 |

Табл. № 179.

Прывезена на Беларусь вырабаў тыс. пудоў.

| Назвы | Наагул | З Зах. Эўр. |
|---|---|---|
| Мануфактура ўсякая | 877 | 98 |
| У тым ліку—папяровая (з бавоўны) | 612 | 101 |
| Галантэрэйн. драбяза | 70 | +3 |
| Земляроб. машыны і прылады, апрача зробл. з дрэва | 345 | 185 |
| Іншыя машыны | 109 | 497 |
| Інструм. рамесьн. | 15 | 16 |
| Цьвікі | 104 | 140 |
| Фасфарыты меленые | 410 | 5 |
| Цэгла агнятрывалая | 331 | 49 |
| Тутун і вырабы з яго | 363 | 18 |

Заход. Эўропа забясьпечвала Беларусь пераважна living рознымі машынамі, прыладамі, інструмэнтамі; Расія—пераважна тэктыльнымі вырабамі. Але і Беларусь вывозіць даволі значную колькасьць сваіх прамысловых вырабаў, і калі б можна было зрабіць хоць прыблізную іх ацэнку, я упэўнен, што па кошту Беларусь вывозіць у Расію больш, чым прывозіць адтуль. Для некаторых мяркаваньняў аб гэтым падаю табл. № 180.

Табл. № 180.

Беларусь вывозіць прамысловых вырабаў (тыс. пудоў).

| Назвы | Наагул | У Зах. Эўропу |
|---|---|---|
| Вырабы з воўны | 138 | 52 |
| Прадзіва з лену | 149 | 16 |
| Палатно сялянскае | 9 | 2 |
| Вырабы з дрэва—хурманач. прыналежн. | 1.201 | 296 |
| Усе інш. вырабы з дрэва | 912 | 420 |
| Вырабы з скуры | 11 | — |
| Сярнічкі | 487 | 50 |
| Шкло featured рознае | 700 | 67 |
| Бутэлькі і бутлі | 455 | 77 |
| Пасуда шкляная | 494 | 97 |
| Кафля | 387 | 89 |
| Цэгла звыч. | 1319 | 66 |
| Папера і кардон усякія | 653 | —165 |

Як бачым, вываз не малы, але пуды не даюць адказу, хто ж болей вывазіў прамысловых тавараў—Беларусь у Расію, ці наадварот. Магчыма першае. Чысты прывоз прадуктаў прамысловасьці быў бязумоўна большы з Заход. Эўропы на Беларусь, а не ад нас туды.

Усе паданыя матар'ялы аб чыстым вывазе—прывозе з Беларусі, пэўна-ж ня поўныя і толькі прыблізныя, бо цэны браліся не мясцовыя (іх няма); але і паданы яны не для таго, каб даць выяўленьне аб актыўным ці пасіўным балянсе, не для пэўнага падрахунку гэтых балянсаў,—а толькі для характарызаваньня тыпу экспорту-імпорту, для адноснага вызначэньня сувязяў Беларусі.

Згуртованыя лічбы высьвятлілі, што:

1) Беларусь вывозіць у Зах. Эўропу пераважна сел.-гасп. і лясную сырызну; у Расію—вырабы сваёй сел.-гасп. апрацоўчае і фабр.-заводское прамысловасьці і лясавую сырызну. Адносна З. Эўропы такі вываз адзначае аграрную краіну, адносна Расеі—краіну з прамысловымі адзнакамі.

2) Прывозіць Беларусь з Зах. Эўропы розныя машыны і прылады, з Расіі—прамысловую сырызну і апал і харчаваньне. І праз прывоз вызначаецца той-жа тып краіны.

3) З сел.-гасп. прадукцыі Беларусь вывозіць — прадукты інтэнсіўнай палявой гаспадаркі і жывёлагадоўлі, пераважна мясной. Сувязі па вывазу з Зах. Эўропай.

4) Прывозіць Беларусь з сел.-гасп. продукцыі выключна збожжа, пераважна з Расіі; і не таму, што наш край бедны і галодны, а таму, што інтэнсіфікацыя сел. гаспадаркі паглыбляецца, выціскаючы ролю збожжа ў сел. гасп. культурах.

5) Агульныя сувязі беларускае сел. гаспадаркі з заходня-эўрапейскім рынкам вельмі слабыя: у Зах. Эўропу вывозіцца толькі 7% ад усяе сел.-гасп. прадукцыі Беларусі, 32% ад усяе таварнае часткі гэтае прадукцыі, 66% ад усяго чыстага вывазу сел. гасп. прадуктаў.

6) Тып народ. гаспадаркі Беларусі такі-ж, як было выяўлена і раней: краіна старой культуры, з багатым праз гістарычныя ўмовы людзкім прамысловым апаратам (рамесьнікі), не забясьпечаным капіталамі, з перавагай у народным вытвары інтэнсіўнае сел. гаспадаркі, з інтэнсіўнымі палявымі культурамі і мясной жывёлагадоўляю.

Па рэалізацыі людзкой рабочай сілы Беларусь Усходняя (сел. гаспадарчая) зьвязана з краінамі багатымі зямлёю (Сыбір, Далекі Усход), Беларусь Заходняя (з большым прамысловым ухілам) з краінамі якія багаты капіталамі, з вялікай вытворчасьцю працы, з вялікай зараб. платай (Амэрыка).

Ні аб прычынах малай працаёмістасьці народ. гаспадаркі Беларусі, ні аб яе жыцьцёвых праявах (эміграцыя, перасяленьне) казаць ня буду.

Некалькі слоў аб тыпах народ. гаспадаркі Беларусі па асобных губэрнях (ухіляючыся ад раённых асаблівасьцяй у самых губэрнях). Гэта-ўсе той жа тып: перавага здабываючай прамысловасьці, сел.-гаспадарчай, інтэнсіўнай, з мясною жывёлагадоўляю і інтэнсіўнымі палявымі культурамі; формы старой прамысловай і гарадзкой культуры (рамесьнікі), з слабымі пакуль што, але адзначанымі рысамі капіталістычнае індустрыалізацыі. Але тып гэты па моцы свайго выяўленьня законаўпарадкавана дыфэрэнцыраваўся па абшару нашага краю: чым далей к заходу, тым большая роля апрацоўчае прамысловасьці і гарадзкога жыцьця, большая інтэнсіўнасьць і інтэнсіфікацыя сел. гаспадаркі, большая роля жывёлагадоўлі, а з інтэнсіўных палявых культур—бульбы. Чым бліжэй к усходу, тым больш узмацняецца роля здабываючае прамысловасьці, менш інтэнсіўнае, з адносна ніжэйшай роляю жывёлагадоўлі і ўзмацненьнем ў інтэнсіўных культурах значэньня тэхнічна-валакняных расьлін. Ужо паданы матар'ял аб гэтым згуртоўваю ў таб. № 181.

Табл. № 181.

| Назовы | Горад | Віл. | Мен. | Віц. | Маг. | Смал. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Роля прамысл. у 1900 г. . . . . . | 22,1 | 19,9 | 14,4 | 11,8 | 10,1 | 9,3 |
| » » у 1913 г. . . . . . | 22,2 | 21,1 | 19,3 | 15,5 | 12,2 | 12,2 |
| » » у 1913 г. (ст. ц.) . | 26,0 | 25,5 | 22,3 | 18,4 | 13,7 | 14,8 |
| Роля сел. гасп. у 1900 г . . . . . | 49,6 | 49,0 | 47,8 | 56,2 | 60,1 | 66,6 |
| » » » у 1913 г. . . . . . | 48,9 | 51,5 | 48,3 | 54,2 | 62,7 | 66,7 |
| » » » у 1913 г. (ст. ц.) . | 44,4 | 45,4 | 46,3 | 48,2 | 60,4 | 62,0 |
| Роля здабыв. пр-ці (с. г., лес, рыба) | | | | | | |
| » » » у 1900 г. . . . . . | 59,7 | 58,5 | 67,9 | 68,3 | 74,0 | 74,9 |
| » » » у 1913 г. . . . . . | 56,4 | 59,2 | 65,2 | 62,5 | 72,9 | 72,4 |
| » » » у 1913 г. (ст. ц.) . | 51,5 | 53,2 | 61,3 | 56,8 | 70,3 | 67,9 |
| % сел.-гасп. нас. у 1897 г. . . . | 68,90 | 73,01 | 74,35 | 73,28 | 79,18 | 83,39 |
| % гарадз. жыхароў у 1897 г. . . . | 15,7 | 12,7 | 10,3 | 14,6 | 8,6 | 7,6 |
| % » » у 1913 г. . . . | 18,1 | 13,9 | 8,8 | 16,7 | 10,7 | 10,1 |
| Гушчыня ўсіх насел. у 1897 г. . . | 47,30 | 43,21 | 26,79 | 38,53 | 40,03 | 30,99 |
| % жывелагадоўлі ў пр. ад с.-г. у 1900 г. | 37,4 | 39,8 | 34,7 | 34,3 | 33,4 | 32,3 |
| % бульбы ў прыб. ганд проц. у 1913 г. | 72,4 | 75,6 | 72,5 | 47,4 | 58,8 | 28,2 |
| Прыбытак на 1 чал. у 1913 г. . . . | 84,77 | 81,43 | 75,12 | 77,77 | 62,95 | 75,66 |
| Прыб. на 1 дзес. карыс. з 1900 г. . | 32,41 | 32,45 | 21,88 | 24,87 | 22,15 | 19,55 |

Можна значна больш адшукаць пакажчыкаў, якія будуць законаў—парадкавана зьмяняцца з заходу на ўсход Беларусі; я падаў толькі галоўныя, асноўныя. Чым жа вытлумачыць такую зьмену і інтэнсіўнасьці і форм народнае гаспадаркі з заходу на ўсход? Адказ можа даць толькі самастойны асобны досьлед. Як мне здаецца, прычынай зьяўляецца усё ж не адлегласьць ад Зах. Эўропы, як рынку: выходзячы з прынцыпаў Цюнэна гэту зьмену ня зразумець; прычыны трэба шукаць у гісторыі Беларусі, у гісторыі яе засяленьня, ў палітычных умовах.

Канчаючы на гэтым сваю працу, падаю ў табл. № 182, 183 і 184 лічбы аб долі Беларусі ва ўсім прыбытку Эўр. Расіі і ў асобных частках гэтага прыбытку.

Табл. № 182.

| Галіны | Доля Беларусі (%) | | |
|---|---|---|---|
| | 1900 г. | 1913 г. | 1913 г. па ст. ц. |
| Сел. гасп. . . . . . . | 10,3 | 10,1 | 9,7 |
| Лес . . . . . . . . . | 15,0 | 16,0 | 15,0 |
| Рыба . . . . . . . . . | 0,5 | 1,6 | 0,6 |
| Прамыслов. . . . . . . | 6,0 | 7,0 | 6,9 |
| Шляхі знос. . . . . . . | 7,2 | 6,9 | 7,0 |
| Будаўніцтва . . . . . . | 6,4 | 7,0 | 7,2 |
| Гандаль . . . . . . . . | 6,1 | 6,0 | 5,8 |
| Увесь прыб. | 8,6 | 8,8 | 8,4 |

Табл. № 183.

| Галіны | Доля Беларусі (%) | | |
|---|---|---|---|
| | 1900 г. | 1913 г. | 1913 г. ст. ц. |
| Збожжа | 7,2 | 6,9 | 6,9 |
| Ганд-прам. расьл. | 15,0 | 17,0 | 16,7 |
| У прыват. лен (вал.) | 18 2 | 28,5 | 20,9 |
| „ бульба | 20,6 | 21,0 | 20,3 |
| Жывелагадоўля | 13,0 | 13,3 | 12,4 |
| У прыват. малако | 12,9 | 12,7 | 10,4 |
| „ сьвіньні | 22 6 | 21,9 | 22,3 |
| Сад, гарод, пчолы і інш. | 11,2 | 12,5 | 12,3 |
| Рамесьніц. прам. | 17,0 | 20,5 | — |
| Хатняя „ | 1,0 | 0,9 | — |
| Фаб-зав. прам. | 3,4 | 3,7 | — |
| Абкладз. акц | 6,9 | 10,2 | — |

Табл. № 184.

Доля Беларусі (%) ў таварнай частцы прыб. Э. Расіі.

| | |
|---|---|
| Сельская гаспадарка | 7,1 |
| Лес | 22,5 |
| Збожна | 2,1 |
| Гандл-прам. расьл. | 10,3 |
| Жывёлагадоўля | 10,9 |
| Бульба | 14,7 |
| Лен і каноплі | 17,9 |
| Малако | 5,2 |
| Мяса (гавядз. і цяляціна) | 17,8 |
| Сьвініна | 15,8 |

На падставе ранейшага выкладаньня табліцы зразумелы без тлумачэньня. Па абшару доля Беларусі 6,3%, па насельніцтву 10,8% і 10,7%.

## Сьпіс выкарыстанае літаратуры.

**(У парадку выкладаньня).**


1. **А. Смит.** Исследования о природе и причинах богатства народов. Пер. П. А. Бибикова. СПБ. 1866.
2. **К. Маркс.** Капитал т. II и т. III. Под ред. В. Базарова и И. Степанова. М. 1907 г. М. 1923 г.
3. «Промышленность». Зборнік з «Handwörterbuch der Staatswissenschaften». М. 1896 г. Р. Мейер. «Доход».
4. **С. Прокопович.** Опыт исчисления нар. дохода 50 губ. Евр. России в 1900—13 г. г. М. 1918 г.
5. **Л. Литошенко.** Национальный доход СССР.
6. **Гельфферих.** Развитие нар. хозяйства Германии с 1888 по 1913 г. М. 1920 г.
7. Опыт приблизительного исчисления народного дохода по различным его источникам и по размерам в России. Материалы к проекту Положения о государств. подоходном налоге СПБ. 1906 г.
8. **В. В. Морачевский.** Земледельческий промысел в народн. хозяйстве России. Адбітак з «Агрономическая помощь в России». 1914 г.
9. **Ю. Э. Янсон.** Сравнительная статистика России и западно-европейских государств. т. II. Промышленность и торговля. Отд. I. Статистика сел хоз. СПБ. 1880 г.
10. **Г. А. Студенский.** Очерки сел.-хоз. экономии. М. 1925 г.
11. **А. Л. Вайнштейн.** Место сел. хоз. в нар. хоз. России, адбітак з «Социалистическое хозяйство» т. III. 1924 г.
12. **Ен жа.** Обложение и платежи крестьянства в довоенное и революционное время. М. 1924 г.
13. **А. Боули.** Теоретические основания выборочного метода. Харьков. 1924 г. Уступ праф. С. Берштэйна.
14. **А. Котов-Кот.** Экономический ландшафт полосы сев. ж. д. от ст. Москва до ст. Пушкино. М. 1923 г.
15. **А. Скворцов.** Основы экономики земледелия. СПБ. 1914 г.
16. **Л. Н. Маресс** Производство и потребление хлебов в крест. хозяйстве. У зборніку «Влияние урожаев и хлебных цен на некоторые стороны рус. нар. хозяйства». СПБ. 1897 г.
17. **К. Маркс.** Письма к Кугельману.
18. Свод статистических сведений по сел. хоз России к концу XIX века. Изд. М. З. Г. И. Отд с.-х. экон и стат СПБ. 1902 г
19. Урожай хлебов и трав. Изд ЦСК. Гады: 1896, 1897, 1898, 1899, 1900, 1909, 1910 1911, 1912 і 1913
20. «.... год в сел.-хоз. отношении»... Выд. б. М Зем.
21. **В. Обухов.** Эволюция урожайности ржи за период 1883—1915 г. г. в Евр. России. Вестник стат. кн. XV 1923 г.
22. **Н. Череванин.** Эволюция рус. земледелия по данным об урожаях. Вестник стат. № 8—12. 1919 г.
23. **Н. Четвериков** Колебания урожаев, как фактор, влияющий на устойчивость сел. хоз. в России. Вестник стат. кн. XIV. 1923 г.
24. **Е. Ф. Лискун.** Мясной вопрос в соврем. хоз. обстановке. II. 1917 г. Материалы КЕПС.
25. **М. Ф. Иванов.** Свиноводство. М. 1922 г.

26. Материалы к пересмотру торгового договора России с Германией и другими государствами. Перевозки по рус. ж. д.
27. Журнал агрономич. совещания при Могил. Г З. Упр. в 1912 г.
28. **Е. Ф. Лискун**. Краткие сведения о животноводстве некоторых русских хозяйств, по данным, полученным от хозяев. II. 1915 г.
29. Отчет о деятельности товариществ контроля скот. дворов Минск. 1915 г
30. Современное состояние овцеводства в России. СПБ 1912 г.
31. Труды I всерос. с'езда по овцеводству в Москве. 1912 г.
32. **Н. П. Макаров** Рыночное молочное хозяйство. II. 1917.
33. **Н. А. Крюков**. Хранение продуктов птицеводства и торговля ими.
34. **Н. М. Семенов**. Птицеводство в Полесье. Мозырь. 1911 г.
35. **Я. Полферов**. Рус. промысл. птицеводство в предстоящем пересмотре торговых договоров. II. 1915 г.
36. **А. Чефранов**. Русская пчелопромышленность к началу XX века. 1901 г
37. Главные данные поземельной статистики по обследованию 1887 г.
38. Положение садоводства в России СПБ 1901 г.
39. Стат.-экон очерки областей, губерний и городов России, под ред. Л. Н. Яснопольского. Киев. 1913 г А. Власов. «Белоруссия и Литва».
40. **Г. Касперович**. Лесное дело, лесная торговля и лесопромышленность в России в связи с пересмотром торг. договоров II 1916 г.
41. Ежегодник Лесного Департамента за 1913, 1912, 1911, 1910, 1909 г. г.
42. **В. И. Майер**. Распределение лесов Евр. России по районам и областям установленным Госпланом Труды Госплана. Кн II. М. 1923 г.
43. **Н. А. Марков**. Жел.-дор. транспорт. лесн. материалов для экспорта за границу. СПБ. 1914 г.
44. Известия Упр Делами Особ Совещания по топливу 1917/18 г. № 4.
45. Рыболовство и рыбоводство в Сев.-Зап. крае. Справаздача экспедыцыі праф. Зографа.
46. **В. А. Кевдин**. Современное рыболовство России. М. 1915 г.
47. Ежегодник Мин. Финансов за 1901, 1903, 1913 и 1914 г. г.
48. Ежегодник России. Изд. ЦСК 1906, 1910, 1911, 1912, 1913, 1914, 1915, 1916 г. г.
49. Статистические сведения о фабриках и заводах по производствам необложенным акцизом за 1900 г. под ред В. Е Варзара.
50. Статистические сведения по обрабатывающей фаб.-зав пром. Р. И. за 1908 г. под ред. В. Е. Варзара. Изд. М. Торг. и Пром.
51. Фабрично-зав. пром. Евр. России в 1910/12 г г.
52. Свод товарных цен за 1900, 1911, 1912 и 1913 г. г
53. Стнтистика производств облагаемых акцизом за 1896, 1897, 1898, 1899, 1900 г.; за 1909, 1910, 1911, 1912, 1913 г. г.
54. Материалы и исследования о еврейской ремесл. промышленности. II. 1915 г.
55. **А. Бурбис**. Краткий очерк по экон. географии Белоруссии. Нар. Хоз. Бел. № 4. 1922 г.
56. **А. Смоліч** у зборніку «Беларусь» Менск. 1924 г Эканомічнае становішча Беларусі перад вайной і рэвалюцыяй
57. **А. А. Рыбников** Мелкая промышленность России. М. 1923 г.
58. **В. Е. Варзар**. Материалы о кустарн. пром. за 1900 г.
59. **Т П Петров**. Промысловая кооперация и кустарь.
60. **М. Довнар-Запольский**. Исследования и статьи. Куст пром. Минской губернии.
61. **М. Туган-Барановский**. Русская фабрика
62. **В. Ф. Мейен**. Россия в дорожном отношении. СПБ. 1902 г.
63. Статистика прямых налогов за 1912 г. Промысловый налог. Изд. Д-та окл. сбор.
64. Статист. результаты процентного и раскладочного сборов за 1896, 1897 и 1898 г г. Изд. М. Ф. Д-т Торг и Мануфактур
65. Статистика прямых налогов и пошлин. Госуд промысловый налог за 1912 г.
66. Статистика по казенной продаже питей 1903 и 1913 г. г.
67. Первая всеобщая перепись населения Р. И. в 1897 г. Погубернские выпуски.
68. Труды ЦСУ т. I. вып. I. Предварительные итоги переписи населения 28 августа 1920 г. М. 1920 г.

69. **В. Аленицын.** Население и прирост его в Е. Р в десятилетие 1891–1900 г. Ежегодник России. 1905 г.

70. Предварительные итоги с.-х. переписи 1916 г

71. **Р Кабо.** Потребление городского населения России. М. 1918 г.

72. **Блиох** Влияние ж. д на экон состояние России. Т. III.

73. Производство, перевозки и потребление хлебов.

74. Приложение к отчету государств. контроля по исполнению госуд. росписи и финансовых смет за 1913 г. П. 1914 г.

75. Очерки по нар хозяйству и финансам Белоруссии.

76 Сел. хоз. БССР и мероприятия по его восстановлению. Минск. 1925 г

77. Россия, под ред. В. П. Семенова, т IX. Верхнее Поднепровье и Белоруссия

78. **Т. Штейн.** Отправление и прибытие хлеб грузов по ст. ж. д. и пристаням за 1875 г. «Движение хлебных грузов».

79. **Н С. Петлин.** Опыт описания губ и областей России в стат. и эконом. отношениях. 2 т. СПБ. 1893 г.

80. **А. Н. Челинцев.** Производство свинины в России. М. 1916 г.

Республиканский книжный магазин
подписных изданий
ОТДЕЛ БУКИН. КНИГИ
Цена — руб. 40 коп.
№ 5229 1961 г.